Менавіта матэрыялы апарата ўпаўнаважаных Савета па справах Рускай праваслаўнай царквы пры СНК (СМ) СССР утвараюць аснову крыніцазнаўчай базы па вывучэнні гэтага амаль зусім недаследаванага перыяду па гісторыі царкоўна-дзяржаўных адносін. Фонды рэспубліканскага і абласных упаўнаважаных, якія сёння захоўваюцца ў дванаццаці архіўных установах Беларусі, утрымліваюць унікальныя звесткі для вывучэння прававога стану царквы, працэсаў налажвання рэлігійнага жыцця, сістэмы царкоўна-адміністрацыйнага ўпраўлення і кананічнай пераемнасці царкоўнай улады ў першыя пасляваенныя гады.

Правы і абавязкі сфарміраваных апаратаў упаўнаважаных рэгулявала «Інструкцыя для ўпаўнаважаных Савета па справах РПЦ пры СНК СССР» ад 5 лютага 1944 г., якая вызначала асноўныя напрамкі і змест дзейнасці, а менавіта – ажыццяўленне сувязі з епархіяльнымі епіскапамі, справы аб

адкрыцці і закрыцці цэркваў, рэгістрацыя духавенства, храмаў, заключэнне дамоваў, улік і статыстыка, падрыхтоўка інфармацыі для прадстаўлення ў Савет пры СНК СССР і інш.

Упаўнаважаныя таксама павінны былі сачыць за пераходам дзейнасці царкоўных прыходаў у адпаведнасць з новым «Палажэннем аб кіраванні РПЦ», прынятым на памесным саборы РПЦ і зацверджаным пастановай СНК СССР у 1945 г. Палажэнне, як вядома, прадугледжвала калегіяльны прынцып кіравання царкоўнай абшчынай, умовы яе рэгістрацыі з боку дзяржавы, умовы карыстання царкоўнымі будынкамі і прызначэнне прыходскіх святароў.

Найбольш складаным і неўнармаваным у першыя пасляваенныя гады было пытанне юрысдыкцыі праваслаўных прыходаў у Беларусі. Абсалютная большасць духавенства і прыхаджан станоўча ўспрымалі пераход пад юрысдыкцыю Маскоўскай патрыярхіі і патрабаванні «Палажэннем аб кіраванні РПЦ». У першым рапарце архіепіскапа Васілія (Ратмірава), які прыехаў 10 жніўня 1944 г. ў Мінск для вывучэння на месцы царкоўных спраў, патрыяршаму Месцазахавальніку мітрапаліту Аляксію (Сіманскаму, будучаму Патрыярху) адзначалася, што пасля адыходу з немцамі былых духоўных кіраўнікоў Праваслаўнай царквы «...веруючыя знаходзіліся ў плачэўным стане. Прыезд епіскапа, прадстаўніка Маскоўскай патрыярхіі, для веруючых быў вялікай духоўнай радасцю. Вестка аб прыездзе епіскапа з хуткасцю маланкі абляцела горад». Ужо ў першыя дні прабывання архіепіскапа ў Мінску ў кананічныя зносіны з РПЦ быў прыняты праз пакаянне 31 святар [14, с. 103 – 104].

Асаблівасць сітуацыі была і ў тым, што фармальна працягвала існаваць дзяленне на епархіі, утворанае ў час вайны, але епархіямі кіравалі не епіскапы, а благачынныя або прыходскія святары. Прыкладам можа служыць даклад мітрапаліту Аляксію ад 9 жніўня 1944 г. святара Аляксандра Раманушкі, які апісвае прыняцце на сябе абавязкаў часовага ўпраўляючага Палескай епархіяй наступным чынам: «Воляй Госпада нашага Ісуса Хрыста і Яго вялікай міласцю, па ўзгадненню з мясцовымі адміністрацыйнымі органамі, я прыняў на сябе часовае кіраванне Палескай епархіяй, асірацеўшай пасля адыходу ў Германію разам з нямецкімі акупантамі і разам з усім пінскім духавенствам нашага ўладыкі…» [5]. Загадам ад 5.09.1945 года архіепіскапа Мінскага і Беларускага Васілія (Ратмірава) Аляксандр Раманушка быў афіцыйна зацверджаны на пасадзе ўпраўляючага справамі Палескай епархіі [3]. Ён нават меў права перамяшчаць свяшчэннаслужыцеляў і забараняць іх у служэнні. Такія ж пасады ўводзіліся па іншых епархіях Беларусі.

Такая практыка супярэчыла «Палажэнню аб кіраванні РПЦ» і пастанове Свяшчэннага Сінода ад 16 мая 1947 г., згодна з якой указы аб перамяшчэнні маглі выдавацца толькі епіскапамі. Таму ў 1947 г. тыя епархіі, дзе не было епіскапаў, пераўтвараліся ў благачынныя акругі, пры абласцях ўводзіліся пасады т. зв. абласных благачынных, што таксама супярэчыла згаданаму «Палажэнню», але адпавядала рэаліям таго часу.

У існаванні абласных благачынных у першую чаргу былі зацікаўлены і самі ўпаўнаважаныя. У пісьме ад 25.07.1946 г. упаўнаважаны па Баранавіцкай вобласці Барташ звяртаецца да ўпаўнаважанага па БССР Часнакова з просьбай: «Я ўжо не раз прасіў, каб вы дамовіліся з еп. Васіліем аб прызначэнні свайго ўпаўнаважанага (абласнога благачыннага) па Баранавіцкай вобласці. Яго адсутнасць… значна ўскладняе працу…» [4].

Яшчэ адной праблемай як царкоўнай улады, так і ўпаўнаважаных была рэгістрацыя і прызначэнне на прыходы святароў. У інфармацыйным дакладзе ад 01.04.1945 г. ўпаўнаважанага па Брэсцкай вобласці Аўласенкі, адзначалася, што духавенства былой украінскай аўтакефаліі заявіла сябе прыхільнікамі Маскоўскай патрыярхіі і пры рэгістрацыі ўсе абвяшчаюць сябе прыхільнікамі РПЦ [1], але ў наступным дакладзе, за трэці квартал 1945 г., упаўнаважаны пісаў, што «значная частка святароў вобласці (каля 60-ці з 102) пры рэгістрацыі прад’яўляюць загады аб сваім прызначэнні ад былых епіскапаў пры польскай уладзе ці нямецкай акупацыі, а падцвярджэнняў ад Маскоўскай патрыярхіі не маюць» [2].

Некаторыя святары, якія атрымалі загады аб прызначэнні на прыходы ад абнаўленчых епіскапаў або пры польскай і нямецкай акупацыі, не спяшаліся прызнаваць уладу Маскоўскага патрыярхату. У інфармацыйным дакладзе па Гомельскай вобласці за першы квартал 1946 г. упаўнаважаны паведамляе аб васьмі святарах, якія адмовіліся прайсці рэгістрацыю. «У асноўным гэта манахі, рукапалажаныя ў гады вайны, супраціўляюцца ў падпарадкаванні Маскоўскаму патрыярху» [5]. Часам канфлікты даходзілі да адкрытай канфрантацыі. У Баранавіцкай вобласці дзейнасць настаяцеля Карэліцкай царквы Душука была ацэнена ўпаўнаважаным, як «антысавецкая»: «Больш за год ён не прызнаваў Маскоўскага патрыярха і ў малітвах памінаў архіерэяў Польскай праваслаўнай аўтакефаліі. Толькі пасля таго, як епіскап Варсанофій прыгразіў яму забаронай, ён фармальна прызнаў уладу патрыярхіі і падпарадкаваўся епархіі» [6]. Для дзяржаўных органаў такія святары з’яўляліся нелегітымнымі, таму мясцовым адміністрацыйным органам прадпісвалася: «пры з’яўленні ўказаных асоб, рашуча супрацьдзейнічаць

ажыццяўленню рэлігійных абрадаў і прымаць меры па выдаленню іх з вобласці» [7].

Акрамя кантралюючых функцый у першыя пасляваенныя гады ўпаўнаважаныя аказвалі канкрэтную дапамогу царкоўным уладам па многіх гаспадарчых і арганізацыйных пытаннях, такіх як выдзяленне памяшканняў, транспарту, дроў, харчовага забеспячэння. У многіх выпадках яны прадухілялі парушэнні заканадаўства з боку мясцовых органаў улады.

Улічваючы рэлігійную сітуацыю ў Беларусі, асабліва ў заходніх абласцях, упаўнаважаныя ішлі на некаторыя саступкі вернікам. Напрыклад, на зварот Гродзенскага епіскапа ад 19 лютага 1946 г. аб дазволе правесці ў Гродне хрэсны ход на р. Нёман, «улічваючы міжнародную абстаноўку і ўмовы Заходняй Беларусі», было прынята станоўчае рашэнне. На хрэсны ход сабралася каля 4 – 6 тыс. вернікаў, а епіскап публічна выказаў падзяку мясцовым ўладам [8].

Аднак не трэба перабольшваць станоўчыя адносіны ўладаў да царквы ў перыяд 1944 – 1948 гг. У аснове рэлігійнай палітыкі дзяржавы ўсё ж пераважаў «прагматычны» падыход. Выкарыстоўваючы пазітыўны «імідж» царквы для кансалідацыі грамадства ў цяжкія пасляваенныя часы і аўтарытэт царквы ў міжнароднай палітыцы, улады дазвалялі весці рэлігійнае жыццё толькі на «аптымальна дастатковым» узроўні.

Гэта можна прасачыць па дакументах адносна ініцыятывы святароў і прыхаджанаў па легалізацыі дзейнасці царкоўна-прыхадскіх арганізацый – брацтваў і сястрынстваў. Такіх захадаў было зроблена нямала. Так, прыхаджане Гродзенскага Пакроўскага сабора звярнуліся з заявай аб адкрыцці пры храме Гродзенскага праваслаўнага Пакроўскага брацтва і распрацавалі статут брацтва па ўзору існаваўшага раней, пры польскай уладзе [9].

У 1945 г. да ўпаўнаважанага па Брэсцкай вобласці звярнуўся благачынны Кобрынскай акругі пратаіерэй Феадосій Дзмітрук, які паведаміў аб існаванні пры Кобрынскім саборы брацтва, якое налічвае каля 70 братчыкаў, і прасіў узгадніць яго дзейнасць [10]. У інфармацыйным дакладзе па Брэсцкай вобласці, у якім былі пералічаны брацтвы пры Кобрынскім, Пружанскім саборах, Мікалаеўскай царкве г. Брэста, пры некаторых цэрквах Дывінскага раёна. Упаўнаважаныя, у сваю чаргу, неаднаразова ставілі перад Саветам пытанне аб адносінах да юрыдычна незарэгістраваных прыходскіх арганізацый [11]. Пытанне існавання брацтваў падымалася на рэспубліканскай нарадзе ўпаўнаважаных у 1946 г. Аднак канкрэтных інструкцыйных указанняў аб

дзейнасці брацтваў не было прынята, па кожным выпадку прымалася асобнае рашэнне.

Напрыклад, на інфармацыю ад 17 мая 1948 г. упаўнаважанага па Бабруйскай вобласці аб арганізацыі ў г. Слуцку святаром Дзюкавым брацтва Савет тлумачыць, што «арганізацыя т.зв. «брацтваў» і «сястрынстваў» у цэрквах не павінна дапускацца, калі такое брацтва сапраўды было створана, вы (упаўнаважаны па БССР Менькоў) павінны звярнуць увагу архіепіскапа Піцірыма з тым, каб ён даў указанне распусціць брацтва і далей без указання архіерэя падобных мерапрыемстваў не праводзіць» [12].

Не былі падтрыманы Саветам ініцыятывы, прапанаваныя сходам благачынных Гродзенскай епархіі 9 – 12 мая 1946 г. па стварэнні праваслаўнай семінарыі ў г. Гродна, або захады архіепіскапа Піцірыма аб пераносе дзейнасці Мінскай духоўнай семінарыі з Жыровіч у Мінск. Таксама Савет вынес катэгарычнае патрабаванне аб роспуску створанага 24 сакавіка 1948 г. місіянерскага савета Мінскай епархіі [13].

Такім чынам, фонды ўпаўнаважаных даюць даследчыку шырокі дакументальна-інфармацыйны матэрыял для вывучэння гісторыі адносін царквы і дзяржавы ў першыя пасляваенныя гады. Аналіз дакументаў дае магчымасць выявіць асаблівасці наладжвання як царкоўнага жыцця, так і змены ў дзяржаўнай палітыцы, прасачыць працэсы рэарганізацыі і ўладкавання царкоўнага жыцця ў новых умовах існавання.

На падставе дакументаў фондаў упаўнаважаных можна зрабіць высновы, што разам з наладжваннем царкоўна-адміністрацыйнай сістэмы кіравання і ўпарадкаваннем зносін з дзяржаўнымі органамі ў Беларусі некаторы час удавалася захоўваць раней створаныя формы прыходскага жыцця. Працягвалі існаваць брацтвы і сястрынствы (у заходніх абласцях), у прыходах выкладаўся Закон Божы, адбываліся хрэсныя ходы, вялікія хрысціянскія святы насілі масавы характар.

Змена характару справаводчых матэрыялаў упаўнаважаных з 1948 г. сведчыць аб паступовай змене дзяржаўнай палітыкі ў адносінах да царквы, гэта можна прасачыць перш за ўсё на прыкладзе прыпынення працэсу рэгістрацыі і адкрыцця новых цэркваў, а таксама ў стварэнні новых форм абмежаванняў і кантроля дзейнасці духавенства і вернікаў.

Вывучэнне дакументальных крыніц па гісторыі адносін дзяржавы і царквы ў Беларусі ў пасляваенны перыяд знаходзіцца сёння на пачатковым этапе. Улічваючы значны інфармацыйны патэнцыял дадзенага комплекса крыніц для вывучэння гісторыі духавенства, храмаў, манастыроў, духоўных школ і інш. у 1940 – 1960-я гг., мэтазгодным рашэннем стала б падрыхтоўка і выданне тэматычных зборнікаў

дакументаў і ўвядзенне ў шырокі навуковы зварот новых масіваў дакументаў.

Спіс крыніц і літаратуры

1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 951. – Воп. 2. – Спр. 2. – Л. 98.
2. НАРБ. – Ф. 951. – Воп. 2. – Спр. 2. – Л. 116.
3. НАРБ. – Ф. 951. – Воп. 1. – Спр.10. – Л. 104.
4. НАРБ. – Ф. 951. – Воп. 1. – Спр. 3. – Л. 22.
5. НАРБ. – Ф. 951. – Воп. 2. – Спр. 6. – Л. 6.
6. НАРБ. – Ф. 951. – Воп. 2. – Спр. 8. – Л. 27.
7. НАРБ. – Ф. 951. – Воп. 2. – Спр. 8. – Л. 27.
8. НАРБ. – Ф. 951. – Воп. 2. – Спр. 6. – Л. 15.
9. НАРБ. – Ф. 951. – Воп. 1. – Спр. 7. – Л. 109.
10. НАРБ. – Ф. 951. – Воп. 1. – Спр. 7. – Л. 122.
11. НАРБ. – Ф. 951. – Воп. 2. – Спр. 8 – Л. 65.
12. НАРБ. – Ф. 951. – Воп. 1. – Спр. 13. – Л. 33.
13. НАРБ. – Ф. 951. – Воп. 1. – Спр.13 – Л. 25
14. Русская православная церковь в Белоруссии в 1941 – 1944 гг. Документы Государственного архива Российской Федерации / подг. Орлова Ю.Г. // Исторический архив. – 2006. – № 6. – С. 93 – 105.

Кулажанка Уладзімір Генадзьевіч – аспірант Беларускага навукова-даследчага інстытута дакументазнаўства і архіўнай справы, галоўны археограф Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва.

УДК 281.2 (075.8)

В.В. Горидовец (Витебск)

ИЗВЕСТНЫЕ ЛЮДИ ГРОДНЕНЩИНЫ: ЖИЗНЕОПИСАНИЕ МИТРОФОРНОГО ПРОТОИЕРЕЯ ПАВЛА КИРИКА

XX век дал многочисленные примеры твердости в христианской вере. В статье рассказывается о судьбе человека, который своим примером духовного служения церкви прославил гродненскую землю. Описанные исторические сюжеты восполняют взгляд на проблему взаимоотношений церкви и государства, государства и личности.

Священное Писание неоднократно говорит о необходимости почитания святых и вменяет христианам в обязанность чтить память святых – «Память праведника пребудет благословенна» (Притч. 10, 7); подражать примеру их жизни – «Поминайте наставников ваших…, и

взирая на кончину их жизни, подражайте вере их» (Евр. 13, 7); прославлять святых угодников Божиих – «… отныне будут ублажать Меня все роды» (Лк. 1, 48). При этом молитвенная память о подвижниках веры вознаграждается от Господа: «…кто принимает пророка во имя пророка, получит награду пророка» (Мф. 10, 41).

XX век дал многочисленные примеры твердого стояния в христианской вере, и мы не вправе забывать подвиг исповедников веры, как уже прославленных в лике святых, так и оставшихся неизвестными, благодаря которым Церковь Христова выстояла в суровое время гонений на веру. Одним из таких подвижников веры, прославивших Гродненщину, является протоиерей Павел Кирик. Следуя новозаветному императиву подражать вере праведников, мы можем подробно исследовать жизнеописание о. Павла на основании источников, сравнительно недавно ставших доступными исследователям – архива Управления КГБ республики Беларусь по Витебской области и архива Минского епархиального управления.

Павел Константинович Кирик родился 23 мая 1912 г. в д. Охоново Дятловского района Барановичской области в крестьянской семье. В 1933 г. он окончил Виленскую Духовную семинарию. В возрасте двадцати пяти лет Павел Кирик окончил богословский факультет Варшавского университета со степенью магистра богословия [1].

На праздник Успения Пресвятой Богородицы, 28 августа 1937 г., Павел Константинович был рукоположен в диакона Гродненским епископом Саввой в кафедральном соборе г. Гродно, а на следующий день, 29 августа 1937 г., в священника [1]. С этого дня ведется отсчет его многоскорбного и одновременно благодатного служения в Церкви Христовой.

С 1937 г. по май 1939 г. о. Павел служил священником в д. Ожуны (современная железнодорожная станция Воропаево) Поставского уезда, исполняя обязанности помощника Поставского благочинного [2].

С мая по октябрь 1939 г. он служил в г. Дисна, одновременно являясь местным штатным законоучителем. В октябре 1939 г. для лечения жены о. Павел выехал в г. Вильно и после освобождения Западной Белоруссии Красной Армией невольно оказался за границей [2].

Литовские власти депортировали о. Павла и его жену в Польшу. Здесь он получил назначение в церковь с. Гировое Кросненского уезда Краковского воеводства и служил священником до октября 1941 г. [2].

В октябре 1941 г., с большими трудностями перейдя границу, вместе с женой он возвращается в Белоруссию. Первое время после возвращения из Польши они живут в с. Любча Новогрудского района у его тестя –

священника Сергия Кубаевского, а также в д. Ятвеск Щучинского района у его шурина – священника Иоанна Кушнера [2].

Для получения назначения на приход требовалось приехать в Минское епархиальное управление, а такое путешествие в условиях военного времени изобиловало неожиданностями. По пути следования в Минск о. Павел был задержан немецкими властями, и более двух недель находился под арестом до выяснения личности. В результате до февраля 1942 г. о. Павел не служил, а его семью приютил тесть – священник Сергий Кубаевский [2].

Наконец, в феврале 1942 г. со стороны оккупационной администрации было получено разрешение на поездку в Минск. По рекомендации священника Иоанна Кушнера, ставшего членом консистории Минской епархии, в Минском епархиальном управлении о. Павел получил назначение на должность секретаря консистории Новогрудской епархии и был представлен архимандриту Афанасию (Мартосу), с которым он был лично знаком еще в 1935 – 1936 гг. во время учебы в Варшавском университете, где о. Афанасий работал воспитателем студенческого интерната [2].

8 марта 1942 г. архимандрит Афанасий (Мартос) был хиротонисан во епископа и назначен на Полоцко-Витебскую кафедру с поручением временного управления Новогрудской епархией. О. Павлу выпал удел трудиться на духовной ниве вместе с владыкой Афанасием в течение последующих двух лет [2].

С конца марта 1942 г. по июль 1944 г. о. Павел проживал в м. Жировицы Слонимского района, где служил секретарем и членом консистории Новогрудского епархиального управления [2].

С осени 1943 г. протоиерей Павел Кирик несет послушание директора и преподавателя богословско-пастырских курсов в Новогрудке. В 1942 г. о. Павел также исполнял обязанности эконома архиерейского дома. С 15 сентября 1942 г. по июль 1944 г. он служил вторым священником Борисоглебской церкви Новогрудка. С марта 1943 г. по октябрь 1944 г. о. Павел исполнял обязанности Кореличского благочинного [2].

Вскоре после освобождения Белоруссии от немецко-фашистских захватчиков начался процесс перехода клириков, служивших на оккупированной территории, в юрисдикцию Русской Православной Церкви Московского Патриархата. 4 октября 1944 г. протоиерей Павел Кирик был принят в молитвенное общение с Московской Патриархией архиепископом Минским и Белорусским Василием (Ратмировым) [1].

С октября 1944 г. по март 1947 г. о. Павел являлся Новогрудским благочинным. С 17 марта 1947 г. он служит Клецким благочинным. По

причине невыполнимого налогообложения, 25 ноября 1948 г. о. Павел переведен на должность Воложинского благочинного [2].

С 3 октября 1949 г. протоиерей Павел Кирик служил настоятелем Свято-Николаевской церкви в г. Поставы и благочинным Поставского округа [1].

После окончания Великой Отечественной войны осуществлялся активный поиск помощников немецко-фашистским захватчикам из числа местного населения. Подобного рода подозрение пало и на протоиерея Павла Кирика, поскольку он в этот период активно участвовал в возрождении Православия на Белоруссии, занимая при этом ответственные должности в Церкви.

27 апреля 1951 г. о. Павел был арестован в Поставах и помещен в Минскую тюрьму. Формально он обвинялся в принадлежности к антисоветской националистической организации, а также в антисоветской агитации. Будучи подозреваемым в оказании помощи оккупантам, с мая по август 1951 г. о. Павел очень часто допрашивался, буквально каждую ночь, но виновным себя не признал [2].

Тем не менее, постановлением Особого совещания при МГБ БССР от 5 сентября 1951 г. протоиерей Павел Кирик был приговорен к заключению в исправительно-трудовой лагерь сроком на 10 лет. В заключении о. Павел находился в Буре-Поломском лагере МВД, в районе ст. Шерстки Горьковской железной дороги [2].

Только после пяти с лишним лет заключения, 29 августа 1956 г., о. Павел был освобожден со снятием судимости [2].

С 20 ноября 1956 г. протоиерей Павел Кирик возобновляет свое служение у Престола, получив назначение в Свято-Николаевскую церковь г. Петриков [1].

С 27 декабря 1956 г. он служил в Бобруйском Свято-Николаевском соборе, а с 15 марта 1957 г. – в церкви с. Ляды [1].

С 8 октября 1957 г. о. Павел служил в г. Жодино, а с 23 сентября 1958 г. был назначен благочинным Борисовского округа. С 14 июля 1960 г. он переведен благочинным Шкловского округа [1].

Во время службы на Шкловщине о. Павел Кирик получил великое духовное утешение – он обнаружил икону и житие св. Мартина Туровского. В память об этом событии 6 апреля 1965 г. о. Павел был награжден Патриаршей грамотой [1].

С 6 сентября 1967 г. протоиерей Павел Кирик служил благочинным Барановичского округа, а с 22 мая 1968 г. начал многолетнее служение в Минском Свято-Духовом кафедральном соборе [1].

Поскольку диплом об окончании богословского факультета в Варшавском университете, полученный в буржуазной Польше, в

советское время считался недействительным, о. Павел был вынужден поступить в Московскую Духовную академию.

В 1970 г. он ее окончил со степенью кандидата богословия. Но на этом научная деятельность протоиерея Павла Кирика не окончилась, он работал над магистерской диссертацией, посвященной исследованию истории Полоцко-Витебской епархии [1].

К сожалению, данный труд окончен не был: подвело здоровье, подорванное многими жизненными испытаниями. Протоиерей Павел Кирик скончался 20 февраля 1979 г. и был похоронен на кладбище с. Любча Новогрудского района [1].

Через тринадцать лет после смерти, 24 августа 1992 г., о. Павел был реабилитирован прокуратурой Витебской области [2].

Протоиерей Павел Кирик за свою жизнь пережил несколько исторических эпох. В его судьбе соседствуют трагизм и драматизм внешних событий, а также несокрушимая личная вера в Бога, сопряженная с горячей молитвой. Эти добродетели, укорененные и приумноженные в жизни о. Павла Кирика, позволили ему достойно перенести все непростые испытания середины XX века с пользой для своей души, пасомых и для Церкви.

Список источников и литературы

1. Архив Минского епархиального управления. – Фонд 1. – Оп. 1. – Дело « Личные дела священнослужителей и церковнослужителей» .
2. Архив Управления КГБ Республики Беларусь по Витебской области. – Архивное уголовное дело № 22429-П.

Горидовец Владимир Владимирович – кандидат богословия, Витебский государственный университет им П. М. Машерова.

УДК 27-789.32(476) (092 К.Ю.Вальтась)

Ю. Макарчык (Гродна)

А. АРКАДЗІЙ КАРАЛЬ ЮЗАФ ВАЛЬТАСЬ, ФРАНЦІШКАНІН (1916 – 1975). ЖЫЦЦЁ І ДЗЕЙНАСЦЬ

Статья посвящена пастырской деятельности францисканца Аркадия Вальтася, который являлся священником ряда приходов. Его жизненный путь и творчество реконструированы впервые на основе документов и материалов из архивов Польши и Беларуси.

Постаць айца Аркадзія Вальтася, францішканіна, які жыў у 1916 – 1975 гг., многіх людзей прымушае задумацца і здзівіцца. Ён быў капланам-законнікам і мастаком. Усім вядома, што мастакі – людзі асаблівыя, маюць незвычайныя здольнасці, прыродны дар. Я ж – як яго паслядоўнік на францішканскім пробастве ў Гродна – спрабую бліжэй прыглядзецца да яго жыцця і дзейнасці. Ніякіх распрацовак і публікацый пра яго асобу не знайшоў. Для рэканструкцыі яго жыццёвага шляху я шукаў матэрыялы ў архівах АА Францішканаў у Гродна, Кракаве, Лодзі, і яны дазволілі па крупінках рэканструяваць біяграфію і вобраз гэтага незвычайнага чалавека.

Дзяцінства і маладосць

Пра пачатак жыцця ў доме бацькоў, як і пра самую сям'ю, захавалася не шмат інфармацыі. Галоўныя звесткі знаходзяцца ў асабістай справе, якую айцец Аркадзій прывёз з сабою пры паступленні ў Закон АА Францішканаў, цяпер яна знаходзіцца ў Кракаве.

Караль Юзаф Вальтась нарадзіўся 21 чэрвеня 1916 года ў Львове ў каталіцкай сям'і Войцеха і Анны, у дзявоцтве Рыбы. Ахрышчаны 2 ліпеня таго ж года ў парафіяльным касцёле святога Антонія Падуанскага, атрымаў імёны Караль Юзаф. Хрышчонымі бацькамі былі Яцак Ракочы і Магдалена Лончка. Святога хросту ўдзяліў ксёндз Зыгмунт Галуневіч. З гэтых дакументаў можна даведацца імёны дзядоў а. Аркадзія. З боку маці – Францішак Рыба і Вікторыя Бахэнак, з боку айца – Лаўрэнты Вальтась і Анна Ямалаў[1].

Сям'я Караля жыла ў Львове на вуліцы Выспянскага, 22. Бацька працаваў прыбіральшчыкам у Фінансавай палаце. У Караля былі два браты і адна сястра. Сям'я Вальтасяў жыла з зарплаты бацькі, якая налічвала 50 злотых, і з 200 сажняў агароду[2]. Маці займалася домам і выхаваннем дзяцей[3].

У 1922 годзе Караль пачаў вучыцца ў Публічнай мужчынскай усеагульнай школе імя святога Антонія ў родным горадзе Львове. У тым жа годзе памёр бацька. Малы Караль вельмі востра перажыў яго смерць, што стала прычынай выбару жыццёвай дарогі[4].

---

[1] Архіў Францішканаў у Кракаве (далей – АФК). – Teczka sygn. C II. Waltoś Karol Arkadiusz (1916 – 1975). – Liber natorum, nr. 127, t. 24, копія выдачы 27. IV. 1940 г.; Liber baptismi, nr. 127, t. 24, копія выдачы 29. VII. 1929 г.

[2] Сажань – мера даўжыні, сажань аўстралійскі – 189,7 см (гл.: Mizerski, W. Tablice historyczne / W. Mizerski. – Варшава, 1996. – С. 326).

[3] АФК. – Teczka sygn. C II. Waltoś Karol Arkadiusz (1916 – 1975). Sprawozdanie Magistra Nowicjuszów-Kleryków, nr. 132 a.

[4] АФК. – Teczka sygn. C II. Waltoś Karol Arkadiusz (1916 – 1975). Sprawozdanie Magistra Nowicjuszów-Kleryków, nr. 125 a.

Пасля смерці бацькі матэрыяльнае становішча сям'і пагоршылася. З дапамогай кляштара АА Францішканаў у Львове Караль скончыў агульнаадукацыйную школу на пасрэдна[1]. Сам павінен быў вырашаць, што рабіць далей.

Пакліканне ў Закон

Ужо ў першым класе агульнаадукацыйнай школы Караль адчуў пакліканне да капланства. У аўтабіяграфіі-заяве ў Малую Семінарыю АА Францішканаў у Непакалянаў пісаў, што смерць бацькі стала для яго штуршком, які даў яму зразумець, што хацеў бы служыць Пану Богу ў стане капланскім[2].

Пасля сканчэння сёмага класа звяртаецца ў Малую Семінарыю АА Францішканаў у Непакалянаве. Быў залічаны, але не хапала яму грошай на аплату за навучанне. Меў пры сабе толькі 30 злотых, плаціць жа трэба было 50 злотых. Тым не менеі, яго прынялі. 16 верасня 1929 года – першы вучэбны дзень семінарыста. У справаздачы аб наборы ў Семінарыю, айцец Віталіс Яскевіч так пісаў пра Караля: «Галоўнае, што ёсць жаданне прысвяціць сябе служэнню Пану Богу ў нашым Законе»[3]. Караль, прыехаўшы ў Непакалянаў, меў пры сабе даведку ад львоўскага старасця, што ён на правах убогіх вызваляецца ад гербавых збораў[4].

Францішканін

На практыцы было так, што навучэнцы Малой Семінарыі амаль усе ўступалі ў Закон. Быў гэта своеасаблівы папярэдні набор кандыдатаў у Закон і дапамога бедным сем'ям атрымаць адукацыю.

12 ліпеня 1933 года Караль пісаў просьбу на імя айца правінцыяла, каб залічылі яго ў Малую Семінарыю і прынялі ў Закон АА Францішканаў. Сваю просьбу матываў так: «Адчуваючы ў сабе місійнае пакліканне, звяртаюся з просьбай прыняць мяне ў Навіцыят АА Францішканаў. Скончыў сем класаў у Малой Місійнай Семінарыі ў Непакалянаве і маю 17 гадоў. Караль Вальтась»[5].

Неўзабаве атрымаў адказ наступнага зместу: «Мой дарагі! Адклікаючыся на Тваю просьбу, прымаю цябе ў наш Закон. Каб толькі Бог даў табе сілы і мужнасці ў законным жыцці, каб быў ты годным Рыцарам Той, Якая цябе ў сваю «Сядзібу» запрасіла. Маю ў Богу надзею, што ласку паклікання не змарнуеш, але нават яшчэ больш умацуеш.

[1] АФК. – Teczka sygn. C II. Waltoś Karol Arkadiusz (1916 – 1975). Пасведчанне аб сканчэнні школы, nr. 32, 1928 – 1929 школьны год. Львоў, 28. 06. 1929.
[2] АФК. – Teczka sygn. C II. Waltoś Karol Arkadiusz (1916 – 1975), nr. 125a.
[3] АФК. – Тэчка сігн. C II. Вальтась Караль Аркадзій (1916 – 1975). Ліст з датай 18.08.1929 г.
[4] АФК. – Тэчка сігн. C II. Вальтась Караль Аркадзій (1916 – 1975). Пасведчанне маральнасці. Львоўскае Гарадское Старасць. Львоў, 12. 08. 1929 г. Л. 4110/29.
[5] АФК. – Тэчка сігн. C II., Вальтась Караль Аркадзій (1916 – 1975). Ліст нр.143a.

Няхай святы Францішак прытуліць цябе ў сям'і сваіх братоў. Прыязджай у Непакалянаў у вызначаным тэрміне, там табе скажуць, што трэба рабіць далей. Deus Te benedicat!»[1].

14 ліпеня 1933 года Караль быў далучаны да Правінцыі АА Францішканаў і ў час абраду пастрыжэння атрымаў імя Аркадзій.

Якім быў братам у навіцыяце? Паводле ўстаноўленага ў навіцыяцкім жыцці парадку, магістр піша характарыстыку сваім падапечным. Айцец Ежы Вердак, магістр навіцыяту, у першым квартале 1933 года адзначыў у брата Аркадзія наступныя рысы: «вясёлы, паслужлівы, ветлівы, пабожны, дасціпны, апроч некаторых дробязяў, усё ў яго добра». У другім квартале, 17 сакавіка 1934 года, айцец магістр зрабіў такі запіс: «Здаровы, вясёлы, абавязковы. Агульнае развіццё добрае». У трэцім квартале – кароткі запіс: «Ніякіх заўваг няма». Пад датай 21 жніўня 1934 года занатавана наступнае: «Агульны поступ вельмі добры. Можна яго дапускаць да прафесіі»[2].

2 верасня 1934 года брат Аркадзій звярнуўся да айца Правінцыяла з просьбай аб допуску да складання першых законных шлюбаў: "Найправялебнейшаму Айцу Правінцыялу Закона Братоў Меншых Канвентуальных у Польшчы. Я, ніжэйпадпісаны брат Аркадзій Вальтась, клерык навіцый Закону Бр. Мн. Канвентуальных, пакорна прашу аб ласкавым дапушчэнні мяне да складання прафесіі. Адначасна завяраю, што з усёй свядомасцю і абсалютна дабраахвотна хачу прысвяціць сябе назаўсёды служэнню Богу як будучы каплан у вышэй названым Законе. Непакалянаў, дня 2 верасня 1934 года, брат Аркадзій Вальтась, навіцый-клерык"[3].

У заканадаўстве Закона было так, што ўсе капланы, якія належаць да данага кляштару, сустракаюцца на кляштарнай капітуле і там праводзяць тайнае галасаванне аб кандыдаце на складанне шлюбаў на так званую балатацыю. У час балатацыі на складанне першых шлюбаў, якая адбылася 23 жніўня 1934 года ў мясцовым кляштары, брат Аркадзій атрымаў ад шасці галасуючых шэсць станоўчых – белых шарыкаў. Гэтак жа галасавалі і ў Правінцыйнай Радзе – ад чатырох галасуючых атрымаў чатыры станоўчыя, белыя шары[4].

[1] АФК. – Тэчка C II. Вальтась Караль Аркадзій (1916 – 1975).
[2] АФК. – Тэчка сігн. C II. Вальтась Караль Аркадзій (1916 – 1975). Справаздача Магістра Навіцыяў-Клерыкаў, nr. 132a.
[3] АФК. – Тэчка сігн. C II. Вальтась Караль Аркадзій (1916 – 1975). Заява 127a.
[4] АФК. – Тэчка сігн. C II. Вальтась Караль Аркадзій (1916 – 1975). Справаздача Магістра Навіцыяў-Клерыкаў, 132a.

21 лістапада 1935 г. перад Дзяржаўнай Экзаменацыйнай Камісіяй, скліканай Кураторыум Школьнай Акругі ў Львове, бр. Аркадзій здаў экзамен сталасці і з 1935 года пачаў вучыцца ў семінарыі.

Семінарыст

1935/1936 акадэмічны год быў для бр. Аркадзія першым годам семінарыйнай вучобы.

У Collegium Leopoliense ён вывучаў філасофію і ў канцы акадэмічнага года атрымаў наступныя ацэнкі: логіка – "вельмі добра", крытэрыялогія – "добра", анталогія – "добра", касмалогія – "здавальняюча", тэадыцэя – "здавальняюча", этыка – "здавальняюча", гісторыя антычнай філасофіі – "вельмі добра", гісторыя сярэдневечнай філасофіі – "здавальняюча", гісторыя сучаснай філасофіі – "здавальняюча", грэцкая мова – "добра". У семінарыі ён таксама ілюстраваў часопіс для моладзі "Bratni Zew"[1]. Рэктарам Калегіум быў тады а. др. Віталіс Яскевіч[2].

У 1936 года бр. Аркадзій пачаў вывучаць тэалогію ў Кракаве. У той час чатыры курсы тэалогіі знаходзіліся ў Кракаве, філасофія і пяты курс тэалогіі – ў Львове. Разам з бр. Аркадзіем вучыліся 17 клерыкаў: Яхім Дэмбак, Юзаф Тавінскі, Эміль Зяралка, Сарафін Заега, Фульгэнты Бонк, Густаў Цісак, Эпіфаній Сліва, Апалоній Жыналь, Вітальд Серадзкі, Леанард Пэнар, Ізыдор Козьбял, Цырыль Настальскі, Ірэнэвуш Жаўнерчык, Іва Томчык, Уладыслаў Нетаровіч, Пшамыслаў Ягяльніцкі[3].

Набліжалася вайна. 16 ліпеня 1939 года, пасля сканчэння трэцяга курса тэалогіі, Святой Кангрэгацыяй па Справах Закону а. Аркадзій па дыспэнсе (з-за ўзросту) прыняў капланскія пасвячэнні ў Кракаве[4]. На прыміцыйным абразку змясціў надпіс[5]: "Дазволь мне хваліць Цябе, о, Найсвяцейшая Панна! Памятка Першай Святой Імшы, якую адправіў айцец Аркадзій Караль Вальтась, францішканін. Львоў-Кракаў, 1939".

---

[1] Архіў АА Францішканаў у Лодзі (далей – АФЛ). Segregator 68 uchm-Warc (764 – 770). – Тэчка нр.770. – Вальтась Аркадзій Караль, буду пры гэтым архіве ўжываць вызначэнне: Тэчка А. Аркадзій Караль Вальтась, Некралог 19.12. 1975 г.

[2] АФК. – Тэчка сігн. С II. Вальтась Караль Аркадзій (1916 – 1975). Collegium Leopoliense N.C. 15.01.09. 1936.

[3] АФК. – Liber Scholaris Collegii in Conventu Cracoviensi Ordinis Minorum S.P. Fr. Corventualium instituii per Dekretum Capituli Provincialis A.D. 1892 Vol.I. (ab a. 1892 ad 1946), sygn. B-VII c – 19, s. 287 – 302; Elenchus Fratrum Minorum S. Francisci Conventualium (OO. Franciszkanie) Provinciae S. Antonii Patavini et B. Jacobi de Strepa nec non Monialium S. Clarae in Polonia pro Anno Domini 1939. Typogr. «Rycerz Niepokalanej». Niepokalanów, s. 15 – 16.

[4] АФК. – Тэчка сігн. С II. Вадьтась Караль Аркадзій (1916 – 1975). Sacra Congregatio de Religiosi, Dispensatio ab aetate cononica pro Sacra Ordinatione, Roma, 20.04.1939 N 799/39, атрыманы дазвол 01.05.1939.

[5] АФК. – Тэчка сігн. С II. Вальтась Караль Аркадзій (1916 – 1975). Нр.123а.

Калі яшчэ быў клерыкам, да яго добра адносіліся і калегі, і выхавацелі. 30 кастрычніка 1937 года магістр айцец Войцех Змаж пісаў пра яго так: "Бр. Вальтась Аркадзій, нарадзіўся 21 чэрвеня 1916 г., студэнт 2-га курса тэалогіі. Спакойных паводзінаў. Паслухмяны і сумленны ў выкананні абавязкаў. У адносінах да кіраўнікоў і субрацтву ветлівы і далікатны. Да навукі мае пасрэдныя здольнасці, мае выключныя здольнасці да графікі і малюнкаў. Ад прыроды слабога складу, але на здароўе не скардзіцца"[1].

Душпастыр

Прыняўшы капланскія пасвячэнні, айцец Аркадзій паўтара гады прабывае ў кляштары ў родным Львове[2]. Пасля Вялікадня 1941 года яго высылаюць ў кляштар у Гродна. Гродзенскі Канвент перад Правінцыяльнай Капітулай у 1939 годзе меў наступны склад: а. Гадрыян Ледухоўскі, гвардыян і пробашч, а. Інацэнты Гуз, а. Тытус Стшалевіч, а. Цэцыліян Рудніцкі, а. Ахілес Пухала, бр. Раймунд Казьмерчак, бр. Тэадор Бартчак, бр. Эгідзій Сэйфарт, бр. Станіслаў Карнатка[3].

23 верасня 1939 года Гродна заняло савецкае войска. Кляштар занялі на ваенны, а пасля – на гарадскі шпіталь. Законнікі жылі ў прыватных дамах. 22 чэрвеня 1941 года ў горад уступіла нямецкае войска. Персанальны склад кляштара к таму часу змяніўся і выглядаў так: а. Дзіанізі Клімчак, гвардыян і пробашч, а. Інацэнты Гуз, а. Крыштаф Гурэцкі, а. Тытус Стшалевіч, а. Цэцыліян Рудніцкі, бр. Раймунд Казьмерчак, бр. Язафат Гэйнар, бр. Тэадор Бартчак. Помсцячы за забітых 16 ліпеня 1943 года нямецкіх афіцэраў, гестапа расстраляла на Фартах у Навумавічах некалькі дзесяткаў заложнікаў, сярод якіх знаходзіўся гвардыян і гродзенскі пробашч а. Дзіанізі Клімчак. З таго часу персанальны склад у кляштары мяняўся ў залежнасці ад сітуацыі на фронце.

Айцец Аркадзій, які быў вікарыем у парафіі[4], у выніку рэпрэсій нямецкіх уладаў 2 кастрычніка 1943 года быў арыштаваны і змешчаны ў турму, спачатку ў Гродна, а пасля ў Беластоку. Вызвалены 7 красавіка 1944 года.[5]

---

[1] АФК . – Тэчка сігн. С II. Вальтась Караль Аркадзій (1916 – 1975). Нр. 141а.

[2] АФК. – Тэчка С II. Вальтась Караль Аркадзій (1916 – 1975). а. Кубіт Анзэльм. Прамова на жалобным набажэнстве.

[3] Elenchus Fratrum Minorum S. Francisci Conventualium (OO Franciszkanie) Provinciae S. Antonii Patavini et B. Jacobi de Strepa nec non monialium S. Clarae in Polonia pro Anno Domini 1939. Nepokalanów, s. 47.

[4] АФЛ. – Тэчка Гродна. а. Тытус Стшалевіч. Гродна ў часе II сусветнай вайны, с. 1 – 7.

[5] АФК. – Тэчка сігн. С II. Вальтась Караль Аркадзій (1916 – 1975). Entlassungsschein, Беласток, G.B. – нр. 72061VB, 3145, den 07.04.1944; Jacewicz, W. Martyrologium polskiego duchowieństwa rzymskokatolickiego pod okupacją hitlerowską w latach 1939 – 1945 / W.

Пасля расстрэла а. гвардыяна айцец правінцыял Маўрыцы Мадзурак назначыў гвардыянам і пробашчам у Гродна айца Тытуса Стшалевіча. Калі набліжаўся фронт, айцец Аркадзій паехаў да ксяндза пробашча парафіі Святой Тройцы ў Індуры, якая знаходзіцца на адлегласці 21 кіламетр ад Гродна, і там перачакаў. Аднойчы прапанаваў а. Тытусу, што калі яго маці прыедзе ў Гродна, тады айцец Тытус, паколькі ён рэпатрыянт, зможа вярнуцца ў Польшчу, тым больш, што савецкая ўлада ніколі не згодзіцца на тое, каб было два капланы ў адным касцёле. У выніку такой дамоўленасці айцец Тытус Стшалевіч у канцы 1946 года выехаў у Непакалянаў[1].

Пачаўся нялёгкі час для айца Аркадзія, заклапочанага пра душы даверанай яму аўчарні і лёс парафіі Маці Божай Анёльскай у прадмесці Гродна. Яшчэ ён абслугоўваў парафіі ў Квасоўцы і Капцёўцы, а таксама каля 30 вёсак, раскіданых навокал на адлегласці некалькіх дзесяткаў кіламетраў. Уявіўшы мясцовасць і адлегласць паміж вёскамі, цяжка зразумець, як можна было працаваць у такіх умовах. Тысячы хростаў, споведзяў, візітаў у хворых, сотні пахаванняў і шлюбаў. Да таго ж трэба было дапамагаць па іншых парафіях, як хоць бы выезд у Слонім 19 красавіка 1954 года, каб адправіць там святую Імшу[2]. Здаралася, што савецкія ўлады не дазвалялі такія паездкі, напрыклад, 25/26 снежня 1968 г. забаранілі паездку ў Начу на правядзенне Літургіі Божага Нараджэння[3].

Пра казанні айца Аркадзія сведчыць запіс Святой Імшы і аднога казання на ленце ў Архіве АА Францішканаў у Кракаве. Пасля прачытання Евангелля паводле св. Лукі пра дзесяць пракажоных казнадзей пачынае маленне: "У імя Айца і Сына і Святога Духа. Умілаваныя ў Хрысце..." Гаворыць пра ачышчаных ад праказы людзей. Пералічвае жахі гэтай хваробы. Звяртаючыся да Евангелля, перадае радасць тых, якія былі ачышчаныя. Заўважае, што толькі адзін самарытанін шчыра падзякаваў за выздараўленне. Гаворыць пра тое, як людзям патрэбна ўдзячнасць. І як яны не любяць дзякаваць. Лічыць, што ўдзячнасці трэба вучыцца ў звяроў. Прыводзіць прыклад, як у першыя вякі хрысціянскіх праследаванняў багаты рымлянін трымаў нявольнікаў. Паслаў іх на будоўлю ў Афрыку, адзін з іх, а быў ён хрысціянінам, не мог вытрываць цяжару працы і неймавернага здзеку над ім, таму аднойчы ноччу ўцёк. Хаваўся і еў абы-што. Аднойчы, калі знаходзіўся ў пустыні,

Jacewicz, W., J. Woś. – Zeszyt V. Zakony i Zgromadzenia męskie i żęnskie. – Warszawa, 1981, s. 270.

[1] АФЛ. – Тэчка Гродна. а. Тытус Стшалевіч. Гродна ў час ІІ сусветнай вайны, с 7 – 9.

[2] АФК. – Тэчка сігн. С II. Вальтась Караль Аркадзій (1916 – 1975). Разрешение №14, БССР, 11.03.1954.

[3] Архіў АА Францішканаў у Гродне (далей – АФГ). Справка, 20.12. 1968.

сустрэў льва. Не меў куды ўцячы. Але леў на яго не нападаў, лёг перад ім і выцягнуў лапу, у якой тырчэла калючка. Хрысціянін выцягнуў калючку і вылечыў лапу. Праз нейкі час дагналі іх людзі. Чалавека, закутага ў ланцугі, і льва ў клетцы завезлі ў Рым. Хрысціяніна асудзілі, каб яго разарвалі львы.

Калі ж ён апынуўся на арэне, удзячны леў яго пашкадаваў, памятаючы яго дабрыню. Такім спосабам Бог чыніць цуд для тых, хто верыць у Яго і хто добры.

Далей казнадзей пераконвае так: "Надзея заахвочвае нас быць удзячнымі тым, хто нам робіць дабро. За сакрамэнты, за Святую Камунію, за ўсё трэба дзякаваць Богу. Бог за тое дае нам ласку і ўдзячнасць. Няхай будзе пахвалёны Езус Хрыстус!"[1] – так заканчвае казанне.

У Гародні ў той час было двое капланаў: кс. дзекан Міхал Арановіч – генеральны вікарый, а таксама наш герой – таварыскі чалавек, якога любілі людзі, якіх ён ніколі не пазбягаў. Ахвотна прагульваўся па горадзе, асабліва па беразе Нёмана[2]. Зрэдку наведвалі яго законныя браты: бр. Аўгустын Кісялеўскі, Міхал Врублеўскі, айцец Каміль Валымански і іншыя.

Айцец Аркадзій вельмі перажыў смерць маці. Яна жыла пры ім ад 1946 года і была яму найбліжэйшай асобай. Памерла 23 лістапада 1965 года ва ўзросце 93 гады, пахаваная на францішканскіх могілках, якія знаходзяцца за 2 км ад касцёла. Спачывае пры цэнтральнай алейцы, якая вядзе да капліцы[3]. Савецкія ўлады, НКВД успрымалі айца Аркадзія "як чалавека ад прыроды не кампанейскага (замкнутага), вельмі асцярожнага ў справах", да таго ж: "Гэта добры мастак і разьбяр". Усяго толькі і запісана ў 1954 годзе ў яго персанальнай справе[4].

Незабыўным здарэннем жыцця айца Аркадзія было падарожжа ў Італію. Айцец Флавіян Славінскі, які працаваў у *Kolegium Penitencjarzy,* прыслаў яму запрашэнне. Айцец Аркадзій, поўны збянтэжанасці і здзіўлення, са страхам пайшоў у Аддзел рэлігійных справаў, каб спытаць, што яму рабіць. Адказалі: ехаць! Здзіўлены і ўсцешаны, вяртаецца дадому і думае. Але без перашкод атрымлівае пашпарт і дазвол на закупку пяці долараў на кожны дзень побыту. Выязджае.

Прыехаў у Рым 12 студзеня 1968 года. Пасяліўся ў Генеральнай Курыі OFMConv на вуліцы XII Апосталаў, 51. Там сустрэўся з а. Базылём

[1] АФК. – Словы, якія запісаў на магнітафон а. Аркадзій Вальтась, францішканін, пробашч ў пасляваенныя гады ў Гродне. Памёр 16.12. 1975 г. Праслухаў некалькі разоў 09.08.2001.

[2] Zaniewski, F. Miłował Boga i ludzi / F. Zaniewski // Głos znad Niemna. – Nr. 33 (327). – S. 4.

[3] Надпіс на помніку такі: "s. p. Anna Waltoś żyła lat 93/ Zm. 23 XI 1965 r."

[4] АФГ. – Ксеракопія F. 13850. 1 d. 22 (1954).

Гэйсарам – Генералам Закону, з а. Альфонсам Орліхам – экс-генералам, з а. Абатам – гісторыкам Закону, з а. Тацанэлем – дзеканам у Лятэранскім Універсітэце, з а. Аўгустам Расінскім – генеральным асістэнтам, і з а. Флавіянам, які яго запрасіў. Галоўнай падзеяй візіту была сустрэча са Святым Айцом Паўлам VI. На памятнай фатаграфіі а. Аркадзій укленчыўшы каля ног Папы, а збоку стаіць а. Паўлін Сатоўскі.

Айцец Аркадзій наведаў таксама Асізі, Падую, Фларэнцыю, Венецыю і іншыя гарады Італіі. На зваротным шляху спыніўся ў братоў па Закону ў Вене. У пятніцу, 1 сакавіка, вяртаўся праз Варшаву і затрымаўся ў Правінцыяльнай Курыі. Наведаў сваякоў у Чэнстахове і Вроцлаве. У пятніцу, 8 сакавіка 1968 года, вяртаўся цягнікам, выехаўшы ў 7 гадзін раніцы з Гданьскага вакзала Варшавы.

Быў усцешаны і задаволены[1], але дакладна ведаў, што як вернецца, пачнуцца допыты, праслухоўванні і бясконцыя падазрэнні.

На святой Імшы ў малой базыліцы ў Гродне з нагоды 25-годдзя капланства Яго Эксцэленцыі кс. Ардынарнага Біскупа Аляксандра Кашкевіча казанне меў Яго Эксцэленцыя Кс. Арцыбіскуп Тадэуш Кандрусевіч у прысутнасці ўсіх біскупаў Беларусі, мноства капланаў, законных сёстраў і верных. Ён і нагадаў размову айца Аркадзія Вальтася з генеральным вікарыем ксяндзом Міхалам Арановічам. Айцец Аркадзій сказаў так: "Калі я памру, ты пахаваеш мяне, калі ты памрэш, то прыедуць з Літвы ксяндзы і цябе пахаваюць. І больш не будзе ў Гродна каплана". Такое было становішча ў той час.

Асаблівыя здольнасці

Бог некаторых людзей надзяляе асаблівымі талентамі. Таленты даюцца чалавеку ад Бога, каб імі служыў супольнасці, у якой мастак творыць. Сёння захапляемся многімі шэдэўрамі мастацтва, якія на працягу вякоў стваралі мастакі. Да такіх людзей-творцаў можна залічыць і айца Аркадзія Вальтася, мастака і музыку.

Мастак і музыка

Айцец Аркадзій меў талент мастака. Калі быў клерыкам, гэта заўважыў магістр айцец Войцех Змаж і запісаў у характарыстыцы: "Мае выключныя здольнасці да малюнкаў і графікі"[2].

Айцец Аркадзій маляваў у семінарыі, рабіў ілюстрацыі да часопіса моладзі "Bratni Zew"[3]. Бывалі часы, што з сябрамі хадзіў на пленэры

[1] АФЛ. – Тэчка А. Аркадзій Караль Вальтась. Фр. С. Гродна. –АА Францішкане. Варшава, 08.03.1968 г.

[2] АФК. – Тэчка сігн. С II. Вальтась Караль Аркадзій (1916 – 1975). Нр. 141а.

[3] АФЛ. – Тэчка А. Аркадзій Караль Вальтась. Некралог 19.12.1975 г.

маляваць эскізы з натуры[1], такіх пейзажаў захавалася больш трыццаці. Іншыя знаходзяцца ў яго сяброў і знаёмых. Вялікім творам, які пакінуў, з'яўляюцца 14 стацый Крыжовага Шляху ў касцёле Маці Божай Анёльскай у Гродне. Разглядаючы гэтыя творы, можна заглыбіцца ў духоўны свет таго, хто іх ствараў.

У 1952 годзе айцец Аркадзій правёў рамонт касцёла, які ў Другую сусветную вайну быў знішчаны на 16,03% (паводле акта ацэнкі ад 3 сакавіка 1945 года). Сам намаляваў на столі біблійныя сцэны, праводзячы шмат часу на рыштаваннях. Кошт рамонту – 7.930 рублёў за выкананне працы і 1.388 рублёў 66 капеек за матэрыялы. Увесь кошт склаў 11.676 рублёў.

Вялікае мастацкае дасягненне айца Аркадзія – атрыманне першага месца на ўсесаюзным конкурсе "Голуб міра". З усяго Савецкага Саюза яго твор быў прызнаны лепшым. Дзяржаўныя ўлады спачатку не ведалі, што пераможца конкурсу – каталіцкі ксёндз. Калі зарыентаваліся, было позна: узнагарода ўжо была вызначана. Улады БССР знайшлі такое выйсце: дамовіліся з айцом Аркадзіем, што ён не паедзе па ўзнагароду ў Маскву "з прычыны хваробы".

Яго галубок быў не падобны да іншых, не такі выразны, яго сілуэт расплываўся, зліваўся з блакітам неба. "Такі нестандартны, сімпатычны галубок у палёце. Думаю, што ўдасца яго некалі знайсці", – кажа айцец Інацэнты Шумоўскі.

Айцец Аркадзій атрымаў мастацкую адукацыю. Працуючы капланам, вучыўся ў Інстытуце выяўленчага мастацтва ў Львове[2]. А калі працаваў у Гродне, скончыў завочна Народны універсітэт мастацтваў, факультэт жывапісу і графікі, і атрымаў 26 кастрычніка1963 года дыплом з добрымі вынікамі[3]. Нічога дзіўнага, што не мог праходзіць абыякава каля разбураных касцёлаў. У Гродне, як і ва ўсім Савецкім Саюзе, усё, што мела рэлігійны прысмак, планавалася на знішчэнне. Вялікім ударам для культуры ў Гродне было разбурэнне найстарэйшага каталіцкага касцёла, фундатарам якога з'яўляўся вялікі князь літоўскі Вітаўт у 1392 годзе. Праз некалькі гадоў пасля гэтага здарэння айцец Аркадзій асмеліўся напісаць пра гэтую справу ў дзяржаўныя ўлады.

[1] Zaniewski, F. Miłował Boga i ludzi / F. Zaniewski // Głos znad Niemna. – Nr. 33 (327). – S. 4.

[2] АФК. – Тэка сігн. С II. Вальтась Караль Аркадзій (1916 – 1975). Пасведчанне з Львова 09.12.1939 г.

[3] АФК. – Тэчка сігн. С II. Вальтась Караль Аркадзій (1916 – 1975). № 141а; Пасведчанне № 3813. Министерство Культуры РСФСР Заочный Народный Университет Искусства, 26.10. 1963 г.

У цяжкія часы для Касцёла пры ўладзе камуністаў айцец Аркадзій працаваў, кіруючыся разважнасцю; не сядзеў бяздзейна, спасылаючыся на цяжкасці. Стварыў касцёльны хор моладзі, быў яго дырыжорам і акампаніятарам.

Канструктар і паляўнічы

Пан Бог надзяліў айца Аркадзія канструктарскімі здольнасцямі. Разумеючы, што дзяцей і моладзь можна прыцягнуць у касцёл вынаходніцтвам, сканструяваў рухомую Батлейку Божага Нараджэння, адзіную такую ў Беларусі. Была яна ў Гродне захапленнем і здзіўленнем. Улады адразу забаранілі пускаць яе ў рух. Усё роўна яна прыцягвала ўвагу майстэрскай работай, прыгожымі фігуркамі, якія ўсе выканаў сам. Меў шмат іншых практычных здольнасцей: умеў літаваць, рамантаваў гадзіннікі, ведаў радыётэхніку[1].

Калі не меў магчымасці выконваць душпастырскія абавязкі або хацеў крыху адпачыць, выпраўляўся на паляванне. Так называлася прабыванне на лоне прыроды. Тым не меней, ад 20 сакавіка 1972 года меў зброю і быў сябрам Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў, рэгулярна плаціў членскія ўзносы. Пад канец жыцця зброю перадаў у міліцыю, а членскую легітымацыю падараваў пану Фрыдрыху Занеўскаму з Гродна, які перадаў яе ў Архіў АА Францішканаў у Гродне.

Смерць і пахаванне

Пайшоў да Пана, калі меў 59 гадоў. Адбылося гэта ў аўторак 16 снежня 1975 г. Меў цукровы дыябет, павышаны ціск, артэрыяльны склероз, двойчы перанёс сардэчны прыступ. У пасведчанні аб смерці запіс аб прычыне смерці такі: хвароба павышанага ціску ў форме мозгава-сэрцавай недастатковасці[2]. Месяц павінен быў ляжаць у ложку. Нягледзячы на гэта, уставаў, прасіў завесці да касцёла, каб праводзіць св. Імшу, спавядаць, удзяляць іншыя сакраманты. Жыў тут на вуліцы Чырвонапартызанскай. Тут і памёр, атрымаўшы святыя сакраманты. У 21 гадзіну цела было перанесена ў касцёл. Вестка хутка разляцелася па горадзе. Людзі плакалі. У сераду 17 снежня ў 5.30 адчынілі касцёл. Прыходзілі вернікі аж да 23.30, каб ушанаваць яго і падзякаваць Богу за яго трыццацігадовую працу. У чацвер 18 снежня ў 12 гадзін адбылася пахавальная ўрачыстасць. 30 капланаў, сярод якіх быў францішканін з Меднік айцец Каміл Валыманскі, праводзілі святую Імшу і складалі пахавальнае шэсце. Крыж, два ліхтары і тры чорныя харугвы адкрывалі працэсію каля 8 тысяч верных. Дзяржаўныя ўлады выдзелілі для абслугоўвання шэсць аўтакараў. Міліцыя ахоўвала парадак. Пахавалі яго

[1]Zaniewski, F. Miłował Boga i ludzi / F. Zaniewski // Głos znad Niemna. – Nr. 33 (327). – S. 4.
[2] АФГ. – Свидетельство о смерти 1-ДР № 275810, Бюро ЗАГС г. Гродно, 16.12.1975 г.

на могілках каля Азота, у той час было забаронена хаваць на Францішканскіх могілках. З роднай правінцыі святога Антонія і благаславёнага Якуба ніхто не прыехаў, таксама і з правінцыі Маці Божай, у якой працаваў. 16 студзеня 1976 у Непакалянаўскай базыліцы за душу святой памяці айца Аркадзія была адпраўлена вялікая канцэлебра Айцоў Правінцыі Маці Божай, як выраз гонару і доказ сардэчнай памяці[1]. У Кракаве ў Малой Базыліцы імя святога Францішка 10 лютага 1976 года а 11 гадзіне адпраўлена жалобная святая Імша за душу памерлага[2].

Заканчэнне

Постаць Аркадзія Вальтася знаходзіцца побач з іншымі духоўнымі асобамі, якія ў цяжкія часы не адчайваліся і не закрываліся ад людзей. Не аднойчы ён адчуваў небяспеку, але ішоў да верных. Умеў рознымі магчымымі спосабамі дасягаць да людзей, каб перадаваць ім святло Евангелля. Свае таленты і асаблівыя здольнасці не загубіў, але змог іх памножыць.

Макарчык Юзаф , OFMConv – доктар гуманістычных навук.

УДК 277.4(476. 6)

Т.У. Касатая (Гродна)

СТАНОВІШЧА АБШЧЫН ЕВАНГЕЛЬСКІХ ХРЫСЦІЯН-БАПТЫСТАЎ (ЕХБ) У 1960-я ГАДЫ НА ГРОДЗЕНШЧЫНЕ

Общины ЕХБ в 1960-е годы в Гродненской области претерпевали внутренний кризис и раздор. Это было вызвано целенаправленной политикой государственных органов, а тоже противоречиями в самом Союзе ЕХБ. Молитвенные дома закрывались, пресвитеры, которые нарушали законодательство, лишались своих должностей, некоторых верующих притягивали к административной и криминальной ответственности. Среди верующих-баптистов распространялись идеи «инициативной группы», которая выступала за возрождение демократических принципов управления в общинах и свободы совести в стране.

[2] АФК. – Teczka sygn. C II. Waltos Karol Arkadiusz (1916 – 1975). Kraków, 13.01.1976, nr. Dz. 10–76. List o. Prowincjala Albina Dudka do o. Prowincjala w Warszawie.

У канцы 1950-х – пачатку 1960-х гадоў урад Савецкага Саюза ўзяў курс на жорсткую барацьбу супраць царквы, выкараненне рэлігійнасці насельніцтва і пабудову атэістычнага грамадства. Гэта акцыя ў маштабах усяго СССР набыла мэтанакіраваны і зацяжны характар.

Такая палітыка дзяржаўных органаў прывяла да таго, што шмат вернікаў пайшлі ў падполле, некаторыя рэлігійныя цэнтры спынілі сваю дзейнасць (напрыклад, у 1960 г. Усесаюзны Савет адвентыстаў сёмага дня), іншыя спазналі ўнутраныя разлады, нават расколы. Так, крызіс у пачатку 1960-х гадоў перажываў Усесаюзны Саюз евангельскіх хрысціян-баптыстаў (УСЕХБ), што было выклікана ўмяшаннем уладаў ва ўнутраныя справы царквы.

У 1960 годзе ў Гродзенскай вобласці дзейнічалі 22 абшчыны ЕХБ з агульнай колькасцю вернікаў 1211 чалавек [1, арк. 13]. Паступова актыўнасць абшчын зніжалася, а іх колькасць скарачалася ад 22 абшчын і 1227 вернікаў у 1955 г. да 21 абшчыны і 984 вернікаў у 1965 г. [1, арк. 4; 2, арк. 15; 3, арк. 18].

Працэс скарачэння колькасці абшчын ЕХБ тлумачыцца, па-першае, мэтанакіраванай антырэлігійнай палітыкай савецкага ураду, а па-другое, выхадам вернікаў-«ініцыятыўнікаў» і пяцідзесятнікаў з зарэгістраваных абшчын з-за ўнутраных канфрантацый і непаразуменняў.

Да мінімуму было зведзена прыняцце вернікаў праз хрышчэнне. Нягледзячы на іх заявы, гэты абрад у пачатку 1960-х гадоў не праводзіўся. Напрыклад, у 1960 годзе былі пададзены 32 заявы на воднае хрышчэнне, але ніводная з іх не была задаволена [4., арк. 93].

Дзяржаўныя органы зачынялі цэрквы, канфіскоўвалі дамы для богаслужэнняў, пазбаўлялі прэсвітэраў рэгістрацыі. За 1961–1962 гады ў Гродзенскай вобласці за парушэнне заканадаўства аб культах было знята з рэгістрацыі 3 абшчыны і 5 прэсвітэраў [2, арк. 40]. Прэсвітэра Ваўкавыскай абшчыны пазбавілі рэгістрацыі з-за прыцягнення дзяцей да ўдзелу ў богаслужэннях. Старшага прэсвітэра па вобласці адлучылі ад пасады на 3 месяцы, так як ён не праводзіў ніякіх мерапрыемстваў, каб папярэдзіць гэтыя парушэнні заканадаўства. Планавалася ліквідаваць пасаду старшага прэсвітэра па вобласці, бо яго дзейнасць, на думку Упаўнаважанага Савета па справах рэлігійных культаў па Гродзенскай вобласці, садзейнічала ажыўленню рэлігійнасці насельніцтва і ўмацаванню абшчын ЕХБ [4, арк. 35 – 36].

Часта парушаліся правы вернікаў з боку прадстаўнікоў мясцовай улады. 5 студзеня 1965 года Першамайскі сельсавет Шчучынскага раёна прыняў рашэнне перадаць малітоўны дом ЕХБ сельпо, паколькі вернікі арэндавалі дом ва ўласніка, які жыў у іншай вёсцы. Старшыня калгаса Свіслацкага раёна забараніў праводзіць электрычнасць у дом гаспадара,

дзе праводзіліся служэнні Лыскаўскай абшчыны ЕХБ. Старшыня гэтага ж сельсавета доўга супрацьдзейнічаў абшчыне ў дазволе арандаваць памяшканне для богаслужэнняў. Нягледзячы на тое, што вернікі часцей за ўсё былі добрасумленнымі працаўнікамі, іх звальнялі з прадпрыемстваў і арганізацый. Праводзіліся так званыя суды сумлення над вернікамі, дзе выкрывалася «антыўрадавая і экстрэмісцкая» дзейнасць баптыстаў.

Крызіс Царквы ЕХБ быў абумоўлены і ўнутранымі супярэчнасцямі. У пачатку 1960-х гадоў пачаўся рух т.зв. «ініцыятыўнай групы», які быў накіраваны супраць Усесаюзнага Савета ЕХБ і выступаў з ініцыятывай правядзення Усесаюзнага з'езда прадстаўнікоў усіх абшчын. Падставай для з'яўлення «ініцыятыўнай групы» стала прыняцце ў снежні 1959 г. «Палажэння аб Саюзе ЕХБ у СССР» і «Інструкцыйнага ліста старшым прэсвітэрам». Іх галоўнай мэтай было прывядзенне дзейнасці рэлігійных абшчын у адпаведнасць з дзеючым заканадаўствам аб культах. Гэтыя дакументы па свайму зместу супярэчылі асноўным баптысцкім прынцыпам. Некаторыя абшчыны палічылі, што Савет «прадаўся» ўладам, не стаў на абарону вернікаў ад ганенняў і праследу.

Адным з буйнейшых цэнтраў «ініцыятыўнікаў» у Беларусі стаў Брэст, у 1965 гаду ў Брэсцкай вобласці дзенічалі 6 нелегальных абшчын з 461 вернікам [9, с. 288]. Прыхільнікі «ініцыятыўнай групы» у Гродзенскай вобласці з'явіліся ў пачатку 1960-х гадоў. У 1965 годзе тут ужо дзейнічалі 3 групы «ініцыятыўнікаў» (у г. Ваўкавыску, в. Некрашы Гродзенскага раёна і в. Бародзічы Зэльвенскага раёна), у склад якіх уваходзіла каля 80 чалавек [6, арк. 6]. Выхад вернікаў з зарэгістраваных абшчын пачаўся пасля знаёмства іх з лістом старшага прэсвітэра ЕХБ па БССР К.С. Велісейчыка, у якім адзначалася: «Кроме общего и хорового пения, в Богослужебных собраниях ЕХБ ни в коем случае не должно допускать постановок, стихотворений, инструментальных концертов. Это всё является нарушением Положения ВСЕХБ, отводит от благоговения присутствующих и вызывает у посетителей соблазн. В некоторых общинах наблюдаются факты своевольного поведения верующей молодёжи: разъезды группами, куда вздумают, а также приглашения к себе в общину без ведома руководства. Эти факты говорят о том, что или молодёжь не подчиняется руководству общины, или руководство небрежно управляет… Заставлять детей дошкольного и школьного возраста посещать молитвенные собрания – неправильно. Тех грехов, от которых отводятся верующие, дети не имеют. Они не понимают там ничего, а только мешают, нарушая тишину» [7, арк. 10 – 11]. Канстанцін Сцяпанавіч Велісейчык з 1949 года з'яўляўся старшым прэсвітэрам па Гродзенскай вобласці, а з 1958 – па БССР. На яго долю выпалі складаныя задачы захавання ў цэласнасці Саюза ЕХБ. Яму, як і ўсім прэсвітэрам на

месцах, трэба было ўвесь час балансаваць паміж двух вогнішчаў – савецкім заканадаўствам аб культах і прынцапамі веравучэння ЕХБ. Але лаяльнасць старшага прэсвітэра да савецкага ўраду выклікала ў большасці вернікаў незадаволеннасць яго дзейнасцю, яны казалі аб яго адыходзе ад евангельскіх традыцый.

«Ініцыятыўнікі» выступалі супраць савецкага заканадаўства аб культах, дасылалі лісты на імя М.С. Хрушчова (а потым і Л.І. Брэжнева) з патрабаваннем усталявання свабоды сумлення ў краіне і аддзялення царквы ад дзяржавы. Такая пазіцыя вернікаў прадвызначыла ганенні і праследу з боку дзяржаўных органаў. За 1966 год у Гродзенскай вобласці да адміністрацыйнай адказнасці было прыцягнута 5 «ініцыятыўнікаў», да крымінальнай – 1 вернік [8, арк. 57]. Некаторыя актыўныя прыхільнікі «ініцыятыўнай групы» нярэдка наўмысна правакавалі сутычкі з праваахоўнымі органамі, парушаючы парадак у грамадскім транспарце, праводзячы шумныя малітоўныя сходы ў парках, зонах адпачынку і г.д.

З сярэдзіны 1950-х да пачатку 1960-х гадоў абвастрылася канфрантацыя паміж баптыстамі і пяцідзесятнікамі. Апошнія часта на багаслужэннях прытрымліваліся прынцыпаў свайго веравучэння. Пад кіраўніцтвам падпольных прэсвітэраў і «прарокаў» пяцідзесятнікі займаліся місіянерствам сярод вернікаў зарэгістраваных абшчын ЕХБ. У абшчыне в. Мількі Іўеўскага раёна на багаслужэнні 15 кастрычніка 1961 г. з антыбаптысцкай і антыўрадавай казанню выступіў вернік-пяцідзесятнік з Ліды В. Смушко (у 1960 г. выключаны з Лідскай абшчыны ЕХБ). «Сатана надвигается и преследует нас, – казаў Смушко наконт прыняцця новага Палажэння ЕХБ. – Пасть дьявола раскрыта, и мы должны молиться, чтобы Всевышний не дал возможности дьяволу закрыть пасть и проглотить нас» [10, арк. 124].

У пачатку 1959 г. за парушэнне заканадаўства аб культах быў зняты з пасады прэсвітэра Мастоўскай абшчыны ЕХБ П.П. Пецевіч (былы пяцідзесятнік). У адказ на гэта Пецевіч арганізаваў нелегальную пяцідзесятніцкую групу. З 1959 па 1965 гады ім было «завербавана» і ахрышчана 29 чалавек, з якіх 24 – моладзь ва ўзросце да 30 гадоў. Пад уплывам Пецевіча знаходзіліся пяцідзесятнікі ў Гродзенскім, Ашмянскім і Шчучынскім раёнах [11, арк. 55 – 56].

Такім чынам, у выніку дзяржаўнай рэлігійнай палітыкі і ўнутраных супярэчнасцей у Саюзе ЕХБ абшчыны перажывалі разлад і крызіс. Малітоўныя дамы зачыняліся, прэсвітэраў, што парушалі заканадаўства, пазбаўлялі іх пасад, некаторых вернікаў прыцягвалі да адміністрацыйнай і крымінальнай адказнасці. Усё гэта садзейнічала распаўсюджванню ў Гродзенскай вобласці ідэй «ініцыятыўнікаў». Рух «ініцыятыўнай групы»

набыў аўтарытэт сярод многіх баптыстаў, ён адрадзіў адзін з асноўных прынцыпаў евангелізму і баптызму – аддзяленне царквы ад дзяржавы. Менавіта баптысты ў гэты час аказалі рэальнае супраціўленне ганенням з боку дзяржавы, з іх «наиболее демократической организационной структурой, более «индивидуалистическим» духом и традицией независимости» [12, с. 13].

Спіс крыніц і літаратуры

1. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (далей – ДАГВ). – Ф. 1385. Упаўнаважаны Савета па справам рэлігійных культаў пры Савеце Міністраў СССР па Гродзенскай вобласці. – Воп. 1а. – Спр. 79.
2. ДАГВ. – Ф. 1385. – Воп. 1а. – Спр. 37.
3. ДАГВ. – Ф. 1385. – Воп. 1а. – Спр. 30.
4. ДАГВ. – Ф. 1385. – Воп. 1а. – Спр. 34.
5. ДАГВ. – Ф. 1385. – Воп. 1[а]. – Спр. 36.
6. ДАГВ. – Ф. 1385. – Воп. 1. – Спр. 79.
7. ДАГВ. – Ф. 1385. – Воп. 1. – Спр. 50.
8. ДАГВ. – Ф. 475. – Воп 1. – Спр. 4.
9. Канфесіі на Беларусі (к. XVIII – XX стст.) / В.В. Грыгор'ева [і інш.], пад рэд. У.І. Навіцкага. – Мінск.: ВП « Экаперспектыва», 1998. – 340 с.
10. ДАГВ. – Ф. 1385. – Воп. 1. – Спр. 52.
11. ДАГВ. – Ф. 475. – Воп 1. – Спр. 67.
12. Фурман, Д.Е. Религия, атеизм и перейстройка / Д.Е. Фурман // На пути к свободе совести: сб. ст. / сост. и общ. ред Д.Е. Фурмана, отца Марка. – М., 1989. – С. 6 – 18.

Касатая Таццяна Уладзіміраўна – магістр гістарычных навук, аспірант кафедры гісторыі славянскіх дзяржаў факультэта гісторыі і сацыялогіі Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы.

РОЛЯ ХРЫСЦІЯНСКІХ КАНФЕСІЙ У СУЧАСНЫМ САЦЫЯКУЛЬТУРНЫМ ЖЫЦЦІ

УДК 27-662.3(476)

Л. Уладыкоўская (Мінск)

ХРЫСЦІЯНСТВА І САЦЫЯКУЛЬТУРНАЕ РАЗВІЦЦЁ: СУЧАСНЫ БЕЛАРУСКІ КАНТЭКСТ

В статье анализируется социально-культурная трансформация в период, когда первичную роль в развитии выполняет индивидуальный выбор, витальные нужды, упрощенное понимание духовной жизни. Очевидна необходимость такой системы ценностей и идеалов, которая бы обеспечила единство и стабильность современного белорусского общества. Роль христианской традиции в сохранении духовности общества рассматривается в статье в различных аспектах.

Глабалізацыя прынесла сапраўдны сацыякультурны шторм, які характарызуецца такой велізарнай імклівасцю і маштабнасцю змяненняў, такім перарваннем традыцый і аслабленнем культурнай залежнасці ад асяроддзя, што аб'ектам індывідуальнага выбару становіцца літаральна ўсё – ўзровень і тып адукацыі, тэрмін замужжа, валоданне дзецьмі і кантакты з імі, нават пол і пол партнёра. Сучасныя сацыякультурныя трансфармацыі часта падрываюць саму аснову духоўна-маральнага парадку звыклай светабудовы, і пытанне пра тое, ці становіцца ў працэсе грамадскага развіцця чалавек лепшым, разумнейшым, дабрэйшым, застаецца адкрытым, хаця ўсё часцей філосафы схіляюцца да адмоўнага адказу. Чалавек пераўтвараецца ў істоту, засяроджаную на сваіх фізіялагічных і біялагічных патрэбах, якою вельмі лёгка маніпуляваць, ён пазбаўляецца свабоды духоўнага выбару, калі ўсё, што па-за стэрэатыпам паводзін, альбо замоўчваецца, альбо дыскрэдытуецца. Павелічэнне патокаў інфармацыі звязваецца з яе збядненнем і спрашчэннем, зніжэннем або нават знікненнем культурнага і духоўнага элементаў.

У такой сітуацыі паўстае пытанне пра саму сутнасць сацыякультурнага развіцця, якое не заўсёды супадае з прагрэсам. У адрозненне ад паняцця развіцця, якое мае на ўвазе такія змяненні, якія ўскладняюць сістэму, пашыраюць ці паглыбляюць яе, паняцце прагрэсу служыць у большай ступені каштоўнаснай ацэнцы гэтых зменаў, а значыць, падразумевае духоўнае развіццё.

У сучасных грамадствах самых розных культурных традыцый паступова выспявае ідэя аб тым, што далейшая эвалюцыя чалавека будзе звязана з пошукам новых духоўных рэсурсаў.

Хаця Беларусь з яе кансерватыўным традыцыяналізмам не з'яўляецца тыповай краінай, дзе грамадства актыўна глабалізуецца і мадэрнізуецца, складанае і канфліктнае перапляценне ў нашым грамадстве такіх розных працэсаў, як мадэрнізацыя, постмадэрнізацыя, традыцыяналізацыя, ствараюць часам сапраўды сюррэалістычную карціну сацыяльнай рэальнасці. Патрабуецца такая сістэма каштоўнасцей і ідэалаў, якая б забяспечыла еднасць і стабільнасць сучаснага беларускага грамадства і ўстойлівае сацыякультурнае развіццё на фоне глабальных і лакальна-рэгіянальных праблем, спрыяла б гарманізацыі асабістага і грамадскага, дзяржавы і рынку, планавасці і прыватнай ініцыятывы, нацыянальнай ідэі і ўніверсальнай (еўрапейскай) інтэграцыі і інш.

На маю думку, такая канструктыўная і збаўчая сістэма ідэалаў грунтуецца, з аднаго боку, на беларускіх нацыянальных традыцыях, адкрытых да сучасных каштоўнасцей глабалізму, з іншага боку, на рэлігійна-канфесійнай талерантнасці, заснаванай на разуменні хрысціянства як найважнейшага гістарычна-культурнага, нацыятворчага, рэлігійна-духоўнага і светапоглядна-каштоўнаснага фактараў развіцця.

Варта мець на ўвазе, што нацыянальна-культурныя і рэлігійна-духоўныя памкненні беларусаў могуць успрымацца ў Еўропе як кансерватыўна-архаічныя, бо там нацыянальнае станаўленне адбылося да канца XIX стагоддзя, ды і ў рэлігійным плане назіраецца адкат, але няхай нас гэта не бянтэжыць, бо перамога заўсёды – на баку большай духоўнай актыўнасці.

Рэлігійна-духоўная роля хрысціянства

У Беларусі духоўнасць асацыіруецца, перш за ўсё, з хрысціянствам. Гэта звязана з разуменнем духоўнасці як перспектывы ў вечнасць, а такую перспектыву праз ідэалы і задае хрысціянства. Без хрысціянскіх духоўных ідэалаў адбываецца поўная падпарадкаванасць чалавека прыродзе, інстынктам. Хрысціянства дае надзею, што свет не абмяжоўваецца матэрыяй, і ўводзіць паняцце духоўнага *пераўтварэння (преображения), што дазваляе лічыць хрысціянства, па Гегелю, рэлігіяй выратавання*.

Самае моцнае ў хрысціянскай духоўнасці – гэта менавіта не адмаўленне, а сцвярджэнне, ахоп і паўната. Хрысціянства – гэта не з'ява новай маралі, новай дактрыны ці новай філасофіі, а гэта адкрыццё вечнасці ў паўнаце. Хрысціянства нясе веру не проста ў бессмяротнасць душы, але і ў пераадоленне смерці, цемры і распаду. Хрысціянства ў свой час з'яднала мудрасць Афінаў і надзеі Усходу з марамі Рыма пра

ўсеагульную "згоду", яно асудзіла прыгнятальнікаў, узвысіла жанчыну, садзейнічала выкараненню рабства. Пазней у маладых варварскіх краінах Захаду яно стала апорай гуманнасці і асветы, прымусіўшы грубую сілу прызнаць духоўны і маральны аўтарытэт. Хрысціянства стала крыніцай жыццёвага дынамізму, усеахопнасці і ўніверсальнасці, што аргументавана падкрэсліваў Аляксандр Мень: "Калі будызм быў прасякнуты палымяным імкненнем пазбаўлення ад зла, імкненнем да выратавання, ...то гэта прага выратавання… ўласціва і хрысціянству, Новаму Запавету. Калі ў ісламе ёсць абсалютная адданасць чалавека Богу, які з'яўляецца суверэнным валадаром Космасу і чалавечага лёсу, то гэта мы знаходзім і ў хрысціянстве. Калі брахманізм, індуізм сучасны, гаворыць пра шматстайныя праявы Боскага, то і гэта ёсць у хрысціянстве. Калі, нарэшце, пантэізм сцвярджае, што Бог ува ўсім, што Ён нейкая таямнічая сіла, якая пранізвае кожную кроплю, кожны атам светабудовы, то хрысціянства і з гэтым згоднае, хаця і не абмяжоўвае ўздзеянне Бога толькі такой пантэістычнай усепрысутнасцю. Але мы памыліліся б з вамі, калі б лічылі, што хрысціянства з'явілася як нейкая эклектыка, якая проста сабрала ў сабе ўсе элементы папярэдніх вераванняў. У ім выявілася каласальная сіла нечага новага, і гэтае новае было не столькі ў дактрыне, колькі ў прарыве іншага жыцця ў гэтае нашае штодзённае жыццё" [6, с. 662].

Гістарычна-культурная роля хрысціянства

Што дало Беларусі хрысціянства, у самым агульным плане яшчэ ў 1951 годзе паказаў у аднайменным артыкуле каталіцкі святар, гісторык, культуролаг, адзін з актыўных дзеячаў беларускага рэлігійнага і культурна-асветніцкага жыцця ў эміграцыі Леў Гарошка (1911–1977): хрысціянства прынесла на Беларусь евангельскую навуку і традыцыю, хрысціянскую мараль і філасофію; асвету, кнігі; яно дало штуршок для арганізацыйнага жыцця; кананічнае царкоўнае права аказала вялікі ўплыў на кадыфікацыю беларускага права; хрысціянства паспрыяла развіццю мастацтва (іканапіс, фрэскавае мастацтва, ювелірнае, музыка і інш.); стварыла мураванае будаўніцтва (дагэтуль было драўлянае); дало вялікіх святых (дарэчы, магутны аўтарытэт агульнахрысціянскіх святых, не раз'яднаных на праваслаўных і каталіцкіх (Кірыл і Мяфод, Вольга, Уладзімір Вялікі, Барыс і Глеб, Ефрасіння Полацкая, Кірыл Тураўскі і інш.), для беларусаў палягае на сімвалічным увасабленні ў гэтых постацях цэльнага, неразздзельнага хрысціянства, што аб'ектыўна выявіла адзін з асноўных архетыпаў беларускасці – імкненне да бесканфліктнасці – тое, што служыла і служыць перадумовай экуменізму); адчыніла дзверы для скарбаў культуры Захаду і Усходу (для духоўнага развіцця неабходны абмен думак); спрыяла ўтварэнню адной літаратурнай мовы і

спрычынілася да аб'яднання беларускіх плямёнаў у адзін народ; рэлігійныя спрэчкі садзейнічалі паглыбленню беларускай свядомасці; каталіцтва, напрыклад, з яго дысцыплінаванасцю карысна паўплывала на беларускую псіхіку; пачаткі беларускага адраджэнскага руху таксама з'явіліся ў каталіцкім асяроддзі (К.Каліноўскі, Я.Баршчэўскі, Я.Чачот, В.Дунін-Марцінкевіч, Ф.Багушэвіч і інш.), хрысціянская царква прышчэплівала сваім вернікам глыбокі ідэалізм і ахвярнасць; каталіцтва паўплывала і на праваслаўе, якое ў Беларусі адрозніваецца ад расійскага і не мае ні цэзарапапізму, ні крайняй пасіўнасці; каталіцтва адчыніла дзверы для беларускага народа і ў міжнародным жыцці (напрыклад, Ватыканская радыёстанцыя першая ўключыла беларускія перадачы ў сваю праграму), дзякуючы каталіцызму беларусы залічаюць сябе да народу Захаду) і інш. [2].

Спецыфічны беларускі культурны феномен – гэта жанравае багацце і духоўная глыбіня фальклору, які, як вядома, гістарычна і змястоўна-вобразна цесна звязаны з язычніцтвам. Язычніцкая рэлігія звычайна разглядаецца ў апазіцыі да хрысціянства. Між тым, як слушна заўважае Уладзімір Конан, "... у даследаванні дахрысціянскай эпохі нашай духоўнай гісторыі неабходна адрозніваць старадаўнюю, народна-мастацкую рэлігійную свядомасць і язычніцтва сучаснае, "цывілізаванае", якое грунтуецца на самаабагаўленні чалавека і пакланенні "мамоне". Стараславянскае "паганства" …было напоўнена верай у Боскае тварэнне, у быццё, космас, у яго жыццёвасць, красу і самакаштоўнасць. У гэтым "вітаісцкім аптымізме" – пазітыўны, культурны сэнс старадаўняй язычніцкай рэлігіі, яна заслугоўвае не пустога адмаўлення, а дыялектычнага "зняцця" і захавання язычніцкай творчасці ў хрысціянскай свядомасці і культурнай традыцыі…" [4, с. 570].

Беларускі фальклор і да сённяшняга дня ўсё яшчэ багацейшы за прафесійную мастацкую культуру, якая развівалася ў неспрыяльных умовах, адносна кароткі перыяд і не паспела творча пераасэнсаваць хрысціянскае Пісанне і царкоўнае Паданне [4]. Гэта азначае, што працэс далейшага культурнага засваення хрысціянства – яшчэ наперадзе, што можа забяспечыць перспектыўнае фундаментальнае развіццё ўсёй беларускай культуры.

Нацыятворчая роля хрысціянства

Хаця хрысціянства – рэлігія ўніверсальная, яна, тым не менш, не адмаўляе развіццё нацый: Хрыстос, як вядома, выратоўвае народы. Паводле рускага філосафа У.Салаўёва, звышнароднае не ёсць безнароднае. Гэтую думку дасканала аргументуе і польскі святар кс.Ч.Бартнік у кнізе "Тэалогія нацыі" (1999), настойваючы на аналогіі правоў кожнай нацыі з правамі чалавека [1].

Уся трохступенчатая іерархія паняццяў, якая адлюстроўвае тры гістарычныя вектары нацыі – яе мінуўшчыну, сучасны этап і будучыню: этнічную самаідэнтыфікацыю народа, ягоны менталітэт, нацыянальную самасвядомасць і нацыянальную ідэю [4] – цесна звязаная не толькі з роднай мовай і міфалогіяй, але і з рэлігіяй. Хрысціянства, у сваю чаргу, будучы падмуркам беларускай нацыі, служыць крыніцай фарміравання архетыпаў нацыянальнага менталітэту як этна-псіхічнай асновы нацыянальнай самасвядомасці.

На жаль, падзеленасць беларускага народа на хрысціянскія канфесіі, калі рэлігійны фактар не адыгрываў адназначна станоўчай ролі ў станаўленні нацыянальнай самаідэнтыфікацыі, адлюстравала сусветную карціну хрысціянскага канфесійнага падзелу. Разам з тым полікультурнасць і шматканфесійнасць Беларусі найлепшым чынам спрыяюць рэалізацыі ідэі талерантнасці і міжкультурнага дыялогу.

Светапоглядна-каштоўнасная роля хрысціянства

Духоўны фактар у форме рэлігіі і царквы на ранішняй фазе агульнаеўрапейскай культуры быў дамінуючым, адыгрываў вядучую ролю ў развіцці грамадства і забяспечыў разгортванне, станаўленне еўрапейскай цывілізацыі. Перыяд еўрапейскага рэнесансу, выяўлены і ў Беларусі перыядам Адраджэння, – час гарманічных суадносін духоўнага і матэрыяльнага з ідэаламі дасканаласці і прыгажосці, калі паўсталі еўрапейскія нацыі і нацыянальныя дзяржавы з уласнымі суверэнітэтамі. З цягам часу матэрыяльны фактар узмацняўся, духоўна-ідэальны занепадаў. Працэс страты творчай духоўнай сілы і набыцця пачуццёва-спажывецкага характару закрануў мараль і мастацтва, што выявілася ў заходнееўрапейскім мадэрнізме пачатку ХХ стагоддзя і ў глабальным постмадэрнізме пачатку ХХІ стагоддзя [5].

Беларусам варта абапірацца на ўласную культурную і рэлігійную традыцыю, пачуццё ўласнай самапавагі і самастойнасці. Трэба памятаць, што развіццё, будучыню, перспектыву забяспечвае менавіта духоўны фактар, таму і арыентавацца належыць на вечна прыгожыя ідэалы хрысціянства. Хрысціянства, маючы сваю гісторыю, у тым ліку праз дзейнасць царквы зямной, сваёй трансцэндэнтнай, вечнай часткай знаходзіцца па-над часам, як царква нябесная.

Арыентацыя на хрысціянства выдатна суадносіцца з фарміраваннем новага мыслення чалавека, якое, хутчэй за ўсё, будзе характарызавацца не так апораю на палітыцы і эканоміцы, як на культуры, рэлігіі і маральнасці. Прычым і ў навуцы паступова прызнаецца неабходнасць сумяшчэння розных тыпаў пазнання, тлумачэння і пераўтварэння свету – навуковага і рэлігійнага. З гэтага пункту гледжання толькі станоўча можа ацэньвацца як свабода сумлення ў Беларусі, так і тое, што

матэрыялістычныя традыцыі ў беларускай навуцы як часткі постсавецкай, асабліва гуманітарнай, ад пачатку дзевяностых гадоў мінулага стагоддзя паступова дапаўняюцца рэлігіязнаўчымі даследаваннямі, а адукацыя – тэалагічнымі дысцыплінамі (на жаль, апошнім часам гэты працэс замарудзіўся).

Важна памятаць, што культура ёсць творам не толькі духу, але і свабоды, а свабодная навука павінна быць надканфесійнай у прынцыпе.

Беларуская хрысціянская поліканфесійнасць (а ў Беларусі сёння дзейнічаюць 25 рэлігійных канфесій і напрамкаў, агульная колькасць рэлігійных арганізацый дасягнула 3156; 59 % жыхароў Рэспублікі Беларусь лічаць сябе рэлігійнымі, з іх да хрысціянскай традыцыі аднеслі сябе больш як 82 %, прычым 72,6 % атаясамліваюць сябе з праваслаўем, 9,3 % – з каталіцтвам, 0,4 % – з пратэстантызмам [3]) не толькі не выключае, але сцвярджае хрысціянства як адзіную сістэму каштоўнасцей і этычных кодаў.

Нягледзячы на нядаўні рэлігійны рэнесанс, рэлігійныя ўяўленні жыхароў Беларусі на фоне веры ў варажбу і астралогію, вонкавай набожнасці даволі размытыя і недакладныя (сапраўды рэлігійныя людзі складаюць усяго сёмую частку вернікаў). Частка людзей атаясамлівае сябе з пэўнай канфесіяй, маючы на ўвазе толькі культурную ідэнтыфікацыю. Так, больш за палову тых, хто ідэнтыфікуе сябе з хрысціянствам (55,6 %), увогуле не наведваюць царкоўныя службы, толькі 7,4 % вернікаў-хрысціян пастаянна бываюць на набажэнствах [3, с. 6].

Фактычны ўплыў хрысціянства на сучаснае беларускае грамадства даволі абмежаваны і неглыбокі, фрагментарны і мазаічна-лакальны, ён не ўкаранёны ва ўсе формы жыццядзейнасці грамадства і ахоплівае пераважна толькі духоўную эліту (не сацыяльную). Грамадства ў сваёй большасці застаецца секулярызаваным і абязбожаным. Патрабуецца актывізацыя хрысціянскага асветніцтва: глыбейшае ўваходжанне Хрысціянскай Царквы ў кантэкст беларускай нацыянальнай культуры і ў гуманітарна-тэарэтычным плане (удзел святароў у адукацыйным працэсе, культурна-асветнай і навуковай працы, паступовае збліжэнне тэалогіі, хрысціянскай філасофіі і гуманітарнай навукі праз ліквідацыю палярызацыі тэалогіі і гуманістыкі, якая асабліва была характэрнай для канца XVIII, XIX і XX ст.), і ў плане практычна-функцыянальным (выкарыстанне беларускай мовы ў душпастырстве, у царкоўным жыцці, пераклад на беларускую мову Святога Пісання і інш.); уласна рэлігійнае асветніцтва (пераважна праз сродкі масавай інфармацыі, катэхізацыю і т. п.).

У адукацыі, як істотным сегменце шырокага спектру сучаснай культуры, нельга цалкам выключаць з дыдактыкі рэлігійны фактар. Варта шырэй прапаноўваць тэалогію і рэлігіязнаўства, няхай сабе ў форме спецкурсаў, на ўсіх узроўнях сістэмы адукацыі, ва ўсіх тыпах навучальных устаноў. Гэта дапаможа захаваць пераемнасць беларускіх культурных традыцый, удасканаліць змест сучаснай беларускай гуманістыкі, паглыбіць светапогляд і пашырыць кругагляд моладзі, ды і грамадзян у цэлым, пазбегнуць актывізацыі ўплыву на моладзь дэструктыўных рэлігійных сект (якія часта выкарыстоўваюць духоўны голад і адсутнасць элементарных рэлігійных ведаў), пазбегнуць нігілістычных, упадніцкіх настрояў, калі маладыя людзі не здатныя зрабіць асэнсаваны выбар на карысць пэўнай духоўнай пазіцыі, рэалізаваць свабоду сумлення, бо там, дзе ў чалавека павінны знаходзіцца думкі і ўяўленні ўніверсальнага характару (пра сэнс жыцця, і т. п.), часта пануюць закладзеныя, нібы ў кампутары, стэрэатыпы. Нават пры самай добрай адукацыі, калі чалавек не ведае, хто ці што ён такое з пункту гледжання духоўных ведаў, ён не здолее правільна вызначыць сваё месца ў свеце і не будзе ведаць, што рабіць з сабой.

Такім чынам, па-першае, хрысціянства выступіла самым магутным фактарам стварэння беларускай нацыі, яно забяспечыла і працягвае забяспечваць развіццё беларускай культуры. Па-другое, хрысціянства фарміруе каштоўнасную шкалу беларускага грамадства і жывіць духоўны пласт нацыянальнага быцця. Эпоха імклівых глабальных змяненняў не толькі не зніжае, але павышае ролю хрысціянства як ва ўмацаванні нацыянальнай ідэнтычнасці, так і ў забеспячэнні пераемнасці духоўна-культурнага развіцця нашага народа. Хрысціянскія каштоўнасці і ідэалы з прычыны таго, што носяць трансцэндэнтальны характар, увасабляюць ідэю ўніверсалізму і з'яўляюцца сутнаснай характарыстыкай беларускай культуры, утвараюць вось каардынат, якая забяспечвае Беларусі ўстойлівае сацыякультурнае развіццё і адпаведны ўзровень маральнасці і стабільнасці грамадства.

Спіс крыніц і літаратуры

1. Бартнік, Ч.С. Тэалогія нацыі / Ч.С. Бартнік. – Чэнстахова, 1999.
2. Гарошка, Л. Што дало Беларусі хрысціянства? / Л. Гарошка // Беларуская думка XX ст.: Філасофія, рэлігія, культура: анталогія / укладанне, прадмова і апрацаванне: Ю.Гарбінскі. – Варшава, 1998. – С. 408 – 412.
3. Землякоў, Л. Рэлігія ў сучаснай Беларусі / Л. Землякоў, І. Жылінская // Беларускі гістарычны часопіс. – 2008. – № 6. – С. 3 – 12.
4. Конан, У. Хрысціянства ў гістарычным лёсе Беларусі / Уладзімір Конан // Беларуская думка XX ст.: Філасофія, рэлігія, культура: анталогія / укладанне, прадмова і апрацаванне: Юры Гарбінскі. – Варшава, 1998. – С. 565 – 588.

5. Крукоўскі, М.І. Бляск і трагедыя ідэалу / М.І. Крукоўскі. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2004. – 352 с.
6. Мень, А. Мировая духовная культура. Христианство. Церковь: лекции и беседы / А.Мень. – М., 1997. – 671 с.
7. Станкевіч, А. Хрысціянства і беларускі народ / А. Станкевіч // Беларуская думка XX ст.: Філасофія, рэлігія, культура: анталогія / укладанне, прадмова і апрацаванне: Юры Гарбінскі. – Варшава, 1998. – С. 346 – 353.

Уладыкоўская Любоў Мікалаеўна – кандыдат філалагічных навук, намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Роднае слова».

УДК 271.2

С.А. Порозов (Барановичи)

ХРИСТИАНСТВО В ИСТОРИЧЕСКОЙ СУДЬБЕ РУССКОГО НАРОДА

В статье представлен оригинальный взгляд на культурно-историческую роль христианства в судьбе восточнославянских народов. Духовное наследие поколений обусловило необходимость создания и сохранения на современном этапе развитого гражданского общества на основе связи церкви с научным интеллектом, веры прошлого с настоящим.

Нами, восточными славянами, с момента принятия христианства развивалось по преимуществу византийская традиция взаимоотношений государства и церкви с ее специфически восточной мыслью, будто «…правительство может управлять всем, в том числе духовным творчеством» [2, с. 231]. Специфика этого процесса и в том, что мы приняли христианство и античную культуру не прямо из Греции и не на латинском языке, как это имело место на Западе, а во многом с помощью Болгарии и староболгарской литературы, как то «Шестоднев» Иоанна, Экзарха Болгарского, Изборник 1073 года и др. [3, с. 59 – 62]. Все это порою приводило к тому, что «…русская мысль, оторвавшись от источника, беспомощно барахталась в буквенных сетях болгарского перевода, … дрожа над каждой буквой и каждым знаком, в безнадежном буквализме, … готовая скорее отнести к еретичеству всякое проявление ищущей мысли, чем поддержать и удовлетворить духовное искание» [2, с. 227 – 236].

Последствия же церковной реформы и раскола в XVII веке серьезно ослабили церковь в материальном, организационном и в религиозно-идеологическом отношении. И, прежде всего, царская власть сильно притормозила мирское, безмерное стяжание и усиление церковью этих

своих свойств, которые она в лице Никона пыталась направить на возвышение духовной власти над светской [4, с. 135—193]. Однако при этом были подорваны и без того слабые, но в чем-то уже традиционные, старые обряды церковной жизни всего русского народа, как содержательные формы для его дальнейшего внутреннего духовно-личностного развития.

В угоду недальновидным политическим целям и по причине невежества были внутренне ослаблены в их духовно-энергийной сущности православная церковь, русский народ, государство, которые при всем своем внешнем подъеме и великолепии культивировали в себе уже ядовитые семена будущего развала и кровавых переворотов. В 1700 году, после смерти патриарха Андриана, Петр I упраздняет патриаршество, и уже почти до 1917 года церковь становится отраслью государственного управления, угождает и обслуживает потребы императорской власти, пресекающей ее, церкви, мирские стяжания и религиозно-идеологическую инертность [4, с. 200–228]. Подлинный, а не формально-официальный авторитет православной церкви и веры, их позитивное духовное влияние на народ начинают ослабляться еще до развала империи и гонений на церковь.

«В этих условиях русская церковь в ее эмпирической земной организации стала именно тем средоточением и основой религиозной жизни, откуда распространилось расслабление и упадок религиозного духа» [2, с. 38]. Став частью государства, Церковь включилась в его охранительную политику, перешла ее пределы и не стала голосом религиозной совести в отношении отрицательных свойств и действий самодержавной власти и тем самым не соблюла, не одухотворила внутреннее достоинство ее. Учитывая же болезненные претензии русского человека, обращенные к судьбе, к истории, к власти, к культурным ценностям, недоступным ему из-за невысокого качества личностно-нравственного сознания, его дисциплины, а также и то, что трансцендентные идеалы жизни потеряли свою святость и устремились к земному реальному своему осуществлению средствами человеческими и революционными, такая революция и свершилась, как чудесный скачок в лжерелигиозное антихристово царство социализма и коммунизма.

Революционный 1917 год принес для церкви восстановление долгожданного патриаршества, но вслед за этим и страшные гонения от большевиков, от которых мужественно и достойно принял мученическую судьбу патриарх Тихон, тем спасший церковь от гибели для возрождения ее.

Теперь наши восточнославянские народы снова перед трудным историческим выбором дальнейших путей развития. По существу, мы остались те же, со своими достоинствами и недостатками, но «каковы

идеалы и ценностные ориентации данного народа, обусловленные преимущественно его характером, таковы и его исторические судьбы» [6, с. 277]. И все же всем хочется лучшей судьбы. Поэтому связь ошибок и успехов в гордиевых узлах нашей истории следует терпеливо развязывать, чтобы меньше разрубать. Естественно, что эту проблему и современные наши проблемы мы не сможем решить без усиления роли, влияния и авторитета православной Церкви в обществе. Для этого нужно более решительно создавать необходимые, в том числе и правовые, условия и возможности для более широкого и активного участия Церкви в духовном воспитании и образовании не только детей и молодежи, но и всего нашего православного народа [7, с. 42]. Но и Церковь должна внутренне обновляться, чтобы стать подлинно неистощимой сокровищницей духовных идеалов в жизни каждого из нас и всего народа. Православная Церковь призвана быть совестью нашего общественного организма, не устраняться от вопросов политической жизни, а участвовать в их решении и давать им гласную и публичную оценку.

Судьба нашего общества во многом зависит от того, насколько успешно и своевременно мы будем осуществлять его улучшение, развитие. Мы должны создавать благоприятные условия для возникновения собственности простого труженика, работника и дать твердые гарантии ее существования и приложения. Все это через механизм социальных взаимодействий обеспечит нам создание действенной системы самоуправления народа – ядра будущего гражданского общества, которое в перспективе будет определять стратегию деятельности государства и принципы его деятельности тактической. На этом пути будут возрастать социальная и духовная зрелость человека, качество его личностно нравственного сознания, дисциплины. Будет восстанавливаться и крепнуть святое начало в душе русского человека Живительным и благотворным влиянием взаимодействий православной религии и Церкви с современным научным интеллектом, веры и разума, культуры прошлого и настоящего, культуры отечественной и мировой. Это предостережет нас от судьбоносных ошибок на нашем историческом пути, ибо «Если благодаря нашим ошибкам этот вопрос не может быть разрешен к вящей нашей славе, он будет разрешен к вящему нашему унижению» [8, с. 43].

Список источников и литературы

1. История средних веков: в 2 т.: учебник для вузов. – Т. 1. – М., 1990. – 507 с.
2. Введенский, А.И. Очерки истории русской философии / А.И. Введенский [и др.]. – Свердловск, 1991. – 563 с.

3. Громов, М.Н. Русская философская мысль X – XVII веков: учеб. пособие / М.Н. Громов [и др.]. – М., 1990. – 389 с.
4. Козлов, Ю.Ф. Союз короны и креста / Ю.Ф. Козлов. – Саранск, 1995. – 498 с.
5. Долгоруков, П.В. Петербургские очерки. Памфлеты эмигранта (1860 – 1867 гг.) / П.В. Долгоруков. – М., 1992. – 603 с.
6. Кессиди, Ф.Х. К истокам греческой мысли / Ф.Х. Кессиди. – СПб., 2001. – 407 с.
7. Митрополит Смоленский и Калининградский Кирилл. Опыт рассмотрения проблем прав человека и их нравственных основ в европейских религиозных сообществах / Митрополит Смоленский и Калининградский Кирилл // Проблемы управления. – 2008. – № 1 (26). – С. 42.
8. Соловьев, В. С. Русская идея / В. С. Соловьев. – СПб., 1991. – 97 с.

Порозов Святослав Афанасьевич – кандидат философских наук, Баранавичский государственный университет.

УДК 27-428

П.П. Можейко (Пинск)

АБЕРРАЦИЯ РАННЕХРИСТИАНСКИХ ЦЕННОСТЕЙ

В статье анализируется конструктивная и деструктивная роль мировых религий в духовном развитии социума. Христианство, совершив на определенном историческом этапе интеллектуальную революцию в мышлении людей и придав истории динамизм, в условиях современного плюралистического общества постепенно утрачивает свои позиции, уступая их светской культуре. Вместе с тем люди всё чаще обращаются к раннехристианским традициям.

Не вызывает сомнения тот факт, что в последнее время принципиально новую роль в процессе взаимодействия разных культур и цивилизаций играют мировые религии. Сложившаяся ситуация диалога разных религиозных конфессий не только дает человечеству новую надежду, но и таит в себе большую опасность. Усиление влияния мировых религий способно сыграть как весьма конструктивную роль, задав человечеству новое духовное измерение, сформировав ценностные основания взаимодействия разных стран в XXI веке, так и чрезвычайно деструктивную, обострив и без того сложную ситуацию, акцентировав различие аксиологических установок между религиями и культурами.

Наше миропонимание и мироощущение немыслимы без применения аксиологических понятий и категорий, таких как свобода, социальная перспектива, причинность и смысл исторического процесса, общественный прогресс и им подобных. Соответственно, такое мировидение порождает систему ценностей, присущую нынешнему

техногенному обществу, составной частью которого является Беларусь. Сегодня, когда ЕС граничит непосредственно с Беларусью, для лучшего понимания процессов, происходящих на современном цивилизационном и географическом пространстве Европы, необходимо всестороннее исследование факторов, способствовавших становлению ценностей европейской культуры. В белорусском социуме произошел пересмотр стержневых идеологических ценностей, видоизменился взгляд на религиозное и культурное наследие.

Христианство интересно для нас хотя бы потому, что уже более тысячи лет оно играет огромную роль в истории культуры нашей страны и органически связывает своими ценностными установками Беларусь со странами, в которых христианство является доминирующей религией. Учитывая устойчивую тенденцию к возрождению этнического и религиозного самосознания нашего народа, которое наблюдается в конце XX – начале XXI веков, можно ожидать возрастания ещё большего интереса к христианству вообще и к христианским ценностям в частности. Это связано, в первую очередь, с тем, что большая часть населения Беларуси считает себя адептами христианской религии.

Можно быть воинствующим атеистом, ортодоксальным христианским богословом, просто верующим или неверующим, но нельзя отрицать того, что сознание нашего народа во многом формировалось под воздействием христианства. Поэтому вопросы, относящиеся к характеру мировоззрения и к формированию особой ментальности нашего народа, складывавшихся на протяжении длительного времени непосредственно под влиянием христианства, вызывают большой интерес у отечественной науки.

На мой взгляд, очень важно проследить значение религиозного фактора на становление базовых ценностей белорусского этноса и превращения их в национальную культурную традицию.

Несмотря на то, что христианская религия появилась более двух тысяч лет тому, распространение её до сих пор продолжается. Это говорит о том, что христианство в определённой степени является универсальным явлением, до настоящего времени встречающимся в разных уголках земного шара. Поэтому изучение процесса экспансии христианства во многие сферы средневекового белорусского общества позволяет выявить некоторые общие тенденции любой религии оказывать влияние на формирование базовых ценностей социума.

Христианство пришло на территорию современной Беларуси почти тысячу лет спустя после его появления на окраине Римской империи. В таком позднем, но, как показало время, своевременном появлении, были и свои преимущества. Уже закончились триадологические споры и

дискуссии о природе Иисуса Христа, были зафиксированы основные религиозные догматы и каноны. Тем самым, наш народ получил базовые ценностные установки, разработанные под сильным воздействием христианства, уже в сложившемся виде, без разрушительных не только для клира, но и для всего народа богословских споров.

Христианизация белорусских земель в Средневековье имела далеко идущие последствия на дальнейшее развитие практически всех сфер белорусского социума на большом историческом отрезке и продолжает оказывать влияние, пусть и имплицитно, вплоть до нашего времени. Становление единой государственной религии способствовало усилению общественных связей, а также экономической интеграции, особенно в период феодальной раздробленности. Христианство способствовало дальнейшему укреплению семьи и её интеграции как социальной группы. Догматика христианской религии стала основой управления поведением белорусского средневекового социума, легитимируя и укрепляя его традиционные формы. Взгляд Ле-Гоффа на ценностные приоритеты того времени таков: «Долгое средневековье – это эпоха господства христианства, являющегося одновременно и религией, и идеологией» [2, с. 35]. Христианство, рассматривая Церковь как союз верующих, как религиозную цельность, способствовало обоснованию и усилению национального единства. Христианская религия, особенно в раннее Средневековье, несмотря на свое негативное отношение к богатству, закрепляет институт собственности, поскольку табуизация священных предметов и мест, принадлежащих Церкви, переносится мирянами по аналогии на частное владение. Из всего вышеперечисленного можно обоснованно сделать вывод, что христианизация белорусских земель способствовала становлению и развитию принципа социальной непрерывности, который служит гарантом соответствующей идентичности социума. С закреплением на белорусских землях христианского мировоззрения, переосмысливается отношение к человеческой истории, придается глубина историческому измерению. Если предшествующие исторические анналы основное внимание направляли лишь на прошлое, совершенно игнорируя настоящее, то христианская религия постулирует мысль, что прошлое обретает историчность и значение лишь во взаимосвязи с будущим. Для христианства история – это, прежде всего, творческое взаимодействие и диалог людей с Богом. Не случайно практически в каждом монастыре были свои летописцы. Благодаря христианству рождается новая концепция исторического процесса в глазах средневекового летописца. Трактуя историю как линейный процесс, христианство совершает интеллектуальную революцию в мышлении, придаёт креативность

общественной жизни. В истории появляется динамизм. Каждое событие занимает свое особое место в истории. Все события истории уникальны и неповторимы [1, 1 Петр. 3: 18, с. 175].

Человек получает цель и средства её достижения через свою творческую деятельность. История рассматривается как процесс, где у каждого человека появляется уникальная возможность приблизиться через свои действия к Богу, то есть стать более совершенным. Риккерт писал по этому поводу следующее: «Понятие исторической индивидуальности образуется ценностями и фактами, свойственными цивилизации, к которой они принадлежат. Исторический процесс потому есть непрерывная отсылка к ценностям» [6, с. 23]. Такой подход к трактовке исторического процесса закладывал основы для самореализации личности в различных сферах деятельности, что до сих пор является одной из основных характеристик белорусского социума.

Христианство принесло новое осознание исторического динамизма, логики в истории, которая является скорее линейной, а не цикличной, потому в ней нет, и не может быть ничего случайного и малозначимого, каждое мгновение наполнено смыслом. Христианские теологи впервые взглянули на жизнь человечества как на целостный исторический процесс, что нашло отражение в изменении миропонимания белорусского средневекового этноса.

Общеизвестно, что язык – не только знаковая система, но он является носителем представлений и выражает систему ценностей определенной эпохи. Эти функции достаточно успешно выполняла в Средние века в Европе латынь, которая была не только языком культурного и межэтнического общения, но играла и интегрирующую роль. Майбурд замечает по этому поводу следующее: «Была единая христианская общность народов, в которой все грамотные люди говорили и писали на одном языке – латыни» [5, с. 37]. Уникальность Беларуси в том, что на протяжении всей своей многовековой истории на её территории встречались и взаимодействовали две основные деноминации христианства: православие и католицизм. Как известно, основным богословским языком католицизма является латынь. Таким образом, благодаря латыни отечественные мыслители получили доступ ко всему интеллектуальному наследию античности и средневековья.

Огромную роль христианская религия оказала на развитие письменности в белорусских землях. Письменная фиксация догматического корпуса появляется вместе с разработкой соответствующего понятийного аппарата новой религии. Хотя главной ценностью остается устное слово, но развитию письменности христианская церковь придаёт огромное значение, не без основания

считая, что распространение догматического корпуса христианской религии среди неофитов напрямую связано с распространением письменного слова. Ле-Гофф замечает: «В появлении новых ценностных ориентаций и новой практики особо заметен прогресс письменности» [3, с. 35].

Одной из ведущих функций средневековой церкви была функция сохранения и трансляции знания, а положения христианской догматики стали той методологической и интеллектуальной основой, на которой могла строиться система знаний. Причем церковь иногда вынуждена была скорее способствовать сохранению знания, чем мешать его развитию. Одной из форм послушания в монастырях была переписка книг. Острая нужда в образованных теологах послужила одним из факторов становления университетов. Нужно отметить, что интеллектуальная деятельность христианских богословов оказала огромное влияние на развитие гуманитарных наук, методологическую основу которых долгое время составляли правила и подходы, разработанные средневековыми христианскими мыслителями.

Христианская теология создала единую картину мира и единую систему наук, правда, входивших составной частью в средневековую философию, что не помешало впоследствии выделению и становлению многих дисциплин как самостоятельных.

Со временем христианство утрачивало свои доминирующие позиции не только в нашей стране, но и во всем мире, уступая их светской культуре. «Область традиции и авторитета, церковной и родительской власти вынуждена была отступать» [4, с. 628]. В современной Беларуси происходит возврат к ценностным установкам раннего христианства, что, на мой взгляд, заслуживает всяческого одобрения и свидетельствует о том, что христианство продолжает играть важную роль в нашем обществе. Тойнби сделал по этому поводу следующее замечание: «Эти два слова – «Иисус Христос» – имеют неоценимое значение для нас и будут, рискну предсказать, всё так же важны для человечества и две, и три тысячи лет спустя» [7, с. 404]. Правда, при этом необходимо помнить, что в плюралистической культуре современного белорусского социума нельзя абсолютировать и насильно навязывать положения любой отдельно взятой религиозной традиции, так как это приведёт к аномии.

Список источников и литературы

1. Библия. – Минск, PICORP, 1996. – 294 с.
2. Гофф, Ле-Ж. Средневековый мир воображаемого / Ле-Ж Гофф. – М.: Прогресс, 2001. – 440 с.

3. Гофф, Ле-Ж. С небес на землю. Перемены в системе ценностных ориентаций на христианском Западе в XII – XIII веках / Ле-Ж. Гофф // Одиссей. Человек в истории. – М.: Наука, 1991. – С. 25 – 44.
4. Лотман, Ю.М. Семиосфера / Ю.М. Лотман. – СПб.: Искусство, 2004. – 704 с.
5. Майбурд, Е.М. Введение в историю экономической мысли. От пророков до профессоров / Е.М. Майбурд. – М.: Дело, 2000. – 560 с.
6. Риккерт, Г. Науки о природе и науки о культуре / Г. Риккерт. – М.: Республика, 1998. – 413 с.
7. Тойнби, А.Дж. Цивилизация перед судом истории: сборник / А.Дж. Тойнби. – М.: Рольф, 2002. – 592 с.

Можейко Павел Павлович – старший преподаватель, Полесский государственный университет.

УДК 316:2-057.87

З.И. Макаревич (Витебск)

ПРОБЛЕМА РЕЛИГИОЗНОСТИ В СРЕДЕ СТУДЕНЧЕСКОЙ МОЛОДЕЖИ

В статье дан анализ состояния религиозности в среде студенческой молодежи на основе социологического опроса студентов пятого курса Витебского государственного университета имени П.М. Машерова. Показан рейтинг отдельных ценностных ориентаций.

Анализ процесса социализации личности всегда является важнейшей задачей социологической науки. В современном обществе наблюдается взаимодействия двух типов культур: светской, непосредственно формирующей современное общественное сознание, и конфессиональной, актуализирующейся в условиях усиления культурного и политического влияния религии. Эта ситуация охарактеризована как «ассиметрия репрезентативности культур» светского и религиозного типа в социальном пространстве [1, с. 273]. Социологи, изучающие проявление феномена религии в обществе, продолжают задаваться вопросом, каков минимум соответствия религиозным требованиям, с которого человека можно считать принадлежащим к религиозному течению; насколько религия влияет на наличный светский паттерн сознания молодого поколения. В ходе проведенных в январе – марте 2009 г. пилотажного исследования был опрошен контингент студенческой молодежи 20 – 22 лет Витебского государственного университета им. П.М.Машерова.

Для построения эмпирико-аналитической модели вариантов взаимодействия светской и религиозной культуры ученые используют типологию реливантности А. Шютца [4, с. 193], позволяющую изучить, как представители разных социальных групп через призму своего субъективного видения мира интерпретируют объективные объекты и явления. Одна из позиций предполагает максимальную релевантность религии и религиозной культуры в жизненном мире личности. Ценностной доминантой здесь выступает религиозная вера, сочетающаяся с религиозной и конфессиональной самоидентификацией. Среди опрошенной молодежи 75,0 % определили себя как верующие, в том числе: верующие в Бога – 61,9 %; верующие в сверхъестественные силы – 13,1 %). 88,09 % из числа верующих самоидентифицировали себя как христиане.

Следующая позиция предполагает изучение места и роли религии в системе ценностных ориентаций личности. Исследования выявили рейтинг следующих ценностей: семейное счастье (64,29 %); материальный достаток, богатство (46,43 %); физическое здоровье (46,43 %); любовь (40,48 %); образованность (40,48 %); интеллектуальное и духовное совершенство (39,88 %); мир в обществе, стране (27,98 %); личная свобода (26,19 %); вера в Бога (19,05 %); честь и достоинство (16,07 %); вера в себя (15,48 %). Веру в людей выделили 4,76 %.

Стало доброй традицией участие преподавателей и студентов Минских Духовных Академии и Семинарии в торжественных мероприятиях в Горках: Дне Знаний 1 сентября, праздновании 165-летия БГСХА, конференциях и т.д.

По мнению преподавателей и студентов, эти мероприятия меняют взгляды молодых людей, от них они получают так необходимые жизненные ориентиры. Думается, что всеобщим одобрением этого направления в деятельности наших ВУЗов стали продолжительные несмолкающие аплодисменты на концертах студентов Минских Духовных Школ в феврале и октябре 2006 года, которые с аншлагом проходили во Дворце культуры Белорусской государственной сельскохозяйственной академии.

Реализованные проекты подтверждают необходимость дальнейшего развития установившихся отношений. Об этом говорят и сами студенты:

«Жировичи. Теперь это слово для меня означает очень многое. Это не только мужской монастырь, святой храм или люди, которые разочаровались в жизни, но и слово, которое содержит в себе всё самое чистое, светлое, святое. Я никогда не думала, что двое суток, проведённых в монастыре, могут принести столько эмоций и впечатлений в мою жизнь».

«Теперь я стала понимать, что в наше трудное и суровое время, когда в мире и в душе человека творится «бардак», этой душе просто необходимо чуть-чуть веры, надежды и любви на самое лучшее, красивое, доброе, святое и чистое…»

«Беседа со священником заряжает человека, окрыляет его и даёт чувство, а, главное, – уверенность в том, что там, на небесах, существует Бог, который тоже участвует в разговоре».

«Встреча с отцом Сергием была для нас очень неожиданной и интересной. По мере его рассказа, наше впечатление о жизни начало приобретать некий иной оттенок – добра, понимания, терпимости».

«Если честно, я даже боялась зайти в церковь (до Жирович), сейчас я хочу идти туда и жду ближайшего церковного праздника, чтобы сходить в церковь».

«Всё было здорово, мне кажется, что из Жирович я приехала новым человеком».

Работа по осуществлению сотрудничества между БГСХА и МинДАиС – одно из направлений деятельности молодёжного клуба «Ступени». Он функционирует под эгидой Горецкого районного отделения республиканского общественного объединения «Центр православного просвещения преподобной Евфросинии Полоцкой», созданного усилиями преподавателей и сотрудников БГСХА. Своим названием клуб обязан студенческому журналу МинДАиС «Ступени».

Целью работы клуба является возрождение роли православных ценностей в воспитании молодого поколения, развитие интереса к культурному и историческому наследию родного края, воспитание глубокого уважения к православным традициям Республики Беларусь.

Важным направлением деятельности «Ступеней» является осуществление экскурсий и паломнических поездок по культурно-историческим и духовным местам Республики Беларусь и за её пределами. Клуб «Ступени» организует три-четыре экскурсионные поездки в семестр.

На наш взгляд, вопрос организации ознакомительных поездок по историко-культурным и святым местам Республики Беларусь должен стать одним из направлений воспитательной работы в вузе.

Также клуб «Ступени» занимается культурно-просветительской работой среди студентов, преподавателей и сотрудников БГСХА, школьников Горецкого района, которая включает организацию и проведение бесед и кураторских часов на православную тематику, организацию встреч со священнослужителями, распространение информационных листков к основным православным праздникам по общежитиям и учебным корпусам БГСХА, публикацию статей в

периодической печати города и района на православную тематику, участие в республиканских и международных конференциях.

В условиях политических, социальных и духовных перемен постсоветского развития Беларуси проблемы мировоззренческого самоопределения наиболее остро встают, прежде всего, перед молодёжью. Как представляется, работа студентов и преподавателей БГСХА в рамках клуба «Ступени» и Горецкого районного отделения республиканского общественного объединения «Центр православного просвещения преподобной Евфросинии Полоцкой» помогает в осуществлении мировоззренческого выбора и формировании жизненно важных духовных ориентаций и установок у студентов БГСХА.

Список литературы

1. Раков, А. Былинки / А.Раков. – СПб., 2004.

Марченко Татьяна Николаевна – преподаватель Белорусской государственной сельскохозяйственной академии;
Герасимович Эльвира Евгеньевна – старший преподаватель Белорусской государственной сельскохозяйственной академии

УДК 271.4(476)

Л.А. Лукашэвіч (Брэст)

АГЛЯД СУЧАСНЫХ КАТАЛІЦКІХ МАНАСКІХ ОРДЭНАЎ, У ЯКІХ ДЗЕЙНІЧАЮЦЬ БЕЛАРУСКІЯ БРАТЫ ГРЭКА-КАТОЛІКІ

Статья посвящена положению греко-католического причта в Беларуси. Несмотря на относительную немногочисленность монахов восточного обряда, значительной является их роль в возрождения греко-католической традиции. Активная общественная, издательская деятельность греко-католиков Беларуси находится в тесной связи со структурами Римско-католической Церкви.

У XX ст. шмат якія лацінскія манаскія ордэны стварылі свае ўсходнія адгалінаванні. Манахі ўсходняга абраду сёння ёсць сярод езуітаў, рэдэмптарыстаў, марыянаў, салезіянаў, капуцынаў, вярбістаў і інш. З жаночых грэка-каталіцкіх манаскіх ордэнаў сёння найбольш вядомыя супольнасці сёстраў базыльянак, сёстраў студытак, сёстраў служэбніц, сёстраў св. Язэпа, сёстраў язафатак, сёстраў св. Ганны. Кожная манаская супольнасць мае свае законы, асаблівасці, задачы і місію [2, с. 15].

Манаскіх ордэнаў, у якіх служаць менавіта беларускія грэка-католікі, не шмат. Гэта – Ордэн Айцоў Марыянаў, Студыты і Рэдэмптарысты. Пры гэтым марыяне не падзяляюць абрад; рэдэмптарысты маюць заходні і ўсходні абрады; студыты прадстаўляюць непасрэдна ўсходні абрад. Менавіта студыты з'явіліся першымі грэка-каталіцкімі манахамі на тэрыторыі Беларусі пасля апошняга адраджэння царквы [2, с. 15]. Знакамітых у свой час манахаў-базыльян на Беларусі ўжо не існуе, хоць яны вядуць працу ў многіх краінах свету: ва Украіне, Польшчы, Славакіі, Венгрыі, Італіі, ЗША, Канадзе, Аргентыне, Бразіліі, Аўстраліі і інш [2, с. 15]. Прадстаўнікі гэтага Ордэна толькі часам наведваюць Беларусь. У складзе езуітаў беларускіх грэка-католікаў таксама няма. На тэрыторыі Беларусі жыве толькі адзін прадстаўнік гэтага Ордэну – рыма-католік Казімір Жыліс.

Рэдэмптарысты, або Чын Найсвяцейшага Адкупіцеля (лац. "Redemptoris" – адкупіцель) – гэта ордэн місіянераў, заснаваны Альфонса Лігуоры ў 1732 г. у м. Скаля на поўдні Італіі [6, с. 2]. Задачай, якую заснавальнік паставіў перад новым таварыствам, было "прапаведванне Добрай Навіны ўбогім". Сёння "ўбогімі" рэдэмптарысты лічаць людзей, "духоўна апушчаных з розных прычын грамадскага жыцця": тых, хто не чуў Евангелле, тых, хто не мае ніякага дачынення да царквы" [9, с. 10]. Зараз Ордэн налічвае каля 6000 членаў, якія працуюць у 73 краінах свету.

Рэдэмптарысты ўсходняга візантыйскага абраду з'явіліся дзякуючы бельгійскаму місіянеру а. Ахілю Дэлярэ. У 1906 г. ён прыняў усходні абрад, каб працаваць для ўкраінскіх эмігрантаў у Канадзе. У 1910 г. Галіцкі Мітрапаліт Андрэй Шаптыцкі наведаў пасяленцаў і пазнаёміўся з працай бельгійскіх рэдэмптарыстаў сярод украінцаў. Ен запрасіў іх у Кіева-Галіцкую мітраполію. Ордэн з'явіўся ва Украіне ў 1913 годзе. Пасля Першай сусветнай вайны Рэдэмптарысты разгарнулі шырокую місіянерскую дзейнасць, праводзячы рэкалекцыі і іншыя духоўныя справы. У савецкі час знакамітыя імёны сярод рэдэмптарыстаў – мітрапаліт В.Стэрнюк, біскуп Ф.Курчаба, апостальскі візітатар парафій усходняга абраду Мікалай Чарнецкі і інш. За апошнія гады ордэн пашырыў сваю дзейнасць ў Галіччыне, у Цэнтральнай Украіне; праводзіцца служэнне ў Расіі, Іспаніі, Канадзе, ЗША. Беларускія прадстаўнікі таксама прымаюць удзел у дзейнасці ордэна, але манастыроў рэдэмптарыстаў на тэрыторыі Беларусі няма. На сённяшні дзень у Беларусі жывуць і дзейнічаюць 2 манахі-рэдэмптарысты: брат Апалінар Мікалаеў з Брэста, брат Зміцер Чарнэль з Гродна. Манахі-рэдэмптарысты з Беларусі атрымліваюць адукацыю ў Львове [9, с. 10]. Сестраў-рэдэмптарыстак у Беларусі няма.

У 1904 г. галіцкі мітрапаліт Андрэй Шаптыцкі пабудаваў першы манастыр студытаў непадалёк ад Львова, стаўшы яго першым

архімандрытам, а ў 1906 г. напісаў прешы "Тыпікон" [8, с. 9]. Назва "студыты" паходзіць ад Студыйскага уставу, якога прытрымліваюцца гэтыя манахі. Гэты ўстаў яшчэ з Царграда і Афону пераняла першая манаская грамада Пячэрскай Лаўры ў Кіеве, а потым і іншыя манастыры Русі [8, с. 11]. Грэка-католікі вырашылі стварыць ордэн, адносна абраду поўнасцю адпавядаючы ўкладу і традыцыям праваслаўнага манаства. У 1920 г. мітрапаліт Андрэй Шаптыцкі склаў і выдаў для студытаў Тыпікон-Правілы, дзе ва ўступным слове гаворыцца, што студыты змагаюцца за дасканаласць згодна з правіламі Св. Айцоў ды жадаюць зберагчы ўсе манаскія традыцыі Усходу; глыбока паважаюць святыя правілы і пісанні Айцоў: Васіля Вялікага, Пахомія, Макарыя, Бенедзікта, Тэадора Студыта ды з пабожнасцю ставяцца да ўсяго, што яны перадалі [8, с. 11]. Тыпікон мае толькі асноўныя нормы, якія спаўняюцца і зараз. Яго правілы і ўставы могуць быць прыстасаваны да абставін часу, асаблівасцяў Лаўры або асобнага манастыра. У манаскім жыцці ў студытаў, галоўнае не адыходзіць ад прынцыпаў: каб дзейнасць не аддаляла манаха ад манастыра, каб не разрывала яго сувязі з Богам і не турбавала ўнутраны спакой манаха, каб служыла патрэбам царквы. Вельмі важны элемент – жыцце манахаў у супольнасці. Падставай для гэтага з'яўляюцца Дзеі Апосталаў, дзе царква паўстае ўсеагульнай, ва ўсіх – адна душа, адно сэрца [8, с. 9].

Студыйскія манастыры не цэнтралізаваны пад адзінай уладай. Кожная Лаўра з далучанымі да яе манастырамі стварае самастойную адзінку. Між сабою Лаўры могуць ствараць супольную раду – федэрацыю. Лаўрай кіруе ігумен, які выбіраецца пажыццёва. Кожны дзень пачынаецца з малітвы да світанка. Потым – разумовая або фізічная праца, харчаванне і адпачынак чаргуюцца, як у звычайным жыцці. Тыповы распарадак дня такі: 4.30 – пад'ём; 5.00 – Ютрань, Час І, духоўныя чытанні; 6.45 – Час ІІІ, Літургія; 8.30 – снеданне; 9.00 – навука, фізічная праца; 12.15 – Час IV, абед, адпачынак; 14.45 – Час IX; 15.00 – праца; 18.00 – Вячэрня, вячэра, вольны час; 20.15 – Сустрэча братоў, узаемнае прабачэнне; 21.00 – начны адпачынак [8, с. 7 – 8].

У Заходняй Беларусі ў міжваенны час працавалі манахі-студыты з Галіцыі (а. Яўнары Федзюк, а. Нікадзім Стэцура і інш.). Яны мелі свой манаскі дом на Мярлінскіх хутарах на тэрыторыі сучаснага Столінскага раёна.

Сення студыты займаюцца душпастырствам у грэка-каталіцкай парафіі ў Полацку, якая названа ў гонар Язафата Кунцэвіча. Ў справе аднаўлення культу гэтага святога яны адыгралі немалую ролю. Манахі-студыты распачалі пілігрымку з Віцебска ў Полацк у гонар Полацкіх пакутнікаў, якую католікі сёння называюць "дарогай жыцця Беларускай Грэка-каталіцкай Царквы", а таксама пачалі выдаваць беларускую грэка-

каталіцкую газету "Царква". У 2004 г. да супольнасці манахаў студыйскага ўставу належыла чацьвёра беларусаў, трое з якіх склалі малую схіму [5, с. 7]. Сёння на тэрыторыі Беларусі жывуць і дзейнічаюць студыты а. Лявонці Тумоўскі з Полацка і а. Пахом Кавалёў з Мінска. Манахі–студыты з Украіны ў 1995 г. заснавалі ў Полацку мужчынскі грэка-каталіцкі манастыр, дзе зараз ёсць некалькі братоў-манахаў. У 1996 г. была спроба стварыць жаночы манастыр сёстраў студытак, але ён не стаў дзейнічаць.

У грэка-каталіцкай царкве на Беларусі – адзіная жанчына-манахіня. Гэта Вікторыя (Вольга Чэкан). Яна прыняла манаскую схіму ў Свята-Пакроўскім жаночым манастыры студыйскага ўставу 25 лістапада 2004 г., да супольнасці якога яна належыць [3, с. 13]. Гэты манастыр быў заснаваны ў 1924 г. ва Украіне пры дапамозе мітрапаліта Андрэя Шаптыцкага. У гэтым манастыры ўсе манахіні аб'яднаны ў адну супольнасць. Дзень там падзелены на тры роўныя часткі: 8 гадзін працы, 8 – малітвы, 8 – адпачынку. Паводле старажытнай манаскай традыцыі, манахіні моляцца поўнае Царкоўнае правіла, г. зн. Вячэрню, Павячэрніцу, Паўночніцу, Ютрань, Літургію ды Гадзіны. Кожная манахіня ў манастыры працуе згодна са сваімі здольнасцямі: піша іконы, шые, вышывае, вядзе гаспадарку, навучае дзяцей катэхізму або сама навучаецца, тлумачыць кнігі і г.д. Заробак ад працы ідзе на ўтрыманне абіцелі або на дапамогу тым, хто мае патрэбу. Здаўна пры манастырах студытак адкрываліся сірацінцы, якімі апекаваліся сёстры. Гэтым яны займаюцца і зараз. Галоўнае месца ў абіцелях аддадзена малітве, а ўся праца скіравана на службу царкве, яе вернікам адпаведна абставінаў, часу і месца [4, с. 10]. Зараз сястра Вікторыя жыве ў Мінску і дзейнічае пры сакратарыяце Апостальскага Візітатара Сяргея Гаека.

Ордэн марыянаў быў заснаваны ў 1673 г. а. Янам Папчынскім [1, с. 10]. Супольнасць была зацверджана рымскім папаму 1699 г. У той час на балансе ордэна былі тры кляштары і некалькі дзесяткаў манахаў. Першыя марыяне не мелі традыцыі і перспектыў на адукацыю. Марыяне не належылі ў той час да ліку папулярных пустэльных або закрытых ордэнаў, але з'яўляліся душпастырскай супольнасцю. У пачатку ХХ ст. марыяне былі адной з вымiраючых манаскіх супольнасцяў, якіх тады ў Расійскай імперыі было шмат. У той час ў свеце заставалася толькі два марыяніна: а. Сэнкоўскі і Юрый Матулевіч, які фактычна аднавіў ордэн. Асноўнай дзейнасцю ён лічыў аднаўленне Касцёла і евангелізацыю [10, с. 3]. У міжваенны перыяд быў адкрыты марыянскі манастыр у Друі (сучасны Браслаўскі раён), які з'яўляўся духоўным і культурным цэнтрам. Там жылі і працавалі Андрэй Цікота, Фабіян Абрантовіч, Язэп Германовіч, Юры Кашыра [1, с. 10].

Сёння марыяне налічваюць 330 год свайго існавання. Ордэн колькасна разрося, пашырыўся і зараз знаходзіцца ў 19 краінах свету. На 2001 год лічба членаў ордэна складала амаль 600 чалавек. Ад пачатку свайго заснавання марыяне вельмі змяніліся. Яны ўжо не моляцца супольна на брэвіярыі ў хоры, не служаць рэгулярных набажэнстваў за памерлых, не носяць белага хабіту, не выконваюць разнастайных манаскіх практык, якія раней былі часткаю марыянскага супольнага жыцця. Паводле першапачатковай канцэпцыі, супольнасць паўстала, каб дапамагаць у працы пробашчам у парафіях і катэхізаваць простых людзей. Але марыяне паступова перайшлі ад дапамогі пробашчам да самастойнай працы ва ўласных парафіях, да правядзення канкрэтных прыходскіх місій і рэкалекцый, арганізацыі рэкалекцыйных дамоў і санктуарыяў, да кіравання духоўнымі таварыствамі і касцельнымі рухамі, душпастырства ў абрадах Усходніх Цэркваў і экуменізму, а таксама да місіянерскай працы за межамі ўласных краін. У сваю чаргу, катэхізацыя развілася ў кіраванне школамі і ўстановамі, закладанне груп і інтэрнатаў для моладзі, перайшла ў выкладанне ва універсітэтах і ў навуковыя даследванні, публікацыі каталіцкай літаратуры і ўдзелу ў сродках масавай інфармацыі. Марыяне ўсе больш супрацоўнічаюць са свецкімі людзьмі ў розных сферах дзейнасці [10, с. 3 – 6].

На тэрыторыі Беларусі выходзіць альманах "Светач", які рэдагуюць семінарысты ордэна марыянаў. Яго выдае рыма-каталіцкая парафія св. Язэпа ў Оршы [10, с. 2].

Марыяне арганізавалі пілігрымку да санктурыюма Маці Божай Будслаўскай. Упершыню яна прайшла ў 1999 г. Пілігрымка пачынаецца ў Друі, і ўдзельнікі традыцыйна праходзяць праз месцы, звязаныя з дзейнасцю ордэна марыянаў [7, с. 2]. Таксама арганізоўваюцца пілігрымкі з удзелам марыянаў у Росіцу – да месца спалення марыянскіх святароў, у Полацк – да магілы уніяцкіх манахаў-пакутнікаў [7, с. 6]. У Друі марыяне штогод праводзяць рэкалекцыі для моладзі [1, с. 12].

Беларускія марыяне атрымліваюць адукацыю ў марыянскай духоўнай семінарыі ў Любліне (Польшча) разам з прадстаўнікамі іншых краін: Арменіі, Бразіліі, Латвіі, Літвы, Польшчы, Славакіі, Украіны і Чэхіі [7, с. 10].

Сёння найбольш актыўную дзейнасць ў Беларусі вядуць марыяне а. Андрэй Сідаровіч і а. Сяргей Гаек – Апостальскі Візітатар для грэка-католікаў Беларусі.

Беларускія манахі грэка-католікі дзейнічаюць і за мяжой, напрыклад, а. Раман Пентка, які жыве ў Кастамлотах (Польшча). Да студытаў і марыянаў прадстаўнікі іх ордэнаў прыязжаюць з-за мяжы, каб разам каардынаваць працу ордэна.

Такім чынам, ва ўсходнім абрадзе па ўсім свеце дзейнічае шмат манаскіх ордэнаў, але беларускіх грэка-католікаў сярод іх не шмат. На

тэрыторыі самой Беларусі таксама невялікая колькасць манахаў усходняга абраду, і іх дзейнасць паўстае вельмі значнай для ўсей беларускай грэка-каталіцкай царквы.

Спіс крыніц і літаратуры

1. За Хрыста і Касцёл // Светач (Альманах марыянскіх семінарыстаў). – 2000. – № 1. – С. 10 – 12.
2. Катэдральны пляц // Царква. – 1998. – № 3. – С. 15.
3. Манаская схіма сястры Вікторыі // Царква. – 2005. – № 1. – С. 13.
4. Манаства будзе мець перспектывы // Царква. – 2005. – № 3. – С. 10.
5. Манахі-студыты адзначылі 10-годдзе сваёй працы ў Беларусі // Царква. – 2004. – № 3. – С. 7.
6. Нікалаеў, А. Як я стаў рэдэмптарыстам / А. Нікалаеў // Разам (дадатак да газеты «Царква»). – 2005. – № 4. – С. 2.
7. Сідаровіч, А. Праз імглу стагоддзяў / А. Сідаровіч // Светач. – 2001. – № 1. – С. 2 – 12.
8. Студитське чернецтво в Українскій католицкій церкві // Ред. Я. Трояновська. – Рим – Люблин – Львів, 1991. – С. 23.
9. Чарнель, З. Чын Найсьвяцейшага Адкупіцеля / З. Чарнель // Разам. – 2006. – № 1. – С. 10.
10. Шамрыцкі, А. Быць марыянінам сення / А. Шамрыцкі // Светач. – 2001. – № 3. – С. 3 – 6.

Лукашевич Любовь Александровна – аспирант Брестского государственного университета имени А.С. Пушкина.

УДК 27-662.3

А. Крот (Гродна)

СУЧАСНАЕ САЦЫЯЛЬНАЕ ВУЧЭННЕ КАТАЛІЦКАЙ ЦАРКВЫ Ў ЭНЦЫКЛІКАХ БЕНЕДЫКТА XVI

Статья основана на исследовании посланий Папы Римского Бенедикта XVI, в которых вместе с богословской тематикой отражен взгляд Католической Церкви на идеалы построения общества. Главным принципом такого построения должна быть справедливость. Проанализирован взгляд Понтифика на взаимоотношения Церкви и государства, Церкви и общества.

Энцыкліка – пасланне Папы Рымскага, якое прысвячаецца найбольш важным рэлігійным, маральным або грамадска-палітычным пытанням. Энцыклікі звычайна пішуцца на лацінскай мове і называюцца па першых словах лацінскага тэксту [7, с. 359].

За тры гады свайго пантыфікату Бенедыкт XVI напісаў дзве энцыклікі. 25 студзеня 2006 года апублікавана энцыкліка "Deus caritas est" ("Бог ёсць любоў") пра хрысціянскую любоў, а напрыканцы 2007 года з'явіўся новы дакумент Папы – "Spe salvi" ("Збаўленыя ў надзеі"), прысвечаны хрысціянскай надзеі. Падчас прэзентацыі энцыклікі "Spe salvi" кіраўнік прэс-службы Святога Пасаду Фэдэрыка Ламбардзі даў зразумець, што гэтыя энцыклікі з'яўляюцца дзвюма часткамі трыптыху, прысвечанага так званым багаслоўскім цнотам – веры, надзеі і любові [1, с. 3].

Нягледзячы на багаслоўскую тэматыку, абвешчаную ў тытулах дакументаў, яны ўтрымліваюць таксама элементы сацыяльнага вучэння Каталіцкай Царквы. Пад сацыяльным вучэннем Каталіцкай царквы разумеецца сукупнасць сацыяльна-філасофскіх і сацыяльна-багаслоўскіх ведаў аб сутнасці і пабудове чалавечага грамадства, а таксама нормах, якія з гэтай сутнасці вынікаюць і ўжываюцца ў дачыненні да канкрэтных грамадскіх адносін [3, с. 15].

Энцыкліка "Spe salvi" носіць больш тэалагічны характар і ўтрымлівае менш сацыяльных аспектаў. Аднак і ў гэтым дакуменце можна знайсці некалькі важных думак адносна сацыяльнай накіраванасці хрысціянства і прагрэсу грамадства.

Бенедыкт XVI адзначае, што хрысціянства ад часоў свайго ўзнікнення аказвала ўплыў на сацыяльнае жыццё грамадства, несучы змену ў адносінах паміж рознымі слаямі грамадства. "Нават калі не змяніліся знешнія структуры, грамадства змянілася ўнутры", – адзначае Святы Айцец. У першыя стагоддзі станаўлення веры хрысціяне прызнавалі, што тагачаснае грамадства іх не задавальняе, што яны належаць да іншага грамадства – Валадарства Божага. Іх паводзіны ў зямным жыцці ўжо прадказвалі гэтае будучае грамадства і знутры змянялі жыццё і свет [9, с. 7].

Бенедыкт XVI разважае над значэннем і сутнасцю прагрэсу. Пачынаючы з эпохі Асветы, цэнтральнае месца ў ідэі прагрэсу займаюць дзве катэгорыі: розум і свабода. Прагрэс, перш за ўсё, разумеецца як панаванне розуму і развіццё ў накірунку дасканалай свабоды. Палітычнае значэнне, якое мысляры эпохі асветніцтва ўкладалі ў гэтыя тэрміны, – чаканне валадарства розуму як формы існавання чалавецтва, якое стала цалкам вольным [9, с. 21]. Папа палемізуе з такім бачаннем прагрэсу, згадваючы словы Тэадора Адорно, што прагрэс розуму – гэта прагрэс ад прашчы да мегабомбы [9, с. 24]. На думку Святога Айца, тэхнічны і грамадскі прагрэс мусяць ісці разам з прагрэсам этычным, "узрастаннем унутранага чалавека" [9, с. 25]. Розум, для таго, каб быць сапраўдным рухавіком прагрэсу, патрабуе выхавання здольнасці распазнавання дабра і зла. Таксама і сапраўдная свабода, якая з'яўляецца гарманічным спалучэннем розных свабодаў, патрабуе здольнасці да ўнутранай ацэнкі [9, с. 25; 1, с. 2].

Асабліва багатая на сацыяльныя аспекты энцыкліка "Deus caritas est". У ёй Бенедыкт XVI у кантэксце разважанняў пра дабрачынную дзейнасць Царквы і справядлівасць грамадства закранае такія важныя пытанні, як

сутнасць палітыкі, удзел хрысціян у палітычным жыцці, адносіны паміж Царквой і дзяржавай, роля Царквы ў пабудове справядлівага грамадства.

Справядлівы лад у грамадстве Бенедыкт XVI лічыць асноўнай мэтай палітыкі. Услед за святым Аўгустынам Папа параўноўвае грамадства, якое не кіравалася б справядлівасцю, з вялікай бандай злачынцаў. Справядлівасць Святы Айцец называе мэтай і ўнутранай мерай палітыкі. Сама ж палітыка, згодна з навучаннем Бенедыкта XVI, з'яўляецца прыладай для ўсталявання грамадскага парадку [8, с. 40 – 41].

Важным элементам пабудовы справядлівага грамадства Бенедыкт XVI лічыць веру, якую называе ачышчальнай сілай розуму. Яна неабходная ўсім тым, хто, займаючыся палітыкай, задае сабе пытанне: як рэалізаваць справядлівасць тут і цяпер, а таксама пытанне больш радыкальнае: што такое справядлівасць? Перашкодай для слушнага адказу на гэтыя пытанні Бенедыкт XVI лічыць этычнае асляпленне з-за таго, што на першае месца чалавек ставіць не сумленне, а прагу выгады і ўлады. Ачышчальнай сілай для розуму з'яўляецца вера, якая, кіруючыся Божым законам, вызваляе розум ад асляплення і дапамагае яму быць сабой [8, с. 41 – 42]. Грамадскае вучэнне Царквы імкнецца зрабіць патрабаванні справядлівасці зразумелымі і палітычна рэальнымі. Яно служыць фармаванню сумленнай палітыкі, уплывае на фармаванне чуйнасці на сапраўдныя патрабаванні справядлівасці і гатоўнасці да рэакцыі, абапіраючыся на іх нават тады, калі гэта супярэчыць асабістай карысці [8, с. 42].

Погляд Святога Айца на дзяржаву фармуецца ў духу прынцыпаў сацыяльнага вучэння Каталіцкай Царквы. У дзейнасці дзяржавы важнае значэнне Бенедыкт XVI надае прынцыпу садзейнічання – немагчыма абараняць годнасць асобы, не клапоцячыся пра сям'ю, групы, асацыяцыі, тэрытарыяльныя лакальныя супольнасці і г.д, якія ствараюцца людзьмі спантанна і даюць ім магчымасць сапраўднага сацыяльнага росту [5, с. 128]. Дзяржава мусіць заўважаць і падтрымліваць ініцыятывы, якія рэалізуюцца рознымі грамадскімі рухамі. Дзяржава, якая хоча забяспечыць усіх усім і ўсё бярэ на сябе, у рэшце рэшт становіцца бюракратычнай інстанцыяй, якая не можа задаволіць найістотнейшых патрэб чалавека, які знаходзіцца ў патрэбе: не можа даць поўнага любові асабістага прысвячэння. Святы Айцец крытыкуе меркаванне, што справядлівыя дзяржаўныя структуры зрабілі б непатрэбнай дабрачынную дзейнасць. Тыя, хто так выказваецца, прытрымліваюцца матэрыялістычнай канцэпцыі чалавека і прыніжаюць яго, не прызнаючы менавіта таго, што з'яўляецца спецыфічна чалавечым – патрэбу ў любові [8, с. 43 – 44].

Бенедыкт XVI не толькі не абвяргае неабходнасць палітычнай дзейнасці, але, наадварот, высока яе ацэньвае, называючы "грамадскай любоўю" [8, с. 45]. Свецкія вернікі, як грамадзяне сваёй краіны,

пакліканыя да ўдзелу ў грамадскім жыцці, таму не могуць адмаўляцца ад удзелу ў розных гаспадарчых, грамадскіх і заканадаўчых ініцыятывах, якія служаць супольнаму дабру: сукупнасці тых умоваў сацыяльнага жыцця, якія дазваляюць і супольнасцям, і асобным іх членам больш хуткае і поўнае ўласнае ўдасканаленне [4, с. 443]. Місія свецкіх вернікаў заключаецца ў тым, каб належным чынам фармаваць грамадскае жыццё, шануючы яго законную аўтаномію і супрацоўнічаць у гэтым з іншымі грамадзянамі [8, с. 45].

У адносінах паміж Царквой і свецкімі грамадскімі інстытутамі Бенедыкт XVI, згодна з навучаннем II Ватыканскага сабора, выступае за аўтаномію зямных вартасцяў: усё створанае, у тым ліку грамадства, мае свае законы і свае вартасці, якія чалавек мусіць вывучаць, выкарыстоўваць і накіроўваць [2, с. 360]. Дзяржава не можа навязваць рэлігію, але павінна гарантаваць ёй свабоду, а таксама супакой паміж вызнаўцамі розных рэлігій. У сваю чаргу, Царква, як грамадскі інстытут, мусіць таксама мець пэўную незалежнасць, якую дзяржава павінна шанаваць [8, с. 41].

Паводле Бенедыкта XVI, Царква не можа і не павінна ўступаць у палітычную барацьбу і займаць месца дзяржаўнай улады, каб стварыць больш справядлівае грамадства. Аднак Царква не павінна таксама заставацца ў баку ад барацьбы за справядлівасць. Важнае значэнне мае дабрачынная дзейнасць Царквы, якая будзе неабходнай нават у самым справядлівым грамадстве. "Не існуе такога справядлівага дзяржаўнага ладу, які б мог зрабіць служэнне любові непатрэбным", – піша Папа [8, с. 43].

Бенедыкт XVI лічыць, што на глебе будавання справядлівага грамадства могуць узнікаць новыя плённыя формы супрацоўніцтва паміж дзяржаўнымі і царкоўнымі ўстановамі. Царкоўныя ўстановы могуць актывізаваць грамадскія ініцыятывы і спрыяць агульнай каардынацыі ўсіх установаў, якія займаюцца дабрачынным служэннем. Абавязковым элементам для супрацоўніцтва царкоўных і свецкіх інстытутаў Папа лічыць празрыстасць [8, с. 47 – 48].

На Беларусі сацыяльнае вучэнне Бенедыкта XVI яшчэ чакае вывучэння і рэалізацыі. Як заўважае малады беларускі тэолаг Пётра Рудкоўскі, сацыяльнае вучэнне, побач з экуменізмам, з'яўляецца адным з выклікаў Каталіцкай Царкве на Беларусі [6, с. 159]. Каталіцкая перыёдыка да апошняга часу або не ўзгадвала пра сацыяльныя моманты энцыклік, або не засяроджвала на іх асаблівай увагі. Напрыклад, у артыкуле, прысвечаным "Deus caritas est" у часопісе "Ave Maria", толькі два абзацы тычацца сацыяльнага вучэння. Дакументы Святога Айца выдаюцца невялікімі накладамі. "Deus caritas est" выйшла па-беларуску накладам толькі ў тысячу экзэмпляраў, асобнага выдання "Spe salvi" няма да гэтай пары. Аднак ёсць і пазітыўныя тэндэнцыі: беларускія пераклады

дакументаў Святога Айца з'яўляюцца дастаткова апаратыўна (беларускае выданне "Deus caritas est" падпісана да друку праз некалькі тыдняў пасля публікацыі арыгіналу энцыклікі). Зацікаўленасць вучэннем Святога Айца з боку іерархіі Каталіцкай Царквы на Беларусі можна заўважыць у апублікаваным некаторымі каталіцкімі часопісамі каментары мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча да энцыклікі "Spe salvi", які звяртае ўвагу на вышэй азначаныя сацыяльныя моманты дакумента.

Спіс крыніц і літаратуры

1. Кандрусевіч, Т., арцыбіскуп. Надзея сучаснага чалавека. Каментар да энцыклікі Бэнэдыкта XVI « Spe salvi» / Т.Кандрусевіч //Ave Maria. – 2007. – №12.
2. Второй Ватиканский Собор. Конституции. Декреты. Декларации. – Брюссель, 1992.
3. Хёффнер, Й., кардинал. Христианское социальное учение / Й.Хёффнер. – М., 2004.
4. Катехизис Католической Церкви. – Milano, 1997.
5. Компендиум социального учения Церкви. – Paoline, 2006.
6. Рутkoўскі, П. Паўстаньне Беларусі / П. Руткоўскі. – Вільня, 2007.
7. Рэлігія і царква на Беларусі: энцыклапедычны даведнік. – Мінск, 2001.
8. Энцыкліка DEUS CARITAS EST Святога Айца Бэнэдыкта XVI да біскупаў, прэсбітэраў і дыяканаў, да асоб кансэкраваных і да ўсіх свецкіх вернікаў пра хрысціянскую любоў. – Гродна, 2006.
9. Encyklika SPE SALVI Ojca Świętego Benedykta XVI do biskupów, prezbiterów i diakonów, do osób konsekrowanych i wszystkich wiernych świeckich o nadziei chrześcijańskiej. – Poznań, 2007.

Крот Андрэй – магістр тэалогіі, Грэка-каталіцкая парафія Маці Божай Фацімскай.

УДК 265.5

І.В. Данільчык (Гродна)

СЯМ'Я ЯК «МАЛАЯ ЦАРКВА»: ПРАВАСЛАЎНАЕ ВУЧЭННЕ ПРА ШЛЮБ І СЯМЕЙНЫЯ АДНОСІНЫ (НА АСНОВЕ «САЦЫЯЛЬНАЙ КАНЦЭПЦЫІ РУСКАЙ ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВЫ»)

В статье рассматривается позиция Русской Православной церкви в вопросах брака и семьи. Представлен взгляд на проблемы взаимоотношений мужчины и женщины, государства и семьи. Анализируется понятие о христианском браке.

У жніўні 2000 г. Архірэйскі Сабор Рускай Праваслаўнай Царквы зацвердзіў «Асновы сацыяльнай канцэпцыі Рускай Праваслаўнай Царквы». Прынящце гэтага дакумента чакалі даўно. З пачаткам 90-х гг.

XX ст. наша Царква з перыферыі грамадскага жыцця, дзе яна вымушана была знаходзіцца некалькі дзесяцігоддзяў, трапіла ў самы яго цэнтр. Такое месца Царквы ў жыцці грамадства патрабавала распрацоўкі сучасных падыходаў да яе місіі ў зьмяніўшыхся палітычных і сацыяльных умовах існавання. Старыя дарэвалюцыйныя мадэлі ўзаемаадносін Царквы і асобы, Царквы і грамадства былі ўжо не актуальнымі.

Тады яна была часткай дзяржаўнай структуры, і яе правы і прывілеі гарантаваліся законам. Цяпер яе служэнне праходзіць у складаным грамадскім асяроддзі, якое часта называюць то постатэістычнім, то постхрысціянскім, то секулярным. Неабходна было сфармуляваць агульныя прынцыпы адносінаў Царквы да надзённых праблем розных сфер чалавечай дзейнасці і даць ім адпаведную ацэнку. Праца была не простай і цягнулася некалькі гадоў (з 1994 па 2000).

Што такое чалавечая сям'я? Якое значэнне яна мае ў асабістым і грамадскім жыцці людзей і цэлых народаў? Які сэнс надае Гасподзь саюзу мужчыны і жанчыны? Пра гэта задумваецца кожнае пакаленне роду чалавечага.

На скрыжалях Завета, якія атрымаў ад Бога Маісей, тры запаведзі з дзесяці прысвечаны фундаментальным прынцыпам сямейнага быцця. Дзве з іх кажуць: «Шануй бацьку твайго і маці тваю. Не пралюбадзействуй. Не забівай» (Зых. 20:12, 13–14). У Евангеллі Хрыстовым закон становіцца яшчэ больш строгім у пытаннях развода, дазваляючы яго толькі ў выпадку пралюбадзяяння: «Маісей з-за жорсткасці сэрца вашага дазволіў вам разводзіцца з жонкамі вашымі», – гаворыць Збавіцель і падкрэслівае, что «спачатку не было так» (Мф. 19:8). Мы чуем з вуснаў Сына Божага новае, глыбокае і дакладна выразнае азначэнне сям'і: «Пакіне чалавек бацьку і маці і прылепіцца да жонкі сваёй, і будуць двое плоццю адною, так што яны ўжо не двое, а адна плоць. Дык вось, што Бог злучыў, таго чалавек няхай не разлучае» (Мф. 19: 5–6). У гэтых словах змяшчаюцца багаслоўскія і псіхалагічныя, біялагічныя і сацыяльныя асновы як агульнага вучэння ад сям'і, так і штодзённай практыкі сямейнага жыцця.

Адрозненне паміж поламі ёсць асаблівы дар Творцы, створаным Ім людзям. Конецформыначалоформы «І стварыў Бог чалавека паводле вобразу Свайго, паводле вобразу Божага стварыў яго; мужчыну і жанчыну стварыў іх» (Быц. 1:27). З'яўляючыся ў аднолькавай ступені носьбітамі вобраза Божага і чалавечай годнасці, мужчына і жанчына створаны для цэласнага яднання адзін з адным у любові: «конецформыначалоформы Таму пакіне чалавек бацьку свайго і маці сваю і прылепіцца да жонкі сваёй; і будуць адна плоць» (Быц. 2:24). Выконваючы гэту волю Божую аб тварэнні, благаслаўлёны Ім сямейны

саюз становіцца сродкам прадаўжэння і памнажэння чалавечага роду: «конецформыначалоформыI благаславіў іх Бог, і сказаў ім Бог: пладзіцеся і множцеся, і напаўняйце зямлю і валодайце ёю» (Быц. 1.28). Асаблівасці полаў не абмяжоўваюцца адрозненнямі толькі фізічнай іх будовы. Мужчына і жанчына ўяўляюць сабой два розных вобразы існавання ў адзіным чалавецтве. Яны маюць патрэбу адзін у адным, гарманічна дапаўняючы адзін аднаго, нібы дзве паловы адзінага цэлага. Аднак пасля грэхападзення ў нашым пашкоджаным грахом свеце адносіны полаў могуць скажацца, перастаючы быць пры гэтым выражэннем Богам дадзенага пачуцця любові і становячыся праяўленнем празмернай прыхільнасці грэшнага чалавека да свайго ўласнага «Я».

Высока ацэньваючы подзвіг добраахвотнага цнатлівага бязшлюбнага жыцця, прымаемага дзеля Хрыста і Евангелля, і адзначаючы асаблівую ролю манашаства ў сваёй гісторыі і сучасным жыцці, Царква ніколі не ставілася да шлюбу зневажальна і асуджала тых, хто з-за няправільна зразумелага імкнення да чысціні нораваў прыніжаў шлюбныя адносіны.

Апостал Павел, які асабіста для сябе абраў цнатлівае жыццё і заклікаў іншых пераймаць яго прыклад (1Кар.7.8), тым не менш, асуджае «конецформыначалоформыкрывадушнасць ашуканцаў, што спалілі сумленьне сваё, якія забараняюць браць шлюб» (1 Цім. 4.2–3). Пяцьдзесят першае Апостальскае правіла сведчыць: «Калі хто пазбягае шлюбу не з-за імкнення да подзвігу ўстрымання, а з-за таго, што грэбуе ўступаць у шлюб, забываючы пры гэтым, што Бог стварыў мужчыну і жанчыну, і такім чынам, выказваючы хулу на Творцу, узводзіць паклёп на Яго стварэнне, – такі або пакаецца і выправіцца, або будзе пазбаўлены святарскага сану ці адлучаны ад Царквы».

Згодна з рымскім правам, якое пакладзена ў аснову грамадзянскіх кодэксаў большасці сучасных дзяржаваў, шлюб з'яўляецца пагадненнем паміж двума вольнымі ў сваім выбары бакамі. Царква ўспрыняла гэтае азначэнне шлюбу, асэнсавала яго, зыходзячы са сведчання Святога Пісання.

Рымскі юрыст Мадэстын у III ст. пасля Нараджэння Хрыстова даў наступную дэфініцыю шлюбу: «Шлюб ёсць саюз мужчыны і жанчыны, агульнасць іх сумеснага жыцця, іх аднолькавы ўдзел у боскім і чалавечым праве». У практычна нязмененым выглядзе гэта азначэнне ўвайшло ў кананічныя зборнікі Праваслаўнай Царквы. Раннехрысціянскія айцы і вучыцелі Царквы таксама абапіраліся на рымскія ўяўленні пра шлюб. Так, напрыклад, Афінагор у сваёй Апалогіі да імператара Марка Аўрэлія, напісанай у II ст. пасля Нараджэння Хрыстова, піша: «Кожны з нас лічыць сваёю жонкай тую жанчыну, з якой ён ажаніўся згодна з законам».

«Апостальскія пастанаўленні», царкоўны юрыдычны помнік IV ст., загадваюць хрысціянам «уступаць ў шлюб згодна з законам».

Хрысціянства дапоўніла язычніцкія і старазапаветныя ўяўленні пра шлюб узвышаным вобразам саюза Хрыста і Царквы. Для хрысціян шлюб стаў не проста юрыдычнай дамоўленнасцю, сродкам прадаўжэння роду і задавальненнем часовых прыродных запатрабаванняў, але, па словах свяціцеля Іаана Златавуста, «таінствам любві», вечным яднаннем мужа і жонкі ў Хрысце. Першапачаткова хрысціяне ўмацоўвалі шлюб царкоўным благаславеннем і сумесным удзелам у Еўхарыстыі, што з'ўлялася самай старажытнай формай здзяйснення Таінства шлюбу.

Агульнасць веры мужа і жонкі, якія з'яўляюцца членамі цела Хрыстова, ёсць найважнейшая ўмова сапраўднага хрысціянскага і царкоўнага шлюбу. Толькі адзіная ў веры сям'я можа стаць «дамашняю Царквою» (Рым. 16.5; Флм. 1.2), у якой муж і жонка разам з дзецьмі ўзрастаюць у духоўным удасканаленні і пазнанні Бога. Адсутнасць аднадумства ўяўляе сур'ёзную пагрозу цэласнасці шлюбнага саюза. Менавіта таму Царква лічыць сваім абавязкам заклікаць вернікаў уступаць у шлюб «толькі ў Госпадзе» (1Кар. 7.39), гэта значыць з тымі, хто падзяляе і паважае іх хрысціянскія перакананні.

Словы апостала Паўла пра сям'ю як пра «малую Царкву» (Рым.16:4) разумець трэба не толькі метафарычна. Гэта перш за ўсё сведчанне анталагічнае: сапраўдная царкоўная сям'я па сутнасці сваёй павінна быць і можа быць малой Царквой Хрыстовай. Як казаў свяціцель Іаан Златавуст: «Шлюб ёсць сімвалічная выява Царквы» Што гэта значыць?

Па-першае, у жыцці сям'і спраўджваюцца словы Хрыста Збавіцеля: «… Дзе двое або трое сабраны ў імя Маё, там Я пасярод іх» (Мф.18: 20). І хаця двое або трое вернікаў могуць быць сабраны і без утварэння сям'і і шлюбнага саюза, але яднанне двух закаханых у імя Госпада – безумоўна, фундамент, аснова хрысціянскай сям'і. Калі ў цэнтры сям'і – не Хрыстос, а хто-небудзь або што-небудзь іншае, нельга казаць, што такая сям'я з'яўляецца хрысціянскай. У гэтым сэнсе яна недасканалая. Сапраўдны хрысціянскі шлюб – гэта саюз мужа, жонкі, дзяцей, бацькоў, унутры якога адносіны будуюцца па ўзору саюза Хрыста і Царквы: «…Жонкі, будзьце паслухмяныя сваім мужам, як Госпаду, бо муж ёсць галава жонкі, як і Хрыстос – галава Царквы, і Ён жа Збавіцель цела. Але як Царква слухаецца Хрыста, так і жонкі сваіх мужоў ва ўсім. Мужы, любіце сваіх жонак, як і Хрыстос палюбіў Царкву і аддаў Сябе за яе, каб асвяціць яе, ачысціўшы купеллю новага быцця, праз слова; каб прадставіць яе Сабе слаўнаю Царквою, бяз нечыстаты, без заганы, або чаго-небудзь падобнага, а каб яна была святая і беззаганная. Так павінны мужы любіць сваіх жонак, як сваё цела: хто любіць сваю жонку, любіць самога сябе. Бо

ніхто ніколі не меў нянавісці да сваёй плоці, а корміць і грэе яе, як і Гасподзь Царкву; бо мы часткі Цела Яго, ад плоці Яго і ад касцей Ягоных. Таму «пакіне чалавек бацьку свайго і маці і прылепіцца да жонкі сваёй, і будуць двое адна плоць». Тайна гэтая вялікая: я кажу пра Хрыста і пра Царкву» (Эф. 5:20–33)

Па-другое, у сям'і непазбежна рэалізуецца закон, які, згодна з самім сямейным ладам жыцця, з'яўляецца законам і для ўсёй Царквы і грунтуецца на словах Хрыста Збавіцеля: «Па тым пазнаюць усе, што вы мае вучні, калі любоў будзеце мець паміж сабою» (Іаан. 13:35) і на словах апостала Паўла, якія дапаўняюць вышэй прыведзеную фразу: «Адзін аднаго цяжары насіце, і такім чынам выканаеце закон Хрыстоў» (Гал. 6:2). Гэта значыць, у аснове сямейных адносін – самаахвярная адданасць адзін аднаму і высакароднае каханне. Такое каханне, калі не я ў цэнтры свету, а той, каго я кахаю. І гэта добраахвотнае выдаленне сябе з цэнтру свету ёсць абавязковая ўмова і свайго ўласнага збаўлення, і паўнавартаснага жыцця хрысціянскай сям'і.

Сям'я, у якой любоў і каханне як узаемнае жаданне выратавання адзін аднаго і дапамогі ў справе збаўлення душы таго, хто знаходзіцца побач, і ў якой адзін дзеля другога ва ўсім сябе абмяжоўвае, адмаўляецца ад таго, што хочацца менавіта яму, – гэта і ёсць «малая царква». І тады тое таемнае, містычнае, што аб'ядноўвае мужчыну і жанчыну і што ніяк не абмяжоўваецца адным толькі фізічным, цялесным бокам іх узаемаадносін, тое адзінства нават думак і самога агульнага жыцця, якое ёсць у мужа і жонкі, якія сапраўды кахаюць адзін аднаго і прайшлі ўжо доўгі сумесны жыццёвы шлях, становіцца сапраўдным узорам таго яднання ўсіх адзін з адным у Богу, якім з'яўляецца перамагаючая і ўрачыстая Царква Нябесная.

Асабліва ўнутранае падабенства сям'і і Царквы бачна ўжо з таго, што ў Святым Пісанні Хрыстос гаворыць пра Сябе як пра жаніха (Мф. 9:15, 25:1 – 13; Лк. 12:35–36), а Царква на старонках Бібліі называецца Яго жонкаю і нявестаю (Эф. 5:24; Адкр. 21.9). Клімент Александрыйскі называе сям'ю, як і Царкву, «домам Гасподнім», а святіцель Іаан Златавуст – «малою царквой», якую ўтвараюць аб'яднаныя шлюбам мужчына і жанчына, што кахаюць адзін аднаго і разам імкнуцца да сумеснага жыцця паводле хрысціянскай веры. Вынікам іх кахання і сямейных адносінаў становіцца з'яўленне дзяцей, нараджэнне і выхаванне якіх лічыцца, згодна з праваслаўным вучэннем, адной з галоўных мэтаў шлюбу.

«Вось спадчына ад Госпада: дзеці; узнагарода Ягоная – плод ад улоння», – усклікае цар і прарок Давід у Псалтыры – адной з самых мудрых кніг Старога Запавету (Пс. 126:3). Аб неабходнасці і

выратавальнасці нараджэння дзяцей гаворыць і апостал Павел (1Цім. 2:13). Ён жа звяртаўся да бацькоў: «Не раздражняйце дзяцей вашых, а выхоўвайце іх у навуцы і настаўленні Гасподнім» (Еф. 6.4). «Дзеці – не выпадковы здабытак, мы нясем адказнасць за іх… Нядбанне аб дзецях – вялікі грэх. Няма нам апраўдання, калі дзеці ў нас разбэшчаныя», – павучае святіцель Іаан Златавуст. Прападобны Яфрэм Сірын вучыць: «Добра робіць той, хто выхоўвае дзяцей у адпаведнасці з Законам Божым». «Сапраўдныя бацькі не тыя, што нарадзілі, а тыя, што добра выхавалі і навучылі», – піша святіцель Ціхан Задонскі. «Бацькі, галоўным чынам, адказныя за выхаванне сваіх дзяцей і віну за іх дрэнныя ўчынкі не павінны ўскладаць ні на каго, акрамя сябе», – прапаведаваў свяшчэннамучанік Уладзімір, мітрапаліт Кіеўскі. «Шануй бацьку твайго і маці тваю, каб падоўжыліся дні твае на зямлі», – загадвае пятая запаведзь Закона Божага (Зых. 20:12). У Старым Запавеце зневажальныя адносіны да бацькоў лічыліся вялікім злачынствам (Зых. 21:15,17; Прытч. 20:20; 30:17). Новы Запавет таксама вучыць дзяцей любіць сваіх бацькоў і быць паслухмянымі ім: «Дзеці, слухайцеся бацькоў вашых ва ўсім, бо гэта даспадобы Госпаду» (Кал. 3:20).

Сям'я як «малая царква» – гэта адзіны арганізм, члены якога жывуць і будуюць адносіны паміж сабой на падставе закона любові да бліжняга. Вопыт сямейнага жыцця дапамагае чалавеку ў пераадоленні грахоўнага эгаізму і кладзецца ў аснову здаровай грамадзянскасці. Менавіта ў сям'і фармуюцца і ўсведамляюцца правільныя адносіны да таго, хто знаходзіцца побач, а гэта значыць і да свайго народа, і да грамадства ў цэлым. Жывая пераемнасць пакаленняў, што пачынаецца ў сям'і, атрымлівае свой працяг у павазе да продкаў, у адданасці Радзіме, у шанаванні сваёй гісторыі. Таму вельмі небяспечным з'яўляецца знішчэнне традыцыйных сувязяў бацькоў і дзяцей, якому, на жаль, шмат у чым спрыяе лад жыцця сучаснага грамадства. Прыніжэнне сацыяльнай ролі бацькоўства і мацярынства ў параўнанні з поспехамі мужчын і жанчын у прафесійнай сферы вядзе да таго, што дзеці пачынаюць успрымацца як непатрэбны цяжар. Гэта садзейнічае таксама распаўсюджанасці ў грамадстве атмасферы адчужанасці і развіццю антаганізму паміж пакаленнямі. Выключнай з'яўляецца роля сям'і ў працэсе фармавання, станаўлення і сталення чалавечай асобы. У гэтым яна не можа быць заменена ніякім іншым сацыяльным інстытутам. Разбурэнне сямейных сувязяў непазбежна выклікае парушэнні нармальнага развіцця дзяцей і адмоўным чынам ўплывае на іх далейшае жыццё і сацыяльны лёс.

Аказваючы такім дзецям духоўную і матэрыяльную дапамогу, праяўляючы клопат пра іх зварот да нармальнага духоўнага і сацыяльнага жыцця, Царква адначасова бачыць сваім абавязкам умацаванне сям'і і тлумачэнне бацькам іх правоў і абавязкаў. Царква заклікана супрацьстаяць заганнаму ладу жыцця, які разбурае цэласнасць чалавечай асобы, выхоўваць у моладзі цнатлівае пачуццё і рыхтаваць юнацтва да стварэння моцнай сям'і, заснаванай на ўзаемнай вернасці і чысціні адносінаў.

Спіс крыніц і літаратуры

1. Библия. Книги Священного Писания Ветхого и Нового Завета. – М., 2004.
2. Златоуст Иоанн, святитель. Учение о семье и браке / И/ Златоуст. – Сергиев Посад, 1996.
3. Мейендорф, Иоанн, протоиерей. Введение в святоотеческое богословие / И.Мейендорф. – Минск, 1999.
4. Основы социальной концепции Русской Православной Церкви. – М., 2000.

Данільчык Ігар – клірык Свята-Барыса-Глебскай (Каложскай) царквы.

УДК 27-452(476)

Н.Н. Жолнеркевич (Минск)

ХРИСТИАНСКИЙ И «ГРАЖДАНСКИЙ» БРАК В СОВРЕМЕННОЙ БЕЛАРУСИ

Процессы в современной культуре приводят к трансформации основополагающих моральных, религиозных, правовых принципов развития общества. В статье на примере белорусского общества анализируются противоречия между христианской традицией семьи и нетрадиционными формами гражданского брака, основанного на понятии о так называемой «свободной любви».

В современной культуре происходит множество трансформаций, затрагивающих различные сферы. Традиционные моральные, религиозные, политические идеалы исчезают или перестают играть значимую роль в обществе, что проявляется в новых формах отношений и поведения. Особенно ярко изменения в обществе отражаются в семье, которую можно считать «катализатором» настроения эпохи, поскольку

именно здесь закладываются ценности, на которых воспитывается новое поколение.

Ситуацию, которая складывается в современной Беларуси по отношению к идеалу брака можно охарактеризовать как противоречивую. С одной стороны, христианские ценности имеют значение в формировании и функционировании семьи, что выражается в увеличении числа церковных таинств венчания среди молодежи, крещении младенцев, воспитании детей в христианских традициях. С другой стороны, вырабатываются новые формы отношений между полами, в которых трансформированы и искажены традиционные ценности. К таким формам можно отнести так называемые «гражданский брак», «свободную любовь», «виртуальные отношения», за которыми стоит поиск альтернативных стратегий взаимодействия полов.

В нашей культуре трансформация традиционных ценностей семьи и брака отражается в сосуществовании традиционной (христианской, церковной); гражданской (регистрируемой в ЗАГСе) и новой формы так называемого «гражданского» брака – «конкубината» (совместного проживания мужчины и женщины без церковной или государственной регистрации). В данном исследовании, мы обратим внимание на раскрытие «крайних» форм взаимоотношений: христианского брака и его противоположности – так называемого «гражданского» брака, что позволит нам понять некоторые тенденции современной культуры и показать, каковы альтернативные пути построения взаимоотношений в семье. При сравнении двух форм взаимоотношений мы руководствовались следующими вопросами: что является основанием, какова форма (структура) и цель создания семьи.

В «гражданском» браке основанием отношений является изначальная симпатии, любовь и, чаще всего, сексуальная совместимость. Мужчина и женщина по взаимному согласию желают быть вместе, но, тем не менее, не до конца доверяют этому желанию, поскольку решают проверить чувства и испытать свою любовь совместным проживанием. При этом особенностью здесь является то, что решение о совместном проживании может принять как мужчина, так и женщина (в то время как традиционные формы брака основаны на предложении мужчины взять женщину в жены).

Основанием для вступления в христианский брак является желание создания полноценной семьи, что предполагает долгий (а не пробный) совместный путь, на котором встречаемые трудности брачующиеся готовы нести вместе. Самым главным при решении заключить брак является понимание ответственности в ведении семейной жизни не только друг перед другом, но и перед Богом, что выражается в произнесении брачных обетов.

В «гражданском» браке подчеркивается идея партнерства и свободы мужчины и женщины. Партнерство предполагает, что отношения существуют до тех пор, пока одна из сторон не решит их прекратить. Отсюда же и привлекательность второй составляющей – свободы, отсутствием чего в зарегистрированных отношениях (или «штампом» как цепями несвободы) тяготятся молодые люди. При этом свобода понимается как освобождение от обязательств (имущественных, моральных) по отношению друг к другу, отсутствии «скрепляющего» элемента, которым чаще всего становится ребенок, представляющий угрозу дальнейшим «свободным» отношениям. Интересно то, что «гражданский» брак, несмотря на изначальное противопоставление официальному брачному союзу, внешне стремится сохранить форму брака, что выражается как в самом его наименовании, так и в названии партнеров-сожителей – мужем и женой. Это объясняется тем, что до конца расстаться с традиционными формами взаимоотношений между полами в «гражданском» браке не стремятся, надеясь (в большей степени это касается женщин) на завершение данного союза созданием семьи, при этом нередко закрепляя данный брак таинством церковного венчания. Оценивая такую ситуацию, С. Аверинцев говорил о том, что современное общество страдает от «дефицита Любви», борется против ее окончательной утраты, против «холодного» и «отчужденного» мира во имя «какого-то «тепла», хотя бы и «звериного»«, что облекается на Западе (да и у нас также) в форму сексуальной революции» [1, с. 122]. Данная свобода в отношениях между полами оборачивается произволом и, по мысли Н. Бердяева, связана с негативным, неправильным пониманием свободы как таковой. Свобода «от» (запретов, «штампов», детей и т.д.) связана прежде всего с поиском освобождения от внешних ограничителей, при этом внутренняя свобода остается невостребованной. Утрачивается тайна пола и выносится на всеобщее обозрение оболочка, которая ошибочно принимается за суть: глубина, «интимность» (сокрытость) переходит в сферу «интима», любовь из таинства превращается в механический и «временный» процесс. Игра, симуляция, ирония как элементы современной культуры, проникая в сферу отношений между мужчиной и женщиной, лишают их главного – живого чувства любви и понимания тайны Другого. Свобода для самораскрытия, творчества, понимания глубины другой личности – то, от чего отказывается «гражданский» брак и к чему призывает христианский.

Таинство христианского брака, как и любое таинство церкви, имеет связь с Богом. Само понимание таинства связано со священнодействием, в котором «происходит встреча Бога с человеком и наиболее полно, насколько возможно в земной жизни, осуществляется единение с ним» [4, с. 150]. Именно такое понимание таинства венчания необходимо давать

всем вступающим в брачный союз, для того, чтобы показать его суть. Брак, являясь таинством, также обнаруживает в себе видимую и невидимую стороны. Видимыми являются брачующиеся, священник, совершающий таинство, и свидетели, подтверждающие подлинность совершения брака и даваемых супругами обещаний. Невидимой стороной брака является единение в «одну плоть» через присутствие Бога, который есть Любовь, соединение с Ним в таинстве Евхаристии и символическое уподобление союзу Христа и Церкви. Данное таинственное значение брака имеет одну общую составляющую. Брак становится не только земным и временным установлением, но имеет вневременное, непреходящее значение и обретает смысл в вечности. По словам митрополита Антония, брак – есть «единство и образ вечной жизни» [2, с. 17].

«Гражданский брак» своей целью ставит комфорт, проверку отношений, и в итоге – совместную жизнь либо поиск другого партнера. То есть цель – быть вместе с другим, но не обязательно с данным, конкретным партнером. В христианстве акцент ставится на уникальности каждой конкретной личности и на нерасторжимости брака, в котором супруги призваны прийти к его главной цели и ценности – любви, возвышающей человека до тайны Любви. Как отмечает современный богослов П. Евдокимов, «человеческая любовь зажигается от Божественной любви, они одного и того же происхождения, они *единосущны,* в одной присутствует другая» [3, с. 218].

В статье представлен оригинальный взгляд на культурно-историческую роль Франциска Скорины в становлении эпохи Ренесанса на белорусских землях. Философский анализ литературного наследия Скорины раскрывает общехристианские мотивы в творчестве первопечатника. В статье дается ответ на вопрос о вероисповедании и духовных предпочтениях белорусского просветителя.

Беларускі асветнік-гуманіст і біблеіст Ф.Скарына быў сярод тых славутых дзеячаў славянскай культуры, якія адкрылі крыніцу духоўнасці ў Бібліі, убачылі ў ёй кандэнсацыю шматвекавой мудрасці ўсходніх і эліністычных цывілізацыяў. Пра яго жыццё і літаратурна-асветніцкую дзейнасць за апошнія 200 гадоў апублікавана багатая Скарыніяна – выдадзеная Вітаўтам Тумашам кніга «Пяць стагоддзяў Скарыніяны» (Нью-Ёрк, 1989 г.) налічвае 2588 прац.

Верагодная, але недакладная дата нараджэння Скарыны – 1490 год. Дакументы Кракаўскага універсітэту засведчылі: сярод студэнтаў, якія паступілі на факультэт свабодных навук, быў «Францыск, сын Лукі з Полацку» (у арыгінале памылка – з Плацку), а ў 1506 годзе той жа Францыск атрымаў вучоную ступень бакалаўра. Захаваўся цыкл актаў Падуанскага універсітэта (Італія, 1512 г.) пра наданне Ф.Скарыне вучонай ступені доктара лекарскіх навук. Можна меркаваць, што ў 1507 – 1512 гг. асветнік вучыўся і працаваў у Заходняй Еўропе, набыў вучоную ступень доктара свабодных мастацтваў.

Пасля падуанскага трыумфу звесткі пра Скарыну губляюцца да 1517 года. Зусім магчыма, што ён працаваў лекарам і настаўнікам на сваёй Радзіме. На карысць гэтай згадкі сведчыць выдатнае веданне ім жывой гаворкі сваіх бацькоў – старабеларускай мовы. Магчыма, тады ж ён пераклаў Біблію на гэтую мову. А ў 1517 годзе пры падтрымцы беларускіх віленскіх мецэнатаў Якуба Бабіча і Багдана Онькава Ф.Скарына заснаваў у чэшскай Празе першую ў гісторыі ўсходнеславянскіх народаў друкарню і выдаў 23 ілюстраваныя кнігі першай беларускай Бібліі пад агульнай назвай «Библия руска выложена доктором Франциском Скориною из славнаго града Полоцька, Богу ко чти и людем посполитым к доброму научению» (1517 – 1519 гг.). Скарынавая Біблія факсімільна перавыдадзеная выдавецтвам «Беларуская энцыклапедыя» ў 1990 – 1991 гг. [1]. Каля 1521 года асветнік вярнуўся на Радзіму, абсталяваў у Вільні друкарню і апублікаваў «Малую падарожную кніжку» (каля 1522 г.), дзе аб'яднаны Псалтыр, Часаловец (тэксты малітваў, дзённай і вячэрняй царкоўных службаў), каноны і акафісты (з іх два – бясспрэчныя паэтычныя творы Ф.Скарыны). У сакавіку 1525 года ён выдаў апошнюю сёння вядомую кніжку ў віленскай друкарні «Апостал» (Дзеі і Пасланні апостальскія). Пасля гэтага пачаліся драматычныя падзеі ў жыцці асветніка: яго місія ў Маскву (каля 1525 – 1533 гг.), у Кёнігсберг (1529 – 1530 гг.) да герцага Альбрэхта, вялікі пажар у Вільні (лета 1530 г.), смерць жонкі Маргарыты, судовая спрэчка з варшаўскімі гандлярамі з-за маёмасці памёршага брата Івана, урэшце, эміграцыя ў Чэхію і служба садоўнікам у караля Фердынанда I Габсбурга (у 1535 – 1539 гг.). Найбольш верагодна, што Ф.Скарына памёр у канцы 1551 года або ў пачатку 1552 года ў Чэхіі альбо іншай краіне Еўропы. Пра яго жыццё і творчасць апавядаецца ў маёй брашуры «Боская і людская мудрасць», у даследаваннях іншых аўтараў [2; 3].

Літаратурна-публіцыстычная, навуковая і багаслоўская спадчына Ф.Скарыны яшчэ захавала цэласную, сінкрэтычную форму. Яго светапогляд раскрыўся пераважна ў пяцідзесяці прадмовах («предьсловіях», "предмовах», «сказаніях»), кароткіх пасляслоўях (усяго каля 62), урэшце, у шматлікіх спасылках і кароткіх анатацыях да асобных біблейскіх кніжак і да кожнага іх раздзелу паасобку. У светапоглядным плане літаратурная і багаслоўская спадчына Ф.Скарыны мае адзнакі пераходнай эпохі ад сярэднявечча да Новага часу. З аднаго боку, яго каментары грунтуюцца на традыцыях хрысціянскай біблеістыкі і на раннехрысціянскай тэалогіі, найперш, на пасланнях апосталаў і творах айцоў царквы. З другога боку, у адпаведнасці з тагачаснай рэнесанснай атмасферай Біблія тлумачыцца як заканамерны вынік шматвяковай старажытнай культуры, як крыніца тэарэтычнай навукі і практычнай

мудрасці, як сукупнасць твораў чалавечага, праўда, боганатхнёнага таленту і розуму, як адлюстраванне драматычнага шляху станаўлення людской духоўнасці. Тут асветнік імкнуўся паяднаць Бога і чалавека, рэлігію і навуковыя веды, тэалогію і вольнае філасофстваванне, дагматычную экзэгетыку і сімвалічнае тлумачэнне Бібліі.

Беларускі першадрукар быў пачынальнікам самабытнага асветніцкага багаслоўя, выявіў спецыфічна беларускі погляд на месца рэлігіі ў грамадскім і духоўным жыцці народа. Гэтая яго апостальская, місіянерская накіраванасць на прабуджэнне маральнай, прававой, рэлігійнай, урэшце, нацыянальнай свядомасці беларусаў толькі часткова выявілася ў асветніцкай дзейнасці пісьменнікаў і філосафаў другой паловы XVI – XIX ст. І толькі ў XX ст. пачала адраджацца ў творчасці пісьменнікаў-нашаніўцаў, пазней ў філасофскай публіцыстыцы І.Канчэўскага і гісторыка-рэлігійных нарысах А. Станкевіча.

Ф. Скарыны – адзін з пачынальнікаў беларускай і ўсходнеславянскай экзэгетыкі. Вось чаму ў даследаванні яго багаслоўскіх поглядаў найперш патрэбна выявіць традыцыю, у кантэксце якой ён тлумачыў біблейскія тэксты. Дык вось, першае, што ўражвае пры знаёмстве з яго каментарамі да Бібліі, – гэта насычанасць іх сімваламі і сэнсавымі паралелямі паміж Старым і Новым запаветамі. Элементы сімвалізму ёсць ужо ў дахрысціянскай, асабліва ў познеантычнай, эліністычнай культуры, у іудзейскай монатэістычнай тэалогіі. Вядомы філосаф познеэліністычнага перыяду Філон Александрыйскі амаль усе сюжэты і вобразы Бібліі тлумачыў у сімвалічным сэнсе. Аднак універсальны сімвалізм спецыфічны для хрысціянскай рэлігіі і для ўсёй культуры хрысціянскага рэгіёна. Хрысціянская літаратура, іншыя віды мастацтва сімвалічныя па сваёй сутнасці, бо грунтуюцца на светапоглядзе, паводле якога свет вонкавы, бачны, матэрыяльна-прыродны, будучы значымым сам па сабе, набывае паўнату быцця і глыбокі сэнс толькі ў якасці рэальнага сімвалу свету боскага, духоўнага, нябачнага.

Сімвалічная вобразнасць характэрна для сярэдневяковых пісьменнікаў і асветнікаў Беларусі (погляд на зямную красу як сімвалічнае выяўленне боскай дасканаласці і паэтызацыя вясны як сімвалу духоўнага адраджэння праз уваскрэсенне Хрыста ў Кірылы Тураўскага), для сярэдневяковай архітэктуры і выяўленчага мастацтва. Мастацкая і маральна-этычная сімволіка багата прадстаўлена ў беларускім фальклоры [4, с. 119 – 227]. Ф. Скарына ўпершыню шырока карыстаўся самім паняццем сімвала, абазначаючы яго тэрмінамі «знамя», «знаменаванне». У тэалагічным аспекце ён працягваў патрыстычную традыцыю тлумачэння біблейскіх кніг: іх сюжэты, вобразы, дзеючыя асобы разглядаліся ім не толькі ў прамым, фабульным значэнні, але і ў

пераносным, сімвалічным сэнсе. У выніку падзеі і матывы старазапаветнай часткі Біблііў Скарынавай інтэрпрэтацыі набылі выгляд люстэркавай сіметрыі – паралельнай суадпаведнасці матэрыяльнага і духоўнага, чалавечага і боскага, «ветхага» і «новага», зямнога і нябеснага, іманентнага і трансцэндэнтнага.

Напрыклад, дванаццаць суддзяў Ізраілевых (героі «Кнігі Суддзяў»), на думку Скарыны, сімвалізавалі будучых дванаццаць апосталаў Ісуса Хрыста [2]. Кнігу «Песню песняў» ён лічыў сімвалічнай ва ўсіх сваіх тэмах, вобразах і матывах: «жаніх» сімвалізуе Ісуса Хрыста, «нявеста» – хрысціянскую царкву, жаніхова дружына – апосталаў, «отроковици» – дзяцей царквы, «сонмище жидовское» – няверных, якія не прынялі запрашэнне «жаніха» Хрыста прыйсці на духоўнае «вяселле» хрысціянства (III, 423 – 424)[1]. У адпаведнасці з хрысціянскай багаслоўскай традыцыяй беларускі асветнік тлумачыў сімвалічнае значэнне старазапаветных цудаў і міфаў, багата прадстаўленых у кнізе «Выхад». Цяжкае егіпецкае рабства «сыноў ізраілевых», на яго думку, сімвалізавала духоўную няволю; Купіна неапалімая «ясне знаменовала зачатие без семени Сына Божия»; жазло Майсеевае, якое ператварылася ў змяю, сімвалізавала спалучэнне ў Хрысце боскай і чалавечай прыроды; пасланне Майсея егіпецкаму фараону – «пришествие Господне на землю знаменовало»; пераход сыноў ізрайлевых праз Чырвонае мора – «крещение Христова веры извествовало»; манна нябесная, дадзеная яўрэям у пустыні, – «святость тела Христова, нам ко душному спасению зоставленая на земли, знаменовала». Майсеяў пост у пустыні «пост Христов знаменовал». Урэшце, «кивот пак гречески, или скриня завета со двема херувимы, еже стояла во святыя святых, тайну живоналное Троици – Отца і Сына і Святого Духа в серци всякого доброго хрестианина знаменала» (I, 196 – 200).

Адносна кнігі Іова асветнік зазначыў, што яна адлюстроўвае трагічны шлях пазнання: пагэтаму набожнага Іова сімвалічна называюць прарокам у тым сэнсе, што ён пакутамі сваімі прадугадаў хрэстныя пакуты Ісуса Хрыста. «В сих книгах, – кажа Скарына, – открил ест нам Бог великие тайны святым Иовом. Напервей, чего ради Господь Бог на добрых и на праведных дапушчаеть беды и немоци, а злым и несправедливым даеть щастье и здравие» (II, 707). Ф. Скарына ў сваім каментары часта карыстаўся паняццем знака і сімвала («знаменование»), каб выявіць неадназначны сэнс эзатарычных книг – сэнс унутраны, па сутнасці,

[1] Тут і далей рымская лічба азначае том, арабская лічба – старонку выдання: Біблія: Факсімільнае ўзнаўленне Бібліі, выдадзенай Ф.Скарынаю ў 1517 – 1519 гг.: у 3 т. Т. 1 – 3. – Мінск, 1990 – 1991.

сімвалічны, вядомы толькі мудрым, і сэнс вонкавы, агульнадаступны. Звярнуў увагу на пераносны сэнс біблейскіх прытчаў, бо яны «всегда иную мудрость и науку знаменують а иначей ся разумеють, нежели молвены бывають, и болши в собе сокритых тайн замыкають, нежели ся словама пишуть» (III, 292).

Сентэнцыі кнігі «Эклезіяст», якія нібыта пярэчаць адна другой, на самай справе, як зазначае Скарына, выяўляюць неаднолькавыя жыццёвыя каштоўнасці не толькі людзей рознага стану і духоўнага ўзроўню, але аднаго і таго чалавека ў розныя перыяды яго жыцця. Ва ўсіх тых «кохниях и мыслях людскіх» аўтар Эклезіяста знайшоў «суету и утиснение души», прышоўшы да высновы: «Бога бойся и заповеди его соблюди, то ест воистину совершенный человек» (III, 388). У прадмове да кнігі «Ісус Навін» беларускі экзэгет зноў вяртаецца да хрысціянскай інтэрпрэтацыі старазапаветнай гісторыі як сімвалічнага вобраза і знака новазапаветных адкрыццяў: дванаццаць старазапаветных патрыярхаў з іх бацькам Іякавам – гэта вобразы будучых дванаццаці апосталаў Хрыста «со пречистого божиею материю Мариею». А земля абятаваная Ханаанская сімвалізуе царства нябеснае і горны Ерусалім, «яко бо Исус, сын Навин, увел ест людей израйлевых в землю обетованую, тако Ісус, Сын Божий, уведе верующих в него в царство небесное, еже ест земля живых». Урэшце, сам выхад народа з егіпецкага рабства ў зямлю абятаваную «знаменовало наше избавление от смерти вечное». Нават імем сваім Ісус, сын Навіна, падобны Ісусу, Сыну Божаму, пагэтаму «образ Его на собе понесе» (I, 737 – 738).

У прадмовах да абодвух выданняў Псалтыра (1517 і 1522 гг.) Скарына не карыстаецца паняццем сімвала, аднак, імпліцытна тлумачыць гэтую кнігу як сімвалічнае адлюстраванне маральных, пазнавальных, эстэтычных і тэалагічных каштоўнасцей усёй Бібліі. Пракокі кажуць пра выратаванне добрых і пагібель злых; жыццяпісы герояў і святых «жити нас на свете в боязни божией и в терпении научають»; прытчы і прымаўкі «добрых обычаев младых и старых наставляють». Псалтыр жа бачыцца яго выдаўцом як нейкі магістрал да ўсіх біблейскіх кніжак. Яна лечыць хваробы цела і душы, асвятляе розум і мягчыць сэрца, адганяе смутак, мацуе дружбу людзей і ўзаемную любоў. Адным словам, Псалтыр – гэта сімвал усіх духоўных каштоўнасцей, драматычнае станаўленне якіх адлюстравала Біблія, падсумаваўшы вынікі ўсёй старажытнай культуры.

Ф. Скарына параўноўваў сімвалічны вобраз з люстэркам, у якім відаць усё багацце яго канкрэтнага, зямнога зместу. Гераічны ўчынак Юдзіфі сімвалізуе натуральную для ўсіх людзей любоў да сваёй Айчыны, да зямлі, на якой мы «зродилися и ускормлены суть по Бозе» (II, 604). У кожнай біблейскай кнізе ён бачыў вонкавы, фабульны, усім зразумелы

змест («... не толико докторове а люди вченые в них разумеють, но всякий человек простый и посполитый») і ўнутраны, духоўны, або сімвалічны: «написаны суть воистину сие книги внутрь духовне е розумеющим...» (І, 7 – 8). Біблія, на яго думку, сімвалізуе ўсё быццё і перш за ўсё гісторыю чалавецтва, а кожная з яе кніг выступае як сімвал канкрэтнай навукі ці пэўнага «мастацтва» – граматыкі, арыфметыкі, геаметрыі, астраноміі, этыкі, логікі, музыкі, рыторыкі і інш. (І, 8 – 10). Тут Скарына наблізіўся да сімвалічнага тлумачэння Бібліі, што было ўласціва светапогляду рэнесансных гуманістаў. У прадмове да кнігі «Плач Ераміі» Ф.Скарына раскрывае сімвалічнае значэнне ўсіх літар старажаўрэйскай азбукі (алфавіта).

Характэрны для хрысціянства паралелізм зямнога і нябеснага часта сустракаецца ў яго прадмовах. Яго словы пра «дваякую праўду – Божую і чалавечую» неабходна разумець у гэтым іерархічным кантэксце; акцэнтаваным прадмовою да Паслання апостала Паўла да рымлянаў: «Двоякое крещение: едино, им же омываем грехы, другое, еже облачимося во дарования Христова (...). Двоякое воскресение: телесное, яко Христос воста и мы по нем востанем, и духовное, еже мы от злого ко добраму воставаем. Двоякая правда: Божия и человечия. Двоякий суд: Божий и человечий. Двоякая похвала: от Бога и от человека» [5, с. 110].

Схільнасць да сімвалічнага тлумачэння Старога Запавету вылучае Ф.Скарыну з асяроддзя сярэднявечных артадаксальных экзэгетаў і далучае яго да рэнесансных біблеістаў. Вось чаму думка П.В. Уладзімірава, што крыніцай характэрнага для Скарынаўскага біблейскага каментару паралелізма паміж Старым і Новым запаветамі былі Каментарыі да Бібліі Мікалая Лірана, не зусім дакладная. Ф.Скарына, верагодна, мог карыстацца гэтай крыніцай, аднак не наследаваў яе канцэпцыі. Бо французскі экзэгет М.Ліран (М.Ліра, каля 1270 – 1340 гг.) сапраўды характарызаваў розныя метады тлумачэння Старога Запавету, у тым ліку алегарычныя і містычныя, аднак, настойваў на літаральным тлумачэнні, выключыўшы ўсе іншыя [6, с. 233 – 234].

З другога боку, беларускі асветнік не быў так званым «вольнадумцам», а тым больш, абыякавым да веры, якім яго выдавала атэістычная савецкая навука. Ён ніколі не адмаўляўся ад хрысціянскай дагматыкі, не адмаўляў гістарычнасці святой гісторыі, спасылаючыся пры гэтым на ўсходніх і заходніх айцоў царквы і найболей – на кнігі Новага Запавету. Ф. Скарына ўмеў дакладна пацвердзіць свае гуманістычныя ідэі думкамі заснавальнікаў хрысціянскай царквы, як, напрыклад: «Да совершен будеть человек божий и на всяко дело добро уготован, яко святый апостол Павел пишеть» (III, 7). Прадмова да «Псалтыра» пачынаецца з цытаты з Другога паслання апостала Паўла да Цімафея. Другая пражская кніга Скарыны («Іоў») пачынаеца цытатай з Саборнага

паслання апостала Якуба: «Образ примите, братия, злострастия, и долготерпения, и трудов» (II, 706). Трэцяя кніжка «Прытчы» пачынаецца цытатай з Евангелля паводле Іаана.

Наогул жа ў каментары Скарыны – каля паўтараста цытат з Бібліі. Нярэдка спасылаўся асветнік на творы айцоў царквы. У прадмове да ўсёй Бібліі ён цытуе словы Рыгора Вялікага: «Святое писмо все иные науки превышаеть, понеже егда бываеть чтено, под простыми словы замыкаеть тайну» (І, 8). Ф.Скарына распавядаў сваім чытачам пра «святога Герасіма, вялікага вучыцеля», спаслаўшыся на яго думкі ў пяці сваіх прадмовах. Гутарка ідзе пра славутага багаслова, пісьменніка і перакладчыка Еранiма Блажэннага (330 –4 19), які ў 386 – 406 гг. пераклаў Біблію з яўрэйскай і грэчаскай моваў на латынь. Пад назваю Вульгаты яна стала асновай для перакладу Бібліі на многія мовы і была прызнана кананічнай каталіцкім Трыдэнскім саборам (1545 – 1547 гг.). У прадмове да кніг «Прамудрасць Божая», «Выхад», «Прарок Даніiл», «Эсфір» Ф.Скарына указвае на Вульгату і каментары Ераніма, як на адну са сваіх крыніц. Не забываў ён і другую сваю першакрыніцу – старагрэчаскі звод Бібліі і сямідзесяці двух талкоўнікаў – «мужей избранных, в законе божием и во пророцех и во всех иных писмех святых добре навченых, Духа Святого и философии исполненных» – вядомы ў гісторыі над назваю Септуагінта (II ст. да н. э.), якая пакладзена ў аснову перакладу Бібліі на старaславянскую мову і мову іншых народаў праваслаўнага веравызнання.

Такім чынам, выкарыстаўшы як усходнія (грэка-візантыйскія і старaславянскія), так і заходнія (лацінскія і, магчыма, пратэстанскія) крыніцы ў сваёй перакладчыцкай і рэлігійна-паэтычнай творчасці, Ф.Скарына нідзе не аддае перавагі ні праваслаўю, ні каталіцызму. Затое ўсюды дэманструе сваю вернасць агульнахрысціянскім дагматам, святому пісанню і паданню. У большасці сваіх пасляслоўяў ён, датуючы выданне кніжкі, не забывае адзначыць «по нарожению Господа нашего Ісуса Христа, Сына Божия, из Пречистые девици, матери божий Марии» (II, 806). Шмат якія са сваіх кніг асветнік прысвячае «наперад Богу в Троици единому и его Пречистой матери Марии ко чти и людем посполитым к научению» (II, 351, 480, 598). У паасобных пасляслоўях удакладняецца, што Хрыстос нарадзіўся «з непорушенное панны Марии» (I, 827), «из девици Марии» (III, 419), «преблагословенное и пречистое девици Марии» (I, 827). Некаторыя пасляслоўі да новазапаветных кніг прысвячаюцца «Богу во Троици единому и Пречистой матери Его Марии ко славе со всеми святыми во веки веком». Іншыя пасляслоўі заканчваюцца кароткай хвалой-малітвай Хрысту і Святой Троіцы: «...Ему же то буди хвала, честь и поклонение с Отцем и Святым Духом ныне и всегда и в век веком. Амин» (III, 383).

Няма ніякага сумнення, што Ф. Скарына гэткім чынам дыстанцыраўся ад так званых «жыдоўствуючых» – арыянаў-антытрынітарыяў, якія адмаўлялі асноўныя дагматы хрысціянства – спрадвечнасць і боскую прыроду Ісуса Хрыста, звышнатуральнае таінства яго нараджэння, урэшце, святую Троицу – тайну адзінства і непадзельнасці трох боскіх іпастасяў – Айца, Сына і Свято га Духа. Сваё «верую!» асветнік дакладна выявіў у эпіграфе да кнігі «Іоў» – першым, мабыць, сілабічным вершы ў беларускай літаратуры:

Богу въ Троици единому ко чти и славе,
Матери Его Пречистой Марии к похвале,
Всем Небесным силам и святым его к веселію,
Людем посполитым к доброму научению (II, 705).

Біблейскі каментар Ф. Скарыны мае пэўныя прыкметы агульнахрысціянскага катэхізісу, без якіх-небудзь акцэнтаў на карысць пэўнай канфесіі. Па-сутнасці, тут асветнік зрабіў адаптацыю Старога Запавету ў адпаведнасці з хрысціянскай верай. Гэтая нацэленасць на хрысціянскае асветніцтва выявілася ў прадмове да кнігі «Выхад», дзе аўтар прапанаваў хрысціянскую рэдакцыю дзесяці запаведзяў у форме сілабічнага верша. Іудаісцкі дагмат святой суботы ён замяніў хрысціянскім імператывам «помни дни светые святити!», дзесятую запаведзь раздзяліў на дзве, каб захаваць дзесяцічнасць, бо поўнасцю выключыў другую запаведзь, якая забараняла не толькі балванапаклонства, але і «адлюстраванне таго, што на небе зверху, і што на зямлі знізу, і што ў водах ніжнэй зямлі». У XVI ст. яна была непрыгодна для хрысціянскай царквы і культуры, дзе шырока выкарыстоўваліся ўсе віды і жанры выяўленчага мастацтва.

Паэтычны талент Ф. Скарыны выявіўся у «Малой падарожнай кніжцы», куды ён уключыў, сярод іншых, і свае арыгінальныя гімнаграфічныя творы і малітвы. Два акафісты ў пахвалу Імя Ісусавага і Яна Хрысціцеля маюць акравершы адпаведна «Делал доктор Скоринич Франдискоус» і «Писал доктор Скоринич Франдискус» (5). На думку А.Надсана, «Малітву Імю Ісусаву» і цудоўную «Малітву набожную да Найсвяцейшай Багародзіцы Марыі», напэўна, трэба лічыць арыгінальнымі творамі Скарыны. А.Надсан даказаў яшчэ, што тры малітвы ў «Малой падарожнай кніжцы» («Малітва ў Тройцы адзінаму Богу», «Малітва да святых Анёлаў» і «Малітва да святых Апосталаў») належаць Кірылу Тураўскаму. Гэтым пацвярджаецца асветніцкая і паэтычная пераемнасць паміж пачынальнікамі беларускай літаратуры і айчыннага багаслоўя.

Спіс крыніц і літаратуры

1. Біблія: Факсімільнае ўзнаўленне Бібліі, выдадзенай Ф.Скарынаю ў 1517 – 1519 гг.: у 3 т. Т.1 – 3. – Мінск, 1990 – 1991.
2. Конан, У. Боская і людская мудрасць (Францішак Скарына: жыццё, творчасць, светапогляд) / У. Конан. – Мінск, 1990. – 64 с.
3. Немировский, Е.Л. По следам Франциска Скорины: Документальная повесть / Е.Л. Немировский. – Мінск, 1990. – 482 с.
4. Конан, У. Ля вытокаў самапазнання: Станаўленне духоўных каштоўнасцей у святле фальклору / У. Конан. – Мінск, 1993.
5. Скарына, Ф. Творы: Прадмовы, сказанні, пасласлоўі, акафісты, пасхалія / Ф.Скарына. – Мінск, 1990.
6. Еврейская энциклопедия: Свод знаний о еврействе и его культуре в прошлом и настоящем / под общ. ред. А.Гаркави и Л.Кацнельсона. – Т. 10.

Конан Уладзімір Міхайлавіч – філосаф, гісторык, літаратурны крытык, доктар філасофскіх навук, вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

УДК 27-789.33(476) (XVIII-XIX)

А.Ф. Самусік (Мінск)

АСВЕТНІЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ДАМІНІКАНСКАГА ОРДЭНУ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У XVIII – ПЕРШАЙ ТРЭЦІ XIX ст.

Деятельность католических орденов на белорусских землях раскрывает многие тенденции культурной жизни Беларуси. В статье освещается роль доминиканского ордена в деле просвещения. История просветительской деятельности доминиканцев в сложных социокультурных условиях насыщена уникальными фактами.

Сярод каталіцкіх манаскіх таварыстваў дамініканцы заўсёды займалі адметнае месца. Узнік гэты ордэн яшчэ ў пачатку XIII ст. на поўдні Францыі. Яго заснавальнік іспанскі канонік Дамінік дэ Гусман лічыў, што для павышэння эфектыўнасці прапаведніцкай і місіянерскай дзейнасці неабходна значную ўвагу ўдзяляць асвеце манахаў, а таму ў статуце дамініканцаў абавязак рэгулярнай фізічнай працы быў заменены на авалоданне багаслоўскімі навукамі. Найбольш вядомыя іх навучальныя ўстановы дзейнічалі ў Оксфардзе, Манпелье, Балон'е і ў далейшым сталі асновай пры стварэнні тут славутых універсітэтаў. Сама ж сістэма навучання прадугледжвала шэраг ступеняў: 6 год вывучэння філасофіі, багаслоўя, царкоўнай гісторыі і права дазвалялі заняць месца лектара; яшчэ праз 7 год можна было стаць бакалаўрам, а пасля 13 год

педагагічнай дзейнасці лепшыя атрымлівалі пачэснае званне магістра тэалогіі – вышэйшы сан даміниканскага ордэна ў сферы адукацыі [3, с. 134–135].

Што ж датычыцца беларускіх зямель, то сюды дамініканцы прыбылі ў канцы XV ст. Вялікі князь Аляксандр перадаў ім касцёл Св. Духа ў Вільні, пры якім яны ў 1507 г. адкрылі філасофска-багаслоўскую студыю [2, с. 462]. Значнымі цэнтрамі адукацыі сталі таксама кляштары ордэну ў Астраўцы, Ашмянах, Гродна, Мінску, Навагрудку, Пінску, Слоніме і г. д. Пры гэтым іх асветніцкая дзейнасць пашыралася і на мясцовае свецкае насельніцтва, для якога ордэн адкрываў пачатковыя школы граматы і царкоўных спеваў.

Першую ж сярэднюю навучальную ўстанову ў Беларусі дамінікaнцы заснавалі ў 1716 г. пры кляштары св. Георгія ў фальварку Забелы каля вёскі Валынцы (зараз Верхнядзвінскі раён). Магчыма, гэта стала дзякуючы буйной фундацыі Г. Шчыта, які перадаў ордэну 5 фальваркаў (550 двароў з 3 тысячамі прыгонных сялян) з умовай утрымліваць з іх прыбыткаў вучылішча для мясцовай моладзі [1, с. 27]. Месца для размяшчэння школы, аднак, аказалася не вельмі зручным (побач Полацк з папулярным езуіцкім калегіумам), а таму гэтая навучальная ўстанова зараз больш вядома не дасканалай арганізацыяй вучэбна-выхаваўчага працэсу, а дзейнасцю свайго вучнёўскага тэатра, дзе ў 1787 г. была пастаўлена першая беларускамоўная "Камедыя" К. Марашэўскага.

Трэба таксама адзначыць, што ў Рэчы Паспалітай XVIII ст. да асветніцкай дзейнасці дамініканцаў ставіліся неадназначна. Шмат хто лічыў, што манаскіх школ і так хапае, а імкнуцца трэба да свецкай мадэлі адукацыі. Нават кароль Станіслаў Аўгуст адзначаў: "Манахі псуюць і фанатызуюць усю Польшчу, і таму яна можа заняць у свеце належнае ёй месца толькі тады, калі за яе межы будуць выгнаны ўсе манаскія каптуры, а для нас будзе дастаткова піяраў, місіянераў і на благі канец езуітаў, каб выхаваць моладзь без усялякіх забабонаў" [4, с. 19]. Як бачна, дамініканцы ў гэты пералік увогуле не трапілі.

Не вельмі ўдала складваліся адносіны ў іх і з Адукацыйнай камісіяй. На беларускіх землях дамініканскі ордэн не атрымаў ад яе права на адкрыццё новых школ. Кампенсаваць гэта кіраўніцтва вырашыла праз заснаванне шэрагу "нелегальных" навучальных устаноў. У 1770-я гг. падобныя вучылішчы са згоды грамадства, але без дазволу ўлад ствараліся практычна ўсімі манаскімі ордэнамі. У супрацьвагу Адукацыйнай камісіі іх вучэбныя курсы капіравалі традыцыйныя езуіцкія праграмы, што забяспечвала гэтым школам шырокую падтрымку сярод кансерватыўнай большасці тагачаснага насельніцтва Беларусі (у іх вучылася да 20 % усёй айчыннай маладзі). Найбольш вядомая

нелегальная школа дамініканцаў дзейнічала ў Чашніках, дзе яна была адкрыта ў 1777 г. па ініцыятыве ксяндза Кавальскага [11, с. 27, 138]. Адукацыйная камісія дабівалася яе закрыцця школы звыш 10 год, і толькі ў пачатку 1790-х гг. ордэн пайшоў на саступкі і спыніў яе дзейнасць. Узамен гэтага вучылішчныя ўлады дазволілі дамініканцам адчыніць сярэднюю навучальную ўстанову ва Ушачах. Падпарадкоўвалася гэтая 3-класная школа Навагрудскаму вучылішчу. Мелася пры ёй і прыходское вучылішча, арыентаванае на збяднелых вучняў [10, с. 268].

Сапраўдны ўздым дамініканскага ордэну ў сферы адукацыі прыйшоўся на канец XVIII ст. Руская адміністрацыя рознымі метадамі спрабавала аслабіць уплыў у школьнай справе Беларусі езуітаў і піяраў – у тым ліку і праз актывізацыю асветніцкай дзейнасці іншых манаскіх ордэнаў. Менавіта па гэтай прычыне ў 1797 г. дамініканцам былі перададзены свецкія 6-класныя акруговыя вучылішчы ў Гродна і Навагрудку [9, с. 56–57]. Да таго ж, у 1796 г. Полацкі Сумленны суд зацвердзіў завяшчанне мінскага ваяводы Я. Гільзена, па якому Забельскі калегіум пачаў атрымліваць дадаткова 6 тыс. руб. срэбрам штогод, што дазволіла яму таксама ўзняцца да рангу гімназіі [8, с. 138].

Пасля стварэння Віленскай навучальнай акругі дамініканскі ордэн да азначаных вышэй трох уласных гімназіяльных вучылішчаў здолеў у 1809 г. дадаць яшчэ адну адпаведную навучальную ўстанову ў Нясвіжы (створана на базе пераведзенага сюды Слуцкага павятовага вучылішча). Да таго ж, папоўнілася і колькасць належачых яму павятовых школ – у тым жа 1809 г. акрамя ўжо згаданых Ушач такая ж навучальная ўстанова пачала сваю дзейнасць і ў Рэчыцы. Магчыма гэта стала дзякуючы падтрымцы ордэна з боку рэктара Віленскага універсітэта Я. Снядэцкага, які ў 1811 г. пісаў: "Из духовных сословий, содержащих публичные училища по Виленскому учебному округу, сословие ксендзов Доминиканцев особенно отличается своей рачительностью". У выніку дамініканцы здолелі трывала ўмацавацца ў тагачаснай айчыннай сістэме адукацыі. У 1817 г. у шасці школах ордэна вучылася 705 выхаванцаў, што складала 17,5 % ад іх агульнай колькасці ў Беларусі [5, с. LXXVII – LXXX]. Пры гэтым шмат хто з іх назаўсёды ўвайшоў у аналы сусветнай і айчыннай гісторыі. У тых жа Валынцах атрымалі сярэднюю адукацыю пісьменнік А. Вярыга-Дарэўскі, гісторык і археолаг К. Тышкевіч, у Гродна – дыпламат і падарожнік А. Сузін, у Навагрудку – паэты А. Міцкевіч і Я. Чачот, У Нясвіжы – пісьменнік У. Сыракомля і філосаф Ф. Бохвіц.

У пачатку 1820-х гг. дамініканцы паспрабавалі ўвогуле выйсці на лідзіруючыя пазіцыі ў школьнай справе Беларусі. Пасля выгнання ў 1820 г. езуітаў востра стаяла пытанне аб далейшым лёсе іх навучальных

устаноў. Літоўскі правінцыял дамініканскага ордэна Ф. Цяцерскі пры падтрымцы шляхты Дрысенскага павета звярнуўся да міністра народнай асветы князя А. Галіцына з прапановай аб рэарганізацыі Забельскай гімназіі ў акадэмію з факультэтамі: фізіка-матэматычным, філасофска-гістарычным, багаслоўска-прававым і свабодных навук. Ажыццявіць праект прапанавалася праз перавод гімназіі ў Полацк і перадачу ёй памяшканняў былой езуіцкай акадэміі. Аднак кіраўніцтва Віленскай акругі аддала Полацкі езуіцкі кляштар піярам, а таму Ф.Цяцерскі ў 1821 г. даслаў у Пецярбург новы праект, згодна якому планавалася ўжо ў Валынцах адкрыць акадэмію з факультэтам: багаслоўскім (дагматычнае і маральнае багаслоўе, Св. Пісанне, кананічнае права, царкоўная гісторыя і геаграфія), філасофскім (логіка, метафізіка, этыка, палітычная эканомія, статыстыка, народнае права, агульная гісторыя, вышэйшая матэматыка, астраномія, грамадзянская і ваенная архітэктура, тэарэтычная і практычная фізіка, хімія, заалогія, батаніка, мінералогія) і філалагічным (лацінская, грэчаская, яўрэйская, руская, польская, нямецкая, французская мовы). Дамініканскі ордэн абавязваўся ўтрымліваць яе за свой кошт (планаваліся пасады рэктара і 15 прафесараў), а за гэта прасіў вылучыць уласныя школы ў асобную акругу; дазволіць акадэміі прысвойваць вучоныя ступені; адкрыць у Валынцах друкарню для выдання падручнікаў. Перапіска па дадзенай справе працягвалася аж да 1827 г., калі Савет Пецярбургскага універсітэта прыняў канчатковае рашэнне – адхіліць праект, бо, па-першае, Расіі не патрэбна манаская вышэйшая навучальная ўстанова, а, па-другое, прапанова стварыць асобны філалагічны факультэт даказвае “неумение распределять науки”, што сведчыць аб дрэннай распрацаванасці ўсяго статута Забельскай акадэміі [6, л. 1–15].

У якасці частковай кампенсацыі дамініканцы атрымалі яшчэ ў 1822 г. былы езуіцкі калегіум у Оршы, дзе адкрылі ўласнае 4-класнае павятовае вучылішча. Аднак трывала ўмацавацца яна так і не здолела. Ужо ў 1825 г. мясцовых манахаў абвінавацілі “в совращении” праваслаўных вучняў, якія прысутнічалі на богаслужэнні ў касцёле “в римском облачении”. Гэта дазволіла ўладам распачаць справу па ліквідацыі школы, і ў 1830 г. на яе месцы была адкрыта свецкае павятовае вучылішча. Нядоўга праіснавалі і астатнія дамініканскія школы. Падаўленне паўстання 1830–1831 гг. дала добры повад уладам цалкам знішчыць у Беларусі манаскую сістэму асветы. Ужо ў 1832 г. у свецкія навучальныя ўстановы былі пераўтвораны школы ў Рэчыцы і Ушачах, у 1834 г. – у Гродна і Навагрудку, у 1835 г. – у Нясвіжы. У 1838 г. была ліквідавана і Забельская дамінікаская гімназія, яе вялізны фундуш перавялі ў Віцебскую губернскую гімназію (у 1911 г. стаў асновай адкрыцця Віцебскага рэальнага вучылішча) [7, с. 25 – 27].

Вядомы паэт У. Сыракомля здолеў усяго ў некалькіх радках паэмы “Школьныя часы” трапна апісаць усю гісторыю айчыннай манаскай сістэмы адукацыі: «Нашых дзядоў сцябалі старыя езуіты, нашых бацькоў секлі айцы піяры, а мы паспыталі базыліянскай розгі ці цвёрдай дамініканскай дысцыпліны. Але няхай за гэтыя розгі ўшануюць іх нябёсы! Так, здорава яны лупцавалі, калі было за што, але і кахалі яны дзяцей сардэчна і шчыра, старанна настаўлялі іх у навуцы і веры і строга пільнавалі мараль – шмат каго дала нашаму краю іх уважлівая апека» [12, с. 7 – 8].

Спіс крыніц і літаратуры

1. Белецкий, А.В. Исторический обзор деятельности Виленского учебного округа за первый период его существования / А.В. Белецкий. – Вильна: Тип. А.Г. Сыркина, 1906. – 148 с.
2. Гудавичюс, Э. История Литвы с древнейших времён до 1569 года / Э.Удавичюс. – М.: Фонд им. И.Д. Сытина; Baltrus, 2005. – 680 с.
3. Карсавин, Л.П. Монашество в средние века / Л.П. Карсавин. – М.: Высшая школа, 1992. – 191 с.
4. Крачковский, Ю.Ф. Исторический обзор деятельности Виленского учебного округа / Ю.Ф. Крачковский. – Вильна: Тип. А. Г. Сыркина, 1905. – 565 с.
5. Погодин, А. Виленский учебный округ / А. Погодин. – СПб.: Тип. П. П. Сойкина, 1901. – 134 с.
6. Российский государственный исторический архив в Санкт-Петербурге (РГИА). – Фонд 733. – Оп. 62. – Д. 516. Дело об открытии Забельской академии.
7. Самусік, А.Ф. Адукацыйная справа на беларускіх землях у 20 – 30-я гады XIX стагоддзя / А.Ф. Самусік // Адукацыя і выхаванне. – 2000. – № 1. – С. 22 – 27.
8. Сапунов, А. Историческая записка 75-летия Витебской гимназии / А. Сапунов. – Витебск: Тип. Губернского правления, 1884. – 177 с.
9. Сборник сведений о средних учебных заведениях Виленского учебного округа / под ред. Н. Сергиевского [и др.]. – Вильна: Тип. М. Р. Ромма, 1873. – 376 с.
10. Nowozytna mysl naukowa w szkolach Komisji Edukacji Narodowej / pod red. J.Stasiewicz-Jasinkowej. – Wroclaw: Wyd-wo PAN, 1973. – 280 s.
11. Raporty generalnych wizytatorow szkol Komisji Edukacji Narodowej w Wielkim Ksiestwie Litewskim / oprac. K. Bartnicka [i inn.]. – Wrocław: Wyd-wo PAN, 1974. – 599 s.
12. Syrokomla, W. Szkolne czasy / W. Syrokomla. – Wilno: Ksieg. R.Rafalowicza, 1859. – 74 s.

Самусік Андрэй Фёдаравіч – кандыдат гістарычных навук, дацэнт, Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт.

УДК 94(476) (XVIII-XIX ст.):930

І.В. Соркіна (Гродна)

НАВУЧАЛЬНЫЯ ЎСТАНОВЫ КАТАЛІЦКІХ ОРДЭНАЎ І БАЗЫЛЬЯН У МЯСТЭЧКАХ БЕЛАРУСІ (КАНЕЦ XVIII – ПЕРШАЯ ТРЭЦЬ XIX ст.)

В статье на примере местечек Беларуси конца XVIII – первой трети XIX в. показано, что учебные заведения католических орденов и базилиан являлись тем фактором, благодаря которому населенные пункты, в которых они размещались, становились центрами образования и науки. Прослеживается влияние училищ на повседневную жизнь населения местечек. Освещается политика российских властей в области образования в целом, и относительно монастырских униатских и католических учебных заведений в частности.

У канцы XVIII – першай палове XIX ст. мястэчкі займалі даволі значнае месца ў сістэме адукацыі ў Беларусі. Па асветніцка-адукацыйнаму патэнцыялу некаторыя з іх стаялі на ўзроўні ўезных гарадоў і нават пераўзыходзілі іх. Многія мястэчкі сталі вядомымі цэнтрамі адукацыі і навукі дзякуючы манастырскім уніяцкім і каталіцкім навучальным установам.

У канцы XVIII ст. на тэрыторыі Беларусі базыльяне, езуіты, дамініканцы, кармеліты і манахі іншых каталіцкіх ордэнаў мелі ў сваім распараджэнні 37 вучылішчаў [1, с. 94]. Рэформа асветы 1803 – 1804 гг. нязначна пахіснула пазіцыі святарства ў сістэме адукацыі: навучальныя ўстановы, што знаходзіліся на ўтрыманні каталіцкіх законаў і базыльян, не змянілі сваіх гаспадароў. Захаванне навучальных устаноў у руках каталіцкіх законаў, апрача “карысці для скарбу” падмацоўвалася жаданнем польска-літвінскіх патрыётаў на чале з Адамам Чартарыйскім узмацніць пазіцыі каталіцызму на далучаных да Расійскай імперыі землях. Як паказаў вопыт дзейнасці Камісіі Народнай Адукацыі, ці Адукацыйнай Камісіі (1773 – 1794 г.), супрацоўніцтва каталіцкага і уніяцкага святарства з асветнікамі пры кіруючай ролі апошніх магло прынесці добрыя вынікі. Аўтары праекта ўлічылі настроі мясцовага насельніцтва, найперш шляхты, якая ў новых палітычных умовах слушна глядзела на касцёл, як на аднаго з захавальнікаў традыцый былой Рэчы Паспалітай і давярала святарству [2].

Многія з навучальных устаноў каталіцкіх ордэнаў і базыльян размяшчаліся ў мястэчках. Напрыклад, езуіцкія вучылішчы знаходзіліся ў Чачэрку, Лазовічах, Расне; дамініканскія – у Бялынічах, Ушачах; канонікаў рэгулярных латэранскіх – у Азеранах; місіянерскія – у Асвеі, Лыскаве; піярскія – у Шчучыне, Лужках, Воранаве, Любяшове, Дуброўне; базыльянскія – у Жыровічах, Барунах, Беразвеччы, Талачыне і інш.

Аднымі з найбуйнейшых манастырскіх вучылішчаў з’яўляліся Талачынскае базыльянскае, Ушацкае і Забельскае дамініканскія. Па вучэбнаму курсу яны стаялі вышэй за пачатковыя вучылішчы. Талачынскае 5-класнае вучылішча ўзнікла ў 1790 г. з дазволу беларускага генерал-губернатара графа Чарнышова па просьбе мясцовай шляхты [3, с. 28]. У 1804 г. у ім было 6 выкладчыкаў і 135 вучняў [4, арк. 83]. Візітатар вучылішчаў Віцебскай і Магілёўскай губерняў Васіль Севяргін адзначаў высокі ўзровень выкладання ў базыльянскім вучылішчы ў Талачыне і рэкамендаваў яго настаўнікаў Віленскаму універсітэту, як «весьма прилежных и усердных». Вучылішча пакінула ў Севяргіна такое добрае ўражанне, што ён нават хадайнічаў аб аказанні яму матэрыяльнай дапамогі [3, с. 105].

У м.Ушач Віцебскай губерні ў 1791 г. было адкрыта 3-класнае (з 2-гадовым курсам навучання ў кожным класе) вучылішча. У 1804 г. у ім было 4 выкладчыкі і 98 вучняў. Забельскае дамініканскае вучылішча (пры дамініканскім кляштары ў фальварку Забелы каля м. Валынцы) было заснавана яшчэ ў 1716 г., у 1803 г. атрымала ступень уезнага, а ў 1809 г. – гімназіі. У 1804 г. у ім вучылася 57 чалавек, а ў 1825 г. – 150. Навучанне працягвалася 6 гадоў [4, арк. 79; 5, арк. 86]. Пры гэтай навучальнай установе існаваў школьны тэатр. Сярод вядомых педагогаў доктар філасофіі, аўтар падручніка па фізіцы Фелікс Цяцерскі, гісторык і мемуарыст Фаўстын Цяцерскі, беларускія і польскія драматургі, выкладчыкі рыторыкі і паэтыкі Каятан Марашэўскі і Міхал Цяцерскі. Тут вучыўся беларускі пісьменнік Арцём Вярыга-Дарэўскі [6].

Многія прыходскія вучылішчы (ніжэйшыя пачатковыя навучальныя ўстановы ў межах царкоўных праваслаўных прыходаў або каталіцкіх парафій) знаходзіліся на ўтрыманні манастыроў базыльянскага і розных каталіцкіх ордэнаў. Напрыклад, у м.Глуску Бабруйскага ўезда і м.Будслаў Вілейскага ўезда ўтрымлівалі прыходскія вучылішчы бернардзінцы, у м.Дунілавічы Вілейскага ўезда, м.Стоўбцы Мінскага ўезда, м.Ушачы Лепельскага ўезда, м.Зембін Барысаўскага ўезда – дамінікане, у м.Мядзель Вілейскага ўезда – кармеліты, у м.Асвея Дрысенскага ўезда – місіянеры, у м.Чарэя Сененскага ўезда, м.Казіміраўка Бабруйскага ўезда, м.Свержань Мінскага ўезда – базыльяне [4, арк. 121 – 126]. У Гродзенскай губерні базыльяне ўтрымлівалі пачатковыя школы ў Міры, Ружанах і Антопалі, піяры – у Зэльве, францысканцы – у Лапеніцы, бернардзінцы – у Ружанах [7, арк. 200 – 205, 260 – 261; 8, арк. 1 – 28].

Манастырскія вучылішчы абавязаны былі сваім існаваннем не толькі традыцыі (некаторыя з іх узніклі яшчэ ў XVI – XII стст.), але і маёмасці,

што назапасілі манастыры. Акрамя таго, значную матэрыяльную падтрымку аказвала каталіцкаму духавенству мясцовая шляхта і рускае дваранства. Напрыклад, у м. Асвея на сродкі графа Гільзена місіянеры ўтрымлівалі мужчынскае (23 вучні) і жаночае (13 вучаніц) прыходскія вучылішчы Графіня Чарнышова ў Чачэрску адкрыла на свае сродкі пачатковае вучылішча для сялян і передала яго езуітам [3, с. 49].

Мэтаю манастырскіх пачатковых школаў, як правіла, з'яўлялася падрыхтоўка навучэнцаў да паступлення ў старэйшыя класы сярэдніх манастырскіх навучальных устаноў. Так, у Асвейскай пачатковай школе рыхтавалі да працягвання вучобы ў Забельскім дамініканскім і Полацкім іезуіцкім калегіўмах. Вучыліся ў манастырскіх прыходскіх вучылішчах у большасці выпадкаў дзеці духавенства і шляхты. Былі і выключэнні. Так, у 1820 г. манахі-картэзіянцы ў Бярозе заснавалі прыходскае вучылішча «для обучения детей бедного состояния обоего пола не только из крестьян, живущих в местечке, но из бедной шляхты, кто пожелает». Манахі выдзелілі дом пад вучылішча, дровы для яго ацяплення, прызначылі настаўніку заробак у 45 рублёў серабром і харчовыя прыпасы. У першы год тут займаліся 30 хлопчыкаў і 20 дзяўчынак: «Дети сии в осени и зимою будут обучаться по-польски и по-российски моральности, читать и писать, арифметике, а при том девицы разных работ, на весну и лето будут отпускаться до своих родителей для нужных работ» [9, арк. 1].

Склад вучняў піярскага прыходскага вучылішча Зэльвы, паводле дадзеных за 1826/1827 г., быў наступным: «29 хлопцаў: 9 дваран, 14 сялян, 6 мяшчан-габрэяў» [10]. Здзіўляе наяўнасць сярод вучняў габрэяў: гэта вельмі рэдкі выпадак. Як вядома, сістэма адукацыі габрэяў у гэты час характарызавалася аўтаномнасцю, усе габрэйскія хлопчыкі наведвалі свае рэлігійныя школы – хедары.

Як паказваюць матэрыялы візітацыі школаў Мінскай губерні за 1819 г., пачатковая прыходская школа ў Капылі (утрымлівалася коштам прэлата Шантыра, які вызначыў для настаўніка заробак у 200 злотых польскіх, размяшчалася ў доме, які належыў да касцёла) мела вучняў рознага веравызнання: дзеці навакольных шляхецкіх засценкаў – каталікі, дзеці капыльскіх мяшчанаў – праваслаўныя. Візітатар Юзаф Твардоўскі быў здзіўлены наяўнасцю сярод вучняў татарына Аўгустына (Хусэйна) Байрашэўскага. Вучні з наваколля размяшчаліся па розных дамах мястэчка, кошты кватаравання складалі 1 руб. сер. на квартал, а разам з харчаваннем – 6 руб. сер. Некаторых вучняў прэлат размяшчаў па дамах, якія былі пад юрысдыкцыяй плябаніі, а гаспадароў за гэта вызваляў ад часткі чыншу. Верагодна, на вучылішча ўскладваліся абавязкі аказваць насельніцтву ветэрынарныя паслугі, бо візітатар адзначыў у сваёй

справаздачы, што настаўнік не ведае спосабаў прышчэпак супраць каровінай воспы [11, с. 342 – 343].

Згодна «Прадпісаннем арганізацыі вучылішчаў у акрузе Імператарскага Віленскага універсітэта», апублікаваным 20 жніўня 1804 г., ствараліся чатырохгадовыя ўезныя вучылішчы і сямігадовыя гімназіі. Гэтыя пераўтварэнні ў значнай ступені закранулі і сярэднія навучальныя ўстановы, што знаходзіліся ў мястэчках. У 1804 г. Жыровіцкае базыльянскае вучылішча было рэарганізавана ў гімназію. На вучэбны план уезных вучылішчаў пераводзіліся Барунскае базыльянскае, Шчучынскае піярскае, Беразвечскае базыльянскае, Лужацкае піярскае, Талачынскае базыльянскае, Ушацкае і Забельскае дамініканскія вучылішчы.

Вялікую ролю ў культурным жыцці Беларусі адыгрывала мястэчка Шчучын. У працы М.Балінскага і Т.Ліпінскага «Старажытная Польшча» Шчучын вызначаецца як значны цэнтр асветы, навукі і дабрачыннасці ў краі [12, с. 261]. Росквіт асветы і навукі ў Шчучыне быў звязаны з дзейнасцю тут калегіума піяраў, які належыў да найбольш значных у Беларусі. Ён быў заснаваны ў 1726 г. (па іншых звестках, у 1718 г.) [13]. У гэтым заключаецца вялікая заслуга перад Шчучынам Юзафовічаў-Глябіцкіх, якія напачатку эпохі Асветніцтва дальнабачна зразумелі асноўныя тэндэнцыі культурна-гістарычнага развіцця свайго часу і паклалі іх у падмурак росквіту Шчучына. У якасці культурна-асветніцкага і навуковага цэнтру ён пачаў уцягваць у арбіту свайго ўплыву вялікую тэрыторыю паміж Гродна і Лідай. Тэрмін навучання ў калегіуме быў разлічаны на 6 гадоў. Высокі ўзровень падрыхтоўкі гарантаваў моцны падбор выкладчыцкіх кадраў, багаты кніжны фонд: бібліятэка піяраў у пачатку XIX ст. налічвала 2751 кнігу. Акрамя таго, выкладчыкі і студэнты маглі карыстацца вялікай бібліятэкай Сцыпёнаў, а потым Друцкіх-Любецкіх. У 1776 г. Адукацыйная камісія адкрыла ў Шчучыне падакруговае вучылішча, яно таксама належыла піярам і было 3-класным. Пазней яно атрымала статус уезнага, было спачатку 4-класным, затым 6-класным. Школа мела фізічны кабінет, хімічную лабараторыю, геаметрычныя інструменты, тры глобусы, тэлескоп, атласы па старажытнай і сучаснай геаграфіі [14; 15, с. 46 – 47].

Са шчучынскімі піярскімі навучальнымі ўстановамі звязаны імёны такіх вядомых навукоўцаў XVIII – XIX ст., як гісторык-археограф Мацей Догель, філосаф Казімір Нарбут, філосаф, логік і псіхолаг Анёл Доўгірд, біёлаг Станіслаў Баніфацый Юндзіл, сусветна вядомы геолаг, біёлаг, фізік Ігнат Дамейка і інш. Дзейнасць піяраў у Шчучыне, такім чынам, цалкам змяніла ходу гісторыі мястэчка, пераўтварыўшы яго ў значны цэнтр навукі і асветы.

На ніве жаночай адукацыі ў Шчучыне актыўна працавалі сёстры міласэрнасці, колькасць вучаніц «шляхецкага стану» ў 1828 г. дасягнула 72.

Шчучынская піяры і сёстры міласэрнасці адыгралі важную ролю не толькі ў развіцці адукацыі, але і ў медыцынскай справе. Вядома, што пры шчучынскім піярскім калегіуме працавала адна са старэйшых у Беларусі аптэк, якая адкрылася ў 1773 г., а ў 1832 г. мела 821 найменне розных лекаў, бібліятэку ў 70 тамоў. У 1785 г. па ініцыятыве прафесара Станіслава Юндзіла быў заснаваны адзін з лепшых у Беларусі батанічных садоў, што дазволіла пашырыць асартымент прапанаваных насельніцтву лекаў. Сёстры міласэрнасці ўтрымлівалі шпіталь [15, с. 53 – 55].

Адной з лепшых навучальных установаў у Віленскай акрузе з'яўлялася ўезнае вучылішча ў м. Любяшоў Мінскай губерні (цяпер у Валынскай вобласці Украіны). Піярскі калегіум быў тут заснаваны яшчэ ў 1693 г. Адукацыйная камісія стварыла на яго базе падакруговую школу. У часы расійскай рэформы спачатку тут было 6-класнае ўезнае вучылішча з гімназічным курсам навучання, а з 1826 г. – 4-класнае. Любяшоўскае вучылішча мела вялікую бібліятэку, батанічны сад, лабараторыі, аптэку. Было скасаванае ў 1834 г. Сярод найбольш знакамітых выхаванцаў гэтай навучальнай установы вылучаецца імя Тадэвуша Касцюшкі [16, с. 415].

У Лыскаве з 1751 г. існавала школа каталіцкага закону місіянераў. У 1797 г. яна была пераўтворана ва ўезнае 6-класнае вучылішча. Гэта было адзіная на Беларусі сярэдняя навучальная ўстанова, якую ўтрымліваў гэты каталіцкі закон. Доўгі час ганаровым наглядчыкам Лыскаўскага вучылішча быў памешчык Біспінг, які падтрымліваў яго грашовымі субсідыямі. У Лыскаве ў розныя гады вучылася ад 75 (1805 г.) да 127 (1833 г.) чалавек. За 1804 г. захаваліся звесткі аб сацыяльным складзе навучэнцаў: тут вучыліся 80 дзяцей дваран, 2 – купцоў, 3 – мяшчан, 2 – духавенства, 1 – разначынцаў [7, арк. 201; 8, арк. 9 – 10]. У 1835 г. Лыскаўскае вучылішча апошні раз узгадваецца ў справаздачах.

Буйнейшым базыльянскім асяродкам на Беларусі з'яўляліся Жыровічы. Тут яшчэ ў 1631 г. базыльяне заснавалі школу, якая атрымала прывілей караля Аўгуста II ад 11 жніўня 1710 г. [7, арк. 204]. З гэтага часу ў мястэчку дзейнічалі ніжэйшая і філасофская базыльянскія школы, ператорваныя Адукацыйнай камісіяй у падакруговае вучылішча. У 1804 г. яно было рэарганізавана ў гімназію, але пазней ў справаздачах фігуруе як уезнае вучылішча. З 1826 г. яно зноў атрымала статус гімназіі [8, арк. 3 – 4]. У 1828 г. па ініцыятыве Іосіфа Сямашкі на яе аснове ў Жыровічах была заснаваная уніяцкая Літоўская духоўная семінарыя, якая пасля скасавання уніі стала праваслаўнай. У справаздачы аб духоўных вучылішчах Гродзенскай губерні за 1839 г. прыведзеныя звесткі аб

размешчаных у Жыровічах Літоўскай епархіяльнай семінарыі (8 выкладчыкаў, 141 навучэнец на казённым кошце, 65 – на ўласным) і ўезным прыходскім і дзячкоўскім вучылішчах (6 выкладчыкаў, 58 навучэнцаў на казённым кошце, 103 – на ўласным) [17, арк. 65]. У 1845 г. семінарыя была пераведзеная ў Вільню, а ў Жыровічах дзейнічала духоўнае вучылішча (у 1858 г. – 16 выкладчыкаў, 130 навучэнцаў) [18, с. 229, 254.]. Адзначым, што з-за вялікай колькасці навучэнцаў не ўсе з іх маглі размясціцца непасрэдна ў памяшканнях вучылішча, частка здымала кватэры ў мястэчку [19, арк. 15].

Адным з буйнейшых базыльянскіх цэнтраў на Беларусі ў XVII – першай трэці XIX ст. з'яўлялася і мястэчка Баруны Ашмянскага ўезда. Барунскае вучылішча, падакруговае ў часы дзейнасці Адукацыйнай камісіі, уезнае ў першай трэці XIX ст., праіснавала да 1831 г. Тут займалася ад 140 да 200 юнакоў, найперш сыноў шляхты з Ашмянскага і суседняга ўездаў. Вучні жылі ў дамах мяшчан і знаходзіліся пад наглядам гувернёраў. Школа размяшчалася ў асобным будынку, мела бібліятэку (папаўнялася выданнямі Віленскіх прыватных друкарняў і кнігарняў Юзафа Завадскага і Францішка Марыца), матэматычныя інструменты і 6 прафесараў: лаціны, арыфметыкі, красамоўства, гісторыі, фізікі і матэматыкі, якія штодня па чарзе выкладалі свае прадметы ва ўсіх класах. Вучылі таксама геаграфіі, батаніцы, праву, эканоміцы, гісторыі святога пісання, сельскай гаспадарцы, французскай, нямецкай, а з 1800 г. – расійскай мове. Кожны вучэбны год завяршаўся публічнымі экзаменамі. Барунская базыльянская школа адыграла важную ролю ў развіцці асветы і праславілася сваімі выхаванцамі, якія пакінулі след ў навуцы, культуры, грамадскім жыцці Беларусі, Літвы і Польшчы (матэматык, прафесар Віленскага універсітэта Антоні Вырвіч, пісьменнік, філосаф Ігнат Ходзька, гісторык, публіцыст Леанард Ходзька, паэт, перакладчык, публіцыст Антон Адынец, паэт, перакладчык Юльян Корсак і інш.) [20, с. 25 – 33; 21, с. 111].

Значныя змены ў сістэме адукацыі краю выклікала паўстанне 1830 – 1831 гг. Пасля ліквідацыі Віленскага ўніверсітэта і яго вучэбнай акругі (1832 г.) навучальныя ўстановы Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губерняў увайшлі ў склад Беларускай вучэбнай акругі (да 1850 г.). Пачалася рэформа навучальных установаў згодна статуту 1828 г., які даволі рэзка праводзіў саслоўны прынцып у адукацыі. Ліквідавалася пераемнасць вучэбных планаў прыходскага і ўезнага вучылішчаў і гімназіі. З вучэбных планаў былі знятыя амаль усе прыродазнаўчыя і палітычныя дысцыпліны.

У пачатку 30-х гг. XIX ст. былі ліквідаваныя манастырскія уніяцкія і каталіцкія вучылішчы. Напрыклад, 6 лістапада 1831 г. было зачыненае

вучылішча базыльян у Барунах, у яго будынку была размешчана малая ўезная семінарыя для 20-ці сыноў уніяцкага духавенства. 1 мая 1832 г. закрылі піярскае вучылішча ў Лужках. Дамініканскае ўезнае вучылішча ў м. Ушачы было перанесенае ў г. Лепель. Ліквідаваліся прыходскія вучылішчы дамініканаў у Бялынічах і Шклове. За ўдзел манахаў у паўстанні былі закрытыя кляштар картэзіянцаў і школа пры ім ў Бярозе-Картузскай. Перасталі існаваць уезныя вучылішчы базыльян у Жыровічах і піяраў у Шчучыне, разам з кляштарам [22]. У снежні 1833 г. царскія ўлады ўзяліся за шчучынскую жаночую школу сясцёр міласэрнасці: манашак прымусілі даць падпіску не вучыць дзяўчынак рукадзеллю. Царскія чыноўнікі спадзяваліся такім чынам падарваць цікавасць дробнай шляхты да жаночай адукацыі. У 1842 г. да дзяржавы адышоў шпіталь сясцёр міласэрнасці, у выніку чаго ён прыйшоў у заняпад. У 1843 г. жаночая школа ў Шчучыне была зачыненая, а Ф.Друцкі-Дюбецкі насуперак жаданню манашак «выкупіў» іх фальварак Мажалёўцы-Мацейкаўцы. Сёстры выказалі нежаночую ўпартасць. Амаль без сродкаў да існавання яны засталіся ў мястэчку і працягвалі патаемна вучыць дзяўчынак [15, с. 106 – 107]. Царскія ўлады, такім чынам, свядома разбуралі тую інфраструктуру, якая склалася да канца XVIII ст.

Ліквідацыя манастырскіх каталіцкіх вучылішчаў і значнае аслабленне ўплыву каталіцкага духавенства на выхаванне юнацтва ў агульнаадукацыйных школах суправаджалася стварэннем рускай свецкай школы, якая ў другой чвэрці XIX ст. стала пануючай ў Беларусі. Гэты працэс ахапіў, безумоўна, і мястэчкі. Так, архіўныя крыніцы сведчаць, што «вслед за закрытием бывшего пиарского духовного училища в м. Щучин положено открыть светское двухклассное училище по методу Ланкастера» [23, арк.1]. Шчучынскае рускае вучылішча пачало працу толькі напрыканцы 1830-х гг., узроўню піярскай школы яно не дасягнула.

У выцясняемых са сферы адукацыі базыльянскіх колах каля 1833 г. узнік праект адкрыцця ў мястэчках і вялікіх вёсках для дзяцей мяшчан і сялян сеткі парафіяльных школаў, якія б навучылі іх чытаць, пісаць, лічыць, маляваць, далі веды па расійскай мове і геаграфіі з элементамі краязнаўства, св. гісторыі і катэхізісу, сельскай гаспадарцы і агародніцтву і дапамаглі б ім «з найбольшым пажыткам займацца абавязкамі свайго стану» [21, с. 102]. Але добрым намерам уніяцкай царквы ахапіць ніжэйшыя слаі адукацыяй, прыстасаванай да іх патрэбаў, даць асвету народу, не суджана было здзейсніцца. Гэтыя праекты былі рэалізаваны пазней у праваслаўным асяроддзі.

Шмат пачатковых школаў было арганізавана ў мястэчках пры праваслаўных цэрквах на працягу канца 30-х – 40-х гг. XIX ст. Так, пры цэрквах у мястэчках Магілёўскай епархіі з 1837 па 1849 гг. было створана

35 вучылішчаў: тры ў м. Шклоў, па аднаму ў мястэчках Чачэрск, Касцюковічы, Расна, Крычаў, Кадзін, Насовічы, Любавічы, Хоцімск, Чарэя, Прапойск, Горкі, Бялынічы, Гомель і інш. [24].

Былі факты ігнаравання мясцовым насельніцтвам пачатковых школаў пры праваслаўных прыходах па прычыне русіфікатарскіх мэтаў, якія ўскладваліся на гэтыя навучальныя ўстановы. Напрыклад, восенню 1862 г. канфлікт на гэтай глебе ўзнік паміж настаўнікам народнага вучылішча святаром Хамічэўскім і валасным праўленнем у Скідзелі. Хамічэўскі скардзіўся папячыцелю Віленскай навучальнай акругі, што мясцовае валасное праўленне не аказвае садзеяння ў адкрыцці вучылішча: «Крестьяне здешней местности, особенно живущие в м. Скиделе и ближних деревнях, еще слишком пропитаны польским духом, так что не считают большим для себя благодеянием заведенное здесь училище, когда в нем не учат польскому языку, а потому в следующем учебном году еще нельзя надеяться, чтобы они согласились нанять дом под училище и отапливать его за свой счет. (…) Мне гораздо легче было бы действовать на народ и доказывать ему пользу обучения русской грамоте и в духе православном, если бы мировые посредники, волостные писари не были католики или псевдо-православные, каков местный старшина Мозолевский, и если бы дела в волостных управлениях производились не на польском, а на русском языке». Рэакцыяй на гэты рапарт Хамічэўскага было звальненне старшыны Скідзельскай воласці Мазалеўскага як «неблагонадежного» [25].

Такім чынам, прыведзеныя матэрыялы паказваюць, што наяўнасць у шэрагу мястэчак (Шчучын, Жыровічы, Лыскова, Лужкі, Беразвечча, Валынцы, Ушач, Талачын і інш.) манастырскіх уніяцкіх і каталіцкіх навучальных устаноў паспрыяла ператварэнню іх у значныя асветніцкія цэнтры.

Вучылішчы, што знаходзіліся ў мястэчках, не былі вонкавай з’явай, яны ўплывалі на паўсядзённае жыццё іх жыхароў. Гэтаму, па-першае, спрыяла сама эпоха Асветніцтва, калі навучальныя ўстановы рабіліся больш адкрытымі і мацней уцягнутымі ў гаспадарчае, сацыяльнае і культурнае развіццё тых населеных пунктаў, дзе яны размяшчаліся. Па-другое, уплыў навучальных устаноў на паўсядзённасць мястэчак вызначалі канкрэтныя людзі (уладальнікі мястэчак, манахі, святары, настаўнікі), якія клапаціліся аб развіцці школьнай справы. Асобным кірункам узаемадачынення навучальных устаноў з мясцовым насельніцтвам з’яўлялася справа ахвяравання на асвету капіталаў і іншыя формы іх падтрымкі заможнымі прадстаўнікамі мясцовага грамадства, духавенствам.

Навучальныя ўстановы акрамя непасрэдна адукацыйнай выконвалі і іншыя важныя функцыі. На іх ускладвалася ажыццяўленне пэўных мерапрыемстваў па ахове здароўя, як уласных выхаванцаў, так і па магчымасці мясцовага насельніцтва. Пры некаторых з іх дзейнічалі батанічныя сады, аптэкі. Захаваліся сведчанні аказання настаўнікамі некаторых местачковых вучылішчаў ветэрынарных паслуг. Адчувалася дзейнасць навучальных установаў у непасрэдным эканамічным жыцці мястэчак. Навучэнцы ды настаўнікі папаўнялі местачковае насельніцтва і стваралі для мястэчка дадатковы рынак тавараў і паслуг.

Навучальныя ўстановы мястэчак, іх выкладчыкі і навучэнцы зведалі на сабе ўсе павароты адукацыйнай палітыкі царызму разглядаемага часу. Да сярэдзіны 20-х гадоў XIX ст. у сувязі з ліберальным стаўленнем расійскіх уладаў да мясцовай шляхты асвета амаль цалкам была аддадзеная ў рукі патрыётаў Рэчы Паспалітай на чале з Адамам Чартарыйскім. Школа займала значнае месца ў іх планах як сродак выхавання новых змагароў за аднаўленне Рэчы Паспалітай. Пасля следства і суда над філарэтамі і філаматамі пачынаецца русіфікацыя адукацыі, якая ўзмацнілася пасля падаўлення паўстання 1830 – 1831 гадоў. Адбывалася разбурэнне культурнай інфраструктуры, якая склалася да канца XVIII ст. Што датычыць беларускай мовы, то яна, як і раней, не дапускалася ў школу. Такім чынам, узнікненне беларускай школы было немагчымым. Не ўсведамляла такой неабходнасці і насельніцтва. Рух за беларускую школу ў Беларусі, у тым ліку і ў мястэчках, разгарнуўся толькі ў пачатку XX ст.

Спіс крыніц і літаратуры

1. Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі. – Мінск, 1968.
2. Куль-Сяльверстава, С.Я. Беларусь на мяжы стагоддзяў і культур: Фармаванне культуры Новага часу на беларускіх землях (другая палова XVIII – 1820-я гады) / С.Я. Куль-Сяльверстава. – Мінск, 2000.
3. Белецкий, А. Исторический обзор деятельности Виленского учебного округа за первый период его существования. 1803 – 1832. / А.Белецкий. – Ч. 1 – Отдел 3. – Вильно, 1906.
4. РДГА. – Ф. 733. – Воп. 95. – Адз.зах. 380.
5. НГАБ. – Ф. 2507. – Воп. 1. – Адз.зах. 1.
6. Мальдзіс, А. Забельскі дамініканскі калегіум / А.Мальдзіс // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Т. 3. – Мінск, 1996. – С. 391.
7. РДГА. – Ф. 733. – Воп. 62. – Адз. зах. 389.
8. ДГА Літвы. – Ф. 567. – Воп. 2. – Адз. зах. 1878.
9. НГАБ у Гродна. – Ф. 1. – Воп. 1. – Адз. зах. 2197.
10. ДГА Літвы. – Ф. 567. – Воп. 2. – Адз. зах. 1878.
11. Archiwum do dziejów literatury i oświaty w Polsce. – T. X. – Kraków, 1904.
12. Baliński, M., Lipiński, T. Starożytna Polska pod względem historycznym, geograficznym i statystycznym / M.Baliński, T.Lipiński. – T. III. – Warszawa, 1846.

13. Łukaszewicz, I. Historya szkół w Koronie i Wielkim Księstwie Litewskim / I.Łukaszewicz. – T. 4. – Poznań, 1851. – S. 241; Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Т. 6. – Кніга ІІ. – Мінск, 2003. – С. 242.
14. Крень, И.П. Щучин: историко-экономический очерк / И.П. Крень, Я.Н. Мараш. – Минск, 1989. – С. 8; Сборник материалов для истории просвещения в России… – Т. 1. – СПб., 1893. – С. 250; РДГА. – Ф. 733. – Воп. 62. – Адз. зах. 389. – Арк. 205.
15. Данскіх, С.У. Наш Шчучын / С.У.Данскіх. – Гродна, 2001.
16. Самусік, А.Ф. Любяшоўскі піярскі калегіум / А.Ф.Самусік // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Т. 4. – Мінск, 1997.
17. НГАБ у Гродне. – Ф. 1. – Воп. 20. – Адз. зах. 4.
18. Бобровский, П. Материалы для географии и статистики России. Гродненская губерния / П.Бобровский. – Ч. 2. Приложения. – СПб., 1863.
19. НГАБ у Гродне. – Ф. 1. – Воп. 28. – Адз. зах. 708.
20. Палуцкая, С.В. Барунская базыльянская школа і яе выхаванцы / С.В.Палуцкая // Матэрыялы навукова-практычнай краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай Ашмяншчыне. – Гродна-Ашмяны, 1995.
21. Марозава, С.В. Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі (1596 – 1839 гады) / С.В.Марозава. – Гродна, ГрДУ, 2001.
22. Beauvois D. Szkolnictwo polskie na ziemiach Litewsko-Ruskich. 1803 – 1832. – T. 2. – Rzym–Lublin, 1991. – S. 430; НГАБ. – Ф. 3157. – Воп.1. – Адз. зах. 70. – Арк. 33.
23. НГАБ у Гродне. – Ф. 1. – Воп. 27. – Адз. зах. 375.
24. НГАБ. – Ф. 2254. – Воп. 1. – Адз. зах. 75. – Арк. 5 – 76.
25. НГАБ у Гродне. – Ф. 1. – Воп. 27. – Адз. зах. 1637. – Арк. 9 – 11.

Соркіна Іна Валер'еўна – кандыдат гістарычных навук, дацэнт, Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы. Сфера навуковых інтарэсаў – убраністыка, мястэчкі Беларусі.

УДК 27-534.5(476)

Т.Г. Мдивани (Минск)

МУЗЫКА И ПРАВОСЛАВНЫЕ ПЕСНОПЕНИЯ: К ВОПРОСУ О ТЕРМИНОЛОГИИ

В статье затрагивается проблема соотношения церковного песнопения и традиционного понятия о музыке как виде искусства. Возрождение православной певческой культуры в XIX веке не утратило актуальности и в постсоветском обществе. Главный акцент сделан на вопросе терминологии.

Никакая передача знаний, никакое общение между собой в любой области не может осуществляться при отсутствии профессионального языка, или терминологического аппарата. Музыкальная терминология, относящаяся к области академической музыки и к песнопениям православной церкви, исключительно разнообразна. Но, как справедливо

заметил доктор искусствоведения, профессор Московской консерватории В. Медушевский, «…великое множество трудов написано о музыке <…>, а главный вопрос <…> обходим стороной – вопрос об отношениях между музыкой церковной и светской» [1, с. 160]. Мы же сейчас поставим вопрос о соотношении понятий «музыкальное произведение» и «православное песнопение», «музыка» и «богослужебное пение». История теоретических воззрений на этот вопрос, как и череда мнений достаточно освещены Густовой Л. А. в кандидатской диссертации «Музыкально-певческое искусство православной церкви в Беларуси». Однако вопрос этот по-прежнему актуален, поскольку разночтения не устранены.

Что составляет объем понятия «музыка», каковы его границы? В самом общем плане это:

- Вид искусства, куда входит композиторское творчество и музицирование, или исполнительство – игра на разных инструментах и вокализирование (профессиональное и любительское);
- Музыкальное произведение, созданное композитором;
- Народная музыка.

Что касается православных песнопений, то они имеют музыкальную составляющую, но являются ли музыкой?[1] Как пишет регент В. Мартынов, богослужебное пение «само по себе есть божественный чин и порядок» [2, с. 6], что определяет смысл и стилистику православных песнопений. Последние есть распевание богослужебных текстов, где главенствующее значение принадлежит Слову, подчиняющему себе мелос, мелодическое начало.

К настоящему времени сложились **три точки зрения** по вопросу соотношения заявленных понятий. **Первая** гласит о различии православных песнопений и музыки. Процитируем важнейшие мнения:

Вознесенский И.: «…распределение церковных песнопений ясно должно указывать пределы их мелодий, выступая за которые они теряют существенные свойства церковности и принимают чуждые им элементы светской музыки» [3, с. 16];

[1] Богослужебное пение и православные песнопения, начиная с Шестого Вселенского Собора (VII в.), в строгом значении музыкой не являлись. Они противопоставлялись ей и по своему внутреннему смыслу, и по происхождению, и по своим причинам, целям, условиям существования, средствам выражения. Богослужебное пение – это не простое пение, а пение во имя служения Богу. Это означает исполнение Его воли, что проявляется в следовании установленному Им порядку, или чину (по В. Мартынову).

Николаев Б., протоиерей: «Если церковное пение как музыкальное искусство выражает чувства и настроения церковного сообщества в целом, то почему оно не может отражать субъективных настроений художника-композитора, особенно тогда, когда эти настроения отвечают вкусам какой-то части этого общества?… Вот вам и протестантский персонализм: сколько верующих, столько и религий. Наконец, если церковное пение есть музыкальное искусство, то оно не должно отставать от жизни… Отсюда и джазовая музыка при богослужении, и реквием, и литургическая драма. Все это чуждо нашей Православной Церкви» [4, с. 12];

Мартынов В.: «К древнерусскому богослужебному пению надо относится не столько как к объекту изучения, сколько как к средству спасения» (Цит. изд., с. 19). Это мнение поддерживается И. Гарднером [5, с. 557 – 578].

Медушевский В.: «Они (*различия – Т.М.)* столь велики, что наш крупнейший композитор и авторитет в этом вопросе В. И. Мартынов рекомендует развести <…> понятия даже терминологически, говоря, с одной стороны, о богослужебном пении, а с другой – о музыке, и ни в коем случае не называя первое «музыкой Церкви» [1, с. 160].

Вторая точка зрения выражается в применении слова «музыка» как к светской музыке, так и к православным песнопениям и богослужебному пению, имея в виду и мелодический аспект распевания текстов, и музыкальный жанр. Назовем некоторые источники:

- Статьи «Музыка» и «Церковная музыка» в «Музыкальной энциклопедии», состоящей из 6 томов (М.: Советская энциклопедия, 1973 – 1982);
- Раздел «Русская духовная музыка XX века» в книге «История современной отечественной музыки», вып. 3 (М., 2001);
- Статья «О современном состоянии церковного пения» М. Асмуса, а также высказывания Н. Герасимовой-Персидской и др.

Эта точка зрения имеет следующую аргументацию: «Именно в братских школах, – пишет Е. Николаева, – рождалось то новое для Руси понимание богослужебного пения, как особого рода музыки…» [6, с. 145]. Речь идет о внедрении в XVII веке в православные песнопения западноевропейского аккордового склада изложения. М. Бражников считал, что почин был положен Н. Дилецким, чей труд «Идея грамматики мусикийской» свидетельствовал «об окончательном переходе русского певческого искусства в новый мир гармонического многоголосия» [7, с. 412]. Мартынов В. И., будучи адептом разделительной концепции,

говорит в этом случае о гибриде музыки и богослужебного пения, о «духовном компромиссе» (Цит. изд., с. 175).

Существует и **третья точка зрения**, связанная с использованием в теории и практике церковного пения терминологии (мажор, минор, тональность, проходящие хроматические звуки и т.д.), сложившейся в европейской теории музыки. Между тем известно, что в основе православных песнопений лежит гласовая, а не тонально-гармоническая система. Вот, что писал по этому поводу выдающийся ученый XX века Ю. Н. Холопов: «Древнерусские гласы – одна из великих ладовых систем, сравнимая по важности с другими великими ладовыми массивами – древнегреческой и западной грегорианикой. Поразительно, однако, что до сих пор нет ладовой теории древнерусской монодии, несмотря на ценные разработки ряда ученых. Мы хорошо знаем, например, в каком ладу та или иная грегорианская мелодия, есть твердые надежные критерии однозначного определения лада в каждом конкретном случае. Но что за лады в <…> древнерусских мелодиях, мы не знаем; неизвестно, сколько их, как их надо именовать, каковы их признаки; мы не знаем, тождественны ли лады гласам или нет. Для создания полной картины необходимы дальнейшие исследования…» [8, с. 177]. Об этом он писал в 1988 году, посвятив теме целый параграф своего трактата. Тем самым был заложен теоретический фундамент для изучения обиходных ладов как основы православных песнопений.

Наконец, есть разночтения и в манере пения, и в репертуаре. В православном храме можно услышать и уста́вное пение, и новые песнопения, и гармонизации, создаваемые на потребу. И хотя этот вопрос прямо не относится к заявленной теме, но он является косвенной характеристикой общего состояния православной певческой культуры на современном этапе.

Думается, что разные точки зрения, изложенные здесь, являются результатом сложившейся в течение десятилетий исторической ситуацией на территории бывшего СССР. Нынешнее же положение вещей чем-то напоминает конец XIX века, когда остро встал вопрос о восстановлении истинной православной певческой культуры. Так, например, П. Чайковский писал, что «нужен мессия, который бы пошел по новому пути, а новый путь заключается в возвращении к седой старине». А. Кастальский же нашел выход в создании специального «Практического руководства к выразительному пению стихир».

Таким образом, затронутый здесь вопрос о разночтениях в терминологии требует обстоятельного и серьезного изучения, ибо

неточность употребления терминов вносит путаницу не только в понимание важнейшего пласта культуры, но и в постижение истин православного жития. Поэтому для решения обозначенных вопросов необходимы, думается, не только семинары, совещания и встречи для их обсуждения, но и создание специальной рабочей группы для универсализации терминологического аппарата и выработки объединяющих принципов по исполнению православных песнопений.

Список источников и литературы

1. Медушевский, В. В. Внемлите ангельскому пению / В. В. Медушевский. – Минск: Православное братство во имя Архистратига Михаила, 2000.
2. Мартынов, В.И. История богослужебного пения / В.И.Мартынов. – Сергиев Посад, 1994.
3. Вознесенский, И. О церковном пении православной греко-российской церкви / И. Вознесенский. – Изд. 2-е. – Рига, 1890.
4. Николаев, Б., протоиерей. Знаменный распев и крюковая нотация как основа русского православного церковного пения / Б.Николаев. – Иосифо-Волоцкий монастырь, 1995.
5. Гарднер, И.А. Богослужебное пение в Русской православной церкви. Сущность. Система. История / И. А. Гарднер. – Сергиев Посад, 1998.
6. Николаева, Е. В. История музыкального образования. Древняя Русь. Конец X – середина XVII столетия / Е. В. Николаева. – М.: Владос, 2003.
7. Бражников, М. В. Древнерусская теория музыки / М.В.Бражников. – Л.: Музыка, 1972.
8. Холопов, Ю.Н.Гармония. Теоретический курс / Ю.Холопов. – М.: Музыка, 1988.

Мдивани Татьяна Герасимовна – доктор искусствоведения, ведущий научный сотрудник Института искусствоведения, этнографии и фольклора имени К. Крапивы Национальной академии наук Беларуси.

УДК 37.01(476):17

В.С. Болбас (Мазыр)

ХРЫСЦІЯНСКАЯ ЭТЫКА ЯК НАЙВАЖНЕЙШАЯ КРЫНІЦА ФАРМІРАВАННЯ ЭТЫКА-ПЕДАГАГІЧНАЙ ДУМКІ БЕЛАРУСІ

В статье анализируется взаимосвязь и взаимовлияние религии и морали как двух значимых пластов духовной культуры. Рассматриваются исторические и социальные условия распространения христианской этики и христианских идей в белорусском обществе. Определяются духовные принципы, заложенные в основу этико-педагогической мысли Беларуси.

Рэлігія і мараль утвараюць два магутныя пласты духоўнай культуры. Маральны патэнцыял хрысціянства з яго верай у перамогу дабра і справядлівасці сфарміраваў многія правілы і нормы зямнога суіснавання людзей. Пачынаючы з глыбокай старажытнасці, хрысціянская этыка выпрацоўвала маральныя каштоўнасці, якія вызначалі шматлікія бакі жыцця, у тым ліку і пытанні выхавання.

У язычніцкі перыяд ва ўсходніх славян існавала пэўная сістэма правіл супольнага жыцця, якая насіла прадпісальны характар і была цесна звязана з абраднасцю, з шанаваннем звышнатуральных сіл. Практычна для ўсіх і кожнага былі ўстаноўлены досыць строгія рамкі паводзін шляхам разнастайных табу і забарон. Ужо ў гэты час нашымі продкамі выпрацоўваюцца адпаведныя формы паводзін, у межах якіх індывід мог рабіць самастойныя ўчынкі, але з досыць падрабязнай рэгламентацыяй сваіх дзеянняў. Падобныя прадпісанні ўтваралі, як іх цяпер называюць, першасныя асновы маральнасці. Сярод найважнейшых з іх – забарона забойстваў, шанаванне багоў, бацькоў, старэйшых, захаванне традыцый і г.д. На многія з іх абапіраецца і хрысціянская этыка. Менавіта апора на каштоўнасці духоўнай культуры народа дапамагла хрысціянству ў асноўным негвалтоўна распаўсюдзіцца на ўсходнеславянскіх землях. Усё гэта дае падставы сцвярджаць, што пісьменнасць, летапісанне, асвета і педагагічная думка ўсходніх славян маюць сваю ўласную аснову, а хрысціянства надало істотны дынамізм развіццю гэтых працэсаў і прынесла з сабой новыя элементы, якія прыжыліся дзякуючы адпаведнаму ўзроўню развіцця матэрыяльнай і духоўнай культуры нашых продкаў.

Поспех распаўсюджвання хрысціянскіх ідэй на беларускіх землях быў настолькі значным, што ўжо ў XII ст. тут з'яўляюцца такія магутныя духоўныя постаці, як Еўфрасіння Полацкая, Кірыл Тураўскі, Клімент Смаляціч і інш. Іх уплыў на развіццё айчынных ідэй маральна-духоўнага выхавання быў выключны. Увогуле нельга не пагадзіцца з думкай, што само хрысціянства як аснова сярэдневяковага светапогляду і ідэалогіі «было па сваёй сутнасці менавіта "педагагічным" рухам, пэўнай маральна-рэлігійнай школай чалавецтва» [1, с. 233].

У адрозненні ад язычніцкай рэлігіі, якая ў аснове была натуралістычнай, хрысціянства ўзнікла як рэлігія чалавека. У падмурак светапоглядных уяўленняў хрысціянства быў пакладзены прынцып духоўна-маральнай каштоўнасці чалавека і пастаянная скіраванасць да агульнага дабра. Два вымярэнні чалавека (душа і цела) дапаўняюцца трэцім – «дух» (духоўнасць) – прыналежнасць да боскага праз веру. Згодна з хрысціянскім веравучэннем падмуркам грамадскага ўладкавання

павінна стаць высокамаральнае жыццё. Дамінантай паводзін чалавека, мэтай яго выхавання з'яўляецца маральнасць.

На думку У.М. Конана, менавіта ў перыяд ранняга хрысціянства тэарэтычна афармляюцца наступныя прынцыпы ўладкавання грамадскага супольнага жыцця: «а) усведамленне духоўнай свабоды як істотнай якасці чалавека, што адрознівае яго ад усіх іншых форм зямнога жыцця; б) апеляцыя да маральнай прыроды чалавека, да яго сумлення як вышэйшаму крытэрыю адносін паміж людзьмі; в) выпрацоўка паняцця чалавека як вышэйшай каштоўнасці, якая не залежыць ад яго нацыянальнай і сацыяльнай прыналежнасці» [2, с. 7].

Паводле хрысціянскіх уяўленняў чалавек ад нараджэння нясе на сабе цяжар першароднага граха, але ў яго ёсць адзіны шлях да ўратавання – маральнае ўдасканаленне. Важнейшым зыходным пунктам хрысціянскай этыкі з'яўляецца сцвярджэнне, што кожны чалавек можа радыкальна «змяніць сваю сутнасць». Зыходзячы з таго, што кожны індывід мае магчымасць не толькі выправіць дрэннае, а і палепшыць прыродна добрае, маральна-этычныя ідэі напаўняюцца духам аптымізму.

Асноўная мэта хрысціянскай этыкі – дасягненне ўсеагульнага дабра – магла ажыццявіцца толькі праз дабрачыннасць. Была распрацавана сістэма маральна-духоўных каштоўнасцей і Богачалавек вылучаўся ў якасці яе ўвасаблення. Дзякуючы такой арыентацыі на маральны абсалют, які натуральна ўспрымаецца чалавецтвам, хрысціянская этыка самым рашучым чынам уплывала на фарміраванне ідэй маральнага выхавання ў грамадстве. У яе ўяўленні быць чалавекам – гэта значыць жыць па запаветам Ісуса Хрыста. Праблема выхавання дабра ці скіравання выхаванцаў да дабра становіцца галоўнай і асноўнай праблемай выхавання наогул.

Важна адзначыць, што ў адрозненні ад язычніцкага перыяду, калі паняцце дабра, маральнасці цалкам і поўнасцю вызначалася інтарэсамі канкрэтнай людской супольнасці, хрысціянская этыка акцэнтуе ўвагу на ўзвышэнні кожнага чалавека. Маральныя запаветы хрысціянства звернуты, перш за ўсё, да ўнутранага свету індывіда, да яго сумлення. Нават абмежавальны характар маральных норм уяўляе сабой, у першую чаргу, устанаўленне межаў уласных дум, помыслаў дзеянняў і ўчынкаў. Адносіны да іншых – гэта перш-наперш адносіны да самога сябе.

Хрысціянская любоў аб'яўляла поўную забарону на помсту, якая ўладарыла ў язычніцтве. Нават злыя думкі лічыліся грахоўнымі. Гэта быў прынцыпова новы падыход у арганізацыі супольнага жыцця і грамадскіх адносін. З любві выводзяцца такія якасці, як пакорлівасць, непраціўленне злу гвалтам, добразычлівасць, міласцівасць, гасціннасць і інш. Больш таго, чалавечыя якасці, якія грунтуюцца на любві, істотна адрозніваюцца

ад іншых, нават знешне падобных. Так, даследчыкі падкрэсліваюць, што трэба бачыць розніцу «паміж пакорлівасцю дзеля любві і пакорлівасцю дзеля ўласнага выратавання» [3, с. 20]. Пакорлівасць многімі трактуецца як праява баязлівасці, нерашучасці, бяздзейнасці. Але гэта зусім не так. На час свайго зараджэння хрысціянства мела на мэце радыкальна змяніць існаваўшую рэчаіснасць. Хрысціянскае веравучэнне заклікала да цярпення не дзеля таго, каб прыстасавацца да несправядлівасці, не дзеля таго, каб схіліцца перад злом, а каб «сваёй пакорлівасцю ўтаймаваць сканцэнтраванае па хрысціянскіх паняццях у чалавечай гордасці сусветнае зло, перамагчы яго маральна, духоўна» [3, с. 29]. Любоў бачылася галоўным інструментам ачышчэння грамадства ад злосці і нянавісці.

Хрысціянская этыка прапануе новае разуменне справядлівасці, якая павінна ляжаць у аснове грамадскіх адносін. У дахрысціянскай рэлігіі паняцце справядлівасці ўключала ў сябе прынцып эквівалентнасці дзеяння і дзеяння ў адказ, іншымі словамі, справядлівасць мела месца тады, калі за дабро плацяць раўназначным дабром, за зло – злом. Новая мараль будавалася на прынцыпова новых падыходах. Высокамаральны чалавек павінен рабіць дабро без усялякай думкі пра нейкую адплату за гэта.

Арыентацыя на новыя маральна-духоўныя каштоўнасці абумовіла рашучую змену мэтаў выхавання. У адрозненні ад выхаваўчых мэтаў іншых ідэалагічных плыняў і натуралістычнай этыкі, якія імкнуліся ўдасканаліць чалавека ў межах яго ўласных магчымасцей і здольнасцей, хрысціянства ставіць задачу радыкальна змяніць саму чалавечую сутнасць. Такія ўстаноўкі хрысціянскай этыкі стваралі маральны ідэал і для тых, хто імкнецца да яго цалкам, і для тых, хто хоча пазбавіцца ад асобных заганаў і набыць тыя або іншыя дабрачыннасці. З пункту гледжання хрысціянскай маралі чалавек з'яўляецца вобразам божым, а ў якасці маральнага ідэала выступае Ісус Хрыстос. Трэба прызнаць, што ідэал хрысціянства на многія стагоддзі вызначыў маральны ідэал педагагічнай думкі многіх народаў, у тым ліку і беларускага. Наогул хрысціянства дало пачатак усталяванню універсалізму маральных патрабаванняў на аснове ўласнай дактрыны, што істотна адбілася на развіцці тэорый маральнага выхавання. Па сутнасці фарміравалася новая мараль, ядром якой з'яўлялася духоўна-маральная самакаштоўнасць чалавека і ідэя агульнага дабра, як перадумова існавання грамадства і яднання людзей. Дабро і абавязак утваралі падмурак змястоўнага напаўнення тэорыі і практыкі маральнага выхавання.

Найважнейшай асаблівасцю хрысціянскага выхавання быў яго наднацыянальны, агульначалавечы характар. Практычна ўпершыню ў

гісторыі чалавецтва ставіліся аднолькавыя задачы маральнага ўдасканальвання абодвух палоў – мужчынскага і жаночага. Хрысціянства дало ступень святасці шлюбу, сям'я становіцца найважнейшай сацыяльнай ячэйкай грамадства. У адрозненні ад ветхазаветнай сям'і, дзе панаваў суровы патрыярхат з неабмежаванай уладай гаспадара, хрысціянская будуецца на падмурку любві, узаемнай дапамогі, адноснай роўнасці і свабоды ўсіх членаў сям'і. Значна ўзрастае роля сям'і ў выхаванні дзяцей. Прынцыпова новае становішча ў гэтым працэсе займае жанчына, якая карыстаецца правамі жонкі і маці. Асноўным прынцыпам сямейнага выхавання Свяшчэннае пісанне аб'яўляе павагу да бацькоў. З іншага боку бацькі павінны глядзець на дзяцей як на божы падарунак і пастаянна клапаціцца аб іх выхаванні.

Адной з асаблівасцей хрысціянскага выхавання была яго арганізацыя з улікам свабоды выбару кожнага індывіда. Праблема свабоды волі аказала сур'ёзны ўплыў на фарміраванне тэарэтычных асноў маральнага выхавання. Згодна асноўных палажэнняў хрысціянскага веравучэння, чалавек, дзякуючы свайму свядомаму, асабістаму пачатку ў маральна-духоўным плане, валодае свабодай выбару: быць добрым ці дрэнным. Такім чынам, свабода з'яўляецца абавязковай умовай адказнасці індывіда за свае паводзіны. Кожны чалавек абавязаны імкнуцца да развіцця ў сабе рысаў і якасцей боскага вобразу. І хоць гэта ў многім адбываецца пад уздзеяннем знешніх умоў і фактараў, але іх уздзеянне магчыма толькі праз уключэнне самога індывіда ў гэты працэс. Таму роля індывіда ў асабістым маральна-духоўным удасканаленні не можа быць пасіўнай. Свабода чалавека мае два ўзаемазвязаныя бакі. Па-першае, кожны чалавек можа самастойна асэнсоўваць і вызначаць свае адносіны да тых ці іншых каштоўнасцей і, па-другое, можа самастойна прымаць рашэнні і здзяйсняць адпаведныя ўчынкі. У хрысціянстве маральна-свабодным лічыцца той чалавек, хто выкарыстоўвае свабоду волі на карысць агульнаму дабру.

Складанасць праблемы часта заключаецца ў тым, што ў рэальным жыцці не заўсёды проста можна адрозніць дабро ад зла. З дапамогай пэўных ведаў, на аснове жыццёвага вопыту чалавек павінен сам вызначыцца ў сваім выбары. Задача ўскладняецца тым, што ў кожнай асобнай сітуацыі зло часта маскіруецца пад дабро. І калі ў якасці абсалютнага дабра можна ўказаць ідэальны ўзор паводзін, то для канкрэтных абставін даваліся досыць акрэсленныя арыенціры, не столькі

дабра, колькі таго, што не з’яўляецца дабром, чаго трэба пазбягаць і што яму патрэбна супрацьпастаўляць. Невыпадкова, што шэраг амаральных рысаў, якасцей і адпаведных дзеянняў адносіцца да грахоўных. Сярод іх гардыня, насілле, крадзёж, хлусня, паклёп, зайздрасць, гнеў, распуста, сквапнасць, неміласэрнасць і інш.

Хрысціянская этыка вучыць, што не заўсёды дабрадзейная свядомасць увасабляецца ў дабрадзейных справах. Сапраўды, высокамаральным чалавекам можа быць той, у каго кожны элемент маральнай свядомасці з’яўляецца асновай адпаведных учынкаў, а з іншага боку, кожны дабрадзейны ўчынак з’яўляецца вынікам сукупнай духоўнай вартасці асобы. Іншымі словамі, сама вера, маральнасць чалавека павінны мець дзейнасны характар. Дзеля ўратавання недастаткова аднаго аскетычнага прытрымлівання запаветаў Хрыста, на першае месца вылучаецца грамадская значнасць, менавіта, дзеянняў, учынкаў чалавека, іх выніковасць.

Такім чынам, можна з упэўненасцю сцвярджаць, што ўплыў хрысціянскай этыкі на развіццё тэарэтычных і практычных асноў маральнага выхавання на беларускіх землях у многіх адносінах меў вызначальны характар і садзейнічаў распрацоўцы і ўсталяванню агульначалавечых падыходаў пры вырашэнні праблемы маральна-духоўнага ўдасканалення асобы і грамадства. У аснову развіцця айчыннай этыка-педагагічнай думкі былі закладзены наступныя прынцыпы: прыярытэтнасць маральнага выхавання ў агульным развіцці асобы, імкненне да ўсеагульнага дабра, прадстаўленне кожнаму індывіду свабоды волі, пабудова людскіх узаемаадносін на любві, талерантнасць у шырокім сэнсе слова і пераемнасць з апорай на традыцыяналізм.

Спіс крыніц і літаратуры

1. Идеи эстетического воспитания: антология: в 2-х т. – М.: Искусство, 1973. – Т. I. – 408 с.
2. Идеи гуманизма в общественно-политической и философской мысли Белоруссии. – Минск: Наука и техника, 1977. – 280 с.
3. Майоров, Г.Г. Этика в средние века / Г.Г. Майоров – М.: Знание, 1986. – 64 с.

Болбас Валерый Сяргеевіч – кандыдат педагагічных навук, дацэнт, Мазырскі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя І. П. Шамякіна.

УДК 37.01(476)

М.А. Станчиц (Минск)

ЭТИЧЕСКОЕ НАСЛЕДИЕ БЕЛОРУССКИХ ПРОСВЕТИТЕЛЕЙ КАК ИСТОЧНИК ПРИОБЩЕНИЯ ШКОЛЬНИКОВ К ХРИСТИАНСКИМ ЦЕННОСТЯМ

Данная статья представляет собой разработку факультативного курса «Развіццё этычнай думкі ў Беларусі». Историческое наследие белорусских просветителей, основанное на христианской духовной традиции, должно стать основой воспитания и обучения современной молодежи.

Проблемы христианства актуальны уже более двух тысячелетий. В последнее время одна из таких проблем формулируется следующим образом: спасет ли православие христианскую цивилизацию? «Слово России и Русской православной церкви в современной христианской цивилизации» – эта тема, поставленная на X Всемирном Русском народном соборе в апреле 2006 года, стала предметом обсуждения на круглом столе «Литературной газеты», среди участников которого были представители всех христианских конфессий (Литературная газета, 4 – 10 июля 2007 г.). Участники дискуссии подчеркивали, что только создав базовые ценности, можно осуществить свое назначение в рамках современной европейской цивилизации; что христианская цивилизация – это в том числе и система христианских ценностей, которые вошли в культуру, в быт, в систему представлений «что можно, а что нельзя»; что необходимо разобраться в некоторых этических и антропологических вопросах, возникающих в связи с социальными учениями.

Поставленные проблемы актуальны и для Беларуси, которая «больш за 1000 год знаходзіцца ў сферы хрысціянскай веры. На працягу доўгага часу свядомасць беларусаў знаходзілася пад уплывам розных веравалнняў: спачатку гэта было спалучэнне язычніцкіх поглядаў і праваслаўя, якое марудна замацоўвалася на гэтых тэрыторыях, потым наспеў час каталіцызму, затым – кароткі ўсплеск уніяцтва» [1, с. 3].

Решение этих проблем имеет значение и для сферы образования, а точнее, воспитания, так как именно в школьном возрасте происходит приобщение к моральному наследию, этическим знаниям, христианским ценностям.

Источники приобщения школьников к этим ценностям различны. В нашем опыте это были факультативные курсы этической направленности. Обратимся к одному из таких курсов, а именно «Развіццё этычнай думкі

ў Беларусі» [2, с. 65]. В пояснительной записке к данному курсу отмечаем следующее.

Незалежнасць Рэспублікі Беларусь і адраджэнне нацыянальнай культуры застануцца ўяўнымі, калі не паклапаціцца аб нацыянальнай самасвядомасці кожнага грамадзяніна. «У развіцці культуры этнасу нацыянальная самасвядомасць разам з нацыянальным характарам і развіццём нацыянальнай мовы адыгрываюць рашаючую ролю» [3, с. 111].

Пад нацыянальнай самасвядомасцю разумеецца ўсведамленне асобай сябе як носьбіта духоўных каштоўнасцей, уласцівых пэўнаму этнасу, нацыі. Сярод духоўных каштоўнасцей быцця чалавека звернем увагу менавіта на каштоўнасці этычныя. Якраз яны з'яўляюцца асноватворнымі ў фарміраванні пачуцця нацыянальнай годнасці, павагі да гісторыі, мовы сваіх продкаў, любові да Радзімы, пачуцця адказнасці за яе лёс. Таму актуальная задача сучаснай беларускай педагогікі – знайсці шляхі, формы і сродкі выхавання нацыянальнай самасвядомасці вучнёўскай моладзі, абапіраючыся на традыцыі, гістарычны вопыт нацыянальнага выхавання, маральныя каштоўнасці беларускага менталітэту.

Духоўнаму адраджэнню, нацыянальнай самасвядомасці ў сучасных умовах будзе садзейнічаць знаёмства падрастаючага пакалення з каштоўнасцямі эпохі, якая ўвайшла ў гісторыю чалавецтва як эпоха Адраджэння.

Асноўная, вызначальная праблема этычнай думкі эпохі Адраджэння – праблема чалавека. Актуальнымі з'яўляюцца і сёння такія яе аспекты, як узаемаадносіны чалавека і грамадства, чалавека і дзяржавы, нацыянальная самасвядомасць. Цікавасць да ўнутранага свету чалавека – гэта цікавасць да яго духоўнасці як культурнай каштоўнасці, сродка духоўнага развіцця асобы, маральнасці, узроўню сфарміраванасці яго этычных поглядаў і перакананняў. Беларускія мысліцелі (Ф.Скарына, С.Полацкі, М.Гусоўскі, М.Літвін, С.Будны, Л.Зізаній, Я.Даманеўскі, А.Валан і інш.) праяўлялі вялікую цікавасць да пытанняў прызначэння і сэнсу жыцця чалавека; яго асабістых інтарэсаў і грамадзянскага абавязку; духоўнай свабоды і этычнага ідэалу; маральнага выбару і адказнасці; адносін маралі і веры, маралі і права.

Годнасць, дабрыня, любоў, чалавекалюбства, справядлівасць, сэнс жыцця – этычныя каштоўнасці, з якімі вучні старэйшых класаў могуць пазнаёміцца больш падрабязна і глыбока ў працэсе вывучэння факультатыўнага курса «Развіццё этычнай думкі ў Беларусі»[1].

Мэта курса: далучыць да маральных каштоўнасцей, закладзеных у

[1] У факультатыве адлюстраваны перыяды сярэднявечча, эпохі Адраджэння, эпохі Асветніцтва.

філасофіі і культуры беларускага нрарода, у светапоглядзе айчынных мысліцеляў.

Задачы курса:

- знаёмства з вытокамі этычнай думкі Беларусі;
- пасціжэнне сутнасці этычных ідэй, тэорый, канцэпцый беларускіх мысліцеляў ад Еўфрасінні Полацкай да нерэлігійных маральных вучэнняў;
- вызначэнне індывідуальных інтарэсаў навучэнцаў у адносінах да прапанаваных персаналій;
- актывізацыя індывідуальнай каштоўнасна-пошукавай дзейнасці вучняў.

ВУЧЭБНА-ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН КУРСА

№ п/п	Тэмы	Колькасць гадзін
1	Ля маральных вытокаў. «Еуфросиниа – небопарный орел, пропаривши от Запада до Востока, яко Луна солнечная, просветивши всю землю Полоцкую!»	2
2	Тураўскі Залатавуст. Хрысціянска-этычны характар «Слоў» К.Тураўскага	2
3	Гісторыя рэнесанснай этыкі ў Беларусі	3
4	Філасофска-этычныя погляды Ф.Скарыны. Новае разуменне Ф.Скарынам годнасці чалавека	2
5	Прынцып адзінства дабрачыннасці, прыгажосці і ісціны ў этыцы Ф.Скарыны	2
6	Этыка-гуманістычная канцэпцыя М.Гусоўскага	2
7	Этычныя погляды М.Літвіна	2
8	Уклад С.Буднага ў развіццё айчынных этычных уяўленняў	2
9	Ідэя неабмежаванай маральнай свабоды ў вучэнні Л.Зізанія	2
10	Гуманістычны аптымізм Ф.Соцына	2
11	Праблема маральнага выбару ў этыцы Я.Даманеўскага	2
12	Маральныя погляды Я.Намыслоўскага	2
13	Свецкі характар этычных поглядаў С.Кашуцкага	2
14	Агульначалавечыя каштоўнасці і маральны ідэал у творчай спадчыне С.Полацкага	2
15	Эвалюцыя этычных поглядаў А.Валана	2
16	Нерэлігійныя маральныя вучэнні С.Лована, К.Бекеша і К.Лышчынскага	3
Усяго		34

Для примера раскроем содержание некоторых тем.

Тэма 2. Тураўскі Залатавуст. Хрысціянска-этычны характар

«Слоў» К.Тураўскага. Літаратурная і асветніцкая дзейнасць К.Тураўскага. «Павучанні», іх этыка-педагагічны характар. Класіфікацыя хрысціянскіх дабрачыннасцей, дадзеная К.Тураўскім у прытчы «Аб чалавечай душы». Асэнсаванне паняцця міласэрнасць К.Тураўскім. Этычны і анталагічны сэнс міласэрнасці ў інтэрпрэтацыі К.Тураўскага.

Тэма 3. **Гісторыя рэнесанснай этыкі ў Беларусі.** Своеасаблівасць эпохі: эканамічны ўздым, развіццё гарадоў, абвастрэнне нацыянальнай самасвядомасці, актывізацыя грамадскага і культурнага жыцця, з'яўленне новых духоўных запытаў, актывізацыя лепшых прадстаўнікоў беларускага народа на пошук шляхоў маральна-духоўнага ўдасканалення грамадства. Асноўныя тэндэнцыі развіцця этыкі, яе найбольш значымыя праблемы. Этыка эпохі Адраджэння як канкрэтна-гістарычны феномен, частка філасофскай думкі Беларусі. Сувязь рэнесансна-гуманістычнай культуры Беларусі з папярэднімі этапамі духоўнага развіцця грамадства.

Тэма 4. **Філасофска-этычныя погляды Ф.Скарыны.** Новае разуменне Ф.Скарынам годнасці чалавека. Своеасаблівасць філасофска-этычных поглядаў Ф.Скарыны як сінтэз усходніх і заходніх сярэдневякова-хрысціянскіх і рэнесансна-гуманістычных ідэй. Новае разуменне Ф.Скарынам годнасці чалавека. Чалавекалюбства і справядлівасць – два галоўныя крытэрыі паводзін чалавека. Інтэлектуальна-маральныя якасці, прафесіяналізм, духоўнасць – складаемыя годнасці чалавека. Чалавекалюбства як вышэйшы прынцып адносін паміж людзьмі. Справядлівасць як набожна-прыроднае маральнае паняцце. Катэгарычны маральны імператыў Ф.Скарыны.

Тэма 12. **Маральныя погляды Я.Намыслоўскага.** Першы беларускі падручнік па этыцы для школ I ступені «Сентэнцыі, якія неабходны для жыцця» («Павучанні для агульнага карыстання ў жыцці», 1589 г.). Узор дыдактычнай паэзіі. Тэматычны дыяпазон сентэнцый. Маральна-выхаваўчыя ідэі аўтара. Запаветы Я Намыслоўскага моладзі: «Няма нічога мацней за дружбу», «Калі ўбачыш старца, то хоць і не ведаеш яго, аднясіся да яго з павагай», «Калі вінаваціць пажадаеш, глядзі, каб сам ты быў бязгрэшны», «Калі невукі добрых нораваў прытрымліваюцца», то яны будуць больш пажаданымі для грамадства, чым муж вучоны, якога «зло, агідная справа меціць».

Тэма 14. **Агульначалавечыя каштоўнасці і маральны ідэал у творчай спадчыне С.Полацкага.** Праблема паходжання маралі: пачуццёва-рацыянальныя вытокі. Ідэя С.Полацкага аб набытным характары інтэлектуальна-маральных дабрачыннасцей. Погляд С.Полацкага на лёс свету і чалавека. Абгрунтаванне С.Полацкім прыярытэта духоўна-маральных каштоўнасцей: розуму, дабра, добрых нораваў, годнасці чалавека, прынцыпа адзінства маральнай свядомасці і

паводзін. Каштоўнаснае разуменне духоўнага ўдасканалення: «Краса характва бясконцая», «прамудрасць», «дабрыня невыказная». Паходжанне маралі. Роля маральнага выхавання: «Нораў юнака, ад дзяцінства ўсаджаны, нават да старасці бывае захоўваемы».

Тэма 15. **Эвалюцыя этычных поглядаў А.Валана.** Ад поглядаў на свабоду як сацыяльна-палітычнага паняцця да разумення свабоды як неабходнай перадумовы развіцця маральных дабрачыннасцей: свабода – «настаўніца ўсіх добрых рэчаў». Духоўна-маральная свабода. Свабода волі. Справядлівасць як самая «цудоўная з усіх дабрачыннасцей». Разуменне А. Валанам катэгорыі шчасце: «Усе чалавечыя грамадствы ствараюцца для таго, каб людзі, абапіраючыся на ўзаемную падтрымку і дапамогу, маглі жыць блажэнна шчасліва». Дэструкцыя грамадства пачынаецца з разбурэння маральных асноў, падзення нораваў. Дамінаванне хрысціянскай канцэпцыі маралі («Аб шчаслівым жыцці або вышэйшым чалавечым дабры»).

Тэма 16. **Нерэлігійныя маральныя вучэнні С.Лована, К.Бекеша і К.Лышчынскага.** Узор этычнага вальнадумства, рацыяналізму і натуралізму. Узмацненне эпікурэйскай тэндэнцыі ў вучэнні аб маралі: сацыяльна-этычныя адносіны складаюцца на рэальнай, матэрыяльна-зямной аснове, у сувязі з чым «кому же лихо – тут пекло, а кому добро – тут рай» (С. Лован). Чалавек – абсалютны ўладар свайго жыцця, ён павінны разлічваць толькі на свае ўласныя сілы, быць працавітым, смела глядзець у будучыню. «Я гаспадар самаму сабе, не жадаю прызнаваць бога, не прашу неба, не баюся пекла». (К. Бекеш). Канцэпцыя безрэлігійнай маралі К. Лышчынскага: у маралі, заснаванай на рэлігійнай веры, галоўным пабуджальным матывам выступае страх; рэлігійная мараль трымаецца на прымусовасці, а не на свабодзе. Атэістычна-натуралістычная інтэрпрэтацыя Лышчынскім паходжання маральных паняццяў.

Таким образом, за два тысячелетия своего существования христианство доказало жизнеспособность своих основных положений, стало фундаментом развития общечеловеческих ценностей.

Развитие Беларуси в новом тысячелетии видится в духовном синтезе «соборности» (восточнохристианская традиция) и «человеческого достоинства» (западнохристианская традиция) на основе белорусского менталитета, известной белорусской толерантности и законов мировой культуры.

Этическое наследие белорусских просветителей – источник приобщения школьников к христианским ценностям.

Список источников и литературы

1. Культура. Хрысціянства. Адукацыя: зб. навук. прац / пад. рэд. В.А.Салеева. – Мінск: НИА, 2003.
2. Сборник программ для занятий по формированию этической культуры учащихся во внеурочной работе / М.А.Станчиц. – Минск: Адукацыя і выхаванне, 2007.
3. Салееў, В.А. Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці студэнтаў. – Мінск, 1993.

Станчиц Маргарита Абрамовна – кандидат педагогических наук, ведущий научный сотрудник лаборатории проблем воспитания личности (НИО Министерства образования).

УДК 2-675-1

М.Я. Мацевич (Минск)

О СУЩНОСТИ ЭКУМЕНИЧЕСКОГО ДВИЖЕНИЯ

Статья посвящена проблеме единства христианской церкви. Анализируются исторические предпосылки и условия экуменического движения. Рассмотрены современные факторы, обуславливающие распространение идеи христианского единства.

Живите мирно с друзьями и с врагами, но только со своими врагами, а не с врагами Божиими.
И. А. Ильин

Вопрос о единстве христианского мира и воссоединения церквей стоит перед нашим сознанием сегодня как одна из труднейших и ответственейших богословских проблем, ответ на которую, естественно, приобретает форму того или иного догматического построения. Однако, что может рассматриваться нами как данное? Где лежат границы того, что подлежит нашему рассмотрению в качестве объективной церковной реальности? Новизна современной эпохи заключается в том, что христианское сознание разных церквей стало воспринимать раздробленное состояние христианского мира как грех, тогда как ранее подобное считалось естественной нормой.

Границы экуменического движения очень неопределенны, так как в некоторых своих частях оно предполагает высокую степень догматического сознания и церковной ответственности, а в других

случаях единственным критерием принадлежности к нему является простое желание участвовать в делах, носящих Христово имя. Поэтому состав лиц, принимающих участие в экуменическом движении, является крайне пестрым: от православного иерарха, протестантского пастора, католического «ксендза» – до «либерального» богослова, не верующего в божественность Иисуса Христа, или просто «квакера», неприемлющего вообще никаких церковных установлений.

Но при всей патетичности дискуссий о необходимости или ненужности экуменического консенсуса он уже стал эмпирическим фактом, особенно на территории Республики Беларусь. Однако в чем же этот процесс заключается, каково его содержание и что нам в нем дается?

Во-первых, можно сознавать христианство «Другого» и оставаться в отношении к нему совершенно равнодушным, нейтральным. И в таком случае христианство «Другого» является для нас только внешним признаком, своего рода этикеткой, которая, оставаясь в пределах интеллектуальной сферы, совершенно не захватывает нашей духовной жизни и не вызывает в нас никаких духовных переживаний. В этом случае между христианами не наблюдается живого общения, они остаются совершенно чужды по отношению к друг другу. На языке лицемерия подобная духовная пустота может именоваться «терпимостью».

Во-вторых, можно сознавать христианство «Другого» и относиться к нему отрицательно. В таких случаях – инославное христианство становится «ересью» и вызывает отталкивание, борьбу. По сравнению с «первым равнодушием» подобный конфликт может внешне казаться некоторым прогрессом, потому что заключает в себе некое косвенное, хотя и отрицательное, но аксиологически безупречное признание: для того, чтобы быть еретиком, надо быть христианином, язычник еретиком быть не может.

Наконец, в-третьих, возможно такое отношение, при котором инославное христианство воспринимается не как словесная формула и не как искажение истины, а живая и действенная связь человека с Богом, как его личная преданность Христу.

Таким образом, мы можем констатировать, что в экуменическом движении происходит подлинная встреча церквей: они познают друг друга в полноте своих земных воплощений, различий и ощущают себя укорененными в одном начале божественной любви.

Но экуменическая встреча, понятая как реальность церковных отношений, должна иметь свои богословские и жизненные предпосылки.

Всякое подлинно-научное, истинно духовное исследование свободно. Это значит, что оно ничем не стеснено ни внешне, ни внутренне в том, чтобы добросовестно следовать законам логики при установке фактов. Этот вид добросовестности называется интеллектуальной совестливостью. Свобода интеллектуальной совести есть одна из граней свободы совести вообще, а последняя есть часть общей проблемы личной свободы. Несвобода внешняя и несвобода внутренняя порождают псевдонаучность и анархию. На этом пути возникают «ошибки» революций, реформ и цензуры: притеснение личной свободы, свободы слова и свободы совести. Но проблема осложняется тем, что, как отмечалось русским философом А.Карташевым [1, с. 25], безграничной, анархичной личной свободы человеку вообще не дано. Человек «связуется» с обществом: в светской жизни – моралью, этикой, а в духовной жизни человек по свободному убеждению отдает себя на служение высшим религиозным императивам. Поэтому вопрос о феномене свободы не сводится к опустошению души человека от его живых верований, а к нахождению в каждом индивидуальном случае особо пролегающей границы между аппаратом разума и заинтересованностью, зовом сердца.

На нормальном пути вопрос о свободе и «связанности» человека обретает свой жизненный смысл не в мнимой невозможности совмещения свободы и догматов. Наоборот, «мы верою познаем» (Евр.11, 3). Возможность конфликта таится не здесь, не во внутреннем самопознании, а во внешнем воплощении, авторитете института церкви. Этот авторитет, принимая внешние юридические формы, наталкивает нас на глубокую и неискоренимую черту всякой религии: жажду приобщения к Абсолютному [1, с. 28]. В конечном счете, важны органичность и жизненная подвижность суждений церкви, а не механичность, юридичность или автоматичность. Многостепенность в оценках самою же церковью безусловности, непогрешимости различных форм ее веры и жизни и есть наилучшее свидетельство ее мудрой правдивости в понимании своего авторитета, ее богодухновенности.

Весьма разрушительным для экуменической идеи является так называемый интерконфессиональный метод, стремящийся объединить христиан разных исповеданий на общем для всех минимуме вероучения. Эта точка зрения не учитывает того, что выделение из органичного остова любого христианского учения каких бы то ни было «минимумов» равносильно его уничтожению. Церковная жизнь должна быть всегда целостной, интегральной, и, встречаясь с нею, нужно принимать ее всю

szesc ieden z nich z passyko pozłocistą. Item między koralikami kopieiek dziesięc. Item koralikow samych sznureczek ieden a ieszcze drobnieyszych Sznurek z piankami koralikow ieden. Reliquiarzyk okrągły w srebro oprawiony za kryształem, Szostaczkow dwa, Sygnetow dwa, pierscieni z koralikami dwa, obrączka iedna, et klauzurek sztuk dwie, Łancuszek w granacik robiony łokciowy płaski, kopieyka iedna Na druciku prostym. Krzyz wielki dęty z Sedesem z gałką dużą mieyscami pozłocisty z trzema essami nad Galką Na Pręcie zelaznym porządny kosztu wielkiego. Na Ewangelij Naroznikow Srebrnych cztery, piąta tablica Okrągła. Klauzurki spore sztuk u nich szesc rozyczek z puklem ieden a cztery pukle Miedziane pobielane. Trybularz wielki z czterema łancuszkami y dwoma *kołkowa zasmydzony*, Pereł prawdziwych Sznurkow pięc dostatnich z *sustelnym* krzyzykiem karawaką. Obrazek Miedziany okrągły iakoby mnieyszy nad Część osmą arkusza Częstochowskiey Naysw.[iętszej] Panny u tego Obrazka ramki w koło srebrne y koronka z krwawnikiem sowita, Lampa y krzyż w sztukach drobnych przez złodzieiow połamane które sztuki y Sama lampa od krzyża Wazą grzywien siedm bez łota iednego Sztuk 28. Sznurek ieden paciorek bursztynowych. Pianek morskich Sznurek ieden, Paciorek szklannych Sznurkow trzy. Paciorek koscianych Sznurek ieden, reliquiarzyk w rog oprawny. Obrazek Moskiewski mosiężny, krzyżyk Mosiężny ponad nimi Mirnica Cynowa troista. Lichtarzow potężnych odlewanych Ołtarzowych dwa mnieyszych odlewanych cztery a Stołowych Lichtarzow sporych szesc. Ampułek cztery połamanych. Taca cynowa wielka iedna a druga mnieysza. Nalewka cynowa, kociołek mały miedziany dla wody. Puszka miedziana Na hostye, krzyz mosiężny Płaski z passyiką srebrną, Drugi krzyż mosiężny z passyą mosiężną y z sedesem, kadzielnica Mozięžna stara. Dzwon Na Dzwonicy machina wielka, dzwonow mnieyszych dwa. Signaturka y z uch oberwany drugi sygnaturka mnieyszy rozbity u ołtarza małych dzwonkow dwa. Zegarek z Indexem blachy miedzianey Lampa zesciana [blaszana] wisząca krzyż Wielki zelazny kosztu niemałego z kopuły zpadły u Cerkwie conserwuie się. W osmiu Oknach kraty zelazne, Okiennic w skarbcu Żelaznych dwie w Oknach skarbcowych w sklepach y w karceresie w oknach kraty zelazne. Od koron folgi dwie srebrne sztuczki Lichtarzykow zelaznych essowych na Deisusie pietnascie z swiecami brackiemi. Krzyżowa miernica cynowa intus z kieliszkiem szczupłym klauzurek sztuk dwie u służebnika. Ołowiu od okien szmat duży.

[z boku karty w tym miejscu dopisek: Dzban miedziany spory kociołek takze spory przy Drzwiach przykowany. Stołek zelazny]

Apparata Alby Firanki

Apparat ieden Adamaszkowy biały z kołnierzem Na płotnie haftowanym bogato złotem z petrachelem y naraquicami podszyty kraszeniną Niebieską Apparat drugi Atłasowy czerwony z koronko srebrną marcypanową na bawełnie kraszeniną zielono podszyty z petrachelem y naraquicami Apparat trzeci atłassowy Szkarłatny z kołnierzem Morowym czerwony z *bliszczącym się* na ktorym imię Jezus y Litery złotem haftowane z petrachilem y Naraquicami duzo zazywany Apparat czwarty atłasowy zołtogorący papuzy podarty z petrachelem y Naraquicami Apparat piąty Sztametowy koralowy z petrachelem podbity płotnem Apparat szosty Axamitny Fioletowy z petrachelem y Naraquicami podszyty kraszeniną Niebieski apparat siodmy

k. 206 v

Adamaszkowy Fioletowy z kołnierzem Atłassowym Szkarłatnym, z petrachelem y Naraquicami podszyty kraszeniną Niebieską Apparat osmy Muchaierowy Makowy barzo zazywany z kołnierzem Atłasowym czerwonym z petrachelem Dalmatyka iedna Łyczakowa ceglasta z zmienioną Zieloną kitayko. Dalmatyka druga kanawaczowa Na dnie makowym w kwiaty Zielone mieniona. Dalmatyka trzecia Włoczkowa podarta mała. Płaszczenica Na Atłasie roznym srebrem y złotem szyta podbita kitayką granatową. Vela Atłassowe Adamaszkowe tudanowe, dziewięc, wszystkie bławatne roznego koloru iedne z nich z koronki Marcypanową srebrną a dwie podarte, Palek wszystkich dziewięć Pokrowiec kitaykowy staroswiecki krzyzowy. Burs do kielicha trzy a do chorych trzy. Firanki 1mo Zielonych tabinowych dwie kitayczanych szkarlatnych dwie z Lisztwami Niebieskiemi kitayki rozowey iedna Perłowa w kwiaty y paski dwie tabinowe. Grytowa cynamonowa iedna. Papuza kitayczana iedna stara. Papuza z kitayki w paski iedna spalona tabinowa ceglasta iedna fiałkowa w kwiaty zielona y popielata iedna stara. Hustek Nesokorowych dwie, Bagazyowa w paski iedna, bawełnicy załobne dwie poszarpane, fartuszek bagazyowy firanka harassowa zielona. Antepedia iedwabne Niebieskie w kwiaty dwie stare trzecia harasowa zielona. Chorągwie processyonalne dwie harassowe a trzecia Adamaszkowa czerwona. Antymissow trzy z reliquiami Corporałow pięć Puryfikatorzow pięć. Alby cztery dwa humerałow. Paskow cztery komza iedna. Tuwalni iedwabiem naszywanych dwie Towal dobrego płotna piętnascie Towalni prostego płotna trzydziesci y szesc, chustek prostych trzynascie z ręcznikami. Portatel Rzymski ieden. Sukno karazyowe na gradusy całe.

Księgi Cerkiewne

Ewangelia drukowana na arkuszu pocztowym w srebrze ut supra Apostoł drukowany in folio. Ochtaiow dwa in folio drukowanych wielkich Tryfołoiow dwa in fol.[io] Druk:[owanych] Tryodi dwie postnych a dwie cwitnych wielkich drukowanych in fol.[io] Psałterz drukowany in 4to ieden. Mineja drukow.[ana] in fol.[io] Irmołoy drukowany in fol[io] y Irmołoy pisany in fol[io] trzeci Irmołoy pisany in 4to. Trebnik druk.[owany] in 4to Drugi Trebnik druk.[owany] in 8vo. Pontyfikał drukowany in fol[io] *Tetradlea O bozym ciele* pisane in 4to.

Metryka in semifol[io] notowana. Sobotnik in fol[io] Notowany Służebnikow Wilenskich dwa in fol[io] drukowanych wielkich Trebnik trzeci pisany poszarpany in 4to. Protokuł Spraw od Roku 1701 Item Służebnik pissany in fol.[io] Ewangelia stara odarta pisana in fol.[io] Tryfołoy pisany in fol[io] stary. Tryod postna pisana in fol.[io] Ciceron drukowany in 4to. Lexikon alias Synonim z grecka. Trebnik wielki in 4to wpuł pisany a wpuł drukowany Metryka stara in semifolio. Cuda Obrazu Chełmskiego Naysw. Panny in 4to druk.[owane] Cazusy pisane Ruskie in 4to. Ksiąg dwie starozytnych iedna notowana obie in fol[io] drukow.[ane] Vergiliusz Enegida drukowany in 8vo. Księgi wszystkie są podpisane.

Jeszcze się znayduią ułomki Stare iako to kadzilnica mosiężna Lichtarz mosiężny nadłamany Niecały Lampa mosiężna stara.

k. 207

Bractwo pod znakiem S.[więtego] Mikołaia przy teyze kathedrze liczne, Regestrem obszernym Computowane. Swiec do Assistencyi dość maią y karbone przy Ołtarzu S[więtego] Mikołaia maią też Almaryą zamczystą porządno y skrzyn dwie za zawiadywaniem Podskarbich. Maią Lichtarzow cztery odlewanych miernych które się juz wyżey namieniły, maią Apparatow dwa Nowych z petrachelem i naraquicami Velami y Palkami bogatych ieden Axamitny krwawy z kołnierzem Tercyneli szkarłatney w kwiaty złote z galonem srebrnym podbite Łyczakiem żółtogorącym, A drugi Tercinale takieyże na dnie niby szkarłatnym w kwiaty złote z korunką delikatną Marcypanową podbitą habą białą z Lisztwą zielono Łyczakową. Maią Całun sukienny dno fioletowe brzegi Czarne płotnem tkackim podbity Nowy. Maią Albę iedną płotna dobrego ... [tekst w oryginale niedokończony].

Gil Andrzej – doktor habilitowany, zastępca dyrektora do spraw naukowych, Instytut Europy Srodkowo-Wschodniej.

УДК 272/273(476)

А.К. Гецэвіч (Гродна)

З ГІСТОРЫІ ЛІПНІШКАЎСКАЙ ПАРАФІІ (XV – ПАЧАТАК XX ст.)

Статья представляет собой очерк истории Липнишковской католической парафии, деятельность которой тесно связана с историей местечка Липнишки, известного с XV века.

Як гэта не дзіўна, але гісторыя Ліпнішкаўскай парафіі пачалася з храма ў вёсцы Зыгмунцішкі, што ў трох кіламетрах ад Ліпнішкаў. У пісьмовых крыніцах ёсць звесткі аб тым, што святыня і парафія у вёсцы Зыгмунцішкі была ўтворана раней за Ліпнішкаўскую – яшчэ ў XV ст., бо ўжо ў 1500 г. тут пазначаны як дзеючы парафіяльны касцёл Радуньскага дэканата. У 1623 г. землі касцёла павялічыў і, магчыма, адбудаваў новую святыню кароль Жыгімонт III Ваза. Аднак пасля 1669 г. як самастойная Зігмунцішская парафія больш не адзначаецца. Да канца XVIII ст. мясцовая святыня дзейнічала ў статусе капліцы ад Ліпнішкаўкай парафіі Ашмянскага дэканата [1].

Мястэчка Ліпнішкі вядома з XV ст. як мястэчка Ашмянскага павета ВКЛ, вялікакняжацкая маёмасць. Звесткі пра існаванне культавых устаноў у мястэчку розняцца. Па адных звестках, касцёл, які носіць назву св. Казіміра, быў заснаваны тут у 1510 г. [2, с. 453], па іншых – у 1411 г. [3, с. 136 – 137; 4]. Розніца ў стагоддзе звязана, у першую чаргу, з імёнамі фундатараў касцёла, у першым і другім выпадках у фундатараў адно імя – Жыгімонт, а вось хто гэта быў: Жыгімонт Кейстутавіч ці Жыгімонт I Стары, на жаль, на сённяшні дзень дакладных звестак не захавалася. Разам з тым, па звестках, сабраных ксяндзом Кшыстофам Грошыкам, у 1510 г. у Ліпнішках узнікла парафія Св. Ганны. Мястэчка Ліпнішкі у гэты перыяд належыла Гаштольдам. Па меркаванню К. Грошыка, у мястэчку у гэты перыяд магло існаваць 2 храмы: святога Казіміра і святой Ганны. Адзін з іх размяшчаўся на тэрыторыі сучаснага касцёла, другі – на месцы, дзе зараз стаіць капліца, на перакрыжаванні дарог на мястэчка Геранёны і Ліду [1].

Толькі праз стагоддзе Ліпнішкі сталі цэнтрам парафіі, што было звязана з эканамічным і палітычным развіццём мястэчка. 30 мая 1610 г. мястэчка атрымала Магдэбургскае права [2, с. 453]. Аднак арыгінал дакументаў не захаваўся (згарэлі), што было засведчана канфірмацыйным прывілеем Уладзіслава IV, які быў дадзены 6 чэрвеня 1633 г. Пры падцвярджэнні Магдэбурскага права мястэчка Уладзіславам IV і надання яму герба «Пагоня» была падцверджана інфармацыя і адносна існавання тут парафіі [2, с. 453; 4].

Перыяд заняпаду Рэчы Паспалітай, які пачаўся ў сярэдзіне XVII ст., асабліва абвастрыўся ў перыяд шматлікіх знешнепалітычных канфліктаў, што праходзілі на тэрыторыі Беларусі. Каля 1710 г. касцёл у Ліпнішках быў спалены шведамі, што знайшло сваё адлюстраванне ў дакументах біскупа Віленскай дыяцэзіі, датаваных 1717 г., дзе Ліпнішкаўская парафія не значыцца [4]. Разам з тым, відавочна, што пад час ваенных дзеянняў святыні маглі значна пацярпець. Цікавай застаецца і легенда, якая існуе толькі ў вуснай версіі і пакуль не мае дакументальнага падцвярджэння, аб тым, што жыхары Ліпнішак ратавалі ў час пажарышча з храма ўсё, што маглі. Многія з іх загінулі на гэтым месцы. Сярод іх – Рафал Раманоўскі. На месцы ахвяр адразу была пабудавана капліца, якая захавалася да гэтага часу. Гэта капліца стаіць на скрыжаванні трох дарог – Лідскай, Геранёнскай і Літоўскай (Віленскай) [5].

Паступова, з умацаваннем мястэчка, Ліпнішкі становяцца і значным цэнтрам рэлігійнага жыцця рэгіёну. Зыгмунцішкі – даўнейшы парафіяльны цэнтр, наадварот, губляе гэты статус. Ужо ў канцы XVIII ст. Ліпнішкі на роўных з іншымі сталымі парафіямі уваходзяць у Радуньскі дэканат. З 1789 па 1792 гг. пробаршчам мясцовай парафіі быў кс. Ю. Путасевіч [4].

Падчас аднаўлення Магдэбурскага права Ліпнішкам (1793) было падкрэслена, што «ад юрыздыкцыі ўсякай земскай і ваяводскай места вызваляецца, усе юрыздыкі духоўныя і свецкія, што знаходзяцца ў месцы, скасоўваюцца і яны пераходзяць пад уладу і юрыздыкцыю Ліпнішкоўскага магістрата» [6, с. 259].

Пасля распаду Рэчы Паспалітай Ліпнішкі адышлі да Расіі (з 1795 г.) і былі ўключаны ў Ашмянскі павет. Кацярына II падаравала Ліпнішкі і Геранёны з 11 тысячамі насельніцтва «за заслуги и верность Отчизне» расійскаму канцлеру А. Безбародку [2, с. 453; 5].

У хроніцы касцёла запісана, што яго сын Эльяш у 1804 г. уласным стараннем адбудаваў парафіяльны касцёл. Перад пачаткам вайны з Напалеонам Ліпнішкі перайшлі ва ўласнасць вядомай фаміліі Пуслоўскіх [1].

Перыяд другой чвэрці XIX ст. – час значнага пагаршэння адносін паміж касцёлам і дзяржавай. Перыяд кіравання Мікалая I адзначаўся узростам увагі дзяржавы да дзейнасці каталіцкага касцёла на Беларусі, на яго ўздзеянне на настрой мясцовага грамадства, асабліва моладзі.

У перыяд 1820 – 1833 гг. пробаршчам парафіі быў кс. Якуб Міхалоўскі. На тэрыторыі парафіі, у вёсцы Жыжма, у 1833 г. існавала грэка-каталіцкая царква. Але паміж двумя рэлігійнымі кіраўнікамі

існавала вельмі цеснае супрацоўніцтва. Так, святар грэка-каталікай царквы неаднаразова дапамагаў мясцоваму каталіцкаму ксяндзу ў правядзенні вялікоднай споведзі, а таксама ў наведванні жыхароў аддаленых вёсак і хутароў парафіі [4].

З 1836 г. пробаршчам парафіі стаў кс. Вінцэнт Даўторт. З 1838 па 1845 гг. пробаршчам парафіі быў Гіларый Ракоўскі.

У 1849 г. сыны Войцеха Пуслоўскага прадаюць Ліпнішкі панам Вольскім [2, с. 453]. Згодна са звесткамі Віленскай дыяцэзіі за 1849 г., у склад Ліпнішкаўскай парафіі ўваходзіла 47 мясцовасцей. Аднак колькасць прыхажан за перыяд 1849 – 1868 гг. зменшылася. Так, у 1868 г. яна склала 3609 католікаў, улічваючы той факт, што да парафіі належыла капліца ў Зыгмунцішках. Мясцовыя даследчыкі звязваюць гэты факт, у першую чаргу, з палітыкай мясцовай улады, якая запісывала многіх католікаў-беларусаў у лік праваслаўных [4].

За перыяд 1870–1875 гг. пробаршчам мясцовай парафіі быў кс. П.Юсевіч. За гэты перыяд колькасць вернікаў значна павялічылася: у 1872 – 5099 чалавек, у 1874 – 5341 чалавек [7].

З 1875 па 1886 гг. Ліпнішкаўскую парафію узначальваў кс. К.Бернікові́ч. У 1881 і 1882 гг. парафія налічвала 5900 католікаў. Паводле дакументаў, якія захаваліся ў мясцовым прыходзе, дзейнасць ксяндза была перарвана ў 1886 годзе – ён быў накіраваны на іншую парафію за «рэвалюцыйнае казанне». У гэты ж час пакідае сваю пасаду і мясцовы вікарый Ф. Будвідт, але прычыны такога кроку невядомы [4].

З 1886 г. да 1889 г. пробаршчам быў кс. Т. Доля. У гэты перыяд на тэрыторыі парафіі функцыяніруе капліца ў Зыгмунцішках. Пасля 1889 г. і да 1905 г. пробаршчам парафіі стаў кс. Я. Макжэцкі. 14 ліпеня 1890 г. касцёл у вёсцы Ліпнішкі згарэў. Некаторы час богаслужэнне праводілася ў прыстасаваных пад гэта памяшканнях. Будоўля новага касцёла на грошы і ахвяраванні мясцовых жыхароў і асабістыя сродкі ўладара мястэчка Ст. Вольскага распачалася 1 мая 1894 г. Работа па аднаўленню святыні цягнулася аж да 1900 г., калі ва ўрачыстай абстаноўцы ў дзень Усіх святых (1 лістапада 1900 г.) яна была асвечана [1; 4; 8].

Касцёл узвялі ў цэнтры вёскі ў стылі неаготыкі з цэглы і абклалі гранітнымі блокамі. Касцёл уяўляе сабой прамавугольны у плане 3-нефавы аб'ём з 5-граннай апсідай, сакрыстыяй, прыбудаванай накшталт трансепта да асноўнага аб'ёму. Сярэднія інтэркалумніі бочных фасадаў таксама вырашаны накшталт трансепта. Галоўны уваход пазначаны высокай і стромнай 3-яруснай вежай-званіцай. Асаблівую ажурнасць вежы дадаюць пінаклі над верхнімі ярусамі, крабы на рöбрах спічака і карункавы крыж. Накрыты касцёл адзіным 2-схільным дахам (у пачатку XX ст. ён быў гонтавым), больш нізкая апсіда – вальмавым, крылы трансепта – таксама

2-схільнымі. Трохвугольны франтон над алтаром калісьці быў завершаны ажурнай неагатычнай глаўкай-сігнатуркай.

Інтэр'ер, падзелены на 3 нефы 8-ю калонамі і перакрыты крыжовымі стрэльчатымі скляпеннямі на падпружных арках, якія ўпрыгожаны архітэктанічнымі размалёўкамі. Унутраную прастору ўпрыгожвалі 3 драўляныя неагатыцкія алтары: галоўны св. Казіміра, левы бочны Сэрца Пана Езуса і правы Маці Божай Шкаплернай. Над уваходам у выглядзе балкона зробленыя хоры з арганам.

Тэрыторыю касцёла напачатку XX ст. абнеслі замест драўлянай, бутавай агароджай, галоўны уваход пазначаны 3-пралётнай брамай, увенчанай чатырма пінаклямі [1; 9, с. 202].

Узрастала і колькасць вернікаў парафіі: 1890г. – 7548 католікаў, 1893 г. – 7548, 1894 г. – 7602, 1896 г. – 7630, 1898 г. – 8020, 1904 г. – 8750 католікаў. Разам з тым агульная колькасць насельніцтва саміх Ліпнішак у гэты перыяд скарачаецца. Вікарыем касцёла ў Ліпнішках у 1904–1905 гг. быў кс. Ст. Петрэвіч, які памёр ва ўзросце 24 гадоў. Яго функцыі выконваў з 1905 г. Л. Клюк.

У перыяд 1905–1911 гг. пробаршчам парафіі быў кс. Я. Куніцкі. Дапамагаў яму ў гэты час, з 1907 г., кс. Вітольд Занеўскі. З 1908 г. у парафіі таксама адзначана дзейнасць былога пробашча Яна Макжэцкага, але ўжо ў 1909 г. яго прозвішча не сустракаецца. У гэты перыяд парафія налічвала 7275 прыхажан [4].

У 1911–1913 гг. мясцовым пробаршчам з'яўляўся кс. Баляслаў Сперскі. За перыяд 1913–1914 гг. Ліпнішкаўская парафія неаднаразова змяняла сваіх пробаршчаў. З 21 красавіка 1913 г. ксяндзом быў прызначаны мясцовы жыхар Вінсэнт Латарэвіч. Вікарыямі ў гэты час былі кс. Ю. Шымкунас і кс. Б. Ясяк. У 1913–1914 гг. пробаршчам парафіі быў Б. Яновіч, але з пачаткам вайны ён па асабістай заяве пакінуў месца працы. Парафія на гэты момант налічвала 7570 вернікаў [1; 4].

Такім чынам, за больш чым 400 гадовую гісторыю (на пачатак XX ст.) Ліпнішкаўская парафія ператварылася ў адну з буйнейшых у рэгіёне з цікавай і багатай на падзеі рознага характару гісторыяй.

Спіс крыніц і літаратуры

1. Матэрыялы з асабістага архіва кс. К.Грошыка, Ліпнішкаўская парафія.
2. Памяць. Іўеўскі раён. – Мінск: БелТА, 2002.
3. Цітоў, А. Сімвалы незалежнасці / А. Цітоў // Геральдыка беларускіх местаў. – Менск, 1998.
4. Fibek, Jan. Historia parafii Lipnishki i Żygmunciszki / Jan Fibek [Электронный ресурс]. – 2008 - Режим доступа: http://www.radzima.org/pub/miesta.php?lang=by&miesta_id1=hriulipn. – Дата доступа: 28.03.2008.
5. Летапіс в. Ліпнішкі / рэд. кал.: Т.Захарэвіч, М. Пякша, К. Карыцкі, Т. Горбач [і інш.].

6. АВАК. – Т. 13.
7. Духовенство Виленской епархии [Электронный ресурс]. – 2007. – Режим доступа: http://www.petergen.com/bovkalo/sp/wilno1872.html#ftnsrki. – Дата доступа: 22.01.2008.
8. Урублеўскі, В. Ліпнішкі / В. Урублеўскі // Іўеўскі край. – 2007. – 21 ліпеня.
9. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобласць / АН БССР, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд.кал.: С.В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭС, 1986.

Гецевич Андрей Казимирович – кандидат исторических наук, старший преподаватель, Гродненский государственный университет имени Янки Купалы.

УДК 272/273(476)

А.К. Гецевич (Гродно)

ИЗ ИСТОРИИ ЛИПНИШСКОГО ПРИХОДА (1914 – 2007 гг.)

В 2010 г. Липнишский римско-католический приход (Ивьевский район, Гродненская область, Беларусь) будет отмечать свое 500–летие. В статье рассматриваются исторические аспекты развития прихода в м. Липнишки в период с начала Первой мировой войны до сегодняшнего дня.

Первая мировая война стала фактическим началом нового этапа в жизни целых поколений людей и государств. Небольшое местечко Липнишки Ошмянского повета Виленской губернии очень скоро ощутило это на себе.

Старые немецкие фотографии времен оккупации запечатлели некоторые интересные факты из жизни Липнишек той поры. Очевидно, что центром и одновременно главной достопримечательностью местечка был его храм.

История римско-католического прихода в Липнишках в этот период изучена еще недостаточно. Однако мы можем сказать, что в 1914 – 1921 гг. священником Липнишского прихода работал кс. Казимир Паукшта (1868 – 1921 гг.). Викарием костела в 1914 – 1918 гг. был Александр Августинович. В это же время упоминается и имя кс. Яна Корицкого, местного жителя, рукоположенного в священнический сан. Однако информации о его деятельности в местном приходе нет. Численность прихожан составляла 7 570 человек [4].

Очевидно, война и последовавшие за ней события, вплоть до некоторой стабилизации в 1921 г., нарушили мирный уклад жизни местного населения. И вот уже по статистике 1920 г. количество

прихожан сократилось Население Липнишек 30.01.1920 г. состояло из 6875 поляков-католиков, 562 евреев и 1 русского [10, с. 383 – 384].

Из архивных документов этого периода узнаём также, что приходом продолжал руководить К. Паукшта. Он принимал активное участие в проводимой польскими властями на временно оккупированной территории Беларуси избирательной кампании 1919 г. Согласно документам, в местечке был образован гминный избирательный комитет во главе с председателем Антоном Горновским, членами комитета стали Антон Пекша, ксендз Казимир Паукшта, Тереса Вольска, Зыгмунд Звирко (Жвирко) [10, с. 384].

После трагической смерти К. Паукшты 19.02.1921 г. в течение февраля – марта 1921 г. администратором прихода работал Мариан Вандоловский [1; 4].

Рижский мир 1921 г. на время стабилизировал ситуацию в регионе. Католическая II Речь Посполитая сделала большой упор на костел в работе на вновь присоединенных территориях Западной Беларуси с целью ополячивания местного населения. Необходимо отметить, что в Липнишках проблема данного характера была актуальна в меньшей степени. К гмине Липнишки в 1926 г. относилось 7576 католиков, 422 иудея и 31 православный [10, 388].

В 1921 – 1924 гг. ксендзом Липнишского прихода был Казимир Груздь (по другой версии Константин [1]) (15.12.1871 – 1924 гг.). В исторических хрониках осталась информация о том, что 14 сентября 1921 г. К. Груздь отметил здесь 25-летие своего служения. В это период часть прихода (д. Бакуны, Кирьяновцы, Андрушки, Филиппки, Сонтаки Липнишские) отошла к новообразованному приходу в м. Гавье. Однако в 1923 г. после визита епископа Е. Матулевича Липнишскому приходу часть деревень была возвращена. Викариями костела в этот период были в 1921–1922 гг. – кс. Станислав Петрашевский, в 1922 г. – кс. Аполинарий Александрович, в 1922–1923 гг. – кс. Юлиан Юркевич, 1922–1924 гг. – кс. Юзеф Кропивницкий, 1923–1924 гг. – кс. Каетан Суфринович. Викарии жили в отдельном доме, т.н. «доме викария», который в 1923 г. по невыясненным причинам сгорел [4].

В 1924 – 1927 гг. настоятелем прихода был Иохим Рачковский, и во время его служения Липнишский костел, строившийся с начала века, был завершен [4]. Именно Иохиму Рачковскому история приписывает и появление в костеле колокола [5]. На 1926 г. приход насчитывал 7 576 верующих [4]. К сожалению, на сегодняшний день, кроме этих фактов, о судьбе и деятельности И. Рачковского больше ничего не известно.

С 1927 по 1939 гг. приходом руководил кс. Ярослав Войдак (1875 – 1944 гг.). 29 мая 1928 г. в 16.00 часов с участием епископа

Р.Ялбжиковского прошла первая консекрация (освещение) костела. В этот же день епископ провел также конфирмацию (миропомазание) 429 прихожан [4].

Окончательные работы по отделке костела завершились лишь к 1931 г. 11 апреля 1931 г. прошла вторая торжественная консекрация костела [4].

Через год была расширена и территория приходского кладбища, на которое 4 мая 1936 г. была перенесена каплица из соседних Зыгмунтишек (по преданию заложена на средства Сигизмунда III в 1623 г.) [1; 4].

На протяжении 30-х годов в приходе проходило службу достаточно большое количество молодых священников, которые помогали местным ксендзам: в 1931 – 1932 гг. – кс. Ян Перковский, 1932 – 1933 гг. – кс. Станислав Будник, 1933 – 1934 гг. – кс. Петр Точыловский, 1934 – 1935 – кс. Юзеф Кароль, 1934 – 1936 гг. – кс. Евгений Латецкий, 1936 – 1938 гг. – кс. Антоний Комоса, 1938 – 1939 гг. – кс. Юрий Ожаровский.

Очевидно, что помощь молодых священников была весьма кстати, поскольку численность верующих в приходе за 30-е годы значительно выросла. Так, в 1931 г. насчитывалось 7 310 прихожан, 1933 г. – 7 606 католиков, 1935 – 7 808 человек, а по последним предвоенным данным на 1937 г. численность прихожан составила 8 124 человека.

Учитывая этот рост, просьбы прихожан, в 1937 г. в Липнишки в помощь действующему священнику Я. Войдаку был направлен выходец из соседней деревни Огородники кс. Ян Ивуть (?). В 1938 г. сюда также были направлены и выпускники Пинской духовной семинарии, местные жители Петр и Виктор Ромуки [4].

Начавшаяся 1 сентября 1939 г. Вторая мировая война докатилась до Липнишек с востока 17 сентября 1939 г. Необходимо отметить, что работа костела не прекратилась даже в этот день. Об этом свидетельствует запись о браке от 17 сентября 1939 г., сделанная ксендзом Я. Войдаком [4].

Вместе с тем, уже в сентябре 1939 г. ксендзу пришлось скрываться в связи с угрозой для своей жизни со стороны местных прокоммунистически настроенных жителей. Именно в этот период на территории Липнишской гмины были убиты ксендз А. Тваровский из Юратишек и сопровождавший его помощник [1; 4]. 21 сентября 1939 г. расстреляли и последнего войта Липнишской гмины, кавалера ордена Virtuti Militari Станислава Ковальского [1].

С 1939 по 1942 гг. обязанности ксендза Липнишского прихода исполнял Юрий Ожаровский (27.02.1912 – 10.03.1943 гг.), о чем свидетельствуют его подписи под записями в метрических книгах костела в данный период (иногда с припиской «викарий костела Липнишки») [4].

Однако 17 июля 1941 г. вновь появились подписи кс. Я. Войдака. К сожалению, на сегодняшний день нет полной ясности в вопросе о деятельности кс. Я. Войдака в 1939 – 1941 гг. Также возникает вопрос: почему репрессиям со стороны немцев подвергся только кс. Ю.Ожаровский? Достоверно известно, что Ю. Ожаровский с Я. Войдаком вместе работали в Липнишском приходе на протяжении 1941 – 1942 гг.

Как бы то ни было, отметим тот факт, что ксендз Ю. Ожаровский был арестован немцами 29 июня 1942 г. и расстрелян в Лиде вместе с другими священниками 10 мая 1943 г. [1].

В 1942 – 1944 гг. ксендзом Липнишского прихода вновь является Я. Войдак. Он умер 7 мая 1944 г. от сопутствовавшего войнам тифа (по некоторым данным, специально распространяемого немцами на оккупированных территориях с целью сорвать наступление Красной Армии, вызвав массовую эпидемию) [4].

Необходимо отметить, что, несмотря на войну, уже через неделю, 15 мая 1944 г., у прихожан был новый священник – Стефан Сечко (06.12.1905 – 20.01.1976 гг.), работавший до этого в приходе Неман (нынче Березовка Лидского района). Более 30 лет его пастырской работы припало на период установления советской власти в Западной Беларуси, а также на времена атеизма. Очевидно, что нет необходимости говорить об отношении властей к костелу и его служителям в этот период. Подчеркнем, что влияние костела в Западной Беларуси оставалось весьма значительным. В 1947 году в БССР насчитывались 261 приход и 168 ксендзов. Чтобы уменьшить степень их влияния на крестьянские массы, советские органы власти требовали от священнослужителей заключения типовых договоров на передачу общинам церковных зданий. В ответ шестнадцать ксендзов Молодечненской области (куда входили и Липнишки) во главе с деканом Курн-Гарбовским послали письмо на имя Председателя Президиума Верховного Совета СССР, в котором утверждалось, что по каноническому праву костелы и литургическая утварь принадлежат римскому папе, а не верующим. Как отмечали документы, «многие ксендзы, не имея справок, дающих разрешение отправлять богослужения, разъезжали по приходам, организуя католические общины» [9, с. 86].

Прочтем в документе и следующую запись: «Священнослужители не скрывали своего враждебного отношения к Советской власти. Ксендз Сечко из д. Липнишки Островецкого района Молодечненской области, узнав о создании пионерской организации в местной школе, провел «работу» среди родителей. Те избили своих детей и заставили их сдать галстуки. В результате из 89 детей в пионерской организации осталось только 30». По информации этого же источника, «в целом по

Гродненской области подобной позиции придерживалось 62 священника» [9, с.86].

По воспоминаниям местных жителей ксендз С. Сечко сразу после войны был поставлен под наблюдение со стороны органов внутренних дел. Тому было несколько причин. Еще во время войны, в 1943 г., кс. С.Сечко вместе с другими священниками был арестован, однако, в отличие от всех остальных, отпущен. Остальные были расстреляны. Это вызвало резонный интерес к нему со стороны спецслужб, и ксендз был помещен под домашний арест на время расследования. Однако, очевиднее всего, интерес к нему проявляли именно за сотрудничество с подразделениями Армии Крайовой (АК). Местные жители пострадали от действий советских властей в короткий период 1939 – 1941 гг. и поэтому с большой охотой шли в ряды АК. В послевоенный период действия АК, которые носили в основном бандитский и в меньшей степени идейный характер, продолжались. По воспоминаниям местных жителей, местная молодежь прятала часть оружия в костеле за органом. Выявив данный факт, органы внутренних дел и арестовали кс. С. Сечко. Однако установить факт контакта ксендза и членов АК не удалось. Виновники данного инцидента вскоре сами сдались властям, а местные жители собрали подписи с просьбой отпустить ксендза. Факт довольно показательный для того времени. Виновные были сурово наказаны, а ксендз отпущен [8, с. 6].

По воспоминаниям местных жителей, в 1946 г. в Липнишках стоял жуткий голод, и кс. Сечко раздал жителям все запасы продовольствия и деньги, собранные на ремонт костела. После окончания жатвы местные жители хотели вернуть продовольствие и деньги, однако священник отказался мотивировав: «Не буду ничего брать от вас, потому что вы сами бедные» [8, с. 6]. Подобных эпизодов в благодарной памяти липнишковцев много.

Стефан Сечко много сделал и для местного костела. Несмотря на возможность ареста, занялся вопросом ограждения местного кладбища. Из воспоминаний местных жителей: «Первое, что он хотел сделать – очистить и огородить местное кладбище. «Не могу смотреть на заросшее и не огражденное кладбище», – говорил он [8, с. 6]. На созданном по данному вопросу комитете было решено огородить кладбище не деревянным или металлическим забором, а каменным. Однако для выполнения такого объема работ требовалось значительное количество цемента. Очевидно, что в то время (1947 – 1948 гг.) решить данный вопрос было очень сложно. Некоторое количество цемента было куплено самими прихожанами, однако этого было недостаточно. Тогда С. Сечко вместе с органистом лично поехал в Рось и, по словам местных жителей,

«тайно договорился с бухгалтером цементной фабрики купить два вагона цемента»! Трудно сказать, что сыграло решающую роль в этом вопросе, однако факт остается фактом. В течение пары недель кладбище в Липнишках приобрело свое нынешнее ограждение и в том же 1948 г. было вновь освещено. Дело об ограждении кладбища стало интересовать власти только в 1951 г., когда ксендзу было предъявлено обвинение в «бесправной» покупке цемента. Ситуацию спас органист костела, который взял всю вину на себя. Первый суд приговорил органиста к условному сроку, однако, в результате нового судебного дела срок стал реальным. Органиста приговорили к 1 году тюремного заключения. В этом же 1951 г. ксендз был лишен дома (т.н. плебании) [8, с. 6].

Несмотря на запреты и гонения со стороны советской власти, духовная жизнь в приходе продолжалась. Наряду с традиционными богослужениями ксендз проводил и тайные, которые проводились по вечерам. С целью «конспирации» в это время в костеле не включался свет.

Годы трудной работы очень сказались на здоровье Стефана Сечко. 20 января 1976 г. он умер. В день похорон собралось около 30 священников и много местных жителей. С. Сечко был похоронен на католическом кладбище Липнишек.

В период с января по июль 1976 г. приход формально оставался без священника. Духовную работу проводили здесь священники из соседних приходов, которые приезжали в Липнишки несколько раз в месяц. 19 марта 1976 г. ксендзом был назначен Кароль Францишек Щепанек (01.05.1912 – 10.01.2004 гг.) [11]. Ксендз Кароль Щепанек, капуцин, до 1956 г. был монахом в местечке Перелом (возле Гожи, Гродно).

Утверждение нового священника Липнишского прихода светскими советскими властями затянулось на долгие месяцы. Однако утвердили. К. Щепанек 20 лет (с 1976 по 1996 гг.) являлся священником Липнишского прихода. В этот период ему помогали в работе сестры-монахини из III Закона, а также один из монахов-капуцинов бывшего храма в Переломе брат Криспин Чишек [4].

В 1981 – 1986 гг. в Липнишки приезжали семинаристы из рижской семинарии: братья Витольд Жельветро и Петр Ясевич (из ордена капуцинов). В 1984 г. впервые был проведен внутренний ремонт и внутренняя покраска костела.

Начиная с 1989 г., в период горбачевской перестройки и возрождения религиозных традиций в СССР, в Липнишки приезжали ксендзы-капуцины из Польши: 1989 г. – кс. Кристоф Грошик (в том же году переведен в д. Субботники, Ивьевский р-н), 1990 – 1991 гг. – кс. Тадеуш Ковальски.

После образования в 1991 г. Гродненской диоцезии помощь местному приходу оказывали также в 1991 – 1992 гг. – кс. Тадеуш Трояновский, в 1992 – 1993 гг. кс. Станислав Митюк, кс. Клавдий Призмонт, в 994 – 1996 гг. – кс. Богуслав Росохацкий, который получил официальные документы на должность викария костела [4].

В конце 1980 гг. было начато строительство нового дома для ксендзов. Он располагался на окраине местечка, возле дороги Липнишки – Трокели. В 1991 г. было получено согласие генерала ордена капуцинов на создание в Липнишках дома законников [1].

С 1996 по 2007 г. Липнишский приход возглавлял кс. Кристоф Грошик (орден капуцинов). В этот период в работе ему помогали: кс. Анатолий Ярошко (1998 – 2001 гг., орден капуцинов), Андрей Романовский (1999 – 2001 гг., орден капуцинов), Виктор Борисевич (2001 – 2004 гг., орден капуцинов), Юрий Котович (2004 – 2006 гг., орден капуцинов).

4 мая 2002 г. в приходе появилась новая каплица (архитектор А.Еpоменко, построена на средства Ф.В. Березы и местных прихожан). Построена она в д. Центральная и была освещена гродненским епископом А.Кашкевичем под названием Возвышение Святого креста. Кроме д. Центральной богослужения ксендзом проводятся также в приспособленных для этого помещениях в д. Некраши и д. Князиковцы [1; 4].

Липнишский костел также подвергся капитальному ремонту. Прежде всего, была упорядочена территория вокруг костела: убраны старые деревья, упорядочены могилы. У костела была перекрыта крыша, заменены старые деревянные перекрытия в башнях костела, сделаны ремонтные работы внутри: заменен алтарь, перенесена сакристия.

С основания в Липнишках дома законника в жизни местного прихода принимали участие большое количество клериков и семинаристов, а также сестры из общества Матери Божьей Милосердной (1996 – 2001 гг.), сестры-францишканки (2001 – 2005 гг.). С 2006 г. на территории прихода вновь работают сестры из общества Матери Божьей Милосердной.

С 2007 г. Липнишский приход возглавил кс. Ю.Котович (орден капуцинов). Викарием костела св. Казимира в Липнишках стал кс. Зуй. На 2007 год приход насчитывал 2 688 католиков [4].

Несмотря на трудности, которые приход пережил и которые еще предстоят, необходимо подчеркнуть, что он играл и играет большую роль в духовной жизни местечка Липнишки последние 500 лет.

Список источников и литературы

1. Матэрыялы з асабістага архіва кс. К. Грошыка, Ліпнішкаўская парафія.
2. Памяць. Іўеўскі раён. – Мінск: БелТА, 2002. – С. 453.
3. Цітоў, А. Сімвалы незалежнасці / А. Цітоў // Геральдыка беларускіх местаў. – Менск, 1998. – С. 134 – 135.
4. Fibek, Jan. Historia parafii Lipnishki i Żygmunciszki / Jan Fibek [Электронный ресурс]. – 2008 – Режим доступа: http://www.radzima.org/pub/miesta.php?lang=by&miesta_id1=hriulipn. – Дата доступа: 28.03.2008.
5. Летапіс в. Ліпнішкі / рэд.кал.: Т. Захарэвіч, М. Пякша, К. Карыцкі, Т. Горбач [і інш.]. – Захоўваецца ў Цэнтральнай сельскай бібліятэцы в. Ліпнішкі.
6. Урублеўскі, В. Ліпнішкі / В. Урублеўскі // Іўеўскі край. – 2007. – 21 ліпеня. – С. 4.
7. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобласць / АН БССР, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд кал.: С.В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭС, 1986. – С. 202.
8. Быў святаром вялікага сэрца // Слова жыцця. – 2005. – 9 студзеня. – С. 6.
9. Белозорович, В.А. Западнобелорусская деревня в 1939 – 1953 годах: монография / В.А. Белозорович. – Гродно: ГрГУ, 2004. – С. 86.
10. Гецевич, А.К. Из истории местечка Липнишки (20-е гг. ХХ века) / А.К. Гецевич // Гарады Беларусі ў кантэксце палітыкі, эканомікі, культуры: зборнік навук. артыкулаў / Гродз. дзярж. ун-т; рэдкалегія: І.П. Крэнь, І.В. Соркіна (адк. рэдактары) [і інш.]. – Гродна: ГрДУ, 2007. – С. 383 – 388.
11. Давідовіч, М. Гродзенская пушча. Пералом / М.Давідовіч // Слова жыцця. – 2008. – 4 мая – С. 4.

Гецевич Андрей Казимирович – кандидат исторических наук, старший преподаватель, Гродненский государственный университет имени Янки Купалы.

УДК 27-789.5(476)

В.П. Гарматны (Баранавічы)

ОРДЭН КАРТУЗАЎ І ЯГО КЛЯШТАР У БЯРОЗЕ: СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ

В статье рассказывается о деятельности в местечке Берёза-Картузская (на территории современной Брестской области) ордена картузов, который считался самым строгим монашеским орденом Католической церкви.

Гісторыкі сцвярджаюць, што Бяроза-Картузская (зараз райцэнтр Бяроза ў Брэсцкай вобласці) пачаў развівацца дзякуючы прадстаўнікам магнацкага роду Сапегаў, якія ў канцы XVI ст. сталі ўладальнікамі мястэчка. Яны пабудавалі тут каталіцкую школу, а потым касцёл і адзіны ў Вялікім княстве Літоўскім манастыр (кляштар) ордэна картузаў – самага строгага манаскага ордэна на свеце.

Ордэн (закон) картузаў быў заснаваны ў 1084 г. святым Бруна (прафесарам тэалогіі) у пустэльні Шартроз (лац. Cartusia), размешчанай у

гарыстай мясцовасці каля Грэнобля (Францыя). Прафесар адрокся ад свету і разам з двума аднадумцамі пайшоў у манахі. Статут ордэна, прыняты ў 1134 г. і зацверджанаы ў 1170 г., стаў самым строгім з усіх існуючых ордэнскіх статутаў. У картузаў не было агульных памяшканняў для сумеснага прыёму ежы: манах адтрымліваў прадукты праз асобную адтуліну з двума паваротамі, каб не бачыць рук чалавека, які падаваў іх, а затым гатаваў сабе ежу сам. На службу картузы ішлі ў белых расах па ізаляваным галерэям – нават у касцёле іх ніхто з міран не бачыў [5, с. 8; 12; 13, с. 17; 15, с. 133 – 134].

Манахі існавалі адасоблена, не маючы ніякіх кантактаў з навакольным светам, фактычна стварылі «дзяржаву ў дзяржаве». Узнікненне ордэна з такімі замкнутым спосабам жыцця дыктаваўся неабходнасцю адысці ад свецкасці і існаваць адасоблена ад усіх. Папярэднікі картузаў – бенедыктынцы – па меры накаплення багаццяў, пераўтварэння іх у буйных землеўласнікаў і звязанага з гэтым псаваннем нораву манахаў страцілі аскетычнасць і суровую строгасць статута. Таму картузы максімальна строга рэгламентавалі сваё жыццё, і рымскі папа прыхільна ставіўся да іх, дзякуючы гэтаму ордэн хутка пашыраў сваю дзейнасць у еўрапейскіх краінах. Строгасць правіл закону картузаў зрабіла ордэн адносна нешматлікім і ў пэўнай ступені элітарным, але з канца XVII ст. пачынаецца яго заняпад [1; 3, с. 123; 11, с. 4].

У 1646 г. картузы з Картузаў (каля Гданьска) адправілі магнату Казіміру Льву Сапегу ліст, у якім азнаёмілі яго з гісторыяй свайго ордэна картузаў і далі некаторыя звесткі пра свае найбольш вядомыя кляштары. Праз два гады папскім нунцыем Джавані дэ Торэсам быў закладзены першы камень новага кляштара. Даследчыкі лічаць, што архітэктарам кляштару стаў італьянскі майстар Жан Батыста Гіслені. Казімір Сапега ахвяраваў на будаўніцтва дзесяць тысяч залатых чырвонцаў, яго падтрымала мясцовая шляхта і ўнесла вялікія ахвяраванні [2, с. 2–3; 7, с. 3; 10]. Даследчыкі параўноўваюць кляштар з манастыром Святога Бернара ў Альпах, манахі якога вывелі спецыяльную пароду сабак дзеля адшуквання заблукаўшых путнікаў, а мэтаю бярозаўскіх манахаў было «адшукванне душ і перавод іх да каталіцызму».

Перыяд 1648 – 1667 гг. азначаны вялікай вайной Рэчы Паспалітай з казакамі, а потым – з Маскоўскай дзяржавай; з 1655 г. у гэтую вайну ўцягнуліся шведы. Сапега прымаў удзел у ваеннай кампаніі і не мог адпаведна клапаціцца аб сваім кляштары. Магнат памёр 19 студзеня 1656 г. перад асвячэннем кляштарнага касцёла, але завяшчаў картузам вялікі зямельны надзел з васьмю сотнямі сялянскіх двароў і вялікую суму грошай, якія дазволілі ім дабудаваць кляштарны комплекс. Усяго на кляштар пайшло каля трохсот тысяч залатых чырвонцаў, што адпавядае

тоне золата. 6 чэрвеня 1666 года біскуп Самагіціі Аляксандр Сапега (сваяк заснавацеля) асвяціў касцёл, пад час гэтай падзеі адбылося перазахаванне К. Л. Сапегі ў манастырскім склепе.

Нямецкія візітатары (своеасаблівыя рэвізоры) у 1655 г. пісалі: «Некалькі разоў ён (кляштар) быў абрабаваны маскавітамі, татарамі ды і падобнымі варварамі, пакінуты сваімі насельнікамі, якія ўцякалі ў іншыя вобласці, што належылі ордэну». Таму будаўніцтва кляштара было скончана толькі ў 1689 г., але быў узведзены цэлы комплекс. Напрыканцы будаўніцтва кляштара – двайніка манастыра Святога Бернара ў Альпах наведвальнікі склалі справаздачу, у якой адзначалі, што касцёл «ob sui magnificentiam simile non habemus in nostra Provincia Rheni» («з прычыны свайго хараства не мае падобных у нашай правінцыі Рэйн») [4, с. 5].

Стварыўшы своеасаблівую ферму, картузы здолелі акліматызаваць на нашай зямлі чарапах – кавалак панцыра гэтай жывёлы (прычым не мясцовай жоўлы) знойдзены ў пластах XVIII ст. падчас археалагічных раскопак. Нешта экзатычнае чуваць і ў прадпісаннях для правініўшыхся манахаў: апрацоўка вінаградніка, праца ў разарыуме… Непадалёку ад касцёла стаяў палац для заблукаўшых пілігрымаў, што ішлі да картузаў з усяго свету. У канцы XVIII ст. пры манастыры працавала прыхадская школа, дзе навучаліся дзеці навакольнай шляхты. Парадак у картузаў быў настолькі жорсткі, што некаторыя манахі ў XVIII ст. пераходзілі ў крыху вальнейшы закон францішканцаў [8; 13, с. 21; 14].

Гісторыю кляштара картузаў у Бярозе, які сваёй падвоенай назвай Бяроза-Картузская ці Картуз-Бяроза абавязана манахам гэтага ордэна, можна падзяліць на чатыры перыяды:

1) 1648 – 1666 гг.: заснаванне кляштара – асвячэнне касцёла;
2) 1666 – 1734 гг.: асвячэнне касцёла – грамадзянская вайна 1734 г.;
3) 1734 – 1795 гг.: грамадзянская вайна 1734 г. – уваходжанне ў склад Расійскай Імперыі;
4) 1795 – 1831 гг.: уваходжанне ў склад Расіі – закрыццё кляштара [6; 9].

У 1866 г. па распараджэнню ўладаў кляштар часткова разабралі, а ў казармах, пабудаваных з яго цэглы, размясцілі 151-ы Пяцігорскі полк. У 1915 г. кляштар згарэў, а касцёл быў разбураны: засталіся толькі руіны касцёльнай вежы, вонкавая брама і фасадная частка кляштара.

На мармуровай дошцы ля ўваходу ў касцёл манахі некалі загадалі выгравіраваць надпіс на латыні са страшным праклёнам таго, хто асмеліцца парушыць гэты храм Божы і з`яднаны з ім кляштар. Расійскі імператар Мікалай I не прыслухаўся яго, і праклён збыўся, але своеасаблівым чынам: у 1934 – 1939 гг. улады другой Рэчы Паспалітай

размясцілі ў казармах, якія атрымалі назву «Чырвоныя», канцлагер [8; 10; 13, с. 83 – 87].

Да нядаўняга часу лёс манастыра, дакладней таго, што ад яго засталося, быў вельмі незайздросны. На тэрыторыі, дзе калісьці размяшчаўся найпрыгажэйшы кляштар ордэна картузаў, унесены ў Французскую энцыклапедыю мастацтваў, да нядаўняга часу знаходзілася вайсковая частка, якая … разводзіла тут свіней.

Здавалася, няма надзеі вярнуць Бярозе яе гістарычнае аблічча, але яна з`явілася пасля таго, як кляштар уключылі ў абласную праграму першачарговых аб`ектаў рэстаўрацыі і будаўніцтва манументальных помнікаў на 2004 – 2010 гг. Сёння помнік архітэктуры XVII ст. можна ўбачыць у Бярозаўскім гісторыка-краязнаўчым музеі: навучэнцы Брэсцкага дзяржаўнага палітэхнічнага каледжа па захаваўшымся гравюрам і чарцяжам узнавілі воблік маўклівага сведкі нашай багатай гісторыі – ў якасці дыпломнай працы яны зрабілі макет кляштара памерамі 1,5 на 1,5 метра і перадалі яго ў музей.

У канцы 2005 г. на пасяджэнні каардынацыйнага савету па ахове матэрыяльнай і духоўнай спадчыны пад кіраўніцтвам старшыні Бярозаўскага райвыканкама Ю.І. Наркевіча прынята пастанова аб рэстаўрацыі кляштара ў два этапы. На гэтую справу ў 2006 г. было выдзелена 25 мільёнаў рублёў, акрамя таго, ідзе збор сродкаў сярод мясцовага насельніцтва. Апошні час ажыла надзея на тое, што Бяроза верне свой гістарычны твар, а праклён Сапегаў назаўсёды застанецца ў мінулым.

Спіс крыніц і літаратуры

1. Вабішчэвіч, А. Адкуль картузы ў Бярозе? / А. Вабішчэвіч. // Народная трыбуна (г. Брэст). –1992. – 12 – 18 кастрычніка. – С. 4.
2. Віткоўскі, Р. Некаторыя нататкі аб картэзіянскім кляштары ў Бярозе-Картузскай / Р.Віткоўскі // Гістарычная брама. – 1997. – № 3 – 4. – С. 1 – 5.
3. Габрусь, Т.В. Мураваныя харалы: Сакральная архітэктура беларускага барока / Т.В. Габрусь. – Мінск: Ураджай, 2001. – 287 с.
4. Дзярновіч, А. Маўклівы кляштар князя Сапегі / А. Дзярновіч // Гістарычная брама (г. Бяроза). – 1997. – № 1. – С. 4 – 6.
5. Квітніцкая, А.Д. Кляштар у Картузскай Бярозе / А.Д. Квітніцкая // Гістарычная брама. – 1998. – № 1. – С. 8 – 10.
6. Кныревич, С. Берёзовский кляштор картузов в вопросах и ответах / С. Кнырэвіч. // Маяк (г. Берёза). – 2007. – 5 декабря. – С. 6.
7. Кнырэвіч, С. Да 520-годдзя г. Бяроза / С. Кнырэвіч // Гістарычная брама. – 1997. – № 1. – С. 1 – 3.
8. Козлович, В. Был ли император Николай I проклят родом Сапег? / В. Козлович // Путешественник. – 2000. – 7 – 21 апреля.
9. Козлович, В. От монастырских стен начинался город Берёза / В. Козлович // Брестский курьер. – 2000. – № 45. – С. 11.
10. Конога, П. Благословение и проклятие Сапеги / П. Конога // Рэспубліка. – 2007. – 16 сакавіка. – С. 4.
11. Мартинович, В. «Мёртвый город» может спать спокойно / В. Мартинович // Белорусская деловая газета. – 2000. – 13 мая – С. 4.
12. Муха, Н.Блеск и нищета Картузианского монастыря / Н. Муха // Беларускі Час. – 2001. – 18 мая. – С. 5.
13. Память: Историко-документальная хроника Берёзовского района / под редакцией И.П. Шамякина. – Минск, БелСЭ, 1987. – 439 с.
14. Сикорин, Н. Кляштор – картузианский монастырь / Н. Сикорин // Маяк коммунизма (г. Берёза). – 1973. – 17 февраля.
15. Страчаная спадчына / Т. Габрусь, А. Кулагін, Ю. Чантурыя [і інш.]. – Мінск, Беларусь, 2003. – 351 с.

Гарматны Віталь Пятровіч – магістр гістарычных навук, выкладчык, Баранавіцкі дзяржаўны універсітэт.

УДК 930.85(476.5)

А.А. Саявец (Мінск)

КАТАЛІЦКІЯ ХРАМЫ НА БРАСЛАЎШЧЫНЕ

Статья посвящена истории католических храмов XVI – XVIII вв. на территории современного Браславского района и анализу их архитектурных особенностей. Богатое культурно-историческое наследие позволяет говорить о перспективах разработки туристических маршрутов в изучаемом регионе.

Адным з самых старажытных гарадоў Беларусі з’яўляецца Браслаў (Браслаўе). Браслаўскі раён вядомы як край азёраў. Тут, на Заходняй Віцебшчыне, захаваліся ландшафт і лясы ў спрадвечнай прыгажосці. Яшчэ ў X ст. узнікла першае на тэрыторыі Беларусі і незалежнае княства – Полацкае. Сам горад Браслаў многае бачыў, перажыў у сваёй гісторыі. У 1063 г. горад быў адваяваны князямі Кернусам і Гімбутам у полацкіх князёў [1, с. 73 – 76].

У 1424 г. першы віленскі ваявода Манівід з дазволу вялікага князя літоўскага Вітаўта залажыў у горадзе каля Замкавай гары касцёл Маці Божай. Гэты касцёл на гандлёвай плошчы быў злучаны падземнымі хадамі з Замкавай гарой. У канцы XV ст. касцёл згарэў, але ўжо ў 1554 г. уздоўж возера Дрысвяты стаялі новы касцёл і кляштар. Храм быў спалены 11 мая 1794 года, калі рускія войскі захапілі горад. Мураваны храм (касцёл Раства Найсвяцейшай Дзевы Марыі) каля старажытнага замчышча быў пабудаваны ў 1824 г., у 1897 г. – капітальна перабудаваны, пасля Вялікай Айчыннай вайны закрыты і ў 1967 г. адноўлены і адкрыты.

Гэты храм пабудаваны ў неараманскім стылі, як і касцёл Божага цела ў в. Іказнь, касцёл у в. Плюсы, касцёл Найсвяцейшага Сэрца Ісуса. Помнік уяўляе 3-нефавую базіліку. Падоўжаны, прамавугольны ў плане, накрыты 2-схільным дахам. Вуглавыя пінаклі, ярусная шатровая вежа-званіца, лесвіца з буйных вапняковых блокаў, ступеньчатыя контрфорсы. Зала асветлена высокімі бакавымі аконнымі праёмамі, алтарная частка – вялікім круглым акном-ружай. У цэнтры алтара – абраз Маці Божай Браслаўскай, які, паводле падання, уратаваў касцёл ад пажару ў 1832 г. (што знішчыў манастыр базыльян на востраве возера Неспіш). Паміж канеліраванымі калонамі – скульптуры апосталаў. На хорах устаноўлены арган.

Касцёл Божага Цела, як і кожны з чатырох пералічаных вышэй, мае акно-ружу ў цэнтры (архітэктурная рыса гатычнага стылю). Над магутным арачным уваходным парталам – трыфорыум. 2 магутныя шатровыя вежы [2, с. 71].

У касцёле Божага Цела, што ў в. Плюсы, над уваходным парталам трыфорыум. 3-нефавая 2-вежавая базіліка. Другі ярус галоўнага фасада вылучаны аркатурным фрызам. Форма паўцыркульный аркі ў малюнку ўваходнага партала [2, с. 125].

Як у в. Іказнь і ў в. Плюсы, касцёл Найсвяцейшага Сэрца Ісуса ў в. Слабодка пабудаваны з цэглы ў пачатку XX ст. Гэта 3-нефавая 2-вежавая базіліка з апсідай, трансептам і санкрысціямі. 2 высокія 5-ярусныя вежы з вострымі шатровымі вярхамі, невысокі цэнтральны неф паміж імі. Сцены прарэзаны паўцыркульнымі, лучковымі і круглымі аконнымі праёмамі з вітражамі. На ўсіх сценах ступеньчатыя контрфорсы, дэкаратыўныя аркбутаны. Уваходы ў выглядзе аднатыпных парталаў з паўцыркульнымі праёмамі. Цыліндрычныя скляпенні з распалубкамі, хоры над нартэксам у інтэр'еры. Аркатурныя паясы, нішы, калонкі з капітэлямі раслінных формаў – ордэрныя элементы раманскай архітэктуры. Сцены і скляпенні алтарнай часткі размаляваны арнаментам. Мастацкую каштоўнасць маюць жалезныя акоўкі вонкавых дзвярэй – помнік манументальна-дэкаратыўнага мастацтва і кавальскага майстэрства [2, с. 141].

Пералічаныя вышэй касцёлы – помнікі неараманскага стылю (архітэктурны стыль заснаваны на стылізацыі форм сярэдневяковай раманскай архітэктуры). Раманскі стыль – стыль заходнееўрапейскай архітэктуры X – XIII стст., адметны суровым характарам, масіўнасцю канструкцый, абстрактна-геаметрычным арнаментам, скульптурнымі парталамі.

Гатычны стыль – мастацкі стыль у Еўропе ў XII – XVI стст. Гатычныя саборы маюць у аснове каркас са слупоў, стральчатых арак, нервюрных скляпенняў, распор ад якіх перадаецца праз вонкавыя паўаркі (аркбутаны) на контрфорсы.

У Браслаўскім раёне размешчаны помнікі неагатычнага (касцёл святога Іаана Хрысціцеля ў в. Опса, касцёл Прасвятой Тройцы ў г. п. Відзы), рэтраспектыўна-гатычнага стылю (капліца ў в. Ахрэмаўцы).

Капліца пабудавана ў 1858 г. з цэглы графам Плятэрам каля касцёла (не захаваўся). Кампактны прамавугольны аб'ём пад 2-схільным дахам, 2 вежы і ступеньчаты атык паміж імі. Над стральчатым парталам акно-ружа. Вежы завершаны металічнымі шпілямі з крыжамі. Стральчатая і 3-лопасцевыя нішы, карнізы, фіялы. Прапарцыянальна выцягнутыя архітэктурныя формы надаюць вертыкальную накіраванасць [2, с. 10].

У адрозненне ад рэтраспектыўна-гатычнага стылю (кампілятыўна пераймаў формы сярэдневяковай готыкі) неагатычны стыль (стыль мяжы XIX – XX стст.) заснаваны на стылізацыі форм готыкі.

У г. п. Відзы касцёл Прасвятой Тройцы пабудаваны ў 1914 г. з чырвонай цэглы ў стылі неаготыка. 3-нефавая 2-вежавая базіліка з 5-граннай апсідай, 2-паверховымі санкрысціямі і трансептам. Зграбныя, лёгкія вежы завершаны спічастымі шпілямі і аб'яднаны ступеньчата-зубчастым шчытом. Галоўны ўваход вырашаны перспектыўным парталам з вімпергам і вялікім акном-ружай. У інтэр'еры калоны і пілястры складанага профілю пераходзяць у высокія спічастыя аркі скляпенняў, што надае вертыкальную дынамічнасць [2, с. 24 – 25].

Касцёл Святога Іаана Хрысціцеля ў в. Опса таксама выкананы ў стылі неаготыка. Пабудаваны ў пачатку XX ст. аднанефавы аднавежавы храм з 5-граннай апсідай, па баках – ніжнія санкрысціі. Асноўны аб'ём накрыты 2-схільным дахам. Вімпергі аздабляюць партал галоўнага ўвахода. Над ім – акно-ружа, вышэй – падвойнае арачнае акно. Вежа-званіца завершана востраканцовым шатром. У дэкоры – прафіляваныя цягі, аркатурныя паясы, лапаткі і арачныя нішы. Неф і апсіда перакрыты цыліндрычным скляпеннем з распалубкамі [2, с. 116].

Пасля раманскага і гатычнага стыляў у Еўропе распаўсюдзіўся стыль барока (XVI – XVIII стст.). Для яго характэрны дынамічнасць і пластычнасць, складанасць святлаценявых і колеравых эфектаў, крывалінейнасць абрысаў, ілюзія бязмежнасці прасторы, арганічнае спалучэнне архітэктурных і скульптурных форм.

У гэтым стылі быў пабудаваны касцёл Прасвятой Тройцы і кляштар бернардзінаў (г. п. Друя). Гэта адзін з самых старажытных помнікаў на тэрыторыі Беларусі. На ўзвышаным беразе ракі Заходняя Дзвіна ў паўночнай частцы касцёл быў пабудаваны ў 1643 – 46 гг. па фундацыі падканцлера Вялікага княства Літоўскага Казіміра Сапегі, перабудоўваўся каля 1763 г., у 1934 – 1938 гг., з 1989 г. вернікі вядуць рэстаўрацыю. У 1920 – 1930 гг. тут была школа.

Аднавежавая 3-нефавая базіліка з выцягнутай паўцыркульнай апсідай, аднабаковай санкрысціяй. Спрошчаныя масіўныя формы.

Высокая 5-ярусная вежа ў цэнтры ўвянчана фігурным купалам. Яе грані прарэзаны паўцыркульнымі і круглымі аконнымі праёмамі. Бакавыя сцены нефа і апсіды ўмацаваны высокімі магутнымі контрфорсамі.

Унутры – малітоўная зала. Бакавыя сцены цэнтральнага нефа дэкараваны філёнгамі, ляпным геаметрычным і раслінным арнаментам, пуцці. Дэкор рэнесансны. Інтэр'ер вырашаны ў двух колерах – светлай охры і белым. Пластыка алтара заснавана на спалучэнні пілястрава-калонных устояў з хвалістым, моцна раскрапаваным карнізам. Сядзячыя скульптуры анёлаў на вітых валютах. Ляпная скульптурная кампазіцыя «Глорыя». У стылі ракако выканана алтарная карціна «Укрыжаванне». На хорах быў арган.

Пры касцёле была званіца. 2-павярховы жылы корпус утварае прамавугольны ўнутраны двор. Ад двара з 3 бакоў праходзіць калідор, перакрыты крыжовымі скляпеннямі. Прамавугольныя аконныя праёмы на гладкіх атынкаваных сценах і вузкі завяршальны карніз [2, с. 58 – 59].

Касцёл Найсвяцейшай Маці Божай Анёльскай пабудаваны з дрэва ў барочнай стылёвасці, як і папярэдні (в. Мяжаны). Да асноўнага прамавугольнага зруба далучаны прытвор са званіцай і 2 апсіды: прамавугольная алтарная з рызніцай і 5-гранная. Прытвор абкружаны абходнай галерэяй. Сцены прарэзаны прамавугольнымі і паўцыркульнымі аконнымі праёмамі. Будынак накрыты высокім фігурным дахам, з плаўнымі выгнутымі формамі. Завяршаюць храм 2 розныя па форме 8-гранныя фігурныя вежачкі над асноўным аб'ёмам і званіцай [2, с. 106].

Касцёл Святога Станіслава пабудаваны ў цэнтры вёскі Далёкія ў першай палавіне XX ст., як і папярэдні, з дрэва. Да прамавугольнага зруба на галоўным фасадзе далучана 3-ярусная чацверыковая званіца, завершаная фігурным барочным купалам. У інтэр'еры – абраз XVIII ст. «Каранаванне Маці Божай» [2, с. 53].

Касцёл Святога Іосіфа (у в. Барадзінічы) пабудаваны ў 1905 г. з бутавага каменю. Не мае выразнай мастацка-стылёвай афарбоўкі. Спрошчаны прамавугольны аб'ём пад 2-схільным дахам завершаны 3-яруснай 8-products граннай званіцай. Сіметрычны галоўны фасад. Атынкаваныя і пабеленыя элементы вылучаюцца на фоне бутавай муроўкі [2, с. 11 – 12].

Касцёл святых апосталаў Пятра і Паўла ў в. Друсвяты – таксама помнік драўлянага дойлідства. Пабудаваны ў 1929 г. Раней, у XVI – XVIII стст., у вёсцы быў пабудаваны невялікі касцёл па фундацыі Мікалая Радзівіла паводле каралеўскага ўказа 1514 г. Пазней быў перанесены на другое месца. Касцёл аднавежавы прамавугольны ў плане, мае 5-гранную апсіду, прытвор, санкрысціі. 2-схільны дах з заломам над асноўным аб'ёмам. На галоўным фасадзе – вялікі шырокі вальмавы навес, 4 тонкія мураваныя калоны і галерэя-падценне. 6-ярусная вежа-званіца. Дах пад апсідай завершаны маленькай фігурнай сігнатуркай. У інтэр'еры 8 драўляных слупоў падтрымліваюць кесонную столь, пакрытую алейнай арнаментальнай размалёўкай. Над нартэксам хоры. Алтарныя абразы «Пакланенне вешчуноў» (галоўны, выкананы пад уплывам рэнесансу і готыкі), «Укрыжаванне Збавіцеля» (на першым ярусе), «Святыя Пётр і Павел» (другі ярус) [2, с. с. 59].

Помнік драўлянага дойлідства з рысамі стылю мадэрн. Мадэрн – стыль у еўрапейскім мастацтве (канец XIX – пачатак XX ст.), які вызначаецца свабоднай планіроўкай, асэнсаваннем новых канструкцый і матэрыялаў, шырокім выкарыстаннем хвалістых ліній у дэкоры, цякучых пластычных форм, крывалінейным малюнкам праёмаў, сінтэзам мастацтваў.

Былі страчаны кляштар дамініканцаў (пабудаваны ў 1690 – 1706 гг. італьянскім архітэктарам у стылі барока ў г. п. Друя). Касцёл у в. Падгайцы, пабудаваны ў XVIII ст. з дрэва з рысамі стылю барока, вядомы па малюнку Я. Драздовіча.

Такім чынам, Браслаўская зямля мае вялікую гістарычную спадчыну, якую неабходна вывучаць і беражна захоўваць. Толькі каталіцкіх храмаў розных стыляў і часоў у Браслаўскім раёне захавалася шмат, і яны заслугоўваюць таго, каб стаць аб'ектам турыстычных падарожжаў.

Спіс крыніц і літаратуры

1. Роднае слова. – 2006. – № 4. – С.73 – 76.
2. Кулагін, А. Каталіцкія храмы на Беларусі: энцыклапедычны даведнік / А. Кулагін. – 2-е выд. – Мінск: БелЭн, 2001. – 216 с.

Саявец Анастасія Аляксандраўна – лабарант, Беларускі дзяржаўны універсітэт.

УДК 2-67(476)

Л.Л. Лаўрэш (Ліда)

ЦАРКВА Ў ДЗІКУШКАХ НА ЛІДЧЫНЕ

Статья посвящена истории церкви и прихода в деревне Дикушки, что в Лидском районе. Рассматривается позиция в вопросе ликвидации Униатской церкви родственников известного православного иерарха XIX века Иосифа Семашко: отца Иосифа – настоятеля Дикушской православной церкви, в ней же похороненного в 1856 г., и брата Иоанна.

Лічыцца, што ў 1442 г. прыход ў Дзікушках ўжо існаваў. Першапачаткова тут была драўляная царква. Інфармацыя аб старой драўлянай царкве ёсць у *«поданьи»* (перадачы) 31 ліпеня 1732 г. дзікушскай царквы і прыхода лідскаму протапрэсвітару Яну Скарымскаму. Дакумент утрымливае вопіс царкоўнай маёмасці: *«Царква драўляная, з адным купалам, на ім жалезны крыж, дах нанова пакрыты гонтаю … Срэбная чаша старадаўняй работы, пазалочаная, паламаная … Евангелле рукапісна е старадаўняе … Цудатворны абраз Найсвяцейшай Панны Ченстахоўскі. Царкоўная адзежа, кнігі, пабудовы (плебанія), зямля і сяляне (12 мужчын з 2 канямі і 6 валамі). Прыпісная* царква – лебёдская» [1, с. 68]. 15 лістапада 1781 г. слухалася справа аб абвінавачванні дікушскага «параха» Антонія Свідэрскага *«в неблагоповедении»* [1, с. 396]. Вядома, што на пачатку XVIII ст. дзікушскай уніяцкай царкве належыў адзін «дым» (сялянская гаспадарка).

Яшчэ ў канцы XIX ст. у царкоўнай рызніцы захоўвалася рукапіснае з кінаварру Евангелле (верагодна тое, што згадваецца ў вопісе 1732 г.). Дата напісання ў самім рукапісе не ўказана, але на срэбнай дошчачцы вокладкі пастаўлены 1587 г.

У прытворы царквы ў раме знаходзілася перанесеная са старой драўлянай царквы пабітая мармуровая пліта, 3х1,5 аршыны (1 аршын = 0,711 м) і таўшчынёй у 0,5 аршына. На гэтай пліце быў стараславянскі надпіс, тэст якога занатаваў мясцовы настаўнік: *«Тутъ лежитъ в томъ гробе положена Марина Мартиновна М…сковича Скуминовня Тышкевичая невеста побожностью и учтивостью вшелякую часу житія своего на свете всем людям в том панстве въ 20 летъ знаемая цнот вшелякихъ христіанскихъ взоръ и образъ видомыхъ дней добрыхъ благославенства божего пана пошедши за мужъ зъ дому родичевъ своих у году 14 лет отъ нарожения своего жила у малженском стани … 42 годы по смерти мужа своего удовою годовъ 32 учтиво своего провиденя до коданя своего о другомъ малженствіе не мыслечи оставивши .. всего потомства своего душъ больше 838 … въ старости … не только матка маткомъ але бабкомъ и прабабкамъ маткою была дождавши пращурят т.е. четвертага поколеня своего оглядавши в року 88 отъ нарожения своего душу свою въ руки Творцы Своему отдала и до фалы его святое зъ сего света представилася у выменю отчинномъ малжонка … на которомъ отъ него оставлена была в Дикушкахъ Року божага нар. 1598 мца іюля 28 дня у воторокъ годину 4 и въ томъ же року 98 мца сентября 3 дня похована при церкве преображенія Хрва отъ своихъ старшего Дмитра Скумина старосты менскаго маршалка его к. мсти у в. кн. лит. писаря замковъ волостеи украины а молодшаго Теодора Скумина воеводы Новгородскага старосты Городенскага, Олитскаго, Юрборскага и Нововольскаго*» [2, с. 101].

Скуміны-Тышкевічы – старажытны дваранскі род (герба Ляліва), які прыняў прозвішча ад трэцяга сына Каленіка Мішковіча Цішкі (Цімафея), што жыў у першай палове XV ст. Унук другога сына Цішкі Льва – Ян Тышкевіч, стараста Чарнобыльскі, меў сем дачок і двух сыноў. Яго сын Зміцер Скумін-Тышкевіч (маршалак ВКЛ, менскі стараста) быў бацькам чатырох сыноў. Разам са сваім другім сынам Тэадорам (Федарам) Скуміным-Тышкевічам ён фундаваў мармуровую дошку ў Дзікушскай царкве. Тэадор Скумін-Тышкевіч быў ў 1577 г. паслом ад караля Стэфана Баторыя ў Маскве. Потым прыняў удзел у вызваленні Полацку ад войскаў Івана Жахлівага.

Першапачаткова Тэадор Скумін-Тышкевіч выступаў супраць аб'яднання цэркваў. Але потым стаў прыхільнікам уніі [3, s. 173 – 184]. Мітрапаліт Макары ў сваёй «Гісторыі Рускай царквы» пісаў: *«… і наваградскі ваявода Скумін-Тышкевіч, які настолькі раней быў супраць уніі, зараз прыняў яе і зрабіўся яе заступнікам»* [4]. Дарэчы, апошнім з роду Скумінаў-Тышкевічаў быў Людвік Скумін-Тышкевіч († 1808), польны гетман ВКЛ, жанаты на пляменніцы апошняга караля Рэчы Паспалітай Канстанцыі Панятоўскай. Людвік валодаў маёнткам Гародна на Лідчыне [5, s. 122 – 139]. З яго смерцю галіна Скумінаў-Тышкевічаў спынілася.

Пасля скасавання уніі ў Дзікушскі прыход Літоўскай епархіі на месца, дзе раней працаваў святар Канеўскі, мітрапаліт Іосіф Сямашка ўладкаваў свайго бацьку, так сама Іосіфа Сямашку, які страціў месца святара ў Кіеўскай губерні. Пасля таго, як Іосіф Сямашка-бацька прыняў праваслаўе, ён быў высвечаны ў 1840 г. у Жыровічах на званне саборнага протаіерэя і ўзнагароджаны залатым наперсным крыжам. Сямашка-бацька разам з жонкай пераехаў на Лідчыну. Дзікушкі спадабаліся старым Сямашкам, і яны пражылі тут 15 гадоў, адсвяткавалі залатое вяселле і дажылі да 80-летняга веку. Сын-мітрапаліт наведваў іх адзін-два разы ў год [6, с. 419]. Усяго ў сям'і Сямашкаў было 5 сыноў і некалькі дачок, мітрапаліт Іосіф – малодшы сын.

Прэабражэнская каменная царква была пабудавана мясцовым абшарнікам Рафаілам Грабоўскім як уніяцкая і асвечана ў 1840 г. [7, с. 550]. Новая царква адразу пасля заканчэння будаўнічых прац часова была пакрытая саломай. 26 красавіка 1842 г. загарэлася карчма, размешчаная каля царквы. Пажар хутка перакінуўся на саламяны дах храма, у якім якраз у гэты час ішло богаслужэнне. Усе драўляныя часткі царквы згарэлі, выратавалі толькі царкоўнае начынне. На ўзнаўленне і ўпрыгожванне Дзікушскай царквы настаяцель зрабіў значныя

ахвяраванні. Ён набыў 130 пудоў ліставога жалеза і пабудаваў новы бляшаны дах, збудаваў каменную званіцу і каменную агароджу вакол царквы. Акрамя таго, быў уладкаваны іканастас, на двух ярусах якога стаялі абразы апосталаў, пракокаў, Выратавальніка, Тайнай вячэры, а абраз Бога Айца быў прымацаваная да столі над прастолам. Стары Сямашка быў старанным і вельмі сумленным святаром. Ён шмат зрабіў для сваёй царквы і прыхаджан, быў добрым бацькам сваім дзецям [6, с. 419 – 420].

Ёсць меркаванне, што *«именно от отца будущий митрополит воспылал любовью к России, православной вере и священничеству»* [8, с. 14]. Але ж, вядома, што Сямашка-бацька адмоўна адносіўся да ліквідацыі уніі, а адзін з братоў мітрапаліта – гранічна адмоўна. Таму з'явілася жаданне разабрацца з гэтым пытаннем.

Хутка пасля смерці мітрапаліта Іосіфа Сямашкі протаіерэй А.Мацкевіч, у *«благочинии»* якога знаходзіўся прыход Паўлаўка, радзіма Сямашак (пад Кіевам), сабраў пісьменныя і вусныя ўспаміны аб гэтым родзе. Г.Я. Кіпрыяновіч у кнізе «Жизнь Иосифа Семашки, митрополита литовского и виленского…» прывёў гэтыя звесткі. З нагоды заўвагі архімандрыта Мадэста (потым архіепіскапа Валынскага) аб тым, што *"бацька Іосіфа ахвотна прыняў праваслаўе»*, протаіерэй Мацкевіч пярэчыць: «*Ведаўшы яго асабіста, і пры тым блізка, магу сцвярджаць толькі зваротнае: толькі пераехаўшы ў Літву … ён стаў праваслаўным і то больш па назве»*. Далей Мацкевіч кажа, што *«фанатызм і нянавісць да праваслаўя асабліва выказваў сын протаіерэя Сямашкі, святар Ян (Иоанн) Сямашка»* (родны брат мітрапаліта) [6, с. 414 – 416]. Але аб браце мітрапаліта трохі ніжэй.

У 1827 – 1829 гг. стары святар *«выпрабаваў шмат засмучэнняў»*. *«Раўніцелі уніі»* абражалі яго з-за сына і пагражалі пазбавіць права на богаслужэнне (ён служыў у асобным уніяцкім алтары ў Ілінецкім каталіцкім касцёле). Кіпрыяновіч піша, што бацька таксама падазраваў свайго сына ў схільнасці да *«схізмы»*. І таму стары быў у захапленні, прачытаўшы ў 1828 г. у «Віленскім весніку», што адкрытая ў Жыровічах Літоўская семінарыя засталася ў *«злучэнні з рымскай царквой»*, а не звернутая ў *«схізму»*, як баяліся дбайныя ўніяты. Не зразумелы і фактар, па якім стары Сямашка пакінуў месца службы пры сваім алтары ў касцёле: *«з-за непрыязнасці ксяндзоў, а можа быць і ў сілу новых, выдадзеных урадавых распараджэнняў»*. З гэтага факта, прыведзенага Г.Я.Кіпрыяновічам, можна дапусціць, што бацька галоўнага ліквідатара уніі быў пазбаўлены свайго паста з-за таго, што не адразу прыняў палітыкі сына. Стары не прыняў праваслаўнай абраднасці, якая ўводзілася ў той час ва уніяцкай царкве. Пасля страты месца ён падарыў

сваю хату каля касцёла сыну-лекару Мікалаю і купіў іншы дом, насупраць старога, дзе зрабіў з кухні малельню, упрыгожыўшы яе абразамі. У гэтай малельні стары Сямашка правёў па уніяцкім абраду шлюб сваёй дачкі Алены. Па ўспамінах відавочнікаў, маладыя падчас вянчання стаялі па уніяцкаму абраду на каленах.

Ліквідацыя уніі была нечаканасцю для Сямашкі-бацькі. Па словах мітрапаліта Іосіфа, стары Сямашка *«нічога не ведаў папярэдне»* аб кіруючай ролі свайго сына ў гэтай справе і не спагадаў яму ў гэтым. Мітрапаліт у сваіх лістах да бацькі пераконваў яго ісці за сабой і прыняць праваслаўе. Ён даслаў свайму бацьку багатую рызу і падрызнік узамен лацінскага «габіта» (габіт – манаская рыза), які святар насіў да гэтага часу.

У пачатку 1840 г. стары святар, не маючы места працы, даў падпіску аб далучэнні да праваслаўя. Далей Сямашка-бацька старанна і добрасумленна служыў праваслаўным святаром на Лідчыне [6, с. 417 – 418]. Ён памёр 17 ліпеня 1856 г. (па старым стылі). Высокапастаўлены сын у гэты час быў у Маскве на каранаванні і ў пахаванні бацькі ўдзелу не прыняў. Святар Іосіф Сямашка быў пахаваны ў каменнай пячоры пад левым кліросам Дзікушскай царквы. Над магілай была прымацавана мармуровая пліта з надпісам: «Здесь покоится тело раба Божия протоиерея Иосифа Семашко. Родился 1776 г. 20 августа. Скончался 17 июля 1856 г.» [6, с. 422 – 423]. У 80-х гг. XX ст., калі царква стаяла закрытай, злодзеі разрабавалі пахаванне. Парэшткі засталіся на месцы, але каштоўныя, па меркаванню злачынцаў, рэчы былі выкрадзеныя.

Інакшай была справа з родным братам мітрапаліта Іосіфа, святаром Янам Сямашкам. Аб сваім браце Ян Сямашка гаварыў так: *«праклятьі: ён і сябе ўтапіў, і народ загубіў»*. Калі аднойчы праваслаўны святар паказаў Яну партрэт яго знакамітага брата, *«ён з шаленствам кінуў партрэт на падлогу і пры гуках пабітага шкла ўцёк»*. Паміраючы, Ян завяшчаў пахаваць сябе пры Іленецкім касцёле, і ксяндзы былі гатовы выканаць яго волю. Аднак праваслаўныя святары забралі цела нябожчыка і пахавалі пры праваслаўнай царкве, чаму мітрапаліт быў рады і даслаў ім за гэта грашовую ўзнагароду. Жонка Яна Сямашкі, дачка уніяцкага святара, каб пазбегнуць пераводу ў пануючую веру, перайшла ў рыма-каталіцтва [6, с. 8].

… Маркотная гісторыя падзелу сям'і верай…

Шмат цяжкасцяў перажыў прыход ў Дзікушках у XX ст., аднак у 1936 і ў 1956 гг. у храме рабіўся капітальны рамонт.

Прэабражэнскую царкву ў Дзікушках закрылі ў атэістычным 1961 г., і аж да 1998 г. яна паступова прыходзіла ў запусценне.

Са зменай дзяржаўнай палітыкі адносна рэлігіі і царквы ў Беларусі храм у Дзікушках аднавіў сваю дзейнасць. У 1999 г. над ім усталявалі новы купал з крыжам. Пасля доўгіх рамонтных прац, якія праводзіў настаяцель царквы а. Георгій Сеўрук, 10 кастрычніка 2009 г. храм быў пасвечаны архіепіскапам Навагрудскім і Лідскім Гурыем.

Спіс крыніц і літаратуры

1. Описание документов архива западнорусских униатских митрополитов. – Т. 2. – СПб., 1907.
2. Труды Виленского отделения Московского предварительного комитета по устройству в Вильне IX Археологического съезда. – Отдел II. – Вильна, 1893.
3. Niesiecki, K. Herbarz Polski / K. Niesiecki. Wyd. J.N. Bobrowicz. – T. 9. – Lipsk, 1842.
4. Макарий. История Русской церкви / Макарий. – Т. 5. – Отд. 1 [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.zhurnal.ru/magister/library/history/makary/mak5102.htm – Дата доступа: 30. 01. 2010.
5. Aftanazy, R. Dzieje rezydencji / R. Aftanazy. – T. 4. – Wroclaw, 1993.
6. Киприанович, Г. Я. Жизнь Иосифа Семашки, митрополита литовского и виленского, и воссоединение западно-русских униатов с православной церковью в 1839 году / Г. Я. Киприанович. – Вильна. 1893.
7. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами генерального штаба. Виленская губерния. – СПб., 1861.
8. Черепица, В.Н. Подвижники православия на Лидчине (XIX – середина XX в.) // Ліда і Лідчына: да 685-годдзя з дня заснавання горада / В.Н. Черепица. – Ліда. 2009. – С. 14 – 18.

Лаўрэш Леанід Лявонцевіч – краязнаўца.

УДК 271-055.2(476)

Т.Р. Маліноўская (Гродна),
Н.А. Маліноўская-Франке (Мінск)

ГРОДЗЕНСКІ БРЫГІТСКІ КЛЯШТАР І НАЗАРЭТАНКІ (1790-я – 1930-я гг.)

Гродненский Бригитский монастырь и костел имеют многовековую историю. В статье на материале Гродно рассказывается о деятельности женского ордена назаретянок в 1790-е – 1930-е гг. История ордена представлена в многочисленных сюжетах повседневной жизни сестер.

Брыгітскі кляштар і касцёл Звеставання Панны Марыі ў Гродне знаходзіцца на перакрыжаванні сучасных вуліцаў К. Маркса і Маладзёжнай. У другой палове XVI ст. вуліца К. Маркса называлася Азёрскай (Езерскай) і выводзіла з Рынка на ўсходні гасцінец, які вёў да

мястэчка Азёры, што і вызначыла назву вуліцы. У тыя часы вуліца была ў асноўным забудавана дамамі гродзенскіх рамеснікаў і цэхмайстраў [2, с. 33].

У XVII ст. сітуацыя на вуліцы змянілася: тут ужо мясціліся ў асноўным плацы вяльможных паноў, а напрыканцы вуліцы з’яўляюцца «placy ww panien Brygidek, na których domów dwa zabudawanych» [2, с. 192]. Акт фундацыі кляштара брыгітак у Гродне Аляксандры з Сабешына Весялоўскай – Вялікай Маршалковай Вялікага княства Літоўскага – датуецца 1642 г. [11, с. 1]. Фундацыю зацвердзіў кароль Уладыслаў IV 16 кастрычніка 1642 г. Менавіта фундуш А. Весялоўскай даў магчымасць пабудаваць кляштар. Кутны камень пад будаўніцтва кляштарнага комплексу быў закладзены яшчэ ў 1635 г. [12, с. 7].

Ордэн Св. Брыгіты – гэта закон Найсвяцейшага Збаўцы (Ordo Sanctae Brigittae, Ordo Sanctissimi Salvatoris), быў закладзены на поўдні Швецыі Брыгітай Шведскай каля 1346 г., і ўжо ў 1396 г. брыгіткі з’явіліся ў Гданьску, а ў 1426 г. Уладыслаў Ягайла ўфундаваў брыгітскі кляштар у Любліне.

Менавіта з Любліна ў 1634 г. прыбылі першыя сёстры-брыгіткі ў Гродна і пасяліліся напачатку ў драўляным лямусе [12, с. 16], у глыбіні вяліка плаца. У Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Гродне захоўваецца «Рэестр маёмасці кляштара брыгітак» 1636 г., у якім пералічыны званы, літургічныя шаты, палатно, посуд, скрыні і зялёная шафа [5, с. 1–5].

Захаваныя ў гістарычным архіве ў Гродне касавыя кнігі ад канца XVIII ст. падаюць выдаткі касцёла, у тым ліку і на рамонт касцёла і кляштара [6, с. 9, 23]. Так, у 1791 г. мулярам, цеслярам і іх памочнікам выдавалася 14 злотых і 15 грошаў, што сведчыць пра невялікі аб’ём рамонтных прац і, ускосна, пра добры стан будынкаў пасля рамонту, які праводзіўся пасля пажару 1753 г. Дадаткова ў тым жа годзе было выдаткавана 54 злотыя на рамонт усіх вокнаў кляштара [6, с. 9, 23]. У 1798 г. было выдаткавана 8 злотых на замену шкла ў вокнах [6, с. 23 адв.]. Магчыма, пасля пажару 1753 г., які пашкодзіў кляштарны комплекс, быў праведзены ўжо значны рамонт, што дало магчымасць на працягу наступных больш як шасці дзесяцігоддзяў здзяйсняць толькі бягучыя рамонтныя работы.

Пасля пажару 1827 г. на комплексе праводзяцца не толькі рамонтныя работы, але і дабудоўваецца яшчэ адна частка кляштару з боку касцёла, якая замкнула кляштарны будынак і касцёл, утварыўшы прамавугольны ўнутраны падворак [11, с. 1].

У 1830 г. адбылася рэвізія кляштара і касцёла. У выніковым дакуменце нічога не гаворыцца пра неабходнасць нейкіх рамонтаў, што

ўскосна сведчыць пра канчатковае завяршэнне працаў пасля пажару [7, с. 2]. Дакумент дадае новую інфармацыю, менавіта пра існаванне невялікага цвінтару каля касцёла, ў куце вуліц Брыгітская і Навікоўская (Маладзёжная).

Але ўжо праз 14 гадоў, у 1844 г., адбылася новая рэвізія касцёла і кляштара з боку губернскіх уладаў, у выніковым дакуменце якой пазначана, што кляштар пакрыты дахоўкай, над ім 22 коміны. Дах патрабуе рамонту. Дакумент адзначае наяўнасць трох склепаў пад кляштарам і, што цікава, дахоўкі на даху лямуса, які зараз пакрыты дранкай. Пералічаны гаспадарчыя пабудовы на тэрыторыі кляштара, мураваны дом садоўніка, а таксама бровар і кузня, вынесеныя за межы кляштарнага плаца [9, с. 3 адв.]. Бягучыя рамонты на комплексе ў 30-х гг. XIX ст. здзейснівалі стала працуючыя пры кляштары сталяр, муляр і слесар [8, с. 4].

Напрыканцы 1857 г. камісія, прызначаная губернскімі ўладамі, агледзела касцёл і кляштар брыгітак з нагоды вызначэння неабходных рамонтных работ. Камісія патрабавала «в самом монастыре переменить на место сгнивших две балки и две стропильные ноги, перекрыть черепичную крышу, починить в местах опавшую штукатурку и выбелить снаружи строение; в коридоре при костёле от двора, перекрыть совершенно ветхую железную крышу» [10, с. 2]. У гэтым жа калідоры пайшлі па муроўцы шчыліны, якія рэкамендавалася замацаваць жалезнымі звязкамі. Закрыстыя патрабавала замены кроквaў і меднай бляхі. Рэкамендавалася зрабіць пад дахам закрыстыі люкарны для асвятлення паддаша і падачы свежага паветра, каб захаваць драўляныя звязкі. У памяшканні пральні зусім прагнілі кроквы і камісія патрабавала зрабіць новы дах з выкарыстаннем старой дахоўкі. Патрабаваўся рамонт муру з боку сучаснай вуліцы Маладзёжнай, паколькі ён трымаўся толькі за кошт контрфорсаў. Акт падпісаў архітэктурны памочнік Фардон і Гродзенскі дэкан [10, с. 16].

Звестак пра рэалізацыю рэкамендаванага рамонту ў архіўных дакументах няма, але катэгарычны характар акта дае падставы меркаваць, што рамонт павінен быў быць здзейсненым.

За ўдзел у «польском восстании» 1863 г. расійскія ўлады наклалі кантрыбуцыю на рымска-каталіцкае святарства. Гродзенскі брыгітскі кляштар, як кляштар I катэгорыі, павінен быў унесці ў казну 553 рублі, што з'яўлялася вялікай сумай [3, с. 2]. Для параўнання, увесь рамонт 1857 г., быў вызначаны ў каштарысе сумай каля 3000 рублёў.

Новыя выпрабаванні выпалі на брыгітак у 1885 г., калі пажар не толькі пашкодзіў будынкі, але спаліў старажытныя дакументы і кнігі кляштарнай бібліятэкі [13, с. 13].

Брыгітскі кляштар у Гродне існаваў да Першай сусветнай вайны. У 1913 г. у ім было яшчэ пяць сясцёр [1]. Можна меркаваць, што назарэтанкі, якія прыехалі ў гродзенскі брыгітскі кляштар па распараджэнню біскупа для нагляду за старымі брыгіткамі, узялі на сябе гаспадарчыя абавязкі яшчэ ў 1905 г., калі яны стварылі ў касцёле бабінец [11, с. 2]. Нефармальна ўся ўласнасць брыгітак перайшла да назарэтанак пасля смерці апошняй брыгіткі паміж 1914 і 1918 гг., але паколькі гэта адбылося ва ўмовах Расійскай імперыі, справу трымалі ў таямніцы, каб не страціць кляштар.

У 1923 г. уся ўласнасць сясцёр брыгітак рэскрыптам Кангрэгацыі ордэна была перададзена сёстрам назарэтанкам. Гродзенскі дэкан пацвердзіў гэтае рашэнне 26 жніўня 1924 г. [14, с. 1].

Удакументаваная перадача брыгітскага кляштара сёстрам назарэтанкам здзейснівалася праз старэйшую сястру назарэтанскага дома Маці Паўлу Гажыч, чыя актыўная грамадская, творчая і педагагічная дзейнасць у гродзенскім доме Найсвяцейшай сям'і з Назарэту была аддадзена службе Богу.

Дакументы і асабістыя рэчы першай старэйшай сястры гродзенскага назарэтанскага дома Маці Паўлы Гажыч, што захоўваюцца ў Правінцыйным архіве Варшаўскай правінцыі Згуртавання Сясцёр Найсвяцейшай сям'і з Назарэту, творы мастачкі Марыі Гажыч, якія захоўваюцца ў музеях Варшавы, Кракава і Познані, прыватных калекцыях Францыі, Германіі, Італіі і ЗША, а таксама ў гродзенскім касцёле Звеставання Панны Марыі, апавядаюць пра магутную асабовасць, выключную харызматычнасць і вялікі мастакоўскі талент Марыі Гажыч з дому Хшаноўскай, вядомай ад 1908 г., як Маці Паўла Гажыч. Народжаная ў 1860 г. у сям'і царскага чыноўніка высокага рангу Тадэвуша Хшаноўскага, чый маёнтак Сегянёўшчына мясціўся каля Ваўкавыску, адораная Марыя Хшаноўска ў 16 гадоў становіцца вучаніцай Войцэха Герсана, потым навучаецца ў Мюнхене і Парыжы, актыўна выстаўляецца па ўсёй Еўропе і ў ЗША. Яе творчасцю захапляецца Баляслаў Прус, яе настаўнік В. Герсан і мастацкія крытыкі. У 18 гадоў Марыя выходзіць замуж за Паўла Гажыча, чый маёнтак Тапаляны месціўся недалёка ад роднай Сегянёўшчыны.

У Нацыянальным Музеі ў Варшаве захоўваецца аўтапартрэт Марыі Гажыч, які дагэтуль у мастацтвазнаўчай літаратуры пазначаны знакам пытальніка, паколькі не было ўпэўненасці, ці намаляваная жанчына і ёсць Марыя Гажыч. Але фотаздымак сястры Паўлы, які быў зроблены ў дзень складання ёю вечных шлюбаў у Рыме, што захоўваецца ў архіве сясцёр назарэтанак у Варшаве, не пакідае ніякіх сумніваў – гэта «Аўтапартрэт» Марыі Гажыч.

У альбоме з архіва назарэтанак у Варшаве ёсць яшчэ два аўтапартрэты Гажыч, зробленыя ў малюнку ў 1893 і 1897 гг. Першы – гэта партрэт мастачкі ў капелюшы. Яе пастава, погляд і нават выразная тэхніка малюнку перадаюць упэўненасць мадэлі, яе веру ў свае магчымасці. Другі аўтапартрэт быў зроблены на Вігілію 1897 г. – у час, калі ўжо цяжка хварэў муж. Настрой малюнка зусім іншы, як іншым быў душэўны стан мастачкі – непакой, бязраднасць і нават страх перад нечым яшчэ не перажытым, невядомым, але і неадступным. Не хлусіць і аловак мастачкі – нярвовая лінія, а рука партрэтаванай бязрадна вынесена наперад.

Увесь час хваробы мужа з восені 1896 г. і да 1900 г. мастачка бязвыезна жыве ў родавым маёнтку мужа Тапаляны, пра што сведчаць подпісы пад замалёўкамі альбома мастачкі. У гэты час яна замалёўвала пераважна тое, што яе атачала: асобныя дрэвы, цяністыя прысады, партрэцікі вясковых дзяцей і тыпы беларускіх сялян. Часам яна выязджала ў недалёкія Манькавічы (рэзідэнцыя Радзівілаў), Бабічы, Давыд-Гарадок і Нясвіж. Да таго ж перыяду творчасці адносяцца два партрэты «Паляшук» і «Паляшучка», апошні выстаўляўся ў 1896 г. у варшаўскай «Захэнце» і быў станоўча адзначаны крытыкай .

Пасля смерці мужа Марыя Гажыч, якая выхоўвалася ў лаіцкай сям’і, перажывае духоўны пераварот. Яна становіцца не толькі практыкуючай каталічкай, але вырашае адыйсці ў кляштар. Вядомай, плённа працуючай і прызнанай мастачцы быў ужо 41 год. Адыходзячы ў кляштар, яна ўсе свае грошы і грошы, атрыманыя ад продажу маёнтка мужа Тапаляны, накіроўвае на рэстаўрацыю гродзенскага брыгітскага кляштара.

Назарэтанкі ўзгадваюць нязвыклую харызматычнасць Маці Паўлы, якая змагла спалучаць поўнае аддання рэлігійнае манаскае жыццё з актыўнай грамадскай і педагагічнай дзейнасцю.

Спачатку М. Гажыч пайшла ў закон французскіх аблятак, але жыццё ў гэтым законе ўнутрана не адпавядала яе чаканням і духоўныя пошукі прывялі яе ў Згуртаванне Сясцёр Найсвяцейшай Сям’і з Назарэту (Закон сясцёр назарэтанак). Яе рэлігійная фармацыя доўжылася карацей, чым звычайна. Пасля складання першых шлюбаў і атрымання імя Паўлы яна спачатку накіроўваецца на некалькі месяцаў на замену старэйшай сястры ў Вільню, а потым становіцца старэйшай сястрой ў новазаснаваным у 1908 г. доме навіцыяту назарэтанак у Гродне.

У 1908 г. у гродзенскім брыгітскім кляштары заставалася толькі некалькі старых сясцёр брыгітак, і тады арцыбіскуп Роп, каб ўратаваць кляштар ад касацыі, стаў хадайнічаць перад ўладай і дамогся запрашэння сясцёр назарэтанак для дагляду за старымі сёстрамі. Такім чынам, назарэтанкі апынуліся ў Гродне, а Маці Паўла стала першай старэйшай

сястрой у кляштары. Вялікі досвед з яе свецкага жыцця дапамагаў Маці Паўле ў наладжванні дзейнасці кляштара ў Гродне. Менавіта яна распачала тут культ Найсвяцейшага сэрца Езуса і намалявала першы абраз Сэрца, каля якога адпраўлялася чэрвеньскае набажэнства. Яна таксама дамаглася ад царскіх уладаў дазволу нашэння хабітаў.

Але акрамя наладжвання рэлігійнага жыцця ў кляштары Маці Паўла распачала актыўную грамадскую дзейнасць. Яна, не пытаючы дазволу ўладаў, арганізавала моладзевы хор, а таксама гурток для бедных дзяцей, а праз некалькі гадоў адчыніла інтэрнат для вучаніц расійскіх школ. За зачыненымі дзвярыма касцёла збіраліся розныя каталіцкія суполкі.

Падчас Першай сусветнай вайны, у 1916 г. Маці Паўла з дапамогай ксяндза Францішка Грынкевіча атрымала дазвол акупацыйных уладаў на адкрыццё жаночай гімназіі, якая першапачаткова размясцілася ў чатырох кляштарных пакоях – гэта была першая польская школа ў Гродне. Напрыканцы 1916 г. назарэтанская школа атрымала памяшканне былой рускай школы на вуліцы Ажэшкі (стары корпус універсітэта), у якім мясцілася да 1918 г. У школьным 1916/1917 г. у гімназіі навучалася 150 вучаніц, у наступным – 400, а яшчэ праз год – 500. У гімназіі выкладалі як сёстры, так і свецкія асобы.

Яшчэ раней, у 1908 г., назарэтанкі заснавалі ў Гродне ткацкую майстэрню, дзе навучалі дзяўчат вырабляць коўдры і кілімы. Майстэрня мясцілася ў невялікім дамочку па вуліцы Назарэтанскай. Падчас Першай Сусветнай вайны майстэрня перастала працаваць у сувязі з цяжкасцямі ў здабыванні сыравіны і аднавіла працу толькі ў 1932 г., але тады дзяўчаты займаліся не толькі ткацтвам, але і рукадзеллем і вырабам трыкатажа. Дзяўчаты навучаліся пад кіраўніцтвам с. Натанаэлы Кіткевіч, якая скончыла Кракаўскую школу дэкаратыўнага мастацтва і мастацкіх рамёстваў. Майстэрня дзейнічала да 1942 г.

Наколькі дазваляў Маці Паўле духоўны стан, яна ўключылася ў дзейнасць тайных асяродкаў польскай моладзі. Падчас Першай Сусветнай вайны выхаванкі гродзенскага Назарэту, пераапранутыя ў вясковае адзенне, былі сувязнымі ваенных акцый, пераносілі і хавалі зброю.

У Гродне Маці Паўла працягвала займацца жывапісам і рэстаўрацыяй старадаўніх абразоў. Толькі ў жывапісу Маці Паўлы змянілася тэматыка – цяпер яе цікавіў выключна сакральны жывапіс.

Сёння ў кляштары захоўваюцца 6 абразоў, напісаных Маці Паўлай (М. Гажыч) у Гродне з 1908 да 1919 г.: «Св. Юзаф-цясляр», «Св. Клеменс», «Езус – добры пастар», «Св. Пётр», «Маестат Марыі» і «Хоры анёлаў». У Варшаве захоўваецца яе абраз «Св. Тэкля».

Евангелістычна лаканічная кампазіцыя абраза «Св. Юзаф-цясляр» перадае вобраз святога за звыклай працай цесляра ў абстаноўцы простай

малаасвечанай майстэрні. У цэнтры кампазіцыі – постаць св. Юзафа ў сіняй хламідзе, паверх якой накінуты карычневы плашч-пелерына. Увесь пакой выкананы ў мюнхенскім карычнева-залацістым таямнічым каларыце, таму постаць святога вылучаецца сінім колерам адзення. Асноўны колеравы рытм кампазіцыі – белы, як колер сівых валасоў і барады, які прыцягвае да засяроджанага на працы спакойнага твара, і белай лілеі справа ўнізе. Спакой, раўнавага і годнасць – асноўныя пачуцці, якія выклікае кампазіцыя, у якой асноўны настраёвы прасвятлёна-спакойны акорд стварае святло.

У гродзенскі перыяд Маці Паўла навучала жывапісу с. Карытас (Леанілу) Мікаш, якая нарадзілася ў 1888 г. ў Вільні, дзе вучылася малюнку і музыцы. У гродзенскім назарэтанскім доме, акрамя навучэння жывапісу ў Маці Паўлы, с. Карытас кіравала касцельным хорам і з 1917 г. выконвала функцыі кіраўніка гімназіі, у 1920 г. ад'ехала ў Рым і там пасля складання вечных шлюбаў амаль год навучалася жывапісу. Яе абраз «Св. Сям'я» захоўваецца зараз ў правінцыйным доме назарэтанак у Варшаве.

У Гродне Маці Паўла знаходзілася да 1919 г., пасля чаго яе накіравалі працаваць спачатку ў Люблін, а потым у Альбана. Сярод гродзенцаў Маці Паўла карысталася вялікай пашанай, яе празвалі «Гродзенскай Маці». На прыканцы жыцця, у 1932 г., Маці Паўла зноў вернецца ў свой гродзенскі Назарэт, каб тут правесці свае апошнія на гэтай зямлі гады. Памерла Маці Паўла ў Гродне ў 1934 г. і была пахавана на гродзенскіх каталіцкіх могілках.

Спіс крыніц і літаратуры

1. Encyklopedia katolicka. – T. 2. – Lublin, 1986.
2. Писцовая книга Гродзенской экономии. – Ч. 2. – Вильна, 1882.
3. НГАБ у г. Гродна. – Ф. 1. – Воп. 22. – Спр. 1496.
4. НГАБ у г. Гродна. – Ф. 14. – Воп. 1. – Спр. 16.
5. НГАБ у г. Гродна. – Ф. 1783. – Воп. 1. – Спр. 16.
6. НГАБ у г. Гродна. – Ф. 1783. – Воп. 1. – Спр. 101.
7. НГАБ у г. Гродна. – Ф. 1783. – Воп. 1. – Спр. 188.
8. НГАБ у г. Гродна. – Ф. 1783. – Воп. 1. – Спр. 219.
9. НГАБ у г. Гродна. – Ф. 1783. – Воп. 1. – Спр. 233.
10. НГАЛ. – Ф. 69. – Воп. 1. – Спр. 7561.
11. НГАЛ. – Ф. 694. – Воп. 5. – Спр. 830.
12. НГАЛ. – Ф. 694. – Воп. 5. – Спр. 835.
13. НГАЛ. – Ф. 694. – Воп. 5. – Спр. 847.
14. НГАЛ. – Ф. 694. – Воп. 5. – Спр. 847.

Маліноўская Тацяна Рыгораўна – старшы выкладчык Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы.

Маліноўская-Франке Наталля Аляксандраўна – аспірантка Акадэміі мастацтваў.

УДК 262.2(476)

К.В. Лаўрыненка (Віцебск)

ПАРАФІЯ ЎНЕБАЎЗЯЦЦЯ НАЙСВЯЦЕЙШАЙ ПАННЫ МАРЫІ Ў ВЁСЦЫ ПРАЗАРОКІ Ў XX ст.

В статье приводятся сведения о деятельности в XX в. костела и парафии Успения Пресвятой Девы Марии в деревне Прозороки (Витебская область).

Першы каталіцкі касцёл Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі ў Празароках быў пабудаваны ў 1698 г. па фундушу полацкага падкаморыя Юстына Шчыта. Годам раней, у 1697 г., празарокская парафія была аддадзена канвентуальным францысканцам. І будынак касцёла, і кляштар францысканцаў былі драўляныя. На пачатку XVIII ст. касцёл і кляштар верагодна згарэлі, паколькі ў 1721 г. смаленскі харужы Павел Корсак унёс фундуш на новы драўляны касцёл і кляштар. Пасля паўстання 1830 – 1831 гг., у 1832 г. кляштар быў ліквідаваны, і парафія была перададзена дыяцэзіяльным святарам. 14 жніўня 1892 г. у Празароках узнік пажар, які знішчыў касцёл, калакольню і плябанію. У 1896 г. Віленская рыма-каталіцкая кансісторыя дазволіла пабудову новага касцёла. Парафія ўзнікла 4 сакавіка 1897 г., а 12 жніўня 1899 г. пры закладцы фундаменту пад новы касцёл віленскі біскуп С. Звяровіч асвяціў краевугольны камень. Будаўніцтва касцёла пад кіраўніцтвам пробашча кс. Дамініка Друктэйна працягвалася з 1899 па 1907 гг. Восенню 1907 г. будаўніцтва касцёла было скончана, і 14 кастрычніка новы касцёл у Празароках быў асвечаны пад назвай Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі [1].

З 1921 г. празарокская парафія апынулася у складзе ІІ Рэчы Паспалітай. Як сведчаць схематызмы Віленскай архідыяцэзіі, у 1928 г. пробашчам парафіі быў ксёндз Вінцэнт Габшэвіч, а сама парафія налічвала 5297 чалавек [2, s. 47]. Па стану на 1932 г., акрамя пробашча Габшэвіча, у парафіі працаваў у якасці вікарыя ксёндз Францыск Брудняс [3, s. 55]. У 1936 г. у якасці вікарыя ўжо працаваў ксёндз Юзэф Аляхно [4, s. 56], а дадзеныя 1939 г. сведчаць, што яе пробашчам быў ксёндз Стэфан Астаневіч, у якасці школьнага катэхеты працаваў ксёндз Мікалай Тапер, а сама парафія налічвала ўжо 5536 чалавек [5, s. 57].

У 1939 г. пробашчам парафіі быў прызначаны ксёндз Чэслаў Матусевіч [6]. Ён здолеў перажыць нялёгкі час 1939 – 1944 гг. Адносна спакойным быў некаторы час пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-

фашысцкіх захопнікаў. Так, мясцовыя ўлады прызначылі шасцярых мужчынаў, якія працавалі для касцёла, – падвозілі да яго пясок, парадкавалі могілкі. Можна сказаць, што ўлады лічыліся з патрэбамі Касцёла. Але працягвалася гэта вельмі кароткі час. Ужо ў 1947 г. ксёндз Матусевіч заплаціў падатку 919 рублёў пры суме даходу 6968 рублёў. А сама гаспадарка ксяндза складалася з 0,1 га пашні, 1 га сенакосу і 1 каровы [7]. Сам касцёл быў зарэгістраваны 13 ліпеня 1947 г., у той жа дзень быў зарэгістраваны ксёндз [8]. Але вельмі хутка ксёндз Матусевіч разам з арганістам Антонам Фабіянавічам Бейнаровічам, 1901 г. нараджэння, выехаў у Польшчу. Кароткі час у касцёле служыў ксёндз Ян Літвінскі, пробашч з блізкай вёскі Чарневічы. 2 студзеня 1948 г. ксёндз Антоні Зенкевіч, Глыбоцкі дзекан, прызначыў пробашчам у Празароцкі касцёл ксяндза Вікенція Варшу, а 29 студзеня кс. Варша атрымаў ад Упаўнаважанага рэгістрацыю [9]. Ужо ксяндзу Варшу прыйшлося спазнаць уціск уладаў. Да яго пачалі чапляцца ў розных дробязях, тым больш, што ксёндз неаднаразова прасіў у мясцовых уладаў, каб яму далі большы гарод, паколькі разам з ім пражывалі яго пляменнікі.

У 1950 г. ксяндза Варшу арыштавалі прадстаўнікі органаў МДБ. Адбылося гэта на пачатку красавіка, у Вялікі Чацвер. А 14 гадзіне ён адправіў Імшу Вячэры Панскай. Ужо падчас імшы у Празарокі прыехалі супрацоўнікі МДБ і чакалі, пакуль скончыцца служба, каб не арыштоўваць святара на вачах у людзей. Пасля імшы ксяндза выклікалі у сельсавет нібы для падпісання нейкіх папераў. Там і адбыўся арышт. Да іншага ўваходу падагналі варанок, у якім і вывезлі святара [10]. І пачаўся для кяндза Варшы яго крыжовы шлях. Па чарзе ён знаходзіўся ў турмах у Полацку, Віцебску, Смаленску. І нарэшце, у Маскве святару быў завочна вынесены прысуд – 25 гадоў лагераў [11, s. 620].

Аб арышце святара парафіяне даведаліся толькі праз суткі – на працягу гэтага часу супрацоўнікі МДБ не выпускалі з плябані яе жыхароў, каб тыя не паведамілі вяскоўцам. А 9 красавіка, на Вялікдзень, каля зачыненага касцёла сабралося каля 3000 чалавек, якія маліліся пад адкрытым небам. Пасля гэтага вернікі напісалі заяву на імя І. Сталіна з просьбай аб адкрыцці касцёла і прысылцы новага ксяндза. За дзень да святкавання Вялікадня прадстаўнік МДБ Сіроцін і старшыня сельсавета Ільін папярэдзілі арганіста Ваўжынца Язэпавіча Подрас, каб ніякіх збораў вернікаў не было. А паколькі арганіст сказаць такое не мог, таму ўвогуле падчас свята не выходзіў з хаты [12]. Праз тыдзень прадстаўнікі мясцовых уладаў запрасілі Франца Лавейку, перапісалі ўсю маёмасць, зляжылі ў закрыстыю, ключы ад касцёла перадалі ў сельсавет. Пазней з касцёла выкінулі абразы, каб спаліць. Але частку абразоў вернікі

выратавалі, захоўваючы ў сваіх хатах. Касцёл пераўтварылі ў зернесховішча.

Але вернікі працягвалі змагацца за свой касцёл. Яшчэ двойчы ў 1950-ыя гг. – у чэрвені і жніўні яны дасылалі заявы ў Мінск з просьбай адчыніць касцёл і даслаць святара [13]. Дзесьці ў 1951 ці 1952 г. кладаўшчык калгасу Шчарбіцкі не зачыніў касцёл на замок, чым адразу скарысталіся парафіяне. Яны вычысцілі касцёл, прыбралі, упрыгожылі алтар кветкамі і пачалі збірацца ўкасцёле на малітвы. Але аб гэтым хутка даведаліся ўлады, касцёл зноў быў зачынены [14].

У 1954 г. ксяндза Варшу вызвалілі з прычыны інваліднасці з лагеру. Пасля вызвалення ён зноў вярнуўся ў Празарокі, але паколькі паводле прысуду яму было забаронена вяртацца ў гэтыя мясціны, таму вярнуўся ён таемна, ноччу зышоў з поезду і спыніўся ў Кавалеўскага ў вёсцы Зябкі, якая знаходзілася недалёка ад Празарок. Хата ў Кавалеўскага была вялікая, але Варша жыў у самым крайнім пакоі, святу ў ім таксама не палілі, каб не было бачна, што там нехта жыве. Нягледзячы на неспрыяльныя варункі, святар працягваў патаемна душпастырскую дзейнасць, адпраўляў імшу, спавядаў і хрысціў. Але ў хуткім часе ксёндз Варша вымушаны быў пакінуць тэрыторыю парафіі, паколькі, нягледзячы на старанні вернікаў, Упаўнаважаны адмовіў святару ў рэгістрацыі.

Тым не менш, вернікі не гублялі надзеі. Напрыканцы 1950-х гг. дэлегацыя парафіянаў, сярод якіх былі Франц Лавейка, Адольф Баранчук, асабіста звярнулася да Упаўнаважанага з просьбай аб адкрыцці касцёла. Але заглянуўшы ў карту, Упаўнаважаны ўбачыў, што бліжэйшы касцёл знаходзіцца ў 18 км, у в. Задарожжа, і адмовіў, сказаўшы, што гэта зусім невялікая адлегласць [15].

11 мая 1960 г. касцёл у Празароках быў зняты з рэгістрацыі Саветам па справе рэлігійных культаў пры Савеце Міністраў СССР. У заключэнні аб стане касцёла ад 28 снежня 1959 г. Упаўнаважаны пісаў: “З 1948 і па 1959 год касцёл з’яўляецца бесхозным, малітоўныя сходы ў ім не праводзіліся больш за 10 гадоў, ад часу і кліматычнага ўздзеяння сваё прызначэнне як касцёл страціў” [16]. Такім чынам, вернікі празароцкай парафіі пазбавіліся нават надзеі на адкрыццё свайго касцёла. А самі вернікі празароцкай парафіі, застаўшыся без святара, наведвалі цяпер касцёл у в. Задарожжа, дзе з 1957 г. пробашчам быў ксёндз Люцыян Паўлік MIC. Ён неаднаразова прыязджаў з душпастырскай паслугай на тэрыторыю Празароцкай парафіі. Старшыня выканкама Празароцкага сельсавета скардзіўся, што у 1959 г. кс. Паўлік хрысціў дзяцей у хаце Т. у Празароках, а ў чэрвені 1960 г. спавядаў Д. [17]. Увесь пасляваенны час

вернікі збіраліся на малітвы ў хатах. У вёсцы Касарова каля крыжа праводзіліся маёвыя набажэнствы.

У 1989 г. празароцкі касцёл быў вернуты вернікам. Дзякуючы намаганням парафіянаў і ксяндза Люцыяна Паўліка МІС, касцёл быў адноўлены і ў 1990 г. асвечаны. Пробашчам парафіі тады быў ксёндз Эугеніюш Гук, у 1991 – 1994 гг. – ксёндз Роберт Кшывіцкі, у 1994 – 1996 гг. – ксёндз Люцыян Паўлік МІС, з 1996 г. – ксёндз Роберт Акушка, затым ксёндз Марат Казлоўскі. З 2003 г. пробашчам парафіі з'яўляецца ксёндз Ежы Зыгмунтоўскі [18, с. 117]. У 2007 г. парафія ўрачыста адзначыла 100-годдзе пабудовы касцёла.

Спіс крыніц і літаратуры

1. Гістарычная даведка, складеная старшым мастацтвазнаўцам У. Первышыным. – Мінск, 1989.
2. Catalogus Ecclesiarum et cleri archidioecesis Vilnensis pro anno Domini 1928. – Vilnae, 1928.
3. Catalogus Ecclesiarum et cleri archidioecesis Vilnensis pro anno Domini 1932. – Vilnae, 1932.
4. Catalogus Ecclesiarum et cleri archidioecesis Vilnensis pro anno Domini 1936. – Vilnae, 1936.
5. Catalogus Ecclesiarum et cleri archidioecesis Vilnensis pro anno Domini 1939. – Vilnae, 1939.
6. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. – Ф. 1439. – Воп. 3. – Спр. 104. – Арк. 14.
7. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 952. – Воп. 1. – Спр. 7. – Арк. 205.
8. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. – Ф. 1439. – Воп. 3. – Спр. 104. – Арк. 18.
9. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. – Ф. 1439. – Воп. 3. – Спр. 104. – Арк. 19 – 20.
10. Інтэрв'ю з І. І. К, 1932 г. нараджэння. Празарокі, 29.04. 2009.
11. Dzwonkowski, R. Leksykon duchowieństwa polskiego represionowanego w ZSRS 1939 – 1988 / R. Dzwonkowski. – Lublin: Towarzystwo Naukowe Katolickiego Uniwersytetu Lubelskiego, 2003.
12. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 952. – Воп. 1. – Спр. 19. – Арк. 42 – 44.
13. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 952. – Воп. 1. – Спр. 21. – Арк. 81; Спр. 30. – Арк. 74.
14. Інтэрв'ю з Т. Ф. Л., 1932 г. нараджэння. Празарокі, 29.04. 2009.
15. Тамсама
16. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. – Ф. 1439. – Воп. 3. – Спр. 104. – Арк. 21.
17. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. – Ф. 4029. – Воп. 1. – Спр.13. – Арк. 92.
18. Rzymskokatolicka decezja Witebska. Schematyzm diecezjalny. – Witebsk, 2004.

Лаўрыненка Кацярына Віктараўна – кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі і сусветнай культуры Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П.М.Машэрава.

УДК УДК 2-67(476)

В.А. Панасюк (Гродна)

З ГІСТОРЫІ ВЁСКІ ПАРЭЧЧА ГРОДЗЕНСКАГА РАЁНА. РЭЛІГІЙНЫЯ УСТАНОВЫ ПАРЭЧЧА (XVII – XX ст.)

Статья представляет собой небольшой экскурс в историю деревни Поречье XVII – XX вв. и её культовых учреждений, основанный на документах и материалах Национального исторического архива Беларуси в г.Гродно.

Беларускі першадрукар, вучоны і асветнік эпохі адраджэння Францыск Скарына пісаў: *«Люди, и где зародилися и ускормлены суть ..., к тому месту великую ласку имеють».*

